Сяргій Жадан

МЕСАПАТАМІЯ



МЕСАПАТАМІЯ

Сергій Жадан

МЕСОПОТАМІЯ

Харків
Клуб Сімейного Дозвілля
2014

Сяргій Жадан

МЕСАПАТАМІЯ

Пераклалі з украінскай
Віталь Латыш і Андрэй Хадановіч



ЯНУШКЕВІЧ
выдавецтва

The original Ukrainian edition has been published
by Klub simejnogo dozvillja, Kharkiv, 2014.

Сергій Жадан
МЕСОПОТАМІЯ

ISBN 978-83-969297-0-9

© Serhij Zhadan 2014
© Suhrkamp Verlag Berlin 2015
All rights reserved by and controlled through Suhrkamp Verlag Berlin
© Латыш В. А., Хадановіч А. В., пераклад на беларускую мову, 2023
© Выданне на беларускай мове, афармленне.
Andrei Yanushkevich Publishing, 2023

Ніхто не ведае, адкуль яны з'явіліся і чаму аселі на гэтых рэках. Але іхняя цяга да рыбалоўства і веданне лоцыі ўказваюць на тое, што прыйшлі яны па вадзе, падняўшыся па рэчышчы ўверх. Мова іхняя, мяркуючы па ўсім, добра пасавала да спеваў і праклёнаў. Жанчыны іхнія былі пяшчотнымі і непакорлівымі. Ад такіх жанчын нараджаліся адважныя дзеці і вынікалі сур'ёзныя праблемы.

Сапраўдная гісторыя шумераў, том I

ЧАСТКА ПЕРШАЯ

Гісторыі ды біяграфіі

МАРАТ

За тыя сорак дзён, як памёр Марат, у горад прыйшла вясна. І амаль паспела прамінуць. Хавалі яго ў памінальны аўторак, у пачатку красавіка, а цяпер пагоркі зараслі травою, зялёнай і пякучай: надыходзіла лета. За сорак дзён мы паспелі ўсё забыць і супакоіцца. Але вось Маратавы бацькі патэлефанавалі і нагадалі. І я падумаў: так, сапраўды, толькі сорак дзён. Памерлыя не маюць да нас прэтэнзій, жывыя ўмеюць нас напружыць.

Хавалі яго некалькі сяброў і суседзі. Большасць знаёмых — а знаёмых Марат меў у горадзе цэлыя натоўпы — так і не паверыла, што іх сапраўды запрашаюць на яго пахаванне. Потым, вядома, выбачаліся, прыязджалі на могілкі, шукалі надмагілле. Красавік быў дажджлівы, за аўтобусам з труною беглі вулічныя сабакі, быццам ганаровая варта, час ад часу кідаючыся на чорныя колы пахавальнага фольксвагена, не жадаючы адпускаць Марата ў царства мёртвых. Па цвінтары хадзілі ўрачыстыя натоўпы, выбіраліся на пагоркі, дзе над імі віслі нізкія хмары, спускаліся

ў даліну, залітую залеваю, святкавалі як маглі, змешваючы алкаголь з дажджавой вадою. Мы бадай адзіныя прыехалі на могілкі з нябожчыкам і выглядалі даволі ненатуральна — так, нібы прыйшлі ў музычную краму са сваім піяніна. Вялікдзень усё змяшаў, робячы наш смутак крыху недарэчным. На Вялікдзень ніхто не памірае. Нармальныя людзі ў гэты час, наадварот, устаюць з магіл.

Смерць Марата выявілася падобнай да яго жыцця — нелагічнай і поўнай таямніц. Была ноч з суботы на нядзелю. У царкву Марат не пайшоў, паколькі лічыў сябе мусульманінам, да таго ж няверуючым, затое сярод ночы выбраўся ў шапік па цыгарэты. У хатніх тэпцях і з купюрай, заціснутай у кулаку. Там яго і падстрэлілі. Ніхто нічога не бачыў, усе былі па цэрквах. Начная прадавачка з шапіка сказала, што нічога не чула, хоць ёй здалося, быццам хтосьці спяваў і чуўся рык мататаў, аднак яна не ўпэўнена, але ў выпадку чаго магла б апазнаць галасы; зрэшты, немагчыма дакладна сказаць, ці былі яны мужчынскія або жаночыя, але яна ўсё ж паспела запісаць нумары на жыгулях, аднак выявілася, што жыгулі гэтыя стаяць на ўзбочыне пад студэнцкай паліклінікай ужо другі год і дворнікі складаюць у іх пустыя пляшкі ды знойдзены на сметніках кардон. Ну вось, казалі мы адзін аднаму, дзевяностыя вяртаюцца, хто наступны?

Незразумела было таксама, за што яго расстралялі. Бізнес Марат не вёў, з уладаю не перасякаўся, ворагаў у яго не было, праўда, некаторых сяброў ён не пазнаваў у твар, але хіба гэта нагода ладзіць страляніну? На вуліцах не стралялі ўжо гадоў дзесяць, хіба што ў інкасата-

раў, ды гэта, па вялікім рахунку, не варта ўвагі: многа сярод вашых знаёмых інкасатараў? Мы толькі гадалі, што адбылося насамрэч.

Прайшло сорак дзён, час рухаўся наперад, рэкі паспелі выйсці з берагоў і вярнуцца назад. Пачыналіся цёплыя дні. Я не хацеў ісці, нават вырашыў перазваніць, папрасіць прабачэння, адмовіцца. Потым падумаў: якая розніца? Усё роўна буду цэлы вечар пра гэта думаць, лепш ужо ў кампаніі сяброў, блізкіх ды сваякоў. Губляць галаву разумней у праверaных месцах. Я выйшаў з дому, абышоў сваю школу, спыніўся ля шапікаў, доўга выбіраў цыгарэты, так і не выбраў, падумаў, можа, усё-ткі вярнуцца, і рушыў далей. Збег стромкім спускам уздоўж карпусоў інстытута, прытармазіў ужо на Маратавай вуліцы. Стаяла ціша. Пад будынкам, у паабедзенным цені, праграваліся сонныя целы сабак. Адчуўшы маё з'яўленне, галоўны падняў галаву, слізгануў па мне цёмным уважлівым поглядам, апусціў галаву на асфальт, стомлена заплюшчыў вочы. Нічога не адбылося. Нічога не змянілася.

Марат жыў усяго за некалькі кварталаў ад мяне, бліжэй да ракі. Тры хвіліны пешшу. Тут увогуле ўсё было пад бокам: радзільня, дзіцячы садок, музычная школа, ваенкамат, крамы, аптэкі, бальніцы, могілкі. Можна было пражыць жыццё, не выходзячы да бліжэйшай станцыі метро. Мы так і рабілі. Жылі ў старых кварталах, якія завіслі над ракою, выраслі ў перабудаваных і перадзеленых памяшканнях, выбягалі зранку з сырых пад'ездаў, вярталіся ўвечары пад ненадзейныя дзіравыя дахі, якія варта было б залатаць да канца. Зверху нам адкрываўся цэлы горад, на падворках мы адчувалі, што пад намі ляжаць камяні, на якіх усё і будавалася.

Улетку яны награваліся — і нам рабілася цёпла, зімой яны прамярзалі — і ў нас пачыналася прастуда.

Двор іхні выходзіў на тубдыспансер, побач цягнулася дарога, збягаючы да старых складскіх памяшканняў. З аднаго боку, унізе, за дахамі, — набярэжная і мост, чорныя заводскія карпусы, новабудоўлі, непразрыстыя харкаўскі прыватны сектар. З іншага, уверсе, — цэнтральныя вуліцы, цэрквы і гандаль. Я прайшоў праз браму, адчуваючы ўсё, з чым жыў столькі гадоў: пыл, гліна і пясок, скрозь якія нават трава не магла прабіцца. Падворак быў выбрукаваны бітаю цэглай ды каменнем — Марат у апошнія гады пагражаў заліць усё асфальтам, аднак нешта яму замінала, так што ўсё заставалася як раней: два старадаўнія, яшчэ дарэвалюцыйнай забудовы двухпавярховыя будынкі, напаўпарожнія і даўно не рамантаваныя, пасярод двара — клумбы ды кветнікі, за імі яблыні і чорная цагляная сцяна будынка, што выходзіла ўжо на суседні двор. Сям'я вынесла сталы, павыцягвала з кватэры крэслы, суседзі прыходзілі са сваімі зэдлікамі, на ўсялякі выпадак, каб не застацца без месца. Над сталамі свяціліся яблыні, белыя кветкі падалі ў салаты, дадаючы ім смаку ды горычы.

Я прывітаўся. У адказ мне заківалі, адна з суседак дастала з-пад сябе лішні зэдлік, я ўціснуўся паміж двух цёплых травеньскіх жаночых цел. Хтосьці пачаў адразу ж шчодра накладваць нешта ў талеркі, хтось наліваў, я агледзеўся, узіраючыся і апазнаючы. Усе нашы былі тут: насупраць мяне сядзеў Беня, сівы і коратка стрыжаны, ён падбадзёрліва кіўнуў мне і вярнуўся да агульнай размовы. Гаварылі, наколькі я мог зразумець, пра надвор'е. Нейтральная тэма, чаму б не. Прынамсі, га-

ласіць ніхто не будзе. Косцік сядзеў з іншага краю, здалёк махнуў мне рукой, не адрываючыся ад ежы. Яблыневыя пялёсткі падалі на яго белую кашулю, растаючы ў ёй, як снег у зімовай рацэ. Збоку да яго прытулілася сухенькая суседка, якая жыла якраз над Маратам і якую цяпер Косцік проста выціскаў з крэсла сваімі крутымі бакамі. Сэм стаяў воддаль, пад дрэвамі. Разам з Рустамам — Маратавым братам. Той нервова хадзіў па бітай цэгле ў гумовых тэпціках і новым трэніровачным касцюме і гаварыў з кімсьці па тэлефоне, раз-пораз штосьці перапытваючы ў Сэма. Сэм таксама быў у трэніровачным касцюме, пад яблынямі яны былі падобныя да двух марафонцаў, што збіліся з маршруту і цяпер вызвоньвалі арганізатараў спаборніцтваў, каб распытаць, куды бегчы далей. Суседкі падтрымлівалі размову, і выглядала ўсё так, быццам неўзабаве павінны ўключыць музыку і пачаць дыскатэку. Час ад часу ўсе клікалі Рустама да стала, але той строга махаў рукою, маўляў, ад'ябіцеся, праваслаўныя, і далей нешта палка і незадаволена прамаўляў, а Сэм ківаў галавою, ва ўсім яго, відаць, падтрымліваючы.

Я разглядаў нашых. За сорак дзён, што мінулі, з імі мала што адбылося. Зрэшты, з імі мала што адбылося за апошнія дзесяць гадоў. Хіба што зморшчыны кожны раз вастрэй праразалі Беневу фізіяномію, робячы яго ўсё больш подобным да Міка Джагера. Чорны швэдар, дарагія чаравікі — Беня з апошніх сіл намагаўся выглядаць прыстойна, хоць я ведаў лепш за іншых, што фірму ў яго адціснулі і жыве ён за кошт банкаўскіх укладанняў, якія здолеў захаваць. Зразумела было, што надоўга іх не хопіць, ад чаго Беня, здаецца, яшчэ больш сівеў. Сумныя часы для сумленнага бізнесу, што тут скажаш.

Затое Косцік усё таўсцеў, хоць на характары яго гэта мала адбівалася: характар у яго быў паскудней няма куды, пра якія змены магла ісці гаворка? Косцік быў чыгуначнікам, то-бок сядзеў ва ўпраўленні Паўднёвай чыгункі і за нешта адказваў. За што менавіта — падазраю, ён і сам не ведаў. Набіраў вагу, губляў пачуццё гумару. Трымаўся толькі нас — сяброў дзяцінства. Найбольш змяніўся, мабыць, Сэм. Я маю на ўвазе яго новы трэніровачны касцюм. Ну і ўсё. Ва ўсім іншым — тая ж баявая стойка старога дасведчанага бамбілы, ключы ад тачкі, якія ён ніколі не выпускаў з рук, недаверлівае стаўленне да пасажыраў, прынцыповая нянавісць да патрулёў. Што тычыцца мяне, то я адчуваў, што недзе там, унутры майго цела, паміж сэрцам і селязёнкаю, зараджаецца і ўздымаецца цёплым згусткам стома, захопліваючы ўсё больш месца і прымушаючы сумна прыслухоўвацца: што ж там робіцца ў маёй душы, пад маім адзеннем, пад маёю скураю. І ніякія працоўныя будні, ніводнае кар'ернае прасоўванне нічога не значылі супраць гэтага згустка, які проста раз'ядаў знутры ўсе ўнутраныя органы, бы запушчаная кімсьці пад скуру пірання. У свой час я вырашыў не адыходзіць далёка ад наседжаных месцаў і ўладкаваўся на завод зусім побач, у двух кварталах адсюль. За пятнаццаць гадоў нават даслужыўся да ўласнага кабінета. Зрэшты, завод гадоў дзесяць як не працаваў, і рабіць кар'еру на ім было тое ж самае, што рабіць кар'еру на караблі, які ідзе на дно: можна, вядома, але магчымасці ад пачатку троху абмежаваныя. Мы здавалі пад офісы былыя лабараторыі, здавалі пад склады былыя цэхі, я атрымліваў нармальна, хадзіў у гарнітуры, які на мне не сядзеў. Як і ў маіх сяброў, у мяне з'явіліся праблемы

са сном і прабілася першая сівізна. На праблемы я не скардзіўся, стрыгчыся пачаў коратка. Вахцёркам на прахадной гэта нават падабалася — яны пачалі мяне паважаць. Або шкадаваць. Для ўсіх нас, Маратавых сяброў, пачынаўся той узрост, калі жыццё запавольваецца, даючы табе значна больш часу на страх і няўпэўненасць. Марат дацягнуў да трыццаці пяці, мы замест гэтага мелі ўсе шанцы пражыць доўга і памерці ўласнай смерцю. Скажам, ад маразму.

Дзядзька Алік і Рая Давыдаўна — бацькі Марата — сядзелі па розныя бакі стала, нібы не ведалі адно аднаго. Дзядзька Алік маўчаў, а Рая Давыдаўна гаварыла пераважна пра салаты, і ўсе думалі, што лепш бы яна таксама маўчала. Я сядзеў і дадаваў нешта ад сябе, успамінаў толькі добрае, рабіў журботны твар, звяртаючыся да мамы нябожчыка, адчуваў, як ад ракі падымаецца вільгаць, адчувальная нават тут, на старых падворках, засаджаных дрэвамі і забудаваных брамамі, вежамі ды камуналкамі. Дзядзь Саша, родны брат Маратавага таты, разам з Сэмам працягнуў ад гаражоў правады з дзвюма магутнымі лямпамі, развесіў іх на яблычным голлі, і жоўтая электрычнасць, змяшаўшыся з белым колерам, накрыла нас ценямі. У прыцемках усе зазбіраліся, пачалі развітвацца, дамаўляліся аб наступнай сустрэчы, абяцалі падтрымліваць і не забываць, прапаноўвалі сваю дапамогу, прасілі звяртацца ў выпадку чаго, уздыхалі, цалаваліся з усімі і выходзілі праз браму, вяртаючыся да жыцця.

Першымі пайшлі суседкі. Дзве поўныя, паміж якіх прымасціўся я, і трэцяя, сухенькая, прыціснутая Косцем. Пайшлі, несучы ў руках зэдлікі, нібы атрыманыя

на Новы год падарункі. За імі пайшоў сляпы Зураб, які займаўся рамонтам абутку і якога сюды ніхто не запрашаў. Хоць менавіта яму, напэўна, спяшацца не было куды: ён жыў проста на працоўным месцы, у завалена-най падэшвамі і халявамі металічнай будцы на Рэвалюцыі, дзе зусім не было святла, хоць ён яго не надта і патрабаваў — усё роўна ён нічога не бачыў, а з абуткам выраблял страшныя рэчы. Дык вось, зазбіраўся і пайшоў. Пайшла Марына, невядома чыя далёкая сваячка з глыбокім голасам і нейкай падвялай фрызурай. Яна гандлявала гароднінай у шапіку наверсе, бліжэй да падатковай, са сваякамі была ў добрых адносінах і бадай адзіная плакала па Мараце шчыра і не стрымліваючыся. З ёй пайшоў Марык, яе сын, у белым камбінезоне, перапэцканым жоўтай фарбай, пайшоў, паколькі мусіў на ноч вяртацца ў майстэрню на Дарвіна, дзе рэстаўраваў мэблю і да раніцы меўся перафарбаваць «пад Польшчу» фанерную этажэрку, прынесеную ўчора двума армянамі. Пайшоў Жора — аптэкар-практыкант, пагроза кругласутачных крамаў, які, скончыўшы начную змену, кожны раз адпраўляўся ў рэйд па піўных шапіках Пушкінскай, выводзячы прадаўцоў з каламутнага ранішняга сну і патрабуючы ад іх увагі ды разумення. Пайшоў, пажадаўшы ўсім добрай ночы, якая яго, па-за ўсякім сумневам, чакала. За ім пайшла Тамара, наша класная кіраўніца, — знясіленая, аднак непераможная, узяўшы з сабою загорнуты ў бульварную прэсу кавалак пірага. Яна б і не йшла, аднак усе ўжо стаміліся падтрымліваць з ёй размову, таму проста слухалі яе трызненне, пагаджаючыся і не перапыняючы. Страціўшы цікавасць да такой размовы, яна ўсім суха падзякавала і знікла ў браме, як прывід.

За ёй рушылі Паша Чынгачгук са сваёй Маргарытаю. Марат называў іх кумамі, хоць дзяцей у іх, наколькі ведаю, не было. У Марата іх тым больш не было. Паша накульгваў, меў траўму пасля заняткаў мотаспортам. У сэнсе разбіўся калісь на скрадзеным скутары. Часам мне здавалася, што Маргарыта таксама накульгвае, магчыма, таму, што яна заўсёды трымае Пашу пад руку і спрабуе падстроіцца пад яго разбоўтаную хаду. Так яны і пайшлі, як два вясёлыя матросы, спісаныя з сухагруза праз няўстойлівасць. Пасля іх цяжка падняліся і рушылі ў цемру два сяброўкі, якія раслі разам з намі, хоць і былі маладзейшымі за нас, — Кошкін і Саша Цой. Кошкін плакаў і наліваў сам сабе, паколькі на днях адлятаў у Філадэльфію наведаць татавых сваякоў, якія затрымаліся там яшчэ ў дзевяностыя, не адгукаючыся і не адказваючы на лісты, таму тата, які рэгулярна хадзіў у сінагогу, вырашыў, што так не варта, што трэба адправіць іхнімі слядамі адзінага сына і высветліць, што яны там, у Філадэльфіі, сабе думаюць. Кошкін нават купіў каўбойскі капялюш з гуцульскім арнаментам, каб не моцна адрозніваццца ад мясцовых, як ён іх уяўляў. Для яго гэта была ўвогуле ледзьве не першая ў жыцці выправа з бацькоўскага дому, калі не лічыць піянерскіх лагераў, але іх сапраўды можна было не лічыць, паколькі тата Кошкін сам працаваў у гэтых лагерах, таму падчас чарговай змены Кошкін-малодшы пачуваўся як рэцыдывіст, які вяртаўся ў зону, дзе яго чакаў даўно знаёмы сяброўскі калектыў назіральнікаў. А Саша парываўся ісці ўжо даўно, паколькі меў нейкае пасяджэнне паэтычнага гуртка ў нейкай літаратурнай кавярні, але прызнавацца не хацеў, толькі сядзеў і нерваваўся. Быў ён сынам карэйскага студэнта, якога

занесла сюды ў пачатку васьмідзясятых, аднак з бацькам ён не надта ладзіў, жыў асобна, пісаў духоўныя вершы. Меў складаны характар, часта заводзіўся з незнаёмымі паэтамі на студыі, рэгулярна адграбаў, але не здаваўся. За сябрамі Кошкіным ды Цоем пайшла Алка-Акула, якую мы доўга не адпускалі, якая і сама не хацела ісці, але мусіла, паколькі праца, графік, пацыенты. Яна болей за іншых усімі намі цешылася, успамінала тое, што магла ўспомніць, прыдумляла там, дзе ўжо ніхто нічога не памятаў, дзялілася жыццёвымі планамі, запэўніла, што завязала з былым бесклапотным жыццём, што працуе цяпер у сферы медыцыны, што Марына дапамагла ёй уладкавацца ў тубдыспансер сястрой, таму ў яе цяпер новае цікавае жыццё, адзінае што — пацыенты часта мруць, а так усё ў парадку. Электрычнае святло рабіла пяшчотнымі і дрыготкімі зморшчыны пад яе вачыма, афарбаваныя ў жоўты валасы займаліся іскрамі, і калі яна схілялася над сталом, каб прашаптаць камусьці з нас цёплыя словы ўдзячнасці, яе валасы траплялі ў шклянкі з віном, становячыся ружовымі і вільготнымі. Яна доўга не знаходзіла сабе месца, не давала нікому слова і паводзіла сябе як на ўласным дні нараджэння, патрабуючы добрых слоў, радасці і напояў. Але ўрэшце пайшла і яна. Чым бліжэй яна падыходзіла да брамы, чым глыбей уступала ў цемру, тым больш пахмурным станавілася паветра над яе галавою, быццам там, дзе заканчвалася святло, куды не дабівалі жоўтыя лямпы, ёй даводзілася дыхаць попелам і глінай і размаўляць з памерлымі, якія хаваліся ў гэтай гліне. Я глядзеў ёй услед і ўспомніў раптам, што яна насамрэч была першай жанчынаю Марата, неяк так сталася. І Беневаю, між іншым, таксама. Ну, і Кос-

цікавай, ясная рэч. Ды й Сэмавай, калі ўжо быць шчырым. А калі ўжо быць зусім шчырым — маёю таксама.

Бадай што апошнімі пайшлі яшчэ дзве сяброўкі Рустама. Пайшлі, трымаючыся за рукі, — старэйшая, Кіра, крыўдавала на малодшую, Олю, за тое, што тая зноў зашмат піла, а Оля пяшчотна пахлопвала Кіру па спіне, ад чаго па скуры Кіры беглі мурашкі, лапаткі ажно пазвоньвалі ад холаду, а на вачах выступалі слёзы. У нас ва ўсіх выступалі слёзы і смех ламаўся на зубах, і мы раптам заўважылі, што ўсе разышліся, засталіся толькі мы і сям'я, як у старыя добрыя часы, калі мы збіраліся ў Марата на чый-небудзь дзень нараджэння ці іншае сямейнае свята, і я падумаў, што ўсе разам мы сыходзіліся пераважна менавіта на святы, магчыма, якраз таму і цяпер было дзіўнае ды незразумелае адчуванне свята, адчуванне салюту, што вось-вось пачнецца за суседнімі стрэхамі, якія станавіліся бэзавымі і залатымі ад вечаровага травеньскага сонца, якое яшчэ свяцілася ўгары, хоць тут, над намі, паветра зусім згасла і пахаладнела. Мы таксама пачалі збірацца, аднак нас спыніў дзядзь Саша. Ён спецыяльна прыпёрся на саракавіны аднекуль з прыгарадаў, начаваць збіраўся ў сваякоў, спаць яму не хацелася, адпускаць нас — тым больш. Так не варта, — сказаў ён сур'ёзна, — так ніхто не робіць. Мы не можам, — сказаў ён, — проста разысціся. Трэба сядзець і згадваць нябожчыка, а то не будзе яму спакою. Гэтыя словы неяк адразу вярнулі нас у сябе, і мы наперабой загаварылі, маўляў, дзядзь Саш, ну што за пытанні, ясная рэч, мы нікуды не пойдзем, куды нам ісці, хто нас чакае? Маратавы бацькі толькі цяжка ўздыхнулі, але не пярэчылі. Сказалі толькі, што самі ўжо пойдуць, паколькі ў дзядзькі Аліка зранку

нылі ныркі, а Рая Давыдаўна мелася паглядзець навіны, так, нібы чагосьці чакала, таму яны пакінулі нас адных, папрасіўшы Аліну, Маратаву жонку, прынесці нам што-небудзь з кухні. Аліна моўчкі прынялася за справу. Толькі цяпер, калі ўсе разышліся, калі стала ціха і пуста, мы ўспомнілі пра яе, заўважылі яе прысутнасць. Толькі цяпер мы ўбачылі яе, хоць яна ўвесь час была побач — нешта прыносіла з дому, нешта адносіла назад, выслухоўвала плачы суседак, запісвала рэцэпты печанага карпа, выклікала таксі для Сашы з Маргарытаю, цалавалася з усімі на развітанне. Разам з тым была нібы сама па сабе, нібы стаяла збоку, па той бок размовы, з таго боку цемры. Я толькі цяпер заўважыў, што ў яе іншая прычоска, яна мела цяпер кароткія валасы, якія па звычцы спрабавала прыбраць з вачэй, адзета была ў кароткую чорную сукенку, чорныя калготы і дамашнія тапачкі. Яны ўсе тут хадзілі, як пляжнікі на моры, у хатнім. Сукенка рабіла яе стройнай, тэпцікі рабілі яе крокі нячутнымі. Пярсцёнак яна так і не зняла, іншых упрыгожанняў ніколі і не насіла. Валасы ў яе былі таксама чорныя, скура цёмнаю, і здавалася, што яна вось-вось распусціцца ў ночы. Мне стала няёмка за нас: мы да яе добра ставіліся, нягледзячы на ўсе іх гісторыі з Маратам, ніхто з нас ніколі яе не крыўдзіў, і яна, трэба сказаць, таксама ставілася да нас з цярпеннем і вытрымкай, якіх мы не заўсёды заслугоўвалі. У свой час Марат, знаёмячы нас з ёю, папярэдзіў яе, што мы яго сябры і што адносіцца да нас трэба добра. Яна запомніла. Яна наогул памятала ўсё, што казаў ёй Марат. А вось мы, значыць, пра яе забыліся. Я заўважыў, што рэшта нашых таксама нарэшце звярнула на Аліну ўвагу, магчыма, нават залішнюю: Беня пабег з ёй на

кухню, несучы ў руках нейкія талеркі і губляючы іх у дарозе, Косцік кінуўся прыбіраць са стала парожні посуд, бязлітасна зграбаючы яго на зямлю, нават Сэм пацягнуў Рустама пад святло, пакуль той дакрыкваў у слухаўку нешта пагрозлівае, нешта пра іпатэку. І калі ўсе сабраліся, дзядзь Саша паспрабаваў узяць сітуацыю пад кантроль.

Ён сказаў нам дзіўную рэч. Сказаў, што Марат сёння апошні вечар з намі, таму мы абавязаны гаварыць пра яго розныя добрыя рэчы. Інакш ён так проста не пойдзе. Мы былі і не супраць. І нават кінуліся наперабой згадваць нейкія гісторыі, аднак нічога разумнага ўспомніць не маглі, толькі перабівалі адзін аднаго, перакрыкваючы і сварачыся. Тады дзядзь Саша папрасіў нас усіх замаўчаць. Запанавала цішыня, і я раптам убачыў, як з брамы на падворак запаўзае халодны ліпкі туман. Ён падымаўся знізу, ад чорнага рэчышча, якое яшчэ не паспела па-летняму перасохнуць. Мне раптам зрабілася жудасна, і жуда гэтая перадалася іншым. Усе пачалі разумець, пра што нас тут папярэджвае дзядзь Саша, згарбаціўшыся за сталом і падсвечваючы сабе мабільнікам, каб наліць: ён папярэджвае, што Марат дзесьці побач, стаіць у нас за спінамі і не пойдзе адсюль, пакуль не пачуе неабходныя яму словы. Не надта прыемнае адчуванне — прыслухоўвацца, ці не дыхае ў цябе за спінай памерлы прыяцель, які нешта не дагаварыў пры жыцці і пра якога ты ведаеш столькі гісторый, што яму прасцей цябе прыдушыць, чым спадзявацца, што ты будзеш трымаць іх пры сабе. І тут нехта асцярожна і коратка дакрануўся да майго пляча. Я здрыгануўся і рэзка павярнуўся назад — за спінаю стаяла Аліна, паблажліва ўсміхаючыся і працягваючы мне сурвэткі.

Я таксама заўсміхаўся, схапіў гэтыя чортавы сурвэткі, яны тут жа пасыпаліся ў мяне з рук, я вылаяўся і нахіліўся, каб сабраць іх, падымаючыся, стукнуўся галавою аб стол, выводзячы ўсіх з трансу. І ўсе зноў наперабой загаварылі, а найгрмчэй загаварыў Беня, то і слухаць пачалі яго. Аліна так і замерла за мной, стаяла і слухала. Беню гэта прыкметна напружвала, зразумела было, як старанна і асцярожна ён падбірае словы, каб не пакрыўдзіць удаву. Гаварыў, зазіраючы нам у вочы, быццам просячы аб падтрымцы і разуменні, нібы растлумачваючы: ну, вы ж усё разумееце, падтрымайце мяне, пацвердзіце мае словы, нагадайце, як там усё было насамрэч. Мы нагадвалі і пацвярджалі. Аліна пастаяла некаторы час, нахілілася да стала, сабрала пустыя келіхі са слядамі памады і хацела была пайсці ў дом, аднак нешта яе затрымала, нешта прымусіла далей слухаць гэты аповед, які ўвесь час абрываўся і пачынаўся з іншага месца. Туман падступаў усё бліжэй, ціха і няўмольна набліжаючыся да яе цёплага цёмнага цела.

— Скажу так, — неяк здалёку пачаў Беня. Ён стаяў пад лямпаю і трымаў у руках чарку, быццам прамаўляючы тост. Прычым прамаўляў яго, звяртаючыся перш за ўсё да дзядзь Сашы, які ў прыцемках стаў зусім цёмны, вастраносы і непраглядны. — Што мне больш за ўсё падабалася ў Мараце, — працягваў Беня, — гэта яго мужчынскія якасці.

Ён агледзеў нас, чакаючы падтрымкі, аднак мы не зусім разумелі, што менавіта ён мае на ўвазе, і Беня зноў звярнуўся да дзядзь Сашы.

— Я хачу сказаць, — патлумачыў ён, — што Марат заўжды быў такім, якім мае быць сапраўдны мужчына — дарослым і адказным.

Усе пагадзіліся, а Беня працягнуў:

— Мы ж разам хадзілі ў школу, праўда? Мы аднаго ўзросту. Калі Марат запісваўся на бокс, я хадзіў запісвацца з ім.

— Я таксама, — дадаў Косця.

— І я, — дадалі ў адзін голас мы з Сэмам.

— Так, — працягнуў Беня, — але нас не ўзялі. Я ведаю, — зноў звярнуўся ён да дзядзь Сашы, — у вас там, на Каўказе, кожны другі баксёр. Або самбіст.

— Або альпініст, — дадаў крыху не ў тэму Косцік.

— Але Марат быў сапраўдным байцом, — не даў перабіць сябе Беня. — Ён нават рэжыму не парушаў. Нават калі пачаў сустракацца з Алінаю, — звярнуўся Беня ўжо да Аліны, — не прапускаў трэніроўкі.

— Так-так! — падхапілі мы ў адзін голас.

Аліна напружылася, пустыя келіхі адгукнуліся ў яе руках. Усе заціхлі.

— І тут, — сказаў Беня, перавёўшы дыханне, — я магу расказаць вам такую гісторыю. Магчыма, вы яе не ведаеце.

І пачаў расказваць. З яго слоў выходзіла так, што першыя пальчаткі Марату падарыў тата. Яшчэ калі Марат не стаяў як след на нагах. То-бок спачатку Марат навучыўся шанаваць бацькоў, потым баксаваць, а толькі потым — хадзіць. Баксаваў ён натхнёна і настойліва, усюды і ўвесь час. Удары яго, па словах Бені, неслі сапернiку паразу і забыццё, а яго спорттаварыству — славу і перамогу. Трэнеры адразу гэта заўважылі, яго і ўзялі з ходу, не спытаўшы, колькі яму гадоў, дзе ён вучыцца і хто ён паводле веравызнання. А дарэмна, адзначыў Беня. Паколькі справа веры была для Марата справай гонару. Ён заўсёды меў пры сабе святыя мошчы, прыве-

зеныя яму Бенем з Сіная, а што ніхто з нас ніколі ў вочы іх не бачыў, то толькі з той прычыны, што мошчы выносіць на рынг строга забаронена алімпійскім камітэтам. Акрамя таго, Марат рабіў усе намазы, шанаваў вечар пятніцы, не еў мяса і аддаваў на царкву дзесяціну. На якую менавіта царкву, Беня ўдакладняць не стаў, абмежаваўшыся сухімі лічбамі. Трэнеры несумненна разумелі, каго менавіта выхоўваюць у сябе на базе, з кім ім пашчасціла перасекчыся ў іхнім нікчэмным жыцці. Дык і ўхапіліся за Марата, як за апошні шанц. Што цалкам зразумела: каму ж не хочацца выхаваць алімпійскага чэмпіёна? Усім хочацца. З яго і выхоўвалі чэмпіёна — так і не інакш! Ён гэта адчуваў, таму калі яго ў чарговы раз спрабавалі перацягнуць на гістарычную бацькаўшчыну, на Каўказ, удакладніў Беня, ён заўсёды казаў, што тут яго выхавалі, тут ён і рэалізуецца як прафесіянал. Амбіцыі заўсёды напаўняюць нас сілай і выносівасцю. Клапотная штодзённая праца, знясільваючыя трэніроўкі, прыцэльны шлях да мэты — усё гэта не магло не даць выніку. З простага чачэнскага хлопчыка Марат ператвараўся ў спартыўную надзею Харкаўшчыны. Не было такога саперніка, крыху патэтычна заявіў Беня, вядома, у ягонай вагавой катэгорыі, выправіўся ён, які выстаяў бы супраць нашага Марата хаця б пяць раўндаў! Я хачу нагадаць, пачаў успамінаць Беня, як ён рыхтаваўся да бою. Устрыманне і пост, малітвы і медытацыі, пакора і ўпэўненасць! — Беня канчаткова збіўся з тэмы. — Скура яго з узростам станавілася моцнай, а косці — цвёрдымі і халоднымі. І калі ён біўся за званне чэмпіёна вобласці, бацькі горада заміралі на трыбунах, сочачы за яго грацыёзнымі рухамі і пераможным крыкам!

— Так усё і было, — сказаў дзядзь Саша, і сіняя сляза скацілася ў ягоны каньяк.

— Аніводнага бою! — далей прамаўляў Беня. — Аніводнага бою без перамогі! Ніякіх збораў без перамогі і поспеху! Кроў ворагаў запякалася на яго валасах, іхняе галашэнне суправаджала яго поступ! Да яго абутку спрабавалі дакрануцца найпрыгажэйшыя жанчыны! — тут Беня ўспомніў пра Аліну і запнуўся. — Ну, маецца на ўвазе, ад федэрацыі, — растлумачыў ён, — прафсаюзная работа, працоўныя рэзервы.

Але ўсім неяк раптам стала няўтульна, таму Беня не прыдумаў нічога лепшага, як гаварыць далей:

— А вось гісторыя, якую я вам хачу расказаць, адбылася менавіта на зборах. У Ялце. Я чаму так падрабязна распавядаю, — растлумачыў Беня, — сам там быў. Ніхто не мог сапернічаць з Маратам у спрыце і выносліваści. Ніхто не мог выстаяць супраць яго, не страціўшы здароўя. Ніхто не сумняваўся ў ягонай вялікай будучыні. Акрамя Чорнага. Як яго звалі, я цяпер і не ўспомню. Хаця, — задуменна замоўк Беня, — чаму ж не ўспомню, Чорным яго ўсе і звалі. Быў ён не мясцовы, бацькі яго прыехалі аднекуль з Усходу ці з Захаду — не памятаю. Чорнага як байца ніхто сёння і не ўспомніць. Яго і тады мала хто заўважаў, усе казалі толькі пра Марата. І вось Чорны на зборах сарваўся. Жылі яны на базе, у горад іх не выпускалі, рэжым, распарадак, ранішняя гімнастыка. І вось трэнерскі штаб выклікалі на нейкую нараду. Прычым увесь. Тут якраз Чорнага і панесла. Спачатку ён піў сам. Потым спаіў масажыстаў. Потым узяўся за юніёраў. Адзіны, хто з ім не піў, — Марат! Два дні ламаў яго Чорны, два дні спакушаў. Што толькі ні прапаноўваў. І масажыстаў пад-

сылаў да яго, і юніёраў падгаворваў. Але так і застаўся ні з чым. І таму я прапаную выпіць, — паспрабаваў неяк завяршыць усю гэтую гісторыю Беня, — за нашага прыяцеля, за Марата, за яго мужчынскія якасці, — я заўважыў, што Аліна не даслухала і рушыла да дома, і туман халадзіў яе лыткі, пакуль яна праходзіла падворкам, — за яго вытрымку, — не мог спыніцца Беня, — за яго адданасць спорту і сапраўднаму мужчынскаму сяброўству!

Ніхто не быў супраць выпіць, ніхто не меў нічога супраць сапраўднага мужчынскага сяброўства. Дзядзь Саша, худы, з паголенай галавою, з акуратнай палоскаю вусоў, у сваім чорным пінжаку быў падобны да камінара, які ўпаў з даху проста да святочнага стала і радаваўся, бо ўсё магло скласціся куды горш. Чым цямнейшым рабілася неба, тым больш трывожна гарэлі лямпы над намі. Цемра стаяла вакол іх, нібы вада вакол нерухомых самоў, не адважваючыся ўскалыхнуць іхні спакой.

Мы ўсе ведалі гэтую гісторыю. Пакуль побач была Аліна, ніхто не перабіваў і не пярэчыў, а тут, як толькі яна адышла, я ўспомніў, як усё было насамрэч. І іншыя згадалі, зрабілася заўважнай агульная збянтэжанасць. Нават Рустам адвёў вочы, дастаў мабільнік і пачаў гнеўна набіваць камусь паведамленне. Чорнага звалі Валера. Іх з Маратам выганялі з секцыі разам. Тройчы. Але кожны раз бралі назад. Не тое каб Марат сапраўды быў такі непераможны — ён нават на вобласці ніколі не браў першае месца, проста ў Чорнага тата быў у органах і заўсёды дамаўляўся за малых. У Крым яны звалілі таксама разам. Проста са збораў, якія пра-

ходзілі тут, на месцы. Марат ужо сустракаўся з Алінай, яны нават казалі ўсім пра вяселле, але тут яго перамкнула, быў сакавік, на плошчах і ў скверах ляжаў чорны снег, неба ўспыхвала і гарэла, Марат не мог знайсці сабе месца, таму і прыдумаў гэтую гісторыю са зборамі ў Ялце. З сабой яны ўзялі дзвюх сябровак-гімнастак. Тыя, здаецца, яшчэ і пашпартоў не мелі, Марат з Чорным, якім было па сямнаццаць, выдаваліся ім дарослымі і адказнымі — адным словам, сапраўдныя мужчыны з мужчынскімі якасцямі. Пасяліліся яны ў знаёмых Чорнага, у цеснай кватэры ў панэльніку, з вокнаў нават мора не было відаць. Ды й не было ў іх асаблівай цікавасці да мора, якое штарміла і залівала набярэжную лёдам ды мерзлым багавіннем. Недзе на пяты дзень адпачынку, калі грошы, шампанскае і хлеб заканчваліся, Чорны са сваёй гімнасткай пачалі цягнуць Марата дадому. Але з тым нешта здарылася, нейкая перамена, ён нам расказваў потым. Казаў, што сам не разумее, як так адбылося і калі гэта пачалося, але яго напарніца, яшчэ зусім юная, ціхая і тонкая, у якой не было нічога, акрамя спартыўных перспектыў, згубіла ад яго галаву, і ён таксама згубіў сваю, прычым задоўга да гэтага, таму ніхто з іх асабліва ні пра што не думаў. Яны зачыніліся ў адным з пакояў і днямі не вылазілі з ложка, цалуючыся і знясільваючы адно аднаго. Марат распавядаў, што яна зусім нічога не ўмела і ён тлумачыў ёй усё ад пачатку, паказваў, што і як трэба рабіць, каб усё доўжылася і надалей. Памяшканне зусім не абагравалася, яны хаваліся пад тоўстымі коўдрамі, таму ён яе амаль і не бачыў распранутай, вывучаючы яе хутчэй навобмацак. Потым доўга ўспамінаў, якія ў яе пяшчотныя далоні, якія тонкія вены, якая перасуша-

ная скура. Яна лёгка ў яго ўсяму вучылася, забыўшыся, як ёй было нязручна і балюча ў першы дзень, плакала ўначы, смяялася раніцай і хапала яго за шыю, калі ён спрабаваў выбрацца з-пад коўдраў і схадзіць на кухню за чарговай бутэлькай шампанскага. Ён вяртаўся, лез разам з шампанскім пад коўдры, і ўсё пачыналася спачатку. Ад алкаголю яна рабілася нястомнай і няўважлівай, кусала яго цела, але потым доўга залізвала раны, пяшчотна шаптала яму нешта, пакуль ён думаў, як бы выбрацца і адліць, потым засынала і гаварыла ўва сне з мамай, пасля чаго ён будзіў яе і вяртаў у прытомнасць, і так усе гэтыя дні.

Першым запанікаваў Чорны. Ён разумеў, што дзяўчынкі не маюць пашпартоў. Добра, бог з імі — з пашпартамі, але ён разумеў, што дзяўчынкі таксама паведамілі дома, нібыта едуць на зборы. Выходзіла так, што трэба было неяк выбірацца дахаты, таму што зборы зборамі, але калі гісторыя выплыве, не дапаможа нават тата-праваахоўнік. Сяброўка Чорнага таксама панікавала, плакала і прасіла ўзяць ёй квіток да Харкава. Чорны паспрабаваў пагаварыць з Маратам. Яны сядзелі на кухні, дабівалі рэшткі цыгарэт, і з Маратавых ран выступала кроў, перамешаная з салодкай слінаю. Марат казаў, што нікуды не паедзе, што не хоча нічога чуць, што баіцца вяртацца дадому, што яна ўсім усё раскажа, што яму няма чаго сказаць Аліне, якая ні пра што не здагадваецца, а здагадаецца — проста памрэ ад гора, таму лепш за ўсё — заставацца тут, наколькі хопіць сіл і цыгарэт. Чорны цярпліва пераконваў яго, што гэта не выйсце, што рана ці позна іх пачнуць шукаць і рана ці позна знойдуць, і тады ад гора памруць яны — Чорны з Ма-

ратам, а можа, нават і не ад гора, а ад збіцця камянямі і грамадскай абструкцыі. Не-не, — не згаджаўся Марат, — ты не разумееш: калі нешта не складваецца, калі цябе заганяюць у тупік, лепей проста не рухацца, лепей стаяць і чакаць, пакуль усё міне. І ён вяртаўся ў ложак, і саграваў яе халодныя лапаткі, грэў яе далоні і жывот, спрабуючы ні пра што не думаць, не думаць наогул. Чорны ўгаворваў яго некалькі дзён. Хадзіў на паштамт, тэлефанаваў Аліне, перадаваў прывітанні ад Марата, казаў, што ён у зале, займаецца. Аліна ўсё разумела, але выгляду не падавала, толькі наказвала не надта парушаць спартыўны рэжым. Неяк ранкам сяброўка Чорнага сабрала рэчы, непрыкметна выслізнула з кватэры, дабралася да трасы, злавіла машыну, даехала да Сімферопаля і наступнай раніцай была дома. З'яўленне міліцыі стала пытаннем часу. Чорны выбіў дзверы, дастаў з ложка Маратаву сяброўку, моўчкі дапамог ёй апрануцца, блытаючыся ў калготках і шкарпэтках, і пацягнуў яе на вакзал. Марат застаўся. Праз пару дзён прыйшлі гаспадары кватэры, так ці інакш давялося вяртацца дадому. Аліна яго кінула. Потым вярнулася. Сяброўка-гімнастка труцілася нейкімі таблеткамі. Але неяк няўдала. Ну, гэта значыць выжыла.

Пакуль мы ўсё гэта згадвалі, над падворкам завіс тонкі, меднага адцення месяц. Туман хаваў яго, аднак ён усё роўна праступаў скрозь вільготнае паветра, ціха рухаючыся над бляшанымі дахамі і чорнымі горламі комінаў. З дому выйшла Аліна, цалкам патануўшы ў змроку, — цемра шчыльна ахутвала яе чорную сукенку, толькі локці і запясці час ад часу вырыналі з паветра, нібы з чорнага малака. Усе раптам пасур'ёзнелі, Бе-

ня зноў кінуўся ёй дапамагаць, узяў з рук хлеб і віно, дзядзь Саша пачаў запрашаць яе да стала, Аліна ўрэшце пагадзілася. Рабілася ўсё больш прахалодна, так, нібы недзе побач прайшоў дождж, пакінуўшы пасля сабе роўнае прамерзлае дыханне. Аліна збольшага маўчала, толькі часам перапытвала ў кагосьці з гасцей, што каму падаць, потым адкідалася на цвёрдую спінку крэсла і задуменна разглядала сіняе віно ў зялёных бутэльках.

Тады загаварыў Косця. Цяжкі і непаваротлівы, нібы ўвесь размоклы ад туману ды віна, ён развязаў гальштук, кінуўшы яго на нейкую запечаную рыбу, і прамаўляў ужо не надта выразна, аднак пераканаўча і гучна. Калі чалавек так кажа, яму няма чым запярэчыць, нават калі кажа ён глупства. Косцік гэта разумеў, таму стараўся гаварыць яшчэ гучней. Часам здавалася, што ён кагосьці вінаваціць, часам — што бароніць, часам ён проста зрываўся на крык, і тады Сэм паклаў яму на плячо сваю сухую руку, а дзядзь Саша перасцерагальна ківаў Сэму, маўляў, не чапай, хай гаворыць, усё роўна раніцай не ўспомніць нічога з таго, што нагаварыў.

— Так-так, — хваляваўся Косцік, — я таксама хачу сказаць. Што вы не даяце мне сказаць?! Не глядзіце так на мяне, — заводзіўся ён, перакульваючы шклянкі з віном. Белае палатно набрыняла цёмным цяжарам алкаголю, але Косцік не звяртаў увагі і прасіў яго не перабіваць. — Я хачу сказаць пра добрае сэрца. Калі ў чалавека добрае сэрца, многія рэчы ён успрымае зусім інакш, чым мы з вамі. Вочы такога чалавека ззяюць унутраным святлом, і людзі цягнуцца да яго. І мужчыны, і жанчыны, — удакладніў Косця.

— Ну, пачалося, — незадаволена адрэагаваў Беня, — казаў: не налівайце яму. Зараз ён нагаворыць.

Усе разумелі, пра што ідзе гаворка. Усе ведалі, чаго чакаць. Спачатку ён будзе стагнаць пра ўнутраны свет, потым зацягне пра выратаванне душы, магчыма, будзе плакаць, хутчэй за ўсё, палезе ў бойку. З Косцікам гэта пачалося пасля рэабілітацыі. Наркотыкі нікога не робяць спакайнейшымі. Хутчэй наадварот. Косцік падсеў ужо ў сталым узросце, маючы што губляць. А калі страціў, здолеў спыніцца. Доўга цягаўся па рэабілітацыйных цэнтрах, школах прасвятлення ды курсах духоўнага развіцця. Пасля вярнуўся да жыцця, але пачаў набіраць вагу. Відавочна, праблемы з цукрам, так я сабе думаў. І з ныркамі. І з галавою. З іншага боку, пры чым тут наркотыкі — у дзяцінстве ён паводзіў сябе за сталом гэтаксама жахліва.

Нам не вельмі падабалася тое, што ён казаў, але ўсіх падкупляла яго эмацыйнасць. Ну так, унутрана пагаджаліся мы, усё правільна: адкрытае сэрца, цягнуцца мужчыны. І жанчыны. Аліна, здаецца, зусім змерзла, знайшла на крэслах забытую кімсьці хустку, захуталася ў яе, час ад часу крыху ўздрыгваючы, нібы рэагуючы на чыйсьці шэпт, які чула толькі яна.

— Добрае сэрца дапамагае нам у цяжкія хвіліны і цешыць у гадзіны радасці, — далей гаварыў Косцік, глыбока ўдыхаючы начное паветра, ад чаго белая кашуля яго надзімалася, як ветразь у чорным моры. — Добрае сэрца, сябры, — пачаў ён плакаць, — добрае сэрца!

А далей гаварыў пра нешта зусім далёкае, што, зрэшты, вылілася ў даволі-такі прыемную і ўсім зразумелую гісторыю. Гаварыў пра сэрцы, напоўненыя дабром

і надзеяй, сэрцы міласэрныя ды не абдзеленыя шчодрасцю, праз якія ў свет прыходзіць сумленне і якія ніколі не паддаюцца спакусам і самалюбству. Пасля доўгага і крыху блытанага ўступу нагадаў усім, які цёплы і пагодны быў верасень некалькі гадоў таму, калі адбыўся той дзівосны выпадак.

— От вы кажаце, — усхліпваў Косцік, — пра мужчынскія якасці. А ці не найбольшай дабрачыннасцю сапраўднага мужчыны ёсць усё ж такі суперажыванне і гатоўнасць надаць першую медыцынскую дапамогу. Возьмем Марата. На той час ён — вядомы атлет, аўтарытэтны сярод моладзі баксёр, чулы сын, верны мужчына, чалавек жалезнай волі і строгіх перакананняў, аскетычны, нястрымны і выносліві — знаходзіўся ў тым узросце, калі нічога не здаецца немагчымым, калі здараюцца цуды і нябёсы адкрываюцца над намі, каб святыя маглі лепей разглядзець колер нашых шчаслівых вачэй. Ён і на Каўказ праз гэта не паехаў, хоць яго звалі туды ў зборную. Ну, самі падумайце, як можна кінуць усе свае абавязкі? Пачуццё абавязку — вось што трымала яго тут!

Аднойчы, вяртаючыся са спарынгаў, ён натрапіў пасярод восеньскага парку на невядомага, што ляжаў наўпрост на зямлі галавою на ўсход. Побач таўклася выпадковая міначка, якая затым і распавяла гэтую гісторыю шырокай грамадскасці. Што робіць большасць з нас, сутыкнуўшыся з чужой смерцю? Звычайна мы намагаемся не рэагаваць, каб не прыцягнуць яе ўвагі. Мы проста робім выгляд, што смерці не існуе, не заўважаючы памерлых і не думаючы пра жывых. Затое Марат спыніўся, нейкі ўнутраны голас, як потым расказвала з яго слоў міначка, прымусіў яго

схіліцца над мёртвым целам. Нешта падказала яму, што страчана яшчэ далёка не ўсё, што можна паспрабаваць адагнаць цёмны цень, які падступаў ужо з-за барвовых дрэў. Невядомы быў інтэлігентнага выгляду, у троху старамодным паліто, поруч ляжаў партфель. Марат хутка сарыентаваўся ў сітуацыі, прымусіў міначку выклікаць міліцыю ды хуткую, і пакуль тая набірала халоднымі пальцамі патрэбныя нумары, зрабіў невядомаму масаж сэрца, вярнуўшы небараку фактычна з таго свету. Пасля чаго дачакаўся медыкаў ды міліцыю і нават праехаў у аддзяленне, каб усё патлумачыць. Разам з выпадковай міначкаю.

Тут Аліна зусім расплакалася і сарвалася ісці ў дом, аднак дзядзь Саша паспеў перахапіць яе і моцна абняў за плечы. Яна прытулілася да яго, задыхаючыся плачам, а мы сядзелі і маўчалі, адчуваючы, як незваротна мінае той момант, калі трэба было нешта сказаць, падхапіць размову, не даць запанаваць цішыні, якая станавілася ўсё больш нясцерпнаю, пагражаючы разарваць паветра, як папяровы пакет. Усё амаль так і было — і спарынгі, і восеньскі парк. Чорныя дрэвы, бэзавыя нябёсы з чырвонымі водбліскамі на захадзе. Марат усё збіраўся сысці з клуба, сварыўся з кіраўніцтвам, тыднямі дзесьці прападаў, з Алінай у іх усё было так кепска, што ён сам дзівіўся, як яны дагэтуль не разышліся. У той дзень мы ад абеду заселі ў парку, у разбітым бары, фактычна ў нейкім намёце з півам, дзе, акрамя нас, нікога не было, сядзелі, нікуды не спяшаючыся, — я, Марат, яшчэ хтосьці з ягоных аднаклубнікаў, — чакалі ночы і слухалі Маратавы байкі пра тое, што вясной ён усё кіне і зваліць на Каўказ, куды яго даўно клічуць трэнерам. Недзе пад вечар да ба-

ра прыбілася пара — ён здаваўся значна старэйшым, быў падобны да выкладчыка ўніверсітэта, ні на кога не звяртаў увагі, глядзеў толькі перад сабою. Быў у восеньскім паліто, насіў акуляры, амаль не піў. Яна была юнай, хоць не падобнай да студэнткі — паводзіла сябе ўпэўнена, сама замаўляла, нешта прапаноўвала яму. Марат змоўк і пачаў да яе прыглядацца, штосьці ў ёй зачапіла яго, штосьці ў ім азвалася. У яе былі шорсткія светлыя валасы, і доўгія пальцы з вострымі пазногцямі, і яшчэ яркія белыя зубы, а паколькі яна ўвесь час смяялася і гаварыла, то Марат адно і глядзеў на яе ўсмешку, нават не асабліва хаваючыся. А праз гадзіну, калі выкладчык кінуў-такі на нас двухсэнсоўны погляд, Марат увогуле зладзіў сварку і намерыўся біцца. Бармены ўсіх расцягнулі і параілі разыходзіцца, выкладчык спрабаваў паводзіць сябе спакойна, аднак неяк занадта хутка падаў сваёй сяброўцы плашч, неяк зашмат пакінуў чаявых, неяк дэманстратыўна працягнуў ёй руку, каб вывесці на вуліцу. І менавіта тады Марат вырваўся з нашых абдымкаў і перахапіў яе, схапіўшы за локаць, пацягнуў да сябе — рэзка і не стрымліваючыся, ажно яна ўскрыкнула. І незразумела было, чаго было больш у яе крыку — абурэння альбо здзіўлення. Мне падалося, што здзіўлення. Прычым прыемнага. Хоць яна і паспрабавала вырвацца і гнеўна нешта крычала, бліскаючы зубамі і круцячы галавою, аднак падалася наперад, наляцела на Марата і далей здзіўлена разглядала ўшчыльную яго востры няголены твар са шнарамі і парэзамі, шэрыя запаленыя вочы, чорныя валасы і цвёрдую скуру. І чым даўжэй глядзела, тым больш уважлівым станавіўся яе погляд. А калі выкладчык кінуўся вырываць яе назад, Марат

сябе ўжо і зусім не стрымліваў і заваліў з правай, як яго вучылі ў дзіцяча-юнацкай школе, то-бок старанна і ад душы. Выкладчык пакаціўся па падлозе, а на Марата ззаду наскочылі бармены, і ўжо ўсе трое паляцелі на зямлю. Мы з Маратавым прыяцелем узяліся выкідаць усіх на вуліцу, у сіне-чырвоную паркавую цемру, якая трывожна паглынала агні барнай шыльды. І там, сярод залатога лісця, Марат тоўк выкладчыка, бармены спрабавалі адцягнуць яго ад ахвяры, а мы, у сваю чаргу, намагаліся адцягнуць іх.

Міліцыя забрала ўсіх, акрамя барменаў. Выкладчык ныў і прасіў зрабіць яму масаж сэрца. Яго сяброўка прыкладвала Марату хустачку да разбітага брыва. У аддзяленні выкладчык з сяброўкай сядзелі ў адным куце, мы — у іншым. Ніхто нічога не казаў, толькі яна глядзела на Марата прыдзірлівым і нервовым позіркам, нібы вывучаючы. Ці, прынамсі, запамінаючы. Потым іх адпусцілі, а мы засталіся. Марат прасіў мяне скарыстацца правам аднаго званка, патэлефанаваць Аліне і патлумачыць, што яго выклікалі на сустрэчу з прэзідэнтам федэрацыі.

— Якім прэзідэнтам? — гаварыў я яму. — Другая ночы. Давай я пазваню, скажу, што мы ў міліцыі, няхай нешта робіць!

— У міліцыі? — сумняваўся Марат. — Занадта праўдападобна, яна не паверыць.

І навошта расказваць тое, што ўсім і так вядома, думаў я. Навошта залагоджваць памерлых гісторыямі, у якіх так шмат крыві і болю. Але ўсім, здаецца, падабалася згадваць Марата менавіта такім — у чырвоных баксёрскіх майтках, з архангельскімі крыламі

за плячыма, з Гасподнім бласлаўленнем у добрым сэрцы. Я наважыўся ісці, павярнуўся да дзядзь Сашы, каб усё растлумачыць, выбачыцца і распусціцца ў тумане, аднак Аліна нахілілася да мяне і стомлена дакранулася да рукі.

— Вань, — сказала, — дапаможаш?

— Так-так, — адказаў я, — што за пытанне.

Трэба было проста не прыходзіць, — падумаў.

Аліна пачала выбіраць з травы пустыя бутэлькі, перадавала мне, сама ўзяла са стала талеркі і відэльцы, пайшла ў дом. Я пайшоў за ёй, адчуваючы погляды і галасы за спінаю, ішоў, ступаючы па бітай цэгле і гледзячы, як яна лёгка рухаецца, як паглыбляецца ў ноч, як нечакана аконнае святло падае на яе скуру і цёмныя валасы. Адчыніла дзверы, прайшла ўнутр. Я ступіў следам. Тут яна азірнулася, ціха папрасіла пакінуць бутэлькі ў калідоры, пасля чаго перадала мне відэльцы. Я не ўтрымаў, відэльцы пасыпаліся на падлогу, востра і холадна, быццам кавалкі лёду. Дзесьці глыбока ў доме рыпнулі дзвярыма. Аліна прыклала палец да вуснаў, папрасіла паводзіцца цішэй, сказала, што ўсе ўжо спяць. Гаварыла шэптам, ад чаго голас яе гучаў па-асабліваму даверліва. Прыадчыніла дзверы ў гасцёўню, асцярожна рушыла наперад. Святло было выключана, я яе не так бачыў, як адчуваў, лавіў яе дыханне, троху вастраваты пах яе валасоў, што пахлі грэцкімі арэхамі, троху рэзкаватае парыпванне старой падлогі пад яе нагамі. Што будзе, думаў я, калі тут, у цемры, не заўважыўшы, я выпадкова наткнуся на яе, калі дакрануся да яе ў цемры, калі параню яе вострымі нажамі і відэльцамі, якія трымаю ў руках? Яна прайшла праз гасцёўню, павярнула ў доўгі калідор, ішла на-

вобмацак, кранаючыся пальцамі прадметаў. Я добра ведаў іхняе памяшканне з дзяцінства. Дзіўна спланаванае і некалькі разоў перароблены, захламленае старой мэбляй і высокімі шафамі, яно нагадвала мне пра Марата, пра трохі лепшыя абставіны, пра вясёлыя часы. Мне заўсёды падабалася, як тут пахла: зручным цёплым адзеннем, дрэвам і гарбатай. Ніводнай кнігі на паліцах, ніякіх карцін на сценах. Цесныя пакоі, вузкія калідоры, нерухомыя цені, нябачныя жыхары. Мы рухаліся ў цемры, асцярожна абыходзячы крэслы і торбы, цяжкія вазоны з кветкамі і раскіданыя па падлозе чаравікі. Я раптам усвядоміў, што не памятаю гэтага калідора, раней яго тут не было, я гэта дакладна ведаў, паколькі сотні разоў бываў тут у розным узросце, у розным стане, але вось менавіта гэтага калідора, які выцягваўся і ўсё больш звужаўся, калідора, перапоўненага пылам і цемрай, не памятаў. Магчыма, падумаў я, яны тут у чарговы раз нешта перабудоўвалі, ну так, вядома, Марат планаваў прабіць сцяну, каб сумясціць бацькоўскую спальню з маленькім пакоем, у якім ніхто не жыў, але не памятаю, каб ён перад смерцю нешта казаў пра рамонтныя работы. Зрэшты, мы з ім апошнім часам амаль не размаўлялі. Не хапала часу, не хапала жадання, не хапала цярпення вытрымліваць увесь той чад, у якім ён жыў. Можа, і сапраўды ён паспеў выбудаваць у бацькоўскім памяшканні гэты калідор і выйшаў па ім са свайго жыцця, прарубіўшы сабе прыватны канал сувязі з ноччу, знайшоў тое месца, дзе абшыўка свету была тонкай і ненадзейнай, і скарыстаўся зручнай нагодай выправіць нарэшце ўсё на сваю карысць. Я спыніўся і прыслухаўся. У суцэльнай цемры, што абступала і ціснула, не было чуваць нічога, нават ды-

ханне Аліны абарвалася, нібы яна затрымала паветра і распусцілася ў чорнай гарбаце начнога пакоя, гуляючы са мной у хованкі. Я прыгадаў, як Марат любіў распавядаць пра свайго старога, пра тое, як стары вучыў яго плаваць. Браў за шыю і апускаў пад ваду, прымушаў выбірацца, задыхаючыся і адплёўваючыся. Марат гаварыў пра гэта з гонарам: вось, маўляў, бачыце — не задыхнуўся, не здох, выплыў, выжыў і далей буду жыць, і ніякая смерць мяне цяпер не возьме. Але казаў пра гэта так злосна, што мне самому кожны раз перахоплівала дыханне і бракавала кісларoду, і я прагна хапаў яго ротам, каб пераканацца, што не задыхнуўся. І варта было трапіць у гэтую пастку, каб абудзіць найстрашнейшыя аповеды з дзяцінства. Я адчуў страх. Як адсюль выбрацца, падумаў я, куды вядзе гэты чортаў калідор? Кінуўся шукаць сцяну, натрапіў рукою на нешта цвёрдае, на нейкія металічныя выступы і штыры, узяўся біць рукою па чорнай пустэчы, другой рукою спрабуючы ўтрымаць відэльцы і нажы. Намацаў рваныя шпалеры, з-пад якіх выступала прахалодная цэгла, намацаў вешалку для адзення, намацаў шторы і капелюшы, хусткі і цэлафан. Раптам пальцы спыніліся на чымсьці пругкім і цёплым. Я спрабаваў зразумець, што гэта. Пер'е, гэта было пер'е, пяшчотнае і бязважкае на дотык. Нешта, падобнае да толькі што забітай птушкі, нешта, напоўненае крывёю і памяццю. Я дакранаўся асцярожна і ўважліва, спрабуючы адгадаць, што ж гэта ўсё ж такі ёсць. Раптам цемра пад маімі пальцамі здрыганулася, лёгка азвалася, быццам нехта ўздыхнуў. Я адчуў, як нешта варухнулася. Жах праняў мяне. Жах і роспач. Я кінуўся ў цемру, выкінуўшы перад сабою растапыраную далонь. Завaліў вешалку, зачапіў

крэсла, перавярнуў нейкія рондалі. Рука стукнулася аб цвёрдую паверхню, цемра расчынілася, у вочы ўдарыла рэзкае святло. Я вываліўся на старую кухню, на якой быў тысячы разоў, дзе ведаў кожны куток і кожны заканурак, дзе ўсё было знаёмым і не выклікала ніякіх страхаў ці недаверу. Пасярод кухні стаяла Аліна, памешваючы нешта лыжкай у вялікім казане. Яна здзіўлена пазірала на мяне. Відавочна, выгляд у мяне быў неспакойны.

— Ты дзе быў? — запытала яна.

— Заблукаў, — адказаў я.

— Усё ў парадку? — засумнявалася.

— Так, — схлусіў я.

Хутчэй за ўсё, яна не паверыла. Але прамаўчала.

— Вось, — сказала, памаўчаўшы, — аднясі на стол.

Я ўзяў з яе рук глыбокую талерку з гароднінай, пайшоў назад.

Яны якраз супакойвалі Косціка і згадвалі, на чым спыніліся, дзе была перапынена размова, з якога моманту ўсё пайшло не так. Косцік горка плакаў, паклаўшы галаву на рукі, а рукі, у сваю чаргу, паклаўшы на запечаную рыбу. Можна было падумаць, што ён аплаквае яе, гэтую рыбу. Дзядзь Саша перасеў да яго і, супакойваючы, паляпаў па карку. Ціха, хлопча, — казаў ён, — не варта так забівацца з-за мёртвых. Косцік пакрыўджана шморгаў носам, выціраючы слёзы і смаркачы рукавамі кашулі. Дзядзь Саша навісаў над ім сваім вострым профілем, бы крумкач, Беня нервова курыў, страсаючы попел у марынаваныя грыбы, а Рустам з Сэмам сядзелі наводдаль, працягваючы аб нечым спрачацца. Я падсеў да іх, паставіў гародніну на стол.

Тады Сэм распавёў найцікавейшую гісторыю. Была яна настолькі дзіўнай і заблытанай, што нават Рустам, малодшы брат, на вачах якога ўсё гэта адбывалася, пляскаў час ад часу рукамі, шырока расплюшчваў вочы і адмоўна матаў галавою, не пагаджаючыся і выпраўляючы апавядальніка. Было што выпраўляць! Ніхто з нас не ведае, казаў Сэм, прыпальваючы так, што рубцы на зламаным некалькі разоў носе ружова ўспыхвалі ў газавым святле, як блізка знаходзіцца яго смерць. Ніхто з нас уявіць не можа, як далёка на яе тэрыторыю мы заходзім. Гаварыў ён, магчыма, не так разважліва, як я пераказваю, нервова зацягваўся, трохі заікаўся, але аповед яго быў менавіта пра гэта. Смерць, казаў ён, ніколі не ступае нам насустрач, яна мае час і магчымасць вычакаць, яна стаіць пасярод свежай смарагдавай травы, нябачная ды непазбежная, і назірае, як легкадумна ды неразважліва мы забягаем у яе цень. Час ад часу ў нас атрымліваецца з гэтага ценю выскачыць. Хаця ў большасці выпадкаў ад нас тут мала што залежыць. Мы безабаронныя перад ёю, нас паралізуе страх і асуджанасць. І мала хто гэтую асуджанасць здольны ў сабе перамагчы. З Маратам усё склалася асабліва дзіўна. Ён не баяўся смерці і любіў жанчын. Аднойчы яго запрашалі за мяжу, трэнерам, ну, гэта ўсім вядома. Дык ведаеце, што ён сказаў? Ён сказаў: я памру тут, побач са сваёй мамаю. Усім была вядома тая пашана і шляхетнасць, з якімі ён ставіўся да жанчын. Магчыма, гэта перадалося яму ад мамы. Магчыма, прычына тут у спартыўным выхаванні. Так ці інакш, а да жанчын ён ставіўся ледзь не пабожна. Аднаго разу, мінулай вясной, фактычна год таму, Марата ўцягнулі ў бойку. Адбылося гэта так: ён ужо вяртаўся

дадому пасля бою і спускаўся па Рэвалюцыі, калі раптам убачыў, як нейкі мудзіла чапляецца да дзяўчыны. Прычым даволі брутальна. Пасярод вуліцы. Ясная рэч, Марат палез біцца. Здавалася б, што прафесійнаму баксёру было заваліць нейкага левака. Аднак мудзіла аказаўся не столькі натрэніраваным, колькі выносліВым. Меў проста жалезную галаву, аб якую можна было гнуць роварныя рамы. Біліся яны гадзіны дзве. То сыходзіліся, то пераводзілі дыханне. Потым зноў кідаліся адзін на аднаго. Нават дзяўчына не вытрымала, папрасіла прабачэння і пайшла сабе. Ды яе ніхто і не трымаў. Ну, але верх узяло майстэрства — Марат такі заваліў гэтага дзіка. Той ляжаў на цёплым вечаровым асфальце і сцякаў крывёю. Марату б развярнуцца і пайсці дадому, але нешта яго спыніла, нешта прымусіла застацца. Ён нахіліўся, пацягнуў мужыка на сябе, закінуў сабе на плечы і панёс на святло, што гарэла каля метро, думаючы там кінуць пад дзвярыма якой-небудзь аптэкі. Мужык аказаўся цяжкім і нязручным, ногі яго валакліся па зямлі, джынсы спаўзалі, ён цяжка хрыпеў, кроў зацякала Марату за каўнер. Аднак Марат ішоў, паколькі ведаў: нельга пакідаць пасля сябе трупы, барацьба павінна быць сумленнай. А ўжо калі дацягнуў-такі гэтага мудзілу да аптэкі, асцярожна паклаў яго пад дзвярыма і збіраўся націснуць кнопку выкліку дзяжурнага, але вырашыў у канцы выцерці таму кроў з твару. І калі нахіліўся, мужык раптам расплюшчыў вочы і засадзіў Марату ў бок доўгімі бліскучымі нажніцамі, якія трымаў у задняй кішэні джынсаў. Пасля чаго проста ўцёк. Марат паспрабаваў дагнаць яго, але з нажніцамі бегчы было нязручна, таму ён проста павярнуў дадому і паўночы дабіраўся сю-

ды з нажніцамі ў целе, трымаючыся рукою за сцены і дрэвы. А дзяўчына аказалася цырульніцай.

І яны загаварылі ўсе разам, перабіваючы і высмейваючы адзін аднаго. — Ён ужо не біўся, — крычаў Рустам, — ён ужо з малымі працаваў! — Куды там, — матаў галавой Сэм, — я сам хадзіў на ягоныя баі, ясна, гэта быў не той Марат, ну але што. — Ды дзе? — настойваў Рустам. —Якія баі? Ён на канапе валяўся днямі, са двара не выходзіў! — Правільна, — пагаджаўся Сэм, — а калі выходзіў, то біўся. — Ды з кім там ён біўся? — зрываўся на ногі Рустам, аднак Сэм цягнуў яго ўніз за рукаў спартыўнай курткі. — У яго сэрца хворае было! — Так-так, — падтрымліваў яго Косцік, — добрае хворае сэрца.

Я развітаўся, паціснуў рукі Рустаму з Сэмам, пахлопаў па плячы Косціка, запісаў тэлефон дзядзь Сашы, махнуў Беню рукою. Мяне ніхто не спыняў. Усе стаміліся і засыналі за сталом, аднак не разыходзіліся, нібы баяліся застацца сам-насам з усімі гэтымі гісторыямі. Туман падымаўся ўгору, у травеньскія нябёсы, агаляючы рэчы, робячы цемру яшчэ больш пустою. На другім паверсе Маратавага дома жоўтым раз'ядалі ноч тры акны. Усе тры суседкі — дзве поўныя, адна сухенькая — пільна ўзіраліся мне ў спіну, нешта вястуючы і прадбачачы.

Я ведаў гэтую цырульніцу. Марат з ёй пазнаёміўся ў мінулым сакавіку. Выпадкова ўвечары праходзіў міма, адрэагаваў на бліскучае святло вітрыны з прыгожымі, нібы адсечанымі жаночымі галовамі, вырашыў зайсці. Быў канец халоднага працоўнага дня, акрамя яе, у цырульні нікога не было. Яна таксама збіралася ісці — што сядзець у пустой цырульні, калі за чорным

акном пачынаецца салодкае жыццё? І ўжо скінула свой бліскучы фартух з мноствам кішэняў, куды былі напханы нажніцы, грабянцы ды механічныя машынкі для галення. І тут зайшоў Марат. Яна адразу звярнула ўвагу на цёмныя кругі пад яго вачыма, якія нагадвалі пра ўсе бяссонныя ночы ды абпаленыя тытунём лёгкія, звярнула ўвагу на яго шчацінне, што дзіўным чынам рабіла яго маладзейшым і злейшым, чым ён быў насамрэч. Заўважыла яго перабінтаваную руку, разумеючы, што гэты пасажыр у выпадку чаго будзе стаяць да апошняга. Прабегла позіркам па чорнай куртцы з капелюшом, па спартыўнай торбе з найкаўскім лэйблам, па чорных, прапаленых у некалькіх месцах цыгарэтамі джынсах, па лёгкіх красоўках. Падумала, што так у кіно выглядаюць наёмныя забойцы. Потым іх і знаходзяць па адбітках іхніх красовак. Надзела фартух, кіўнула Марату на крэсла. Той моўчкі сеў. Падышла, доўга разглядала яго ў люстэрка, правяла рукою па яго калючых чорных валасах. З Марата пасыпаліся іскры. Яна ўзялася за нажніцы.

Марат распавядаў, што на ёй было зашмат ружовага і крывавага. Ружовыя валасы, крывавая памада, ружовая майка, крывавыя пазногці, ружовыя пухнатыя тапачкі, крывавага колеру бялізна. Калі яна дакранулася да яго, ён адчуў, якія ў яе нецярплівыя рукі, як яна ўмела дакранаецца да мужчын, як адчувае іхнюю гарачнасць, стрымлівае іхняе трымценне. Альбо не стрымлівае, дадаваў Марат. Ён павярнуўся на крэсле і прыцягнуў яе да сябе, але гэты яе ружовы фартух з рознымі цырульніцкімі штукамі — ён перашкаджаў, Марат паспрабаваў яго сцягнуць, аднак той моцна ахопліваў яе цела, баронячы ад чужых дотыкаў. Тады яна

сама развязала канцы і кінула яго на падлогу, і звонкі метал нажніцаў ды грабянёў паляцеў пад крэсла, а яна стаяла перад ім, і ён глядзеў на яе аголены жывот, які ніякім чынам не магла схаваць кароткая майка, і рэзка пасадзіў яе сабе на калені, здымаючы з яе ўсё, баючыся не паспець, не наважваючыся спыніцца. Яна нават дзвярэй не зачыніла, расказваў Марат, хтосьці нават зазіраў з вуліцы, пакуль ён рваў усе яе чырвоныя шлейкі ды ружовыя панчохі, пакуль прыціскаў яе да сябе, адчуваючы, як яе скура то награваецца ад яго дотыкаў, то ахалоджваецца ад сакавіцкага скразняку. А калі яна ўскрыкнула і замерла, ён яшчэ некаторы час паварочваў яе твар да святла, спрабуючы зразумець, што адбылося, чаму яна не рухаецца, але потым і сам знерухомеў, толькі сціскаў яе далей, разглядаў зблізку яе валасы, яе вейкі, здзіўляўся, якое ўсё гэта яскравае і каляровае, уяўляў сабе, як яна старанна кожную раніцу ўсё гэта вымалёўвае, колькі часу праводзіць ля люстэрка, як старанна нацягвае на сябе ўсе гэтыя каляровыя рэчы, як лёгка потым іх скідае. Яшчэ здзівіўся, як хутка і проста яна супакоілася. Пазірала на яго пільна і адчужана, аж яму раптам стала не па сабе, ён моўчкі ўстаў, трымаючы яе ў руках, упэўнена, хоць і не надта асцярожна кінуў яе на скураную канапу і пайшоў дадому. Так нічога ёй і не сказаўшы.

Наступным вечарам Марат зноў прыйшоў. Яна зноў была адна. Моўчкі зачыніў за сабою дзверы, стаяў і чакаў. Яна ўсё зразумела і выключыла святло. Вуліца за акном была напоўнена агнямі ды ценямі, яны змешваліся і расцякаліся, плылі ў вачах і размывалі абрысы дамоў. Яна таропка гаварыла яму нешта дзіўнае і нечаканае, гаварыла, што чакала яго, веда-

ла, што ён прыйдзе, распавядала пра сябе, успамінала гісторыі пра сваіх мужчын, ціха тлумачыла, што ёй падабаецца, а што не, што яна любіць і чаго баіцца, і так да глыбокай ночы, не стамляючыся і ні пра што не пытаючыся, робячы ўсё, што ён хацеў, не пярэчачы і не спыняючы яго, пакуль ён сам не спыніўся і не заснуў.

Марату яна чамусьці падабалася, ён казаў, што адчувае, як паскараецца яе сэрца, калі яна цалуецца, і як потым яно супакойваецца і запавольваецца. Яна, распавядаў, часам паводзіць сябе так, быццам мяне зусім няма. Пры гэтым ляжыць побач са мною. Альбо на мне. Яна проста глядзіць скрозь мяне, бачыць нешта сваё, магчыма, чуе маё дыханне, магчыма, адчувае мой пах, не болей. Яму гэта, падобна, таксама падабалася. Ён нават не хаваў дома, што ідзе ў цырульню. Калі пачаў хадзіць часцей, казаў, што ходзіць туды галіцца, што сапраўдны мужчына заўсёды павінен быць паголены. Праўда, ідучы галіцца ў цырульню, часам галіўся дома. У яго ўсё руйнавалася і развальвалася ў руках, усе стасункі і ўзаемаадносіны: з Алінай, з бацькамі, з братам. Нават з цырульніцай сваёй ён усё часцей сварыўся. Прызнаўся аднойчы, што ўжо баіцца ў яе стрыгчыся. Яна мне галаву калісьці адрэжа, — меркаваў ён. Прыкладна так яно і адбылося. Уся гэтая гісторыя з нажніцамі — ён яе прыдумаў, седзячы ў мяне на кухні і заціскаючы рану рукою. Скардзіўся, што яна зусім з глузду з'ехала, што хоча яго забіць, што патрабуе немагчымага і трахаецца, быццам у апошні раз. Што ён паспрабаваў ёй нешта патлумачыць, спрабаваў пагаварыць з ёй, ты разумееш? — крычаў ён. — Я хацеў проста з ёй пагаварыць! Але ўсё скончылася скандалам, яна не хацела нічога чуць, плакала і віна-

ваціла яго ў бог ведае чым, ён завёўся, накрычаў на яе, разграміў яе працоўнае крэсла, раструшчыў люстэрка, біў адэкалоны і напалам ламаў фены. Вось яна і ўсадзіла яму нажніцы па самае дзяржальна. Але нікому нічога не кажы, — прасіў ён, — ніхто ні пра што не павінен ведаць. Я і не казаў. Ён сам усім расказаў.

Я пытаўся ў яго, чаму ён не паедзе адсюль. Яго ж пастаянна запрашалі нейкія татавы сваякі, дадому, на Каўказ. Ну, як я паеду, — адказваў ён, — як я іх кіну? — казаў ён пра ўсіх сваіх жанчын, пра ўсіх родных, пра сяброў і сапернікаў. — Не магу, ніяк. Але я ведаў, што ён кажа няпраўду. Ведаў, што ўся справа ў Аліне. Што яна наадрэз адмовілася з ім ехаць. Сказала, што памрэ тут — з яго бацькамі, у яго доме, несуцешнаю ўдавою. Але нікуды адсюль не паедзе. Марат мог рабіць усё, што яму прыходзіла ў галаву. Ён жыў, з кім хацеў, спаў, з кім хацеў, біўся, калі хацеў, ён страчваў прыяцеляў і нажываў ворагаў, адмаўляўся ад важных знаёмстваў і грэбаваў сяброўскімі абавязкамі, пад канец перасварыўся з усімі, нават са мной. Я не камунікаваў з ім цэлую зіму. Косціку ён быў павінен шмат грошай. Аддаваць, наколькі я разумеў, не збіраўся. Ды Косцік і не ўзяў бы. Здавалася, ён рыхтаваўся да чагосьці важнага, да нейкага рашэння, да асаблівых падзей. І адмовіцца мог ад чаго заўгодна. Акрамя Аліны. Гэта я ведаў дакладна. Колькі б у яго ні было жанчын, як бы глыбока ні пракусвала яму скуру гэтая яго ружовая цырульніца, я ведаў, што без Аліны ён не паедзе. І я ведаў чаму. Ніхто не ведаў, акрамя мяне. Чамусьці мне Марат у свой час пра ўсё расказаў. Як яны пазнаёміліся недзе на вуліцы, як ён спыніў яе, як не хацеў адпускаць, ужо дакладна ведаючы, што паспрабуе жыць з ёй разам.

Як яна доўга яго пазбягала, як увесь час нешта ўтойвала. Як ён упершыню трапіў да яе дадому і чым усё гэта скончылася. Як яна пагадзілася ўрэшце жыць з ім. Але перад тым распавяла пра сваю маму, каб усё было па шчырасці. Распавяла, што мама яе час ад часу мусіць класціся ў бальніцу, вось такая бяда, нічога страшнага, хоць і прыемнага таксама нічога — проста яна часам нікога не пазнае. Гэта ж не страшна, праўда? — пыталася Аліна. — Я таксама не заўсёды ўсіх пазнаю. Адным словам, паколькі гэта яе мама, яна мусіць заўсёды быць дзесьці побач, непадалёк. Марат лёгка з ёй пагадзіўся. І ведаў лепш за іншых, што яна нікуды з ім не паедзе. А значыць, і ён нікуды не паедзе. Таму што адна справа — спаць у чужой хаце з чужой жанчынай, і зусім іншая — кінуць таго, каго кідаць нельга. Ніяк нельга. Ні пры якіх абставінах. Прынамсі, так я ўсё гэта зразумеў.

Што з ёй будзе далей, думаў я, як яна дасць сабе рады? Што наогул рабіць далей? Я прамінуў падворак інстытута, падняўся ўгору, спыніўся каля нашай школы. Мой дом стаяў насупраць, зусім побач, стары, чатырохпавярховы, нерамантаваны. Пад'езд не зачыняўся. Часам зранку я прачынаўся ад падлеткавых галасоў на лесвічнай пляцоўцы: школьнікі прыбягалі на перакур. Я жыў на паддашкавым паверсе, нада мною быў толькі дах. Там жылі сотні галубоў, часам я чуў скрозь сон іхняе вуркатанне. Аднойчы, ужо ў старэйшых класах, Марат пацягнуў мяне на іх паляваць. Не ведаю, нашто яму было гэта патрэбна. Не памятаю, чаму я на гэта пагадзіўся. Там сотні галубоў, — узбуджана гаварыў ён, — уначы яны сонныя, іх можна проста набіраць

у мех. Мы сустрэліся вечарам ля майго дома. У яго з сабой была трэніровачная сумка. Мы падняліся наверх. Марат залез першы. Я за ім. На гарышчы было душна і ціха. Цішыню парушала хіба што нябачнае і жудаснае шамаценне птушыных крылаў. Я дастаў ліхтарык, але Марат своечасова мяне спыніў: ты што, сказаў, напалохаеш. Ён пайшоў наперад. Галубы сядзелі на перакладзіне, сонныя і безабаронныя. Марат лёгка хапаў іх і кідаў у сумку. Яны даваліся яму ў рукі з нейкай непрыемнай асуджанасцю, не паспеўшы нічога зразумець, не паспеўшы як след разглядзець сваю смерць у твар. Неўзабаве сумка была поўная. Яна ўся шамацела знутры, быццам там хтосьці з кімсьці спрачаўся. Марат падышоў да акна, вылез вонкі. Паклікаў мяне. Я вылез следам. Мы асцярожна прыладзіліся каля акна, разглядаючы дамы ўнізе. Наўпрост пад намі свяціліся цёмным срэбрам кварталы, у якіх мы выраслі, цяжкія нагрувашчанні дамоў, разгалінаваныя кроны. Свяціліся пустыя падворкі, у якіх стаяла цемра, нібы вада ў патанулых танкерах. Свяціліся вокны і балконы, антэны і лесвіцы. Свяціліся аркі і пад'езды, слупы і афішныя тумбы. Свяціліся цэгла і бляха, трава і камяні, гліна і начная зямля. Свяцілася павуцінне, тонкімі пражылкамі напаўняючы паветра. Далей дамы абрываліся ўніз, да ракі, і ўжо там, бліжэй да рэчышча, свяціліся дахі складоў ды аўтамайстэрняў, свяцілася халодная ртуць плыні, прывідная труба старога млына на тым беразе, агні прыватнага сектара, белыя дымы кацельных і фабрык. Далей срэбра залівала сабою зямлю ды нябёсы. І можна было толькі здагадвацца, хто там жыве і што там адбываецца. Марат зачаравана глядзеў перад сабою.

— Вось што, — сказаў ён, — добра было б усё тут купіць.

— Навошта? — не зразумеў я.

— Як навошта? — здзівіўся ён. — Для прэстыжу. Уяўляеш, мець такі дом, — паказаў ён на суседнія вокны. — Я калі вырасту, абавязкова ўсё куплю. Усё і ўсіх. Тут усё будзе маім. Тут і так усё маё, — дадаў, падумаўшы.

— Сапраўды, — пагадзіўся я.

— Ты што, — пакрыўдзіўся Марат, — не верыш, што я змагу? Пабачыш. Я змагу ўсё. Усё што заўгодна. Як ты можаш мне не верыць? Ты ж мой сябар, мой вучань.

— Як гэта?

— Я цябе вучыў боксу!

— Ды ладна, — не пагадзіўся я. — Ты проста двойчы мяне пабіў.

— Усё роўна, — адказаў Марат. — Ты, можна сказаць, мой любімы вучань.

— Паслухай, — сказаў я, — давай іх выпусцім, — паказаў на сумку. — А то брыдка неяк.

Марат замоўк. Відаць, вагаўся. Потым моўчкі раскрыў сумку, вытрас птушак проста на шыфер. Яны пакаціліся, узмахваючы крыламі і ўзлятаючы ў паветра. Марат адкінуў сумку ў бок. Сядзеў і маўчаў. Я не надта разумеў, пра што цяпер гаварыць. Раптам ён павярнуўся. За намі, у трэснутым акне, рэзка адбіваўся тонкі месяцовы серп. Гэта ад яго было столькі святла. Ён сляпіў вочы і пазбаўляў спакою. Марат асцярожна працягнуў руку і адламаў кавалак шкла. Быццам разламаў месяц напалам. Засталася палова. Зрабілася цямней.

РАМЭА

Два гады таму я адчуваў, як сэрца кожную раніцу будзіць мяне ад сну, гаворачы: давай, прачынайся, мы губляем час. Колькі можна спаць, падштурхоўвала яно, падскокваючы на месцы, давай, мы прапусцім усё цікавае. Я прачынаўся і выбягаў на вуліцу, і ніводзін з цудаў не мог бы мяне тады абмінуць. Два гады таму я ірваў паветра лёгкімі і быў упэўнены, што за бліжэйшым рагом мяне чакае нешта неверагоднае — агні, салюты і святочныя аркестры. І хоць там насамрэч мяне не чакала нічога, акрамя веснавых скразнякоў, гэта зусім не бянтэжыла. Дваццаць гадоў — той узрост, калі д'ябал прыходзіць да цябе, каб паскардзіцца на жыццё. Усё завязана на табе, ад цябе патрабуецца толькі меней спаць. І карыстацца прэзерватывамі. Усё астатняе абавязкова з табою здарыцца. І здарыцца менавіта так, як ты гэтага хочаш. Хочаш ты гэтага ці не хочаш.

Я прыехаў сюды ў канцы траўня. Ад вакзала пайшоў пешшу. Рэчаў было мала: скураны заплечнік з парай

футболак і старым ноўтам, тэрмас з каньяком, які не паспеў дапіць у дарозе. Джынсы, кеды, атрутна-зялёная кашуля — я прыехаў надоўга. Штодзённыя прабежкі рабілі мой крок лёгкім і бязважкім, прычоска рабіла мяне падобным да вакаліста «Боні эм» у лепшыя іх часы, сонца шчодра адбівалася ад цёмных, на палову твару, акуляраў. Я быў зоркай, і на мяне нельга было не звярнуць увагу. Прынамсі, так я сабе ўсё гэта бачыў. Горад мне спадабаўся: ціхія прывакзальныя двары, зарослыя травою і засаджаныя абрыкосамі, гаражы, флігелі ды аварыйныя дамы, з якіх выходзілі павольныя, бы хамелеоны, пенсіянеры, — мяне ўсё задавальняла. Пах цукру і шакаладу ў кварталах вакол кандытарскай фабрыкі, суровыя цэхі пустых прадпрыемстваў вакол рынку, вароты, крамачкі і медыцынскія ўстановы — усё было для мяне. Я выйшаў да набярэжнай. Аказваецца, тут былі масты. Гэта добра, падумаў я, горад, які ляжыць на рацэ, больш абаронены і спакойны, жыццё ў такім горадзе трымаецца сваіх межаў і мае свой парадак. Потым я даведаўся, што рака тут не адна. Горад ляжаў паміж імі, на пагорках, нібы на выспе, свецячыся ўсімі сваімі белымі і чырвонымі будынкамі, якія былі аточаныя з усіх бакоў гарачай травеньскай зелянінай. Што ж, сказаў я, ступаючы на мост, можаце мяне сустракаць.

Дом меў чатыры паверхі. Выглядаў запушчана, гэта значыць утульна. Увогуле ціхая вуліца, толькі з процілеглага боку, са школьнага двара, чуўся адчайны школьны лямант. Я пацягнуў дзверы. Ніякага кода — заходзь і забівай іх у іхніх цёплых ложках. Добры настрой, узнёслы стан, пачатак сонечнага бясконцага

дня. Трэці паверх быў мой. Чорныя металічныя дзверы, сіні гумовы дыванок, чырвоны сімпатычны гузік званка. Часам жыццё забывае пра нашу прысутнасць і пачынае нам падабацца.

Я ціснуў і ціснуў, выціскаючы з чырвонай кнопкі рэшткі непрыемнага піску. Ніхто, зразумела, не адчыняў. Я біў у дзверы нагою, напяваў вясёлыя куплеты. Думаў нават зайсці да суседзяў, ціснуў на такую ж чырвоную кнопку, але там таксама ніхто не адчыняў. Што рабіць? — падумаў. Іншых адрасоў я не меў, у гэтым горадзе мяне проста не чакалі. Кінуў заплечнік пад сцяну, сеў на дыванок, адкрыў тэрмас. Калі-небудзь яны вернуцца, падумаў я, і так ці інакш пашкадуюць.

Праз некаторы час заўважыў, што за дзвярыма нехта ходзіць даволі бестурботна і таксама нешта сабе напявае. Суседзі знізу, падумаў я. Аднак не — хадзілі менавіта за дзвярыма, да якіх я прываліўся спінаю. Я сарваўся на ногі і пацягнуўся да званка. Крокі сціхлі, потым ледзь чутна наблізіліся. Хтосьці разглядаў мяне ў вочка. Я ступіў назад, каб можна было разглядзець акуляры. Галоўнае — зрабіць уражанне, падумаў. Дзверы адчыніліся.

У яе была радасная прычоска. Не проста фарбаваныя ў белае валасы, а фарбаваныя рознымі адценнямі белага. Прыемна і радасна. Погляд яна мела дапытлівы, хоць і сонны. Увогуле выглядала дрымотна. Адзета была ў чырвоную піжаму, паверх якой абы-як быў накінуты беласнежны халат з атэльнай эмблемай. Час ад часу ён спаўзаў, тады яна нагадвала баксёра, які рыхтаваўся выходзіць на рынг, скідаючы камандны халат на плечы масажыстаў. У яе былі зялёныя вочы,

бледная ад курэння скура, пяшчотная шыя, яна стаяла басанож, пераступаючы з нагі на нагу.

— Ты хто? — спытала, зазіраючы мне за плечы.

— Рома, — адказаў я, таксама азіраючыся. — Вам мама мая тэлефанавала.

— Мама? — не зразумела яна. — Навошта тэлефанавала?

— Я ў вас жыць буду, — патлумачыў я.

— З мамаю?

— Адзін. Мама дома.

— Дома? — перапытала яна, паправіўшы халат, што ўсё спаўзаў. — І што яна там робіць, дома?

— У яе працэс, — адказаў я.

— Што?

— Працэс. Яна юрыст.

— Усё, — раптам успомніла яна, — успомніла. Ты — Рома, так?

— Рома.

— Мама — юрыст.

— Так.

— А што ў цябе на галаве?

Звалі яе Даша. З мамай маёй яны пазнаёміліся на семінары месяц таму. Удзень сядзелі поруч, запісвалі за дакладчыкамі, заліваліся кавою на брэйках. Увечары, падчас карпаратыўнага боўлінга, набраліся, мама ведала, як гэта робіцца, пад канец вечара яна вісела ў новай сяброўкі на плячы і распавяла, што я вось-вось мушу пакінуць бацькоўскі дом, паколькі перавёўся да іх на навучанне. Год не давучыўся, — плакала мама, — ясна, што яму са мной сядзець, які інтарэс? Вось ён і перавёўся. А дзе ён там жыць будзе? На вакзале? Ма-

ма выцірала слёзы і замаўляла яшчэ, а ад гэтага яшчэ больш плакала. І ўрэшце Даша сказала: ну, што за бяда, хай пажыве ў мяне, у мяне ёсць вольная кватэра, бабуля вельмі дарэчы памерла. Я ўсё адно збіралася яе здаваць, лепш здаваць знаёмым — хоць мэблю не вынесуць. А захочуць вынесці, усё роўна не змогуць — яе там проста няма. Мама ўчапілася за такі варыянт: калі ўжо адпускаць малога, ну, мяне то-бок, у дарослае жыццё, то лепш ведаць, дзе потым шукаць цела. Я на ўсё пагаджаўся. Нават калі б не было гэтай Дашы, я б усё роўна знайшоў, дзе жыць. Галоўнае — выбрацца з пакоя, які смярдзеў дзіцячай вопраткай і школьнымі падручнікамі. Я даўно збіраўся куды-небудзь з'ехаць, у дваццаць гадоў жыць з мамаю — задавальненне сумнеўнае. Яна зашмат, як для юрыста, піла, я зашмат часу праводзіў у ванным пакоі. Найлепшае для ўсіх у такой сітуацыі — раз'ехацца і пісаць адно аднаму лісты.

Здаецца, уражання я на яе не зрабіў. Вядома, мне гэта не падабалася. Я думаў, трэба ёй нешта распавесці пра маму, пра тое, што мяне цікавіць у жыцці, чым я займаюся, на што разлічваю, але яна мяне апярэдзіла.

— Пайшлі, — сказала, — я табе ўсё пакажу.

Яна падышла да суседніх дзвярэй, адкрыла іх, зайшла ўнутр. Мяне не запрашала, я пастаяў на парозе, потым зайшоў. Два пакоі. Падобна, не так даўно рамантавалі. Падобна таксама, што рамонтам займалася яна сама: шпалеры адклейваліся, у душавых стаялі цёплыя лужыны, столь была не тое каб пабеленая, хутчэй памаляваная. Даша прайшла ў пакой, адкрыла акно, нахілілася вонкі. У яе былі прыгожыя лыткі. До-

бра, што я пасяліўся менавіта ў яе, падумаў я. Тут яна павярнулася.

— Ты без спальніка? — запытала. — Добра, дам табе матрац. Значыць, тут кухня, — яна пацягнула мяне ў суседні пакой. Там стаяла пліта. Ну, і ўсё, больш нічога. — У прынцыпе не так важна, — сказала на гэта яна. — Побач піцэрыя, калі што. Душ, — прамовіла, асцярожна пераступаючы цераз лужыны. — Ручнік дам, — дадала. — Што яшчэ? Ага, інтэрнэт, святло, газ. Ты мяне разбудзіў, — сказала, — я нешта ніяк не засяроджуся.

Мы перанеслі з яе кватэры вялікі матрац, заліты акварэльнымі фарбамі і перапэцканы пластылінам ды губной памадай. У Дашы было тонкае цела і прыемны голас. Я падумаў, добра было б спаць з ёй на гэтым матрацы. Зрэшты, чаму б і не, падумаў. Галоўнае, падумаў, зрабіць уражанне. Жыве яна, здаецца, адна. Спіць да абеду. Ходзіць у пад'езд у піжаме. Мне падыходзіць, падумаў я, гледзячы, як яна лёгка схіляецца над матрацам, спрабуючы яго ачысціць. Проста трэба браць усё ў свае рукі, падумаў я і пайшоў у душ.

У абед яна зноўку забегла. Сказала, што едзе па справах, прынесла пасцель, пакінула ключы ад сваёй кватэры, патлумачыла, што, калі згаладаюся, магу пайсці на кухню і выбраць з халадзільніка ўсё, што знайду. А знойдзеш ты там, дадала, хіба што капусту. Свежую, удакладніла. Была яна ў дзелавым касцюме пясочнага колеру. Ён яе троху таўсціў, аднак чаравікі на высокіх абцасах усё ставілі на свае месцы — не зусім малады, але цалкам упэўнены ў сабе юрыст, з баявой прычоскай, з-пад беласнежнай кашулі прасвечвала бялізна. Нафарбавана была прыхапкам, пахла ад яе

каваю, і гаварыла яна так многа і гучна, што я нават не зразумеў, калі яна пайшла.

Ну, добра-добра, злаваўся я, не назаўсёды ж яна пайшла, хутка вернецца. Якія ў яе могуць быць справы? Ну, судовае пасяджэнне, ну, вочная стаўка, распазнанне трупаў. Выхапіць яшчэ аднаго няздару з кіпцюрастых лапаў смерці, распішацца дзе трэба, і дадому, да мяне. Галоўнае — не ўпусціць момант, не прапусціць нагоду, злавіць сваё шчасце, калі яно будзе прабягаць у калідоры. Вечар павольна мяняў паветра, як атэльную бялізну, робячы зеляніну цёмнай, а шыбы ружовымі. Святло мякка краналася падлогі і пустых сцен, за дрэвамі на вуліцы было чуваць галасы і дзіцячы смех. Хацелася ісці на гэтыя галасы, хадзіць паміж дрэвамі, дакранацца ў цемры да жаночых рук, лавіць зялёныя месяцы, што абрываюцца з галін, не вытрымліваючы ўласнай вагі.

Як усё арганізаваць, думаў я, як усё арганізаваць? Можна, скажам, прыйсці да яе на кухню. Нібыта за прадуктамі. Стрымана паскардзіцца на голад, строга папярэдзіць, што прыгатую ўсё сам, але папрасіць яе дапамагчы. Быць упэўненым і нешматслоўным. Можна прыйсці без футболкі, хай бачыць, які я загарэлы. Можна прыйсці басанож. Не, адразу ж перадумаў я, басанож не падыходзіць, яна ўсё зразумее, скажа: ты б яшчэ голы прыйшоў. Добра, тады пляжныя тэпці. Каб у разе чаго не важдацца са шнуркамі. Так, задаволена пахваліў я сябе, менавіта так. Папрасіць яе дастаць прыправы: цынамон, кардамон, чорны перац. Прыправы ў яе, відавочна, на нейкай паліцы. І калі яна за імі палезе, спакойна, галоўнае — спакойна! — пады-

сці і дакрануцца да яе ног. Нібыта падтрымліваючы яе. А далей яна сама ўсё зразумее. Адчуе цяпло маіх далоняў. І тады я зніму яе з крэсла, пасаджу на стол і пачну распранаць. Галоўнае — каб яна не паспела да таго скінуць свой касцюм. Ёй у ім будзе, напэўна, нязручна, яна сама захоча пазбавіцца ад яго, дапаможа сцягнуць пінжак, нервова пацягне ўверх спадніцу, якая так цесна аблягае яе гарачыя сцёгны. І вось тады можна будзе скінуць тэпці.

Альбо, не мог супакоіцца я, можна прыйсці і папрасіць у яе якую-небудзь драбніцу. Скажам, мыла. Не, запярэчыў я сам сабе, тады яна дакладна ўсё зразумее. Лепш не мыла. Лепш зубную шчотку. Прыйсці да яе ў тапачках, з аголеным торсам, можна ў акулярах, і строга і нешматслоўна папрасіць запасную шчотку. Маўляў, сваю забыў у цягніку — хутка збіраўся, дапамагаў жанчынам, выносіў на перон дзяцей, эвакуяваў пенсіянераў. Шчотка ў яе, напэўна, будзе ў ваннай. І калі яна пройдзе туды ў сваім дзелавым гарнітуры, можна праслізнуць за ёю, стаць у яе за спінаю, блізка-блізка, так, каб яна адчула пах майго дэзадаранту і знерухомела ўстрывожана, усё разумеючы і прадчуваючы. І тады можна дакрануцца да яе адзення, адчуваючы, як пад ім уздрыгвае яе чуллівае цела, і моўчкі сцягнуць з яе пінжак, і дапамагчы ёй скінуць спадніцу так, каб яна засталася толькі ў белай, як у школьніцы, кашулі і маляўнічай бялізне, нахіліць яе над рукамыйнікам — бліскучым, як рафінад, каб яна магла разгледзець у люстэрку, як ад радасці і нецярпення разгладжваюцца ўсе яе зморшчыны, як пашыраюцца зрэнкі і бракуе паветра. І нават тэпці можна пры гэтым не скідаць.

Але і гэта яшчэ не ўсё, заводзіўся я, гэта яшчэ далёка не ўсё! Можна прыйсці да яе з ноўтам, маўляў, не магу наладзіць нэт, які пароль, маўляў. Яна ў гэты час можа валяцца на сваім ложку ў дзелавым гарнітуры, змучаная доўгім працоўным днём, вочнымі стаўкамі. Будзе ляжаць на жываце (яна, відавочна, любіць спаць на жываце) і глядзець тэлевізар, пажадана без гуку, каб не адцягваў увагу. Можна стаць паміж ёй ды экранам і стрымана-строга запытаць пароль. А яна можа сказаць: ты ведаеш, я ўжо і сама яго не памятаю, давай сюды ноўт, зараз наладзім. І папляскае далонню побач з сабою, маўляў, скачы давай, зараз усе зробім. І тады трэба спакойна (спакойна!) упасці побач з ёю. Галоўнае — не забыцца скінуць тэпці! А калі яна пачне корпацца ў кампе, можна ўзяцца ёй падказваць і быццам незнарок накрыць яе далонь сваёй, і дакрануцца да яе валасоў, і паглядзець — уважліва і ўпэўнена — у яе шырока расплюшчаныя вочы. І вось калі яна ўсё зразумее і адкладзе набок мой бядацкі ноўт, мне і рабіць нічога не спатрэбіцца — яна сама скокне на мяне і пачне скідаць з сябе пінжак, і рваць маланку на спадніцы, і кусаць маё загартаванае цела (калі я буду без футболкі) ці грызці ад нецярпення футболку (калі я буду ў ёй). І ўсё, што патрэбна будзе ад мяне, — заставацца мужным і нешматслоўным, строгім, але справядлівым, трывалым, моцным і ўдзячным.

З тым я і заснуў. У сне нада мною лёталі ластаўкі. Пагрозліва рабілі нада мною кругі. Але я не баяўся.

Я і прачнуўся цалкам выпадкова, не столькі пачуўшы, як адчуўшы яе крокі. Спачатку ўнізе рыпнулі дзверы, потым яна затупатала па выцертых сходах, б'ючы да-

лонню па парэнчах, заміраючы на паверхах, зазіраючы ўніз, перачэкваючы і рушачы далей. Яна падымалася бясконца доўга, я ажно паспеў разагнаць усіх ластавак, ірвануў да ваннай, намачыў валасы, каб усё было як мае быць, кінуўся на лесвіцу. Сутыкнуўся з ёю тварам да твару. Яе прыкметна хістала. Яна трымала па бутэльцы шампанскага ў кожнай руцэ. Пінжак валачыла за сабой па сходах, нядбайна падчапіўшы яго правым мезенцам. Чаравікі яе былі запэцканы пяском і травою. Усмешка ў яе была п'яная, выглядала яна чароўна.

— О, — здзівілася, — ты без тэпцяў?

— Няважна, — загаварыў я стрымана і строга. — Пачуў, што ты ідзеш.

— Чакаў мяне? — засмяялася яна.

— Ключы хацеў аддаць, — гаварыў я далей, гэтак жа стрымана і строга.

— Вып'еш? — запрапанавала Даша.

— Шампанскае? — я ўклаў у пытанне максімум суровасці. — Хіба за кампанію.

Яна кінула на падлогу пінжак, села на яго, запрасіўшы і мяне. На спадніцу яе нельга было глядзець без болю, так усё было відавочна. Я сеў побач, адчуваючы босымі нагамі холад начной падлогі. Трэба было ўсё ж такі не апранаць футболку, падумаў, няхай бы разглядзела, няхай бы яна ўсё разглядзела. Даша сама ўзялася адкаркоўваць шампанскае, доўга з ім змагалася, боўтала бутэльку, зубамі грызла фольгу. Урэшце бутэлька выбухнула, Даша завішчала, аднак хутка супакоілася, за знаёмства, сказала і прыклалася да віна. Шампанскае заліло яе ўсю з галавою, пацякло з вуснаў кудысьці за каўнер беласнежнай кашулі, Даша рэзка

перадала бутэльку мне, пачала расшпільваць гузікі, выціраць скуру, я зусім разгубіўся, гледзячы, як яна пяшчотна і старанна дакранаецца да свайго цела.

— Давай, — сказала, — пі.

— Як праца? — спытаў я сур'ёзна.

— Праца нармальна, — патлумачыла яна. — Нервовая праца. У кліентаў заўсёды праблемы. Як працаваць з людзьмі, у якіх праблемы? Іх лячыць трэба. А ты чым збіраешся займацца? — спытала.

— Абжывуся пакуль, — адказаў я, вырашыўшы не адкрываць усіх козыраў. — Можна цябе пацалаваць?

— Яшчэ чаго! Завядзі сабе сяброў — з імі і цалуйся. Усё, давай.

Паднялася, падхапіла пінжак, сунула мне неадкаркаваную бутэльку і пайшла спаць.

Што я зрабіў не так? Дзе памылка? Футболка? Тэпці? Акуляры? Усё мусіла скончыцца зусім інакш. Я цяпер павінен ляжаць у яе ложку, яна мусіла ляжаць побач, пяшчотна і стомлена гледзячы ў мае спакойныя вочы. Замест гэтага я стаю сярод кухні з бутляй шампанскага ў руках і не ведаю, куды падзець рукі. А яна ў гэты час, што яна робіць? Ага, вось яна таксама выходзіць на кухню — за сцяною пачуліся крокі, я паставіў шампанскае на падлогу і прыпаў вухам да сцяны. Вось яна падыходзіць да акна, адчыняе, на яе адразу ж кідаецца ўся вечаровая жамяра, усе гэтыя матылі і жукі, і яна хутка прычыняе акно, падыходзіць да шафкі на сцяне, звініць посудам, дастае бляшанку з гарбатаю, цукар, кубак, лыжачкі, сподкі. Меладычна ўсім гэтым пазвоньвае, ставіць усё гэта на стол проста за маёй сцяною, на адлегласці рукі, на адлегласці выдыху. За-

пальвае газ, ставіць чайнік, садзіцца. Устае, падыходзіць да акна, зноў адчыняе, дастае запальнічку. Чорт, яна паліць. Нервова дабівае цыгарэту, выдыхае дым з лёгкіх, прычыняе акно, дастае з кішэні пінжака мабільны, правярае ўваходныя, рэзка хавае тэлефон назад. Закіпае чайнік, яна доўга не звяртае на яго ўвагі, стаіць і напружана пазірае перад сабою, менавіта туды, дзе стаю я. Рэзка паварочваецца, са злосцю перакрывае газ. Сядае за стол, цяжкім рухам зграбае ў кут усе гаршчочкі, лыжкі ды сподкі. Далей я ніяк не магу пачуць. Што яна робіць? Што яна там робіць? Плача! — раптам даходзіць да мяне, яна плача! Яна там сядзіць і плача! Так-так, сядзіць адна ў пустой кватэры і румзае. Заліваецца горкімі слязьмі, няўцешна бядуе, наглытаўшыся на ноч горкага тытуню, і няма нікога, зусім-зусім нікога, хто б пачуў яе плач, хто мог бы яе суцешыць! Нікога, акрамя мяне. Я ажно падскокваю ад такога прасвятлення, збіваю бутэльку, тая глуха завальваецца набок і павольна, як гружаны нафтаю таварняк, коціцца па вымытай халоднай плітцы, скрыгочучы і парушаючы навакольную цішу. Яна па той бок насцярожваецца. Усё разумее і заціхае, прыслухоўваючыся. Бутэлька дакочваецца да сцяны і спыняецца. Я таксама заціхаю. Стаю і слухаю, як яна маўчыць. Маўчыць, ведаючы, што я тут, што я ўсё чую, усё ведаю, пра ўсё здагадваюся.

Яна разбудзіла мяне перад восьмаю, адчыніўшы дзверы сваімі ключамі, і закрычала з парога:

— Так і ведала, што ты спіш!

Прабеглася калідорам, зазірнула ў ванную, кінула прыдзірлівы погляд на кухню і заваліла наўпрост у па-

кой, дзе я спаў. Спаў я без адзежы, і вось тут яна нарэшце разгледзела ўсё.

— Ой, — сказала, сядаючы поруч і кранаючыся майго пляча, — што гэта ў цябе са скураю? — запытала яна, разглядаючы маю татуху. — Гэта пёс?

— Цмок, — адказаў я, — проста недамаляваны.

— Ну, — не пагадзілася Даша, — які ж гэта цмок? Гэта пёс. Глядзі, які ў яго хвост. Такса, — яна яшчэ раз дакранулася да майго цмока. Па скуры ў мяне пацёк агонь. Аднак не паспеў я знайсці адказ, як яна саскочыла з ложка. — Давай, — наказала, — апранайся, штосьці табе пакажу.

Я паспяшыў апрануцца. Чамусьці мне не хапала ўпэўненасці, да таго ж пасля таксы ўвогуле не было жадання ў чымсьці яе пераконваць. Даша адчыніла дзверы на балкон, выйшла, стаяла і махала рукою: давай, гаварыла, дзе ты там. Яна стаяла ў белым атэльным халаце. Валасы былі прыхоплены сетачкаю, у ёй яна, відаць, і спала, ад чаго прычоска яе нагадвала старанна ды ўмела падабраны набор гародніны для супу. Я пахмурна падышоў.

— Так, — прамовіла яна, азірнуўшыся, — зараз я табе ўсё пакажу. Потым адаспішся. Глядзі, — пачала, вызваляючы мне месца. — Бачыш?

Я зірнуў уніз. Было шмат сонечнага святла, што ляпіла вочы і пазбаўляла прадметы выразнасці. Праз імгненне зрок вярнуўся, рэчы акрэсліліся, фарбы набылі паўнаты. Травень заканчваўся зеленню і цяплом, свежае паветра ляжала на дахах і стаяла ў падворках. Па вуліцы беглі шкаляры, сноўдалі незлічоныя мінакі, на вуглу стаяў дворнік, свецячыся здалёк памаранчавым агнём камізэлькі. Так пачынаецца свята, падумаў я.

— Значыць, — пачала Даша, — гэта вось школа, — яна тыцнула пальцам у двор насупраць, — я там не вучылася, я гады тры як пераехала. Але, каб ты ведаў, там адбываюцца страшныя рэчы. Дырэктарка часта спіць у сваім кабінеце. Не адна. Да яе прыязджаюць. Машына з дыпламатычнымі нумарамі. Да раніцы круцяць італьянскую эстраду і паляць, высунуўшыся ў акно. У яе чырвоная начная кашуля, калі гэта табе цікава. Побач — салон прыгажосці, — тыцнула яна зноў. — Яны там усе нарошчваюць адна другой пазногці. Паглядзі як-небудзь, яны выходзяць на вуліцу, каб перакурыць, садзяцца на лаўку, бачыш, там ёсць лаўка ля сцяны, і дастаюць адна другой з кішэняў цыгарэты, паколькі самі сабе дастаць не могуць — пазногці замінаюць. Пасля сядзяць, як совы, учапіўшыся пазногцямі за край лаўкі. За рагом падазроны рэстаран — уладальнік штораніцы ходзіць па вуліцы ў ружовым кімано і гаворыць з кімсьці па жаночым мабільніку. За імі — спартыўны паб, там арабы глядзяць еўрапейскія лігі. За імі в'етнамцы адкрылі рыгалаўку, але самі там не ядуць. Побач з в'етнамцамі, у падваротні, калі надумаеш, зроблены пад саўну бардэль. Побач з бардэлем — пусты дом, летам там жыве бадзяжны люд, таксама цікава. Побач з бамжамі — майстэрні мастакоў, глядзі не пераблытай. Насупраць — тубдыспансер. Так, што далей? — яна паглядзела налева. — Злева. Злева выдавецтва, падазраю, там падпольна захоўваюць няўлічаную дакументацыю, па вечарах заносяць папяровыя пакеты, на досвітку выносяць трупы, загорнутыя ў кітайскія дываны. Далей старая сядзіба, мне здаецца, там дажываюць век палюбоўніцы бацькоў горада. Я іх часам бачу на верандзе, ну, не бацькоў гора-

да, ясная рэч, іхніх палюбоўніц. Яны там п'юць гарбату з ромам. Наймалодшай з іх гадоў семдзесят.

— Праўда? — засумняваўся я.

— Святая праўда, — пацвердзіла Даша. — У яе таксама, дарэчы, чырвоная начная кашуля. Яна якраз у ёй і п'е сваю гарбату. З ромам, — дадала. — Далей новы дом. Яго доўга не маглі засяліць — дорага. Таму там некаторы час жылі будаўнікі: начавалі ў спальніках, смажылі мяса на агні, знаходзілі штосьці смачнае на складах. Як партызаны, чэснае слова. Там далей, калі павярнуць, ёсць некалькі прадуктовых, яны заўсёды зачыненыя. Чым насамрэч гандлююць — не ведае ніхто, але асабіста я бачыла некалькі разоў, як туды заходзяць маладыя жанчыны і не выходзяць адтуль ужо ніколі. Уніз пайшлі прыватныя дамы з кветнікамі, там амаль ніхто не жыве. Але ніхто і не памірае. Шмат дрэў. Зараз усё цвіце. На паддашкавых паверхах уначы гарыць святло, на ніжніх, як правіла, нейкі бізнес — ксеракс, натарыус, выраб помнікаў. Далей запраўка, майстэрні, а там і рака. А вось тут, проста пад намі, — паглядзела яна ўніз, — ваенкамат. Я ведаю пару сакратарак адтуль — цяжкая праца, скажу табе, шкодная. Ты служыў?

— Не, — адказаў я неахвотна.

— Ясна, — зразумела яна. — Ну, і нарэшце — наш дом. Значыць, глядзі, — яна нахілілася цераз парэнчы, я ледзьве паспеў схапіць яе за капялюш халата, — на першым паверсе жывуць армяне, пах адэкалону чуеш? Гэта ад іх. Іх там двое, усім кажуць, што браты. Я не веру. Суседнія вокны, антэна, бачыш? Анфіса, журналістка, вядзе надвор'е. Будзе запрашаць у госці — не хадзі. У яе там мама — адразу жэніць. Хіба што хочаш больш

ведаць пра надвор'е. На другім паверсе стаіць пустая кватэра. Мужчына-паляўнічы зладзіў страляніну. Вендэта! — весела закрычала Даша. — Я якраз з'язджала, калі ён адстрэльваўся ад міліцыі. Былы вайсковец, артылерыст. Апошнія гады рамантаваў вопратку. Але стрэльбу трымаў зараджанай. Кватэру так ніхто і не купіў. Там пахне смерцю. А вось насупраць артылерыйскай кватэры жыве Гуталін — камуніст і гандон.

— Гандон? — перапытаў я.

— Гандон, — пацвердзіла Даша. — Гніда рэдкасная, пастаянна залівае суседзяў. Думаю, ён гэта спецыяльна робіць. Ну, з нашым паверхам зразумела.

— Нічога не зразумела, — не пагадзіўся я. — Адкуль у цябе дзве кватэры?

— Хоць гэта і не твая справа, — адказала Даша, — але я табе раскажу. Тую, у якой я жыву, мне пакінуў былы муж. А ў гэтай жыла ягоная бабуля. Унука яна не любіла, кватэру пакінула мне.

— А дзе ён? — спытаў я з недаверам. — Гэты твой муж?

— Па-мойму, у Эміратах, — адказала Даша. — Ці ў Саудах. Карацей, вывеў кудысь актывы. Тут для яго занадта холадна.

— А бабуля?

— А бабуля памерла. Яна і так доўга трымалася. Яна паштаром была. Працавала да апошняга кліента. Тобок пакуль не звольнілі. Так, а наверсе, — сказала яна шэптам, — чуеш, ходзіць, гэта Іван Іванавіч. Ён прадае завод. Гадоў дзесяць. Але без мазы. Вань, — крыкнула ў нябёсы, — гэй!

Зверху вызірнуў чалавек. Пад сорак, трохі захуды, са стомаю ў вачах, з цыгарэтай у зубах, у чорным гар-

нітуры, у нясвежай кашулі. Выглядаў так, быццам толькі што вярнуўся з памінак. Цёпла кіўнуў Дашы, уважліва паглядзеў на мяне.

— Твой? — спытаў.

— Мой, — пацвердзіла яна.

— Падрос.

— Хто? — не зразумела Даша.

— Ладна, — кіўнуў ён рукой і пайшоў, прыкрыўшы за сабою балконныя дзверы.

— Калі ноччу будзеш гучна крычаць, — папярэдзіла Даша, — ён усё пачуе. Карацей, — Даша загарнулася ў халат, як генерал разбітай арміі ў шынель, — насалоджвайся жыццём.

Але якое магло быць пасля гэтага жыццё? Якая магла быць асалода? Я згубіў спакой. Няўжо нічога не будзе? — думаў я, стоячы каля акна і назіраючы за сонцам, якое падымалася. Што яна сабе выдумала? Прастаяў на балконе да абеду, праваляўся ў ложку да вечара, выйшаў яе сустракаць. Напусціў на твар рэшткі стрыманасці, хаваючы за акулярамі роспач і лютасць, прайшоўся па вуліцы — ад ваенкамата да тубдыспансера, ад салона прыгажосці да дома былых палюбоўніц. Туды, потым назад, потым яшчэ раз, потым зноўку, і так да бясконцасці. У чарговы раз павярнуўшыся, заўважыў яе ў канцы вуліцы. Ішла павольна, разглядаючы святло за жоўтымі вечаровымі вокнамі. Я нешматслоўна рушыў насустрач. Павітаўся, пацікавіўся справамі, падзяліўся ўражаннямі, наплёў пра справы, пра дзелавыя сустрэчы, маўляў, цэлы дзень бегаў (так-так, у тэпцях), сустракаўся з партнёрамі (у акулярах, а як жа), добра, што сустрэліся, давай правяду, дапама-

гу несці рэчы. З рэчаў у яе быў нейкі камерцыйны глянец, які яна мне, зрэшты, не аддала.

Падымаючыся па сходах, яна маўчала, была задуменная і няўважлівая, аднойчы нават паспрабавала прыкурыць ад фільтра. Я падумаў, што гэта добры знак. Яна гатовая, падумаў, яна ўсё зразумела, усё пабачыла і на ўсё згодная. Яшчэ заўважыў, наколькі іначай яна выглядае ў профіль, становіцца падобнай да лісы, у яе поглядзе з'яўляецца нешта недаверлівае, як дзіўна, падумаў я, калі глядзіш ёй у вочы, гэтага ўсяго няма. Так, нібы яна хавае свой сапраўдны твар, выдаючы сябе за кагосьці іншага. Гэта ўсё вусны, яны ў яе маюць дзіўны абрыс, але каб гэта зразумець, трэба глядзець на яе збоку. Так часам бывае, падумаў я, так нават лепш.

Але на парозе, як толькі я паспрабаваў спыніць яе, пераступіць ёй дарогу, дакрануцца, недзе ў кішэнях яе працоўнага касцюма загыркаў тэлефон, і яна ўпэўнена адсунула мяне, адпіхнула ўбок кароткім жалезным рухам, як і належыць сапраўднаму адвакату, а дастаўшы мабілу, ураз напружылася, скінула званок і знікла за дзвярыма, нават не пажадаўшы мне салодкіх сноў.

Але мне яны ўсё роўна сніліся.

Прынцэса, спяваў я наступным ранкам, прачнуўшыся ў пакамечаных джынсах і нясвежай футболцы і сумна разглядаючы столь, навошта разбіваеш мне сэрца? Навошта аддаеш яго галубам на плошчы? Яны гуляюцца ім, седзячы на антэнах, і я плачу, прынцэса, пакуль ты малюеш яркімі фарбамі свой твар. Навошта ты трымаеш мяне ў гэтых срэбных ланцугах, навошта чапляеш мне чорны аброжак, які душыць мяне, не даючы сказаць усяго таго, што я думаю пра каханне і жорсткасць?

Дзе ты знікаеш штораніцы, прынцэса, у якіх норах хаваешся ад мяне, быццам лісіца? Чаму не прыйдзеш і не адпусціш мяне, чаму трымаеш мяне на ланцугу, чаму ніколі не называеш мяне па імені?

Я спяваў сабе, пакуль за акном прачыналася вуліца, спяваў, пакуль ажываў дом, спяваў, нават не спрабуючы падняцца. Аказваецца, думаў я з роспаччу, каханне можа быць нешчаслівым. Ад яго можа быць балюча, ад яго можа псавацца настрой. Хто б мог падумаць, думаў, хто мог прадказаць. Зрэшты, сонца станавілася ўсё больш, галасы гучалі ўсё больш нахабна, дом напаўняўся імі, на пакуты зусім не заставалася часу.

Мне падабаўся гэты дом. Ён быў падобны да электрааргана. Я слухаў раніцай, як рабочыя бралі кабель, цягнулі яго па вільготным халодным асфальце і падключалі да сініх патокаў электрычнага току. Дзверы пад'езда былі адчынены, і скразнякі стаялі ў іх, як водарасці, лёгка ўздымаючыся, як толькі хто-небудзь забягаў з вуліцы. Яшчэ сярод ночы, пакуль усе спалі, прыслухаўшыся, можна было ўлавіць пакрапванне вады на кухнях, прусаковы шоргат механічных будзільнікаў, соннае перашэптванне галубоў на даху, ціхі жаночы ўздых у сне, быццам хтосьці толькі наладжваў правады і антэны, рыхтуючыся да святочнага канцэрта. Бліжэй да раніцы пачынаўся рух, з'яўляліся першыя гукі — вецер працягваўся па падаконнях і пакоях, нібы па духавых інструментах, рыпелі падлогі, азываліся радыёгаласы, пачыналі гучаць нажы і патэльні, брытвы і фены, можна было адрозніць прасы і тостары, звонка сігналілі рынгтоны, салодка перадаваліся апошнія навіны, чуваць было посуд, чуваць было ваду, пацалункі і перашэпты, напевы маршаў і прамаўлен-

ні малітваў, вясёлыя збегі па сходах, што канчаткова абуджалі калідоры і балконы, якія гучалі цяпер, быццам зрушанае з месца піяніна, і ты знаходзіўся ў ім унутры, недзе пасярод найглыбейшых гукаў, паміж найтрывожнейшых нот, знаходзіўся, слухаючы, як пачынаюць гучаць дрэва і бляха, метал і цэмент, шкло і скура, якімі мацаваліся паверхі ды перакрыцці. І калі бліжэй да абеду ў пад'езд забягалі дзеці, ад іхніх высокіх галасоў пачыналі фаніць нябачныя мікрафоны, і дом гучна выстрэльваў рэхамі ды рыкашэтамі, і музыка гэтая трывала не змаўкаючы — меланхалічная падчас абеду, роспачная ў вечаровую пару, нястрымная апоўначы, але ўсё не заціхаючы, не абрываючыся, лунаючы далей.

Ад гэтай музыкі хацелася памерці. Гэтым я і заняўся.

Ужо да вечара алкаголь стаяў у маёй крыві, як вада ў паводку, гатовая ў кожны момант заліць пустыя вуліцы безабароннага горада. Усё, што я выпіў, усё, на што я адважыўся і да чаго прыклаўся, — а гэта былі дзіўныя сумесі і нечаканыя камбінацыі з шампанскага, херасу і рому — усяго, на што хапіла маёй гарачай фантазіі, уся гэтая вільгаць астуджвала маё сэрца знутры, запавольваючы непапраўнае, быццам графіт у ядзерным рэактары, не даючы, зрэшты, ніякіх падстаў сумнявацца, што яно, гэтае непапраўнае, цярпліва чакае мяне наперадзе. Я занадта любіў сябе, каб разбірацца ў алкаголі, я быў занадта самаўпэўненым, каб своечасова спыніцца. Я хадзіў у розныя падазроныя месцы, зазіраў ва ўсе тыя норы і падвалы, якія яна згадвала, быў у арабаў, заходзіў да в'етнамцаў, братаўся з працаўнікамі «Макдоналдса», піў на брударшафт

з сухотнікамі, замаўляў шампанскае ў саўне «Здароўе», страціў памяць у падвале насупраць сінагогі, прыйшоў у прытомнасць у дзіцячай кавярні, запіваючы малочныя кактэйлі горнымі бальзамамі, пытаўся адрасы ў прадаўцоў піцы, памёр ад каньячных выпарэнняў у бары, які трымалі грузіны, уваскрэс ад паху мадэры ў пустым супермаркеце. Трымаўся, упарта п'ючы за яе здароўе, настойліва прапаноўваючы мінакам услаўляць яе неймаверны профіль, піць за яе голас і скуру, за яе цырульніцу, якая чаруе над ёй, ствараючы з яе шорсткіх валасоў касмічныя ландшафты. Стаяў на нагах, лёгка пагойдваючыся, як юнга. Умешваўся ў дыскусіі, даводзячы ўсім, што ні адна жанчына ў гэтых кварталах не мае такіх зялёных вачэй, ні адна з іх не ўмее так пераканаўча сыпаць праклёнамі і прасіць прабачэння, у ніводнай з іх няма такіх высокіх абцасаў, такіх тонкіх запясцяў, такой біяграфіі. Дзіўна, што мяне не пабілі сухотнікі. Характэрна, што мяне не абрабавалі в'етнамцы. Прыемна, што мяне выкінулі з «Макдоналдса». Жыць мне заставалася некалькі гадзін. Я вырашыў правесці іх з карысцю. Але не змог.

Яна знайшла мяне на сходах каля пад'езда. Я сядзеў, прытуліўшыся да дзвярэй і не даючы нікому выйсці з дома. Спачатку яна раз'юшылася. Потым спалохалася. Падхапіла мяне, як змагла, пацягнула ўверх, да сябе. Пакуль цягнула, я прачнуўся, спрабаваў падсвечваць ёй мабільнікам, набіраў пры гэтым выпадковыя нумары, удала, як мне здавалася, жартаваў з яе імя, да месца, у чым быў перакананы, прапаноўваў выйсці за мяне замуж, пяшчотна, па ўласным вызначэнні, вісеў на ёй, абдымаючы адной рукой яе, другой — парэнчы. Яна пасадзіла мяне на кухні і па-

прасіла заткнуцца. Хадзіла і вырашала, што са мною рабіць. Спачатку надумала тэлефанаваць маёй маме. Потым вырашыла зрабіць мне моцнай гарбаты. Пасля зусім ужо нервова прапанавала прамыць мне страўнік, паставіць кропельніцу, выпіць снатворнага, выпіць вітамінаў, выпіць морсу, выпіць марганцоўкі, выпіць морсу з марганцоўкаю, выпіць марганцоўкі без морсу, але са снатворным, выпіць усё разам і запіць гарбатаю — так ці інакш, яна клапацілася пра мяне, і ад гэтага сэрца маё ганяла кроў, і кроў мая ўцякала ў сэрца далікатна-чырвонай, а выцякала з яго цёмна-крывавай.

Пакуль яна хадзіла вакол, пакуль корпалася ў шафах і шуфлядах, вышуквала ў гугле рэцэпты і тэлефанавала знаёмым аптэкарам і анестэзіёлагам, мне станавілася ўсё больш самотна і горка. Кухня ў яе была акуратна запоўнена рознымі травамі і спецыямі, гароднінай і морапрадуктамі. Я лёгка пазнаваў духмянасць цынамону і гваздзікі, востры водар кары, шчымлівыя пахі чорнага перцу, рэзкую прысутнасць часнаку і лімонаў, цёмны дух сечанага мяса, светлы сок рэзанай гародніны, свежасць лёду і бязважкасць мукі, гаркату, асуджанасць і незваротнасць стэйкаў, прывіднасць воцату, летуценнасць соі, бессэнсоўнасць таматнага соусу. Пахаў станавілася ўсё больш, яны стаялі нада мною, як дэманы, залазячы ў лёгкія і сціскаючы горла, яны абступілі мяне, як войска крапасныя муры, яны складаліся нада мною ў дзіўныя канструкцыі, набіралі нечаканыя абрысы, бянтэжылі і прыгняталі. Жыццё маё пахла свежамарожанай рыбай, смерць мая будзе аддаваць кітайскімі грыбамі. Колькасць пахаў забівала мяне, іхняя насычанасць рабіла гэтую смерць балю-

чай. Толькі не тут, наказваў я сам сабе, толькі не ў яе дома. Ідзі дадому, не марудзь, нашэптваў я сам сабе, валі адсюль. Толькі не тут. Тады яна адкрыла халадзільнік. І я памёр.

Потым яна доўга стаяла нада мною, запіхваючы маю галаву пад халодны струмень. Я вырываўся і спрабаваў падняцца, адводзіў яе руку, аднак яна настойліва вымывала з мяне боль і чарноту гэтага свету, прыгаворваючы нешта жыццесцвярджальнае і не даючы мне падняцца. Адзенне яе даўно намокла, я разумеў, што ёй холадна, што ёй усё гэта сто гадоў не трэба і што паводжу я сябе як апошні мудак. І ад гэтага разумення слёзы цяклі па маім твары, перамешваючыся з халоднай вадою, што ж я так, думаў я ў роспачы, што ж я так усё сапсаваў? Што ж цяпер рабіць? Я прасіў у яе прабачэння і патрабаваў адпусціць мяне, тлумачыў, што са мной усё ў парадку, і прыхлушваў, колькі ж я насамрэч сёння выпіў, прасіў наліць мне яшчэ і цяжка адплёўваўся шампанскім і кока-колай, стрымана казаў нешта пра яе валасы і нешматслоўна прапаноўваў ісці са мной у ложак. Яна цярпліва ўсё гэта выслухвала, злёгку давала мне штурхалёў, калі я загаворваў пра сэкс да вяселля, ледзьве чутна ўздрыгвала ад халоднай вады, ледзьве стрымана ўсміхалася на ўсе мае прапановы.

Калі я плёўся ад яе, пакідаючы ў калідоры шчодрыя мокрыя сляды, мне захацелася сказаць нешта важнае.

— Ведаеш, — сказаў, — я б цябе ахвотна пацалаваў. Але сама разумееш, я тут табе ўсё абрыгаў, уяўляю, як ад мяне цяпер пахне.

— Ідзі-ідзі, — адказала яна, ці то пагаджаючыся, ці то пярэчачы.

І зранку я ўсё памятаў, нічога не забыў, ніводнага яе слова, ніводнага яе дотыку. Памятаў, як трывожна яна на мяне глядзела, як асцярожна трымала за руку, як акуратна выціралa ўсе мае смаркачы. Нічога не забыў, хаця лепей было б нічога не памятаць. У памяці касяком лёталі спалоханыя ластаўкі, на сэрцы мне ціснулі мяхі з лёдам, хацелася пазбавіцца гэтага балючага цела. Аднак я ведаў: нельга губляць часу. Зараз альбо ніколі. Я ўстаў, сяк-так апрануўся, з трэцяй спробы пачысціў зубы, апёк руку, запарваючы гарбату, разліў малако, рассыпаў цукар, перавярнуў вядро са смеццем. Вось зараз усё і адбудзецца, сказаў я сабе і рашуча выйшаў за дзверы.

Зноў ніхто не адчыняў. Зноў давялося стаяць і прыслухоўвацца да галасоў і гукаў. Што за чорт? — думаў я. — Яна што, не хоча мяне пускаць? Рашуча загрукаў у чорны метал дзвярэй, абуджаючы галубоў на даху. Урэшце зазвінелі ключы, трапляючы ў замок, дзверы цяжка адчыніліся. Я рвануў наперад і наткнуўся на хлопчыка. Было яму гадоў сем. На ім была белая майка і футбольныя шорты, калені ў яго былі збітыя, локці падрапаныя, валасы чорныя і густыя, глядзеў з-пад ілба, даверу не выклікаў. У руках трымаў шарыкавыя асадкі і алоўкі. Крытычна агледзеў мяне з ног да галавы. Тут з кухні выбегла Даша. Збянтэжылася, прытворна нядбайна паклала рукі малому на плечы.

— О, — сказала, — Рамэа, гэта ты? А гэта Амін, — кіўнула на малога.

— Як? — здзіўлена перапытаў я.

Малы паглядзеў на мяне з нянавісцю.

— Добрыя ў цябе асадкі, — сказаў я яму міралюбна. — Гэта што, сапраўдны паркер? У мяне калісь такі быў.

— Ты ўмееш пісаць? — працадзіў малы і пайшоў на кухню.

— У яго канікулы пачаліся, — хутка зашаптала Даша, — яго бабуля зранку прывезла. Хаця што ён тут летам будзе рабіць? Яго б на мора куды-небудзь...

І праўда, падумаў я, на мора, за буйкі.

Я сядзеў на кухні, Даша бегала і нешта гатавала, дэманструючы гасціннасць, малы глядзеў на ўсё гэта скептычна. Да мамы ён падобны не быў. Але маму, здаецца, любіў. Я яму, відавочна, перашкаджаў. Ён мне таксама. Даша ўсё больш нервавалася, нешта спаліла, нешта перасаліла, нешта проста выкінула ў сметніцу. Я хацеў разгаварыцца з Амінам, але той мне адкрыта хаміў. Мама рабіла яму заўвагі, але ён хаміў і ёй таксама, ад чаго яна нервавалася яшчэ больш. Зрэшты не вытрымала, схапіла тэлефон, выбегла ў суседні пакой, з кімсьці доўга размаўляла, пакуль малы злосна вымалёўваў паркерам у школьным сшытку монстраў і серыйных забойцаў. Я ўстаў і пайшоў дадому. Малы нават не падняў галавы.

Так прайшло два тыдні. Я прачынаўся ранкам ад яе крокаў за сцяною, чуў, як яна бегае па кватэры, як будзіць малога, як рыхтуе яму сняданак, як спазняецца, як збірае вопратку, марна спрабуе навесці парадак на галаве, панічна шукае абутак, роспачна спрабуе камусьці дазваніцца, безнадзейна далівае малако ў халодную каву, вырачана выбягае ў пад'езд, кідаючы ў сумку тэлефоны, таблеткі і сонцаахоўныя акуляры. Я ведаў, што вернецца яна позна, недзе пад вечар, можна нікуды не спяшацца. Малым займаліся. Прыходзілі нейкія яе сяброўкі, цёткі, суседкі, выхавальнікі. Ад-

нойчы яна папрасіла мяне прыглядзець за ім. Але малы наўмысна (так-так, наўмысна, я бачыў, што ён гэта наўмысна) перакуліў рондалі, патэлефанаваў маме (у яго быў даражэйшы тэлефон, чым у мяне!), паскардзіўся, расплакаўся. Яна мусіла лавіць таксі, ляцець дадому. Я патлумачыў, яна нібы і паверыла, але разам нас больш не пакідала. Я злаваўся і пасылаў праклёны на галаву малога. Адкуль ён тут узяўся, думаў, чаму яна сапраўды не адправіць яго куды-небудзь на мора, на возера, на балота, бліжэй да прыроды, да дзікіх жывёл? Малы мяне ігнараваў — не размаўляў, не адчыняў мне дзверы (зняважліва гледзячы на мяне скрозь вочка, падставіўшы пад дзверы крэсла), дэманстратыўна адмаўляўся ад ежы, калі я сядзеў у іх на кухні, уключаў на поўную калонкі, калі яна гаварыла са мной па тэлефоне. Я нават пачаў паважаць яго. Які прынцыповы, падумаў. Насамрэч ён бяспечны, пераконваў я сябе, нічога страшнага. Але ўсе мае спробы пасябраваць з ім нічога не далі. Ён наогул не выглядаў чалавекам даверлівым і безабаронным, меў цяжкі характар і сур'ёзныя цацкі. Цягаў у кішэнях хімічныя алоўкі і канцылярскія прылады (я сам бачыў, як ён спрабаваў стэплерам прышчапіць шнуркі маіх кедаў да падлогі; яна, вядома, не паверыла), меў падораны татам выкарыстаны газавы балончык (ну, гэта яна думала, што выкарыстаны), падораны дзядулем партабак (ад яго пахла тытунём, я казаў ёй, але яна адмахвалася і не звяртала ўвагі), знойдзены недзе стэтаскоп (для чаго ён яму? — пытаўся я нервова), пазычаныя ў кагосьці гільзы з паляўнічай стрэльбы, скрадзены ў мяне швейцарскі нож (не аддаваў, упарта пераконваючы, што гэта яго, яна зноў жа нібы і верыла мне, але нож так і не забрала). Найгор-

шае, што са мной яна цяпер амаль не кантактавала, хоць і далей забягала час ад часу, дзверы пры гэтым не зачыняючы і асцярожна ўвесь час азіраючыся, на ўсе мае спробы спыніць яе на сходах, загаварыць з ёю на вуліцы, зацягнуць яе ў нейкую цёмную зацішную браму кожны раз напружвалася, рабілася прытворна легкадумнай, дакучліва ветлівай, знарочыста шчырай. Ён увесь час быў недзе побач — чакаў яе, стоячы на балконе, вызвоньваў яе, як толькі я дакранаўся да яе рукі, прачынаўся, як толькі я сярод ночы лёгка грукаў у яе дзверы, раніў сабе пальцы і апякаў язык, дзёр вопратку аб цвікі і ўмешваўся ў бойку на вуліцы, соваў у рот пратэрмінаваныя харчы і цягнуў дадому вулічных сабак — і ўсё гэта, каб адцягнуць ад мяне яе ўвагу, перацягнуць яе на свой бок, выклікаць яе спачуванне ці хаця б раздражненне, слёзы, смех і любоў. Яна, наадварот, злавалася на яго ўсё часцей, сварылася з ім усё больш адкрыта, разам з тым усведамляючы: ну, што ж з ім сварыцца, ён разумны хлопчык, ён усё разумее, усё робіць правільна, чужы тут я, і злавацца трэба на мяне. Але ўсё роўна злавалася на яго. Паступова ў нас з ёй склаліся дзіўныя адносіны, якія трымаліся на тым, каб пакінуць малога ні з чым. Яна спрабавала па дарозе з працы вызваніць мяне і вярнуцца дадому разам. Ноччу дасылала мне паведамленні, у якіх пыталася пра надвор'е ды апошнія навіны ў краіне. Раніцай паспявала заскочыць да мяне на імгненне проста прывітацца і адразу знікала, пакідаючы пасля сабе пах гарачага хлеба. Малы разумеў, што адбываецца, таму адразу заняў абарону, хітра і разумна расстаўляючы паўсюль пасткі. Спаў з яе тэлефонам, шпацыраваў пад сваімі вокнамі, замазаў замок маіх дзвярэй пластылінам (добра, што хоць пла-

стылінам, думаў я), пісаў мне цыдулкі з чорнымі пазнакамі і вудуісцкімі замовамі. Мяне ўсё гэта знясільвала, я страціў сон, страціў спакой, нават захацелася ў нейкі момант вярнуцца дадому. Мне было шкада малога, якога я шчыра даставаў, шкада яе, што не магла знайсці сабе паміж намі месца, а ўжо як шкада было самога сябе — пра гэта лепш наогул не казаць. Так пачалося лета, так памерлі ўсе мае мары.

Яна зайшла ў пятніцу пад вечар, забегла з вуліцы адразу да мяне. Кінула сумку, адтуль пасыпаліся візітоўкі, нататнікі, кантэйнер для лінзаў. Хадзіла па кватэры, старанна абмінаючы мяне позіркам. Гаварыла пра спёку, якая ўпала на горад, пра птушак, што не давалі спаць, пра праблемы з вадою, я паспрабаваў заступіць ёй дарогу, але яна неяк рашуча выставіла далонь, маўляў, стой, дзе стаіш, і сказала:

— Рамэа, — сказала, разглядаючы шпалеры, быццам шукаючы памылкі ў малюнках, — у мяне сяброўка заўтра замуж выходзіць. Запрасіла на вяселле. Мне нама з кім пайсці. Пайшлі разам.

— На вяселле? — насцярожыўся я.

— Гэта побач, — хутка загаварыла Даша, — падарунак я ўжо купіла.

— А малы?

— Пасядзіць дома, — строга сказала яна.

— Як скажаш, — пагадзіўся я.

— Толькі апраніся нармальна, — параіла Даша, падхапіла торбу і знікла ў калідоры.

Зранку яна стаяла перад маімі дзвярыма. З малым, вядома, куды ж без яго. Сказала, што няня захварэла, што

да суседкі сярод ночы прыязджала хуткая, што ў знаёмых у канторы праверка, адным словам, няма з кім яго пакінуць. У яе быў троху прыпухлы ад слёз твар, таму надзела вялікія сонцаахоўныя акуляры. Малы пазіраў на мяне пераможцам. На руцэ ў яго матляўся ролекс — палены, але прыгожы.

Лепей, вядома, было б нікуды не ісці. Ясна, што лепей было б не ісці. Хто мяне туды цягнуў? Ну, як хто? Яна мяне цягнула, яна. Яна ішла наперадзе ў чорнай сукенцы, з чорнай сумачкай, цягнучы малога, кідаючы на мяне роспачныя погляды. Я ішоў ззаду, цягнуў падарунак (нешта шкляное, максімум — парцалянавае) і не мог адвесці вачэй ад яе хады, ад таго, як яна ступала па цёплым бітым асфальце, як рухалася ў гэтай сваёй сукенцы, быццам вяселле пачалося ўжо, быццам пачалося свята і варта было святкаваць проста цяпер — пад акацыямі ды ліпамі, пад сінімі нябёсамі чэрвеня, у горадзе, пра які яна так шмат мне распавядала, на вуліцах, дзе з ёй усе віталіся. Я ведаў яе менш за месяц, але паспеў прывыкнуць да яе паспешлівых рухаў, да яе сварлівых размоў, да цяпла яе рук, да холаду яе вачэй. Лета будзе доўгім, сонца будзе пякучым, мае радасці будуць сумнеўнымі, мае пакуты будуць пякельнымі. Завершыцца ўсё шчасліва, да канца не дажыве ніхто.

Вяселле святкавалі ў лазнях. Я нават не здзівіўся, рознае бывае. У мяне знаёмыя некалі ажаніліся ў спартзале, пад баскетбольнымі кошыкамі, таксама па-свойму рамантычна. І вось тут таксама было такое таемнае, заканспіраванае месца: злева аўтасэрвіс, справа — аптэка, паміж імі — святочныя сталы. Металічную браму з наваранымі на ёй алімпійскімі кольцамі ад-

чынілі насцеж, госці з вуліцы траплялі на вялікі падворак, у цэнтры дэкаратыўны фантан распырскваў ваду, заліваючы ўсё вакол, быццам зламаны пажарны кран. Шыльды я не заўважыў. Магчыма, яны проста не змаглі прыдумаць назву для такой рамантычнай установы. Вакол паркаваліся вясельныя аўтамабілі: бліжэй да лазняў — іншамаркі, далей, за аптэкай — пара жыцём пабітых жыгулёў. Госці пад ранішнім сонцам паміж аптэкай і чорнымі покрыўкамі аўтасэрвісу выглядалі асабліва ўрачыста. Заходзілі з вуліцы на двор, азіраліся па баках, віталіся са знаёмымі. Бегалі афіцыянты, сварыліся сваякі, крычалі дзеці, было шмат сонца. Даша праціскалася паміж гасцей, ёй радаваліся, спынялі, нахіляліся да малога, кідалі на мяне дапытлівыя погляды. Я прыкрываўся парцалянай. Нявеста мне спадабалася — Дашынага ўзросту, невысокага росту, з кароткімі, афарбаванымі ў руды валасамі, са стомленымі вачыма, з заўсёднай цыгарэтай, з лёгкай усмешкай, быццам казала: нічога, пачакаеце, без мяне ўсё роўна не пачнецца. Пад вясельнай сукенкай былі красоўкі. Даша доўга з ёй аб нечым шапталася, падцягнула малога (той, не вітаючыся, вырваўся і звалiў да фантана), падвяла мяне, назвала сваяком. Нявеста кінулася мяне абдымаць, пяшчотна дыхаючы нікацінам. А вось жаніх падгуляў: хоць і старэйшы за мяне, але ў сваім гарнітуры быў падобны да выпускніка, тобок было відаць, што касцюм шылі на хуткую руку. Рысы твару рэзкія, валасы змазаныя гелем, пазіраў цяжка, з каханай амаль не размаўляў, нават па імені да яе не звяртаўся, нібы баяўся памыліцца. Хаваўся за сваімі сябрамі, якія шчыльна абступілі яго, загароджваючы ад непажаданых кантактаў. Многія з сяброў прыйшлі

ў трэніровачных касцюмах з камандным лэйблам, большасць у сонцаахоўных акулярах. Я, убачыўшы гэта, свае дэманстратыўна зняў. Даша, зрэшты, ад маладых мяне хутка адцягнула, загадала знайсці Аміна. Я знайшоў, давай, кажу, сябра, пайшлі святкаваць. Малы прамаўчаў, але пайшоў. А ўбачыўшы маму, пачаў ныць, маўляў, хачу дадому, не хачу тут заставацца, хачу вады, не хачу ні з кім знаёміцца, хачу любові і не хачу ні з кім ёю дзяліцца. Я спрабаваў яго чымсьці заняць, аднак Амін дэманстратыўна ад мяне адварочваўся і галасіў усё больш упэўнена, дабіваючы маму кантрольнымі ў галаву. Даша доўгі час рабіла выгляд, што ўсё ў парадку, аднак нарэшце не вытрымала, развярнулася і нырнула ў натоўп. Малы таксама развярнуўся і гэтак жа кудысьці нырнуў. Найбольш замінала, зразумела, парцаляна.

Госці таўкліся на падворку, заходзілі ў бар, выходзілі з калідораў, нечага чакаючы, аб нечым перагаворваючыся. Я пазнаў Івана, суседа зверху. Побач з ім стаяў нейкі тоўсты, дыябетычнага выгляду ягоны прыяцель, ужо накіданы, ад таго яшчэ больш хваравіты. Акрамя спартоўцаў, хадзілі туды-сюды старэйшыя мужчыны ў старанна вымытых кашулях і самавітыя жанчыны з ярка афарбаванымі тварамі. Праштурхаліся двое, падобныя да таксістаў: адзін у скуранцы, другі з наколкамі. Дзіўныя госці, падумаў я, яны быццам не на вяселле прыйшлі, а цягнік сустракаць. Раптам я ўбачыў Дашу. Стаяла ля сцяны, трымала ў руках віно, падобна, не першае, смяялася, павісшы на нейкім нізенькім мужыку. У таго быў аліўкавага колеру заплылы твар, вузкія вочы, пульхныя вусны, белая, але нясвежая кашуля, дарагія, аднак нячышчаныя чаравікі. Ён усё

спрабаваў дакрануцца да Дашы, усё спрабаваў папляскаць яе па-сяброўску па спіне, усё хапаў за руку, нешта радасна выкрыкваючы і пасмейваючыся. Даша зноў рабіла выгляд, што ўсё ў парадку. Альбо ўсё сапраўды было ў парадку. У мой бок не глядзела. Таксама весела нешта крычала вузкавокаму, таксама пляскала яго па карку, хоць было заўважна, што час ад часу робіць ледзь прыкметны крок у бок, назад, у цень, так, нібы ў чувака дрэнна пахла з рота. І калі ён, нібыта жартуючы, быццам неспадзявана (насамрэч упэўнена і важка) крануў яе нагу трошкі вышэй калена, я не вытрымаў і пайшоў да іх.

— О, Рамэа, — прытворна ўзрадавалася яна. — Пазнаёмся, гэта Коля.

Коля працягнуў далонь, нават не зірнуўшы ў мой бок.

— Патрымай, — сказаў я, перадаючы Дашы парцаляну. Яна не чакала, ледзь не выпусціла падарунак з рук, крыху нязграбна перахапіла яго, паддаўшы знізу каленам. Коля ўрэшце звярнуў на мяне ўвагу. Тут я і сціснуў яго далонь. Была яна вялікая і вільготная, маю руку ён паціскаў млява і неахвотна. — Раман, — сказаў я, — прыемна пазнаёміцца. Даша пра вас шмат распавядала.

— Што распавядала? — не зразумеў ён.

— Рознае, — не стаў я ўдакладняць.

Коля адразу неяк зніякавеў, закруціўся на месцы, вільготна і неахвотна паляпаў мяне па плячы і знік у бліжэйшым калідоры. А яна паглядзела на мяне злосна і расчаравана, кінула сваю парцаляну кудысьці пад святочны стол і рэзка загаварыла. Казала пра тое, што мы ўсе яе дасталі — і малы, і я, што мы паводзім

сябе як два ёлупні, а яна мусіць нас разводзіць, мусіць даваць з намі рады, а яна таксама не жалезная (тут яна пачала плакаць, нібы дэманструючы, што вось, маўляў, ёлуп, бачыш, сапраўды не жалезная), што яна бачыць нас не хоча, а калі захоча — сама скажа, таму каб мы не лезлі да яе, каб адчапіліся (ад'ябаліся), каб далі ёй спакой. Вань, — крыкнула яна кудысьці мне за спіну, — курыць ёсць? І, рашуча мяне адштурхнуўшы, схапіла за руку нашага суседа, які таксама кудысь актыўна прабіраўся, і павяла за сабою. Дыябетык пасунуўся следам. Я псіхануў і пайшоў у адваротным кірунку. Добра, што святкавалі тут паўсюль.

Дзе твая ўпэўненасць? — казаў я сабе. — Дзе твая радасць, дзе ўсё тое, чаго ты так шукаў у гэтым сонечным свеце? І пакуль на падворку працягваліся ўрачыстасці, пакуль пыл падымаўся і асядаў на пяшчотную салатавую траву, я сядзеў у бары і глядзеў серыялы. Выйсці мне не выпадала, прыйшлося б з кімсьці камунікаваць, нешта камусьці тлумачыць, неяк выблытвацца з усяго гэтага, прыйшлося б адводзіць ад яе позірк, прынцыпова на яе не глядзець, рабіць выгляд, што не заўважаю яе. І вось тут, у цёплых ранніх прыцемках, аднекуль ніадкуль проста на мяне выйшаў каўбой — пасажыр у каўбойскім капелюшы, лёгкім пінжаку, маляўнічых шортах і разбітых в'етнамках. Убачыўшы мяне, ён заўважыў таксама і ўвесь смутак у маіх вачах. Таму настойліва параіў ісці за ім, кажучы: давай, Вася, што ты тут віснеш, усё найцікавейшае зараз адбываецца ў раёне басейнаў з халоднай вадою, у сектары водных атракцыёнаў, у квадраце чорных гарачых кабін і пякельных выпарэнняў, і пацягнуў мяне менавіта туды, паколькі, гаварыў,

нягожа так грэбаваць святочным настроем. Кажучы, страшэнна спяшаўся, прагна глытаючы галосныя, пераскокваў ад сказа да сказа. Капялюш спаўзаў яму на вочы, пот заліваў яму лоб, бакі яго былі мокрымі ад нецярплівасці, але як толькі ён правёў мяне таемнымі пакоямі і вывеў да масажнай залы, дык я адразу зразумеў, што ўсё гэта было не дарма. Самае цікавае адбывалася менавіта тут, і вогненная аголеная кампанія, убачыўшы нас, кінулася на каўбоя, услаўляючы яго, і ўсе церліся аб яго з удзячнасцю, і аб мяне таксама церліся, і калі гэта былі жанчыны — было мне радасна, а калі мужчыны — станавілася мне трывожна і хацелася каму-небудзь улупіць. І чым далей — тым болей. А каўбой дастаў з кішэні пухлы духмяны скрутак, нешта каштоўнае, нешта загорнутае ў жоўтую газету, і ўсіх наогул парвала, яго падхапілі на рукі і пацягнулі за дзверы, кудысьці ў самае пекла. Тады я лёг на масажны стол і глядзеў на халодны басейн, у якім успыхвалі электрычныя агні, адбіваючыся ад зялёнай паверхні. І вакол сноўдалі аголеныя красуні, салодка ўсміхаючыся, і важна праходзілі заматаныя ў кашлатыя ручнікі мужчыны, кідаючы на мяне занепакоены погляд: ці свой, ці не залётны? І час сплываў, мінаючы мяне і робячы маю прысутнасць тут выпадковай, а далейшае знаходжанне — пазбаўленым сэнсу. І толькі тады, калі ўсе прайшлі міма мяне, выйшлі вонкі і вярнуліся назад, аднекуль зноў з'явіўся каўбой, ён меў пры сабе паднос з каньяком і лімонамі і прымусіў мяне выпіць столькі, колькі я змагу, а калі я сказаў, што больш не магу, прымусіў выпіць яшчэ. Бо, — крычаў, — калі ж мы з табой яшчэ вып'ем, Вася! Я валю, адсюль, к ебяням, Вася, к ебяням! Міжнароднымі

авіялініямі Украіны! Без перасадак! Проста заўтра! З нябачных тэрміналаў! Патаемнымі паветранымі калідорамі! У абыход усіх мытных службаў! Прайшоўшы крыжовым паходам праз усе дзьюці-фры! Не дэкларуючы нічога з упрыгажэнняў і банкаўскіх актываў! Ужо паслязаўтра, Вася, — п'яна і з захапленнем крычаў ён, — я буду сядзець у нармальнай кампаніі дзе-небудзь у раёне Філадэльфіі (Філадэльфіі, Вася!), у кампаніі маклераў ды брокераў (ага, брокераў!), і піць нармальны кашэрны каньяк! А не гэтае лайно, Вася! — галасіў ён і шчодра прыкладваўся да бутэлькі. — Не гэтае, зусім не гэтае! А калі ў басейн пасыпалася аголеная публіка, зноў падхапіўшы яго на рукі, я вырашыў, што з мяне досыць і што нарэшце час сыходзіць.

Выйшаў з пакоя, прайшоў у бар. За вокнамі стаяла ноч, на падворку звінеў посуд, сварыліся жанчыны, абрываўся спеў. За маёй спінаю рыпнулі дзверы. Я азірнуўся. Паспеў заўважыць сукенку маладой. Дзверы зачыніліся. Я выйшаў з бакавога выхаду на вуліцу. Рушыў быў дадому, калі раптам заўважыў Аміна. Ён стаяў, прыціснуўшыся да сцяны, і горка плакаў. Над ім навісаў Коля. У руках ён трымаў ролекс малога. Малы ныў і цягнуўся па гадзіннік.

— Што тут у вас? — запытаў я, падыходзячы.

Коля спалохана азірнуўся. Зрэшты, убачыўшы менавіта мяне, супакоіўся.

— Ды ўсё нармальна, сынок, — сказаў, яшчэ мацней звужаючы вочы. — Купіў у хлопчыка ролекс, а ён нешта ные.

— Нічога не купіў, — заныў Амін, спрабуючы адабраць гадзіннік.

— Дык купіў ці не купіў? — перапытаў я.

— Купіў-купіў, — холадна пацвердзіў Коля. — Давай, сынок, ідзі.

— Слухай, ты, — загаварыў я, — підар, — удакладніў. — Аддай малому яго ролекс.

— Не поняў, — не зразумеў мяне Коля.

— Кажу, ролекс аддай, — паўтарыў я.

— Ты што, сынок? — Коля нарэшце расплюшчыў вочы і паглядзеў на мяне, быццам упершыню ўбачыўшы.

Я не даў яму дагаварыць і заехаў кудысьці пад дых. Коля сагнуўся, але на нагах утрымаўся і паспрабаваў адступіць. Я кінуўся на яго. Раптам дзверы за маёй спінаю расчыніліся, і на вуліцу пасыпаліся радасныя ад злосці ды ўзбуджэння галасы. Я не паспеў нават азірнуцца, як мяне завалілі на асфальт. Пару разоў атрымаў па хрыбетніку, пару разоў па нырках, добра, што галаву паспеў прыкрыць рукамі. Раптам усе спыніліся. Я паспрабаваў падняцца, але нехта ўпэўнена прыціснуў мяне чаравікам да асфальту. Нада мною навісаў Коля, побач з ім цямнелі яшчэ трое ці чацвёра, я іх не ведаў, а вось ён ведаў іх напэўна, і яны яго, падобна, добра ведалі. Коля вагаўся, дабіць мяне ці пакінуць тут, на асфальце. Урэшце папусціўся.

— Мудак, — сказаў прымірэнча, сплюнуў у бок і пайшоў у бар святкаваць. Астатнія пацягнуліся за ім.

Я падняўся. Нага ныла, футболку можна было выкідаць. Малы спалохана стаяў побач. Ролекс валяўся на асфальце. Я падняў яго, аддаў малому. Прываліўся спінаю да сцяны. Дзверы зноў адчыніліся, адтуль выбегла Даша. Пабачыла нас, падышла. Яе крыху занес-

ла, зрэшты, яна згрупавалася і ўтрымала раўнавагу. Паглядзела на заплаканага малога, убачыла маю разадраную футболку. Пачала крычаць.

— Што ты тут робіш?! — крычала яна малому. — Якога чорта?! Колькі можна?!

Малы прываліўся да сцяны побач са мною. Так мы і стаялі з ім, быццам чакаючы агульны расстрэл. Я з кім размаўляю? — крычала Даша. — Ты мяне чуеш?

— Не крычы на яго, — сказаў я.

— А ты не лезь! — не пагадзілася яна і зноў закрычала. — Я ў цябе пытаюся, якога чорта?!

— Я сказаў, не крычы на яго, — перапыніў яе я.

— Ды хто ты такі? — павярнулася яна да мяне. — Што ты мне ўказваеш?

— Паслухай, — адказаў я, — ідзі бухай, з кім бухала. Можаш з імі нават трахацца. На малога не крычы, ясна?

— Што? — перапытала яна. — Што ты сказаў?

Яна вытрымала паўзу і ўлупіла мне сваёй ледзяной растапыранай пяцярнёй. Падхапіла малога, павалакла да бара. Я кінуўся следам. Аднак дзверы былі замкнутыя. Я пацягнуў іх на сябе, потым наваліўся плячом, потым доўга малаціў па іх разбітымі кулакамі. Можна было, вядома, зайсці са двара, але якога чорта, як казала Даша, якога чорта. Я паплёўся дадому, падняўся да сябе, выкінуў брудную вопратку, сабраў рэчы. Акуляры пакінуў на стале. Спусціўся ўніз. Пераначую на вакзале, падумаў.

Усё, што я ведаў пра гэты горад, я ведаў ад яе. Гэта яна распавядала мне ўсе свае непраўдападобныя гісторыі. Гаварыла заўсёды гучна і пераканаўча, называла

імёны і адрасы, успамінала даты, малявала наском чаравіка на пяску, паказваючы напрамак, у якім рухаюцца рэкі, і месцы, дзе яны перасыхаюць. Расказвала мне пра сістэмы фартыфікацый і сутарэнняў, апісвала металічных цмокаў, што дыхаюць агнём ля трамвайных дэпо, і згадвала непрабіўныя панцыры баявых жывёлін, якія хаваюцца ў пясчаных норах вакол вадасховішча. Расказвала таксама пра макеты паветраных фабрык і машыны масавага знішчэння, выраблены дзецьмі ў дамах піянераў, успамінала нешта пра ўрадлівыя палі стадыёнаў, на якіх растуць дзіўныя расліны, ад якіх добра спіцца і паляпшаецца памяць, скорагаворкай нашэптвала інфармацыю пра таемныя лабараторыі політэхнічнага, што недаступна цямнеюць на небасхіле, пра навуковыя школы, якія ўжо добрую сотню гадоў спрабуюць вырабіць эліксір неўміручасці, і самыя кароткія трамвайныя шляхі, якія праходзяць падворкамі. Згадвала нешта пра халодную зброю, якая выраблялася на старых заводах, пра тое, што ўлетку дрэвы засланяюць сабою неба, ноччу не відаць ані месяца, ані зорак, таму сёй-той думае, што ў горадзе жывуць ведзьмы, і яны тут сапраўды жывуць, сцвярджала, і даволі добра сябе адчуваюць, таму што гэта наогул зручны для пражывання горад, вось сюды і спаўзаюцца тапельцы і вісельнікі, прыплываюць па рэках, пранікаюць скрозь вакзалы, паляпшаючы агульную дэмаграфічную сітуацыю. Затое ўзімку, удакладняла яна, месяц проста вісіць у цябе за акном, хоць бяры яго ў рукі, падобны да тварагу, хаця насамрэч злеплены з гліны і травы. У горадзе, гаварыла, лёгка зімаваць, паколькі фабрыкі пастаянна прагравaюць ранішняе паветра. Расказвала, што вясной у прадме-

сцях вада размывае падмуркі старых санаторыяў, рэкі становяцца чырвонымі і пахнуць медыкаментамі, таму сапраўдны пах вясны — гэта пах нашатыру. А яшчэ гаварыла, што на вуліцах зноў пачалі страляць, што вайна працягваецца і ніхто не збіраецца здавацца. Усё будзе доўжыцца, пакуль мы будзем любіць, — тлумачыла, быццам на нешта намякаючы. Любові хопіць на ўсіх, — дадавала. Гэтага апошняга я не зразумеў.

ІВАН

Ужо прачынаючыся, Соня паспела ўбачыць сон. Быў ён кароткі і неспакойны. Снілася ёй рака, па якой падымаліся караблі. Старыя, іржавыя, з жоўтымі ад вады бартамі і чорнымі ад сажы трубамі. Спыняліся пасярод ракі і шалёна сігналілі. З бартоў у ваду скакалі маракі — стомленыя, няголеныя, ад гэтага злыя і рашучыя. Дабіраліся плаўма да берага, выбрыдалі на пясок у цяжкай вопратцы, разбітых ботах, ішлі па прычале, гнеўна азіраючыся на караблі, што працягвалі гудзець так гучна, што яна канчаткова прачнулася. Ну што ж, падумала, сёння будзе шмат гасцей.

У доме яшчэ спалі. Яна ціха выслізнула з-пад прасціны. Ночы былі цёплымі, яны спалі зусім без адзення, ёй гэта падабалася, падабалася прачынацца і знаходзіць усё такім, якім яно мае быць — непрыхаваным і лёгкім. Ён спаў тварам на ўсход усю ноч — глыбока і нерухома. Суніт нейкі, падумала Соня, нацягнула футболку і выйшла з пакоя. У гасцінай спалі сваякі. Учора яна спрабавала запомніць, хто ёсць кім, у каго якое імя, але безнадзейна: усе яны трымаліся гур-

там, спалі покатам, як пілігрымы, строга выконваючы роднасныя прадпісанні ды іерархічныя ўстаноўкі. Мужчыны ўтрох цясніліся на канапе, паміж імі роспачна захрас чыйсьці пляменнік — друзлы і сарамлівы, зацiснуты з абодвух бакоў старэйшымі, як бабслеіст. Жанчыны ляжалі на разасланых на падлозе вярблюджых коўдрах. Мужчыны адзення не скідалі, спалі ў святочных штанах і кашулях, адзін нават гальштук з вечара не скінуў, каб зранку не мучыцца. Жанчыны спалі ў цёплых халатах, паставіўшы ў галовах прывезеныя з дома пантофлі. Ляглі рана, спалі моцна, у сне не крычалі. Соня раптам успомніла, што, акрамя футболкі, на ёй нічога няма, нячутна зачыніла дзверы. У дзіцячым пакоі на раскладушцы спаў дзядзька Грыша. Спаў так, як спяць героі, — раскоўзаўшы пасцель і застыўшы ў нейкай вар'яцкай позе: галавою закапаўся пад падушку, левую руку зацiснуў паміж сухімі сцёгнамі, правай захрас недзе пад раскладушкай. Коўдра ляжала на падлозе, нібы забыты дэсантнікам парашут, прасціна звісала з нагі, як сарваны з варожай адміністрацыі сцяг, сківіца плавала ў шклянцы з вадою, на крэсле. Уначы — яна чула з суседняга пакоя — дзядзька Грыша цяжка круціўся на раскладушцы, як грэшнік на пякельным агні, стагнаў, плакаў, зрываўся на ногі, час ад часу хапаючы шклянку са сківіцай і прагна п'ючы, а потым доўга адплёўваючыся. Раніцай супакоіўся і высока насвістваў сінімі вуснамі нейкую цёмную прывідную мелодыю для лунцоў. Соня прайшла ў ванную, зачынілася. Скінула футболку. Улезла ў ванну, пусціла гарачую ваду. Пакуль яны будуць спаць, падумала, у мяне ёсць час. У мяне ёсць час, паправілася, пакуль яны будуць спаць.

Вада краналася скуры, робячы яе цёплай і чуллівай. Хочацца пяшчоты, падумала Соня, хочацца сэксу, хочацца кавы з малаком. Калі выходзіла, наткнулася на яго. Ён, аказваецца, адчуў, што яе няма, прачнуўся і пайшоў на пошукі. Стаяў пад дзвярыма ваннай, чакаючы, калі яна скончыць. Толькі адкрыла, заштурхаў яе назад і ўзяўся сцягваць з яе футболку. Дарэчы, падумала Соня і дапамагла яму. А як толькі ён зручна прымасціў яе на ванне, прытрымліваючы адной рукою, намагаючыся сцягнуць з сябе майку другой, нехта лёгка і няўпэўнена пагрукаў у дзверы. Прытым што дзверы не зачынялі. Яны спыніліся, Соня прыслухалася, ён заскрыпеў зубамі. Зноў пагрукалі. Чорт, прашыпеў ён, адпусціў яе, кінуў ёй яе футболку і адкрыў. На парозе стаяў пляменнік. Са сну яшчэ больш друзлы і разгублены. Стаяў у жаночай начной сарочцы і сініх спартыўных штанах, пераступаў няўпэўнена з нагі на нагу. Соня паспела кінуць на калені футболку, каб схаваць ад малога хоць нешта. А вось ён прыкрываўся толькі рукою, але колькі там тых рук, таму пляменнік глядзеў на яго пільна і спалохана, усё больш нервова тупаючы і пераступаючы. Нейкі час усе маўчалі, першым не вытрымаў ён.

— Суседнія дзверы, — сказаў з націскам, высунуўся ў калідор, клацнуў патрэбным выключальнікам, вярнуўся назад, прыкрыўшы за сабою дзверы.

Паспрабаваў забраць у яе футболку, аднак Соня цвёрда адвяла яго руку, адзелася і пайшла на кухню. Ён застаўся. Соня падумала, што і адпусціў ён яе занадта груба, калі малы пачаў ламацца, і футболку кінуў занадта рэзка, быццам выганяючы, і што ўсё гэта насамрэч так недарэчна, хаця, па вялікім рахунку, якая

розніца? Ніякай. На кухні, падчэпленая да люстры, вісела яе вясельная сукенка. Соня ўзялася за каву. Дзень будзе доўгі, падумала. І радасны, дадала.

Сваякі прачнуліся неяк усе адразу. Магчыма, малы прыйшоў і паведаміў радасную навіну, што маладыя ўжо на нагах, а таму варта падымацца і пачынаць з божай дапамогай новы дзень, а можа, дзядзька Грыша ўзяў занадта высокую ноту, але яна ўсё ж паспела праслізнуць са сваёй кавай назад у пакой, калі ў калідорах раздаўся тупат і галасы: мужчыны галіліся — усе трое адначасова ў цеснай ваннай, прыціснуўшы пляменніка спінамі да пральнай машыны. А калі б і адпусцілі, той бы нікуды не пайшоў: мужчынскія паводзіны патрабуюць згуртаванасці, таму ён толькі глядзеў, як дарослыя спешна скрабуць скуру аднаразовымі станкамі, пускаючы першую гэтай раніцай кроў, строга, але без скаргаў, крывячыся. Жанчыны галасілі на кухні, хадзілі вакол сукенкі, адчайна пляскаючы рукамі, маўляў, і сукенка занадта кароткая, і часу замала, і нічога не паспеем, а тое, што паспеем, усё адно ў нас не атрымаецца. Штосьці пачалі смажыць, штосьці рэзаць, запахла мясам і сонцам. З дзіцячага пакоя выбрыў дзядзька Грыша ў доўгіх баксёрскіх трусах, шчодра ўсеяных белымі кветкамі, трымаючы пад пахай прасавальную дошку, падобны да сёрфера, што выбраўся на ранішні пляж у чаканні хваль і подзвігу. Соня сядзела ў сваім пакоі, глядзела ў акно і піла каву, якая безнадзейна астывала. Калі ён вярнуўся, яна яшчэ нават не апранулася.

— Хвалюешся? — запытаў.

— А то, — адказала Соня. — Як упершыню.

Ён незадаволена скрывіўся, хаця ўсё было чэсна — ён у свае трыццаць два жаніўся ў першы раз, яна ў свае трыццаць чатыры падазравала, што ў апошні.

— Сень, — павярнулася да яго, — можа, ну яго? Давай я прыгатую амлет, накормім тваіх і адпусцім з богам.

— Ды ну, ты што, — спалохаўся Сеня, — яны ж ад мяне адмовяцца. Ты думаеш, гэта мы з табой жэнімся? Гэта яны жэняцца.

— Добра, — сказала яна, памаўчаўшы, — тады будзем жаніцца.

Хутка сабраліся, узялі ўсё неабходнае, выцягнулі з ванны пляменніка, што нечакана надумаў купацца, высыпалі ў калідор. Сеня быў у чорным гарнітуры, валасы змазаў гелем, зубы пачысціць сваякі не далі, таму ён злосна жаваў жуйкі. Яна была ў святочнай сукенцы, у руках трымала басаножкі на тонкіх высокіх абцасах, абута была ў белыя красоўкі. — Ты так і паедзеш? — здзівіўся Сеня. — Не перціся ж мне ў шпільках, — адказала Соня. Выпусціўшы ўсіх, выключыла святло, зачыніла дзверы. Кватэра, у якой яны жылі, належала ёй. За святло плаціла яна. Спусціліся ўніз, пачалі запіхвацца ў таксі. Рэшта села ў жоўты форд. Соня паклала шпількі ў багажнік, села за руль. Форд належаў таксама ёй.

Яна не хацела выходзіць замуж — жылі як жылі, жылі б і далей. Але за Сеню ўзялася радня. Былі яны егавістамі, штотыдзень прыязджалі ў горад на службу — у свежавымытай вопратцы, з дзецьмі ды ўнукамі. Выглядалі як пагарэльцы, што паспелі выратa-

ваць вопратку, аднак вяртацца ўсё роўна не мелі куды. Служба адбывалася ў кінаканцэртнай зале. Кіно не паказвалі. Канцэртаў таксама не было. Пасля службы Сеня, як мясцовы, вёў сваякоў на абед. Мужчыны глядзелі на яго з павагай, жанчыны з любоўю. Усе жадалі яму шчасця. Усе гаварылі пра Соню. Патрабавалі, каб ажаніўся. Сеня жыў у яе кватэры, Соня падвозіла яго з раніцы да метро (хаця, што там падвозіць — два кварталы ўверх), купляла яму цыгарэты. Але ён усё роўна пачаў гаварыць жорстка. Соню гэта зачапіла. — Паслухай, — казала яна, — мы жывём разам. Амаль год. Што табе яшчэ трэба? Што гэта зменіць у нашых адносінах? — У нашых нічога, — сумленна адказваў Сеня, — але ў мяне ёсць сям'я, яны хвалююцца. — Скажы, няхай не хвалююцца, — перадавала Соня. Але Сеня далей настойваў, і яна ўрэшце пагадзілася. Нечакана для сябе. І для Сені. Добра, — сказала, — будзе табе вяселле. Толькі не злоўжывай маім каханнем: яно мае ліміты. Дамовілася з татарамі, якія трымалі каля ракі ўзбекскую кухню. Вычапіла аднакласніка, які працаваў тамадою. Аднакласнік яе не пазнаў. Тым лепей, падумала Соня. Замовіла сукенку, папярэдзіла сяброў — сказала, што вяселле будзе ў італьянскім стылі. То-бок прыходзіць трэба ў касцюмах сіцылійскай мафіі. Хай цяпер пераймаюцца, падумала задаволена.

Дзіўныя людзі прыходзілі да іх на свята. Найгоршае, што потым яны заставаліся. Соня стаяла пасярод натоўпу, так і не пераабуўшыся — у белых красоўках пад такога ж колеру сукенкай, — і спрабавала зразумець, каго яна ведае. Ці, прынамсі, хто ведае яе. Прыйшоў увесь яе офіс, уключна з юрыдычным аддзелам: Да-

ша, змучаная і заплаканая, цягнула за сабою двух дзяцей — старэйшага і малодшага. Пад дрэс-код з іх траіх падпадаў хіба што малодшы: у строгім школьным гарнітуры, ён пазіраў на ўсіх з нянавісцю, так што можна было прыняць яго за мафіёзнага сына палка, адлучанага ад асноўных фінансавых патокаў. На руцэ быў цяжкі механічны гадзіннік, напэўна, зняты з закатаванага сям'ёй даўжніка. Прыйшоў Іван, як заўсёды спакойны, хоць і пастарэлы, пажадаў шчасця. Крытычна агледзеў прычоску Сені, але стрымаўся, прамаўчаў. Прыбег нейкі дзіўны чалавек у каўбойскім касцюме, здалёку, праўда, падобны да Чэлентана, але, хутчэй, тэмпераментам. Соня яго не ведала, аднак гасцей пры ўваходзе сустракаць пачаў менавіта ён. Потым пасыпаліся суседзі, школьныя прыяцелі, дзелавыя партнёры. Большасць ужо арыентавалася, што менавіта любіць нявеста, што ёй дарыць, што не трэба: усё ж такі не першы раз замуж выходзіла, усе ўжо неяк прывыклі. Гуртам хадзілі змрочныя сваякі Сені, не ведаючы, за што ўзяцца. Найбольш неадэкватна паводзіў сябе пляменнік: перавярнуў закускі, курыў з татарамі, прадказальна заваліўся ў фантан. І гэта ў свае дзесяць гадоў, захоплена думала Соня, гэта яшчэ пакуль нічога не пачалося. Са сваёй радні яна запрасіла толькі дзядзьку Грышу, які чамусьці лічыў сябе яе хросным бацькам, ужо адным гэтым пасуючы да італьянскага стылю. Хросны дык хросны, думала Соня, галоўнае, каб пасля вяселля вярнуўся дадому, сіл няма слухаць яго начныя крыкі. Іншыя яе сваякі альбо памерлі, альбо зніклі з эфіру. З іншага боку, хросны лёгка гэта кампенсаваў: аціраўся каля прадстаўніц юрыдычнага аддзела, кладучы свае жоўтыя сухія рукі на далікатныя дзявочыя калені,

фужэрамі глушыў шампанскае, час ад часу дастаючы сківіцу і праціраючы яе вільготнымі сурвэткамі. Сеня, акрамя сваякоў, запрасіў каманду. Цэлую футбольную каманду. Асноўны склад, з якім апошнія тры гады бараніў гонар сеткі будаўнічых гіпермаркетаў. Прычым бараніў даволі паспяхова, каманда трымалася ў лідарах, і гульцы намякалі ўласніку, маўляў, давай, Іван Абрамавіч, укладзіся нармальна — выйграй для сябе якую-небудзь спартакіяду. Усё ў нашых руках. То-бок нагах. Аднак Іван Абрамавіч меў свае планы на будучыню, таму ў пачатку другога круга, яшчэ ўзімку, абвясціў, што каманда распушчана. Счапіўся з гарсаветам, не разышоўся з кіеўскімі, прадаў сетку, выкупіў у Егіпце гатэль і перабраўся на афрыканскі кантынент. Сядзеў над басейнам, лічыў вярблюдаў. Для каманды гэта было сапраўдным ударам — па-за футболам яны мала чым цікавіліся, таму і мала што ўмелі. Што цяпер рабіць — ніхто не ведаў. Хтосьці паспеў уладкавацца на працу, хтосьці вярнуўся да вучобы, хтосьці проста пераймаўся. Сеня проста пераймаўся. Але на вяселле прыйшлі ўсе. Дрэс-коду, зразумелая справа, не прытрымліваліся (якая мафія, казалі нервова, Сень, не выёбвайся), зрэшты, да спартыўных касцюмаў надзелі на ўсялякі выпадак сонцаахоўныя акуляры. Гаварылі адзін аднаму, што на Сіцыліі менавіта так і ходзяць, Саня, іхні правы край, быў на мінулыя Каляды на Сіцыліі, усе нашы там менавіта так і ходзяць — у адыдасах, тэпцях і чорных акулярах. Як сапраўдная мафія. Да вяселля ставіліся насцярожана, аднак Соня ім падабалася. Цёмна-чырвоныя валасы, цёплыя вусны, ледзяныя пальцы, загарэлая скура. Невысокая, спартыўная, стройныя ногі, дарагія красоўкі. Калі б

маглі, згвалтавалі б яе проста тут, ля фантана. А калі б яна магла, то не пярэчыла б.

Яны прыйшлі апошнімі. Пасля абеду ўжо. Стаялі пад гарачым сонцам, палілі, думалі. Даніла прапаноўваў вярнуцца дадому: пайшлі, казаў, несур'ёзна неяк. Але Алег глыбока, да галавакружэння, зацягваўся і выціраў бурштынавы пот рукавом скуранкі. Алегу было трыццаць шэсць. Даніла быў старэйшы на чатыры гады. Але выглядаў на ўсе пяцьдзясят. Алег рамантаваў дамы, наймаў брыгады чорнарабочых, вадзіў іх за сабою па горадзе, асвойваў аб'екты. З сабой заўсёды насіў невялікі панасонік — фатаграфаваў вежачкі і аздабленні аварыйных дамоў, потым з дапамогай зуму разглядаў дэталі, якіх не мог убачыць няўзброеным вокам. Адзеты быў у горныя боты, выгаралыя джынсы і карычневую авіятарскую скуранку. Валасы былі цёмныя і нячэсаныя. Ён даўно не галіўся. Даўно не спаў. Даніла быў у спартыўным. Чэрап меў паголены і пабіты. Уражанне складаў суровае, але вочы меў шэрыя і мудрыя. Іншая справа, што ў вочы яму ніхто не зазіраў, усе звычайна звярталі ўвагу на сінія ад наколак кулакі, распісаныя ім яшчэ падчас службы на Каўказе. Працаваў таксістам, упісаўся з уласным мэрсам у нейкую бюджэтную канторы, вазіў студэнтаў ды іншую п'яную публіку. Мэрсэдэс яго стаяў пад вокнамі дома, насупраць «Макдоналдса», зранку Даніла прачынаўся, браў з сабою тэрмас ды ішоў дасыпаць у машыну. Гэй, пытаўся ён цяпер у Алега, нас праўда запрашалі? Алег думаў, нервова сплёўваў, незадаволена адмахваўся. Ясна, што запрашалі, казаў Данілу, мы ж сябры. Проста нагадаць забыліся. Як гэта забыліся? — здзіўляўся Даніла. Забыліся-забыліся,

пераканана круціў галавою Алег, ясна, што забыліся. Зараз я ім скажу. Даніла скептычна хмыкаў, але заставаўся стаяць з братам.

Прастрэлілі паветра недакуркамі, пабілі далонямі па кішэнях — ці няма нічога лішняга, рушылі наперад. На ўваходзе наехалі на абсоса ў каўбойскім капелюшы, далі па карку нейкаму малому, мокраму і брыдкаму, пільна, хоць і коратка, агледзелі незнаёмага пацана, кучаравага і задзірлівага, што з гідлівасцю глядзеў на ўсіх. Праціснуліся да маладой, за локаць адцягнулі ад яе ветэрана з чырвонымі ад бяссоння вачыма, далі яшчэ аднаго штурханца мокраму малому, які ішоў цяпер за імі следам. Павіталіся. Даніла працягнуў далонь, Алег не.

Соня здзівілася. Аднак хутка ўзяла сябе ў рукі, усміхнулася Данілу, працягнула далонь Алегу, а калі той дэманстратыўна не адказаў, прыцягнула яго да сябе і вільготна пацалавала ў шчаку, колячыся аб яго чатырохдзённае шчацінне. Алег збянтэжана папрасіў прабачэння, што яны спазніліся. І што не ў парадным. І без падарунка. Бянтэжыўся ўсё болей, але тут Даніла перабіў яго, дастаў з кішэні звязак ключоў і працягнуў Соні: на, малая, сказаў, сёння мой мэрсэдэс у тваёй уласнасці. А я пайду бухну. Соня засмяялася, разганяючы агульнае напружанне, але ключы нечакана для сябе ўзяла. Давайце, сказала, святкуйце. Ключы хай у мяне будуць, а то зладзіце тут амерыканскія горкі. Данілу ўжо хтосьці наліваў, Алег хацеў нешта дадаць, але толькі махнуў рукою і таксама пацягнуўся да сталоў.

Чаму караблі? — думала яна. — Адкуль караблі? Апошнія гады яна вяла дзённік. На фірму прыходзіў

псіхааналітык, вясёлы шарлатан, што заляцаўся падчас сеансаў да сакратарак і бухгалтараў, за што яго любілі і не выганялі. У вас усё добра, сказаў ён Соні: праца, кар'ера, здароўе. Нават тое, што ў вас няма мужчыны, — добра. У вас наогул усё ў парадку. Самы час занепакоіцца, папярэдзіў ён. І прапанаваў весці дзённік. Маўляў, гэта для сябе самой, таму можна не стрымлівацца — пішыце што хочаце: усё роўна ніхто не прачытае. Соня пагадзілася. Яна ўвогуле лёгка згаджалася на ўсё новае і нечаканае. Толькі, падумала, пра што пісаць? Адразу ж вырашыла, што ніякіх вытворчых момантаў. Навошта палягчаць працу падатковай, падумала. І ніякага кахання, дадала пра сябе. З каханнем насамрэч таксама ўсё было ў парадку. Соня сама кідала сваіх мужчын — яны яе кінуць проста не адважваліся. Двойчы яна была ў шлюбе, двойчы яе мужчыны бясследна знікалі з яе жыцця. Соня жартавала з гэтай нагоды, казала, што паадкусвала ім галовы. І не толькі галовы, дадавала. У яе было шмат сэксу, яна выбірала сабе цікавых мужчын, яна, калі хацела, выбірала сабе жанчын, жанчынам яна падабалася, была нястомнай і спакойнай, такой, якімі яны хацелі бачыць сваіх мужчын. Мужчынам яна, ясная рэч, таксама падабалася, была з імі пяшчотнай і шчырай, да таго ж заўсёды плаціла за сваю выпіўку.

Таму яна пачала фіксаваць уласныя сны. Уважліва і падрабязна. Апісвала пакоі і будынкі, якія бачыла, твары, якія ўзнікалі, запісвала размовы. Малявала дрэвы, кветкі і дзіўных жывёл, імёнаў у якіх не было. Вымалёўвала і рабіла каментары пад малюнкамі метэарытаў, якія падаюць на старыя кварталы, пад схемамі мін, закапаных у пясчаныя дзюны, пад про-

філем серыйных забойцаў, злоўленых і асуджаных да смяротнага пакарання праз павешанне. Забойцы на яе малюнках выглядалі на карабельную каманду: знясіленыя, аднак нязломныя, яны былі паміж сабой чымсьці падобныя, як і належыць мужчынам, якія праводзяць разам у абмежаванай прасторы доўгі час. Аднойчы не ўтрымалася і паказала ўсё гэта маме, тады яшчэ жывой. Мама пачытала і параіла дзённік спаліць, каб спакойна спаць надалей. Соня паслухалася, дзённік спаліла, аднак адразу ж завяла новы, хутка напаўняючы яго профілямі мужчын.

З Алегам яны пазнаёміліся тры гады таму. Ёй трэба было рабіць нешта з фасадам, які ў любы дзень мог абрынуцца, хтосьці са знаёмых (Іван? Здаецца, Іван) парэкамендаваў Алега. Алег з'явіўся, яшчэ без панасоніка, выйшаў на балкон, пералез цераз парэнчы, пайшоў уздоўж сцяны. Яна нават не паспела спалохацца, як ён вярнуўся. Сказаў, што трэба было ўбачыць усё зблізку. Праз некалькі дзён прывёў шумную пірацкую кампанію. Нейкі штрафбат. Тыдзень яны жылі ў офісе, спалі на сталах, елі «Мівіну» з яе кіеўскага посуду, мыліся ў рукамыйніку. Адрамантавалі фасад, выпілі скрыню крымскага каньяку, з усімі перазнаёміліся, усім спадабаліся. У такім узросце новых сяброў звычайна не заводзяць, думала Соня. Зрэшты, бываюць і выключэнні. Выключэнні звычайна больш цікавыя.

Яны шмат каго ведалі, хоць усё адно адчувалі сябе чужымі. Сямейныя святы — дзіўная штука: чым больш у цябе тут знаёмых, тым менш цябе хочуць тут бачыць. Даніла асцярожна піў, вычапіў з-за стала пару сектантаў, сяброў маладога, сапраўдных бясстрашных

місіянераў, што цягаліся па чужым для іх горадзе, ратуючы душы, нібы ратавальнікі на пляжы. Завёў з імі размову. Сектанты ўзяліся за Данілу крыху нядбайна, як цырульнікі за новага кліента. Данілу гэта спадабалася. Ён любіў дыскутаваць. Распавёў сектантам гісторыю свайго знаёмага, які таксама звязаўся з сектантамі. І нават перапісаў на іх дом за ракою, у прыватным сектары. А сам загрымеў на год, за хуліганку. А калі вярнуўся, у яго доме жылі трое слуг Божых. На парог яго, зразумела, не пусцілі. І тады, задуменна завяршыў Даніла, ён іх задушыў. Усіх траіх. А дом перапісаў на дзяцей. Не сваіх, вядома, адкуль у яго дзеці? Даслухаўшы, сектанты прыгнечана заспяшаліся па справах. Даніла не спыняў. Брат яго сядзеў пры ім, заліваўся потам, аднак куртку не здымаў, не расслабляўся, чагосьці чакаў, да нечага прыслухоўваўся. — Што ты? — пытаўся ў яго Даніла. — Не супакоішся? — Супакоюся, — весела адказваў яму Алег, — надыдзе час — супакоюся. — А як жа, — смяяўся Даніла, — супакоішся ты. Нейкія старэйшыя суседкі падыходзілі да іх і пыталіся пра здароўе, дзеці, не памятаючы сябе ад хаосу і ўсёдазволенасці, падпаўзалі да іх пад сталамі і падлівалі ім у чаравікі цёплага віна. Данілу гэта нават падабалася, а вось Алег рашуча штурхаў малых наском пад рэбры, і тыя роспачна адпаўзалі ў цемру і пыл. Даніла амаль нічога не еў. Алег не еў наогул нічога. Пару разоў падыходзіла нявеста з віном, якое ніяк не астывала ў яе халодных пальцах. Казала пра надвор'е, загаворвала зубы. За ёй стаялі жанчыны і мужчыны, жанчыны трымалі ў руках кветкі і лёд, да якога прыкладваліся расчырванелымі тварамі, мужчыны хавалі ў кішэнях жалеза і пачкі грошай, не адводзілі вачэй ад сонца, не заходзілі

ў цень, нібы асцерагаючыся чагосьці не ўбачыць, нешта прапусціць. Крычалі дзеці, пахла вадою і пылам, пачыналася самае цікавае.

Дзіўна, гаварыла Соня маме, я вяду здаровы лад жыцця, правільна сілкуюся, даўно завязала з наркотыкамі, у царкву не хаджу, нават ёгай не цікаўлюся. Але сніцца мне такое, што я пачынаю сумнявацца, ці правільна я ўсё раблю. Скажам, вязні. Што я магу ведаць пра вязняў? Дзе я іх бачыла? У мяне ніводнага знаёмага вязня, ты ж разумееш? А вось мне сняцца вязні, сняцца іхнія турэмныя спевы, сніцца іхні плач. Сніцца, як яны цяжка працуюць, як раняць пальцы, як выконваюць загады, як адпачываюць ад працы, як паміраюць. Потым ляжаць у цесных магілах, прысыпаныя вапнай, і цяжка рыпяць зубамі — ад лютасці і бяссілля. Усе нашы сны, адказвала на гэта мама, якая ўсё жыццё адпрацавала ў дзіцячай бібліятэцы і больш за ўсё ў свеце не любіла мастацкую літаратуру, ад прачытаных у дзяцінстве кніг. Чым лепшыя кнігі ты чытаў, тым горай спіш. Ты б замуж выйшла ці што, раіла яна. Я ўжо выходзіла, нагадвала Соня. Двойчы. Мне не спадабалася.

Алег яе здзіўляў. Аднойчы яна назірала, як ён прымусіў нейкіх тлустых заказчыкаў выплаціць доўг яго брыгадам. Заказчыкі спачатку зрабілі заказ, потым доўга і старанна кантралявалі ход работ, потым умела хваліліся, урэшце прапанавалі Алегу вырашыць гэтае пытанне з кіеўскімі. Алег дамовіўся аб сустрэчы ў грузінскім рэстаране. Запрасіў Соню. Заказчыкі спазніліся, прыйшлі задыханыя і спатнелыя, не выбачаючыся, паскардзіліся, што ледзьве трапілі ўнутр, там, унізе, сказалі, нейкія карагоды, куча народу, мо-

жа, раздаюць што. Гэта мае, растлумачыў Алег, чакаюць, да чаго мы дамовімся. Так што выходзіць будзе яшчэ цяжэй. Заказчыкі памяліся, адмовіліся ад абеду, папрасілі ваду без газу, падпісалі паперы. Не хацела б я з ім жыць, яшчэ тады падумала Соня.

Калі з калідораў пацягнула дымам і запахла мёдам, цукрам і цынамонам і сонца зайшло за вежы ды антэны верхніх кварталаў, а тут, унізе, на схілах пагоркаў, звернутых на поўдзень, па-вячэрняму астывалі расліны, яны такі вырашылі выбірацца. Паспелі ўбачыць, што маладыя перасварыліся, што ўся футбольная каманда паваліла на выхад, стаяла ля дзвярэй і нервова ў чымсьці адзін аднаго пераконвала. Гэта быў знак, трэба было ісці. Даніла павольна падняўся, скінуў на падлогу хроснага маладой, што спаў, седзячы на крэсле, галавой у відэльцах, асадзіў аднаго з футбалістаў, што лез біцца да афіцыянтаў, правёў цяжкай далонню па спіне бледнай кіраўніцы юрыдычнага аддзела, ад чаго тая загарэлася, палаючы знутры, пайшоў, не азіраючыся, адчуваючы за плячыма пах паленага цукру і мокрага тытуню. Алег выбіраўся следам, даў сваім горным ботам хроснаму па рэбрах, каб не псаваў свята, падняў за каўнер заваленага футбалістам афіцыянта, рэзка прыцягнуў да сябе Дашу, адчуваючы, як у ёй усё палае ад горычы, ішоў, бачачы перад сабой толькі братаву надзейную спіну, арыентуючыся толькі на яго пабіты чэрап, давяраючы толькі брату, слухаючы толькі яго. Падышлі да Соні па ключы.

— Ужо сыходзіце? — перапытала яна расчаравана.

Даніла аджартаваўся, Алег нервова палез у кішэні па цыгаркі. Тады Соня схапіла Данілу за руку, укла-

ла туды ключы, але не адпусціла і пацягнула за сабой. Я не магу вас так адпусціць, казала, смеючыся, самі падумайце. Даніла разважліва ішоў за ёй, апошнім асцярожна цягнуўся Алег. Перад дзвярыма, што вялі на кухню, спыніўся, схапіў малога, якога раней даставалі з басейна, але які паспеў пераапрануцца і ішоў за імі след у след, развярнуў яго, засадзіў каленам пад зад. Ідзі, сказаў змрочна, святкуй. І зачыніў за сабою дзверы.

За што ёй падабаўся Сеня: калі плаціла за яго, ён нават не дзякаваў. Гаварыў, што мужчына не павінен прыніжацца, і калі ў яго выпадкова няма бабла, гэта яшчэ не нагода прасіць прабачэння і дзякаваць. Па-свойму гэта было прынцыпова. Прынцыпы прымушаюць нас дзейнічаць, яны даюць нам сілу, думала Соня, або слабасць. Або і тое і іншае. Калі ён пераехаў жыць да яе разам са сваімі рэчамі (футболкі, буцы, шчыткі, залітая потам клавіятура), жыццё яе амаль не змянілася. Нават сны не змяніліся, сніліся так, быццам у жыцці яе нічога не адбывалася, нібы яе проста падключылі да нейкага канала з павучальнымі і мудрагелістымі снамі, якія яна не заўсёды разумела, таму не заўсёды глядзела да канца. Сеня ставіўся да яе са стрыманай ветлівасцю, шмат увагі не патрабаваў, многа не гаварыў, часам увогуле маўчаў, ажно яна пачынала нерваваццa. Ён любіў спаць з ёй, любіў глядзець на яе раніцай, пакуль яна яшчэ не прачнулася і не магла ні пра што яго спытаць. Пасля начэй з ёй цела ягонае выглядала так, быццам ён у цемры прадзіраўся скрозь шыпшыны. Укусы, сінякі і драпіны на плячах і спіне рабілі яго падобным да велікамучаніка, якому дасталася за пераканання.

Сеня спыняўся перад люстэркам, глядзеў на кроў, што праступала скрозь скуру, і яму станавілася невымоўна салодка. А калі пасля трэніровак ён стаяў у душы, кроў праступала з ран і змешвалася з прахалоднай вадою, як вецер з дажджавымі струменямі. Сябры пасмейваліся з яго, ён злаваўся і хутка апранаўся. Аднак дома, перш чым заваліцца спаць, усё роўна падыходзіў да люстэрка і ўважліва разглядаў драпіны, якія ўсё ніяк не гаіліся.

Незразумела было, куды ўсе падзеліся, чаму так рана сышлі. Вечар, праўда, быў позні, можна сказаць, што не вечар ужо, а ранняя ноч, ды хто б звяртаў увагу на час у такую пару, у такім настроі? Аднак на кухні нікога не было, толькі асвятленне роўна клалася на бліскучыя, залітыя соусамі ды крэмамі газавыя пліты, на металічныя паверхні сталоў ды бляшаныя вантробы мыек, на цяжкія халадзільнікі і вострыя нажы, забітыя ў крывавыя драўляныя дошкі для рубкі мяса ды гародніны. Усюды стаялі напаўпустыя рондалі з рэшткамі пачастунку, па падлозе былі рассыпаны ярка-зялёная капуста і далікатныя пялёсткі салаты, у мыйцы каштоўнымі згусткамі цямнела ялавічына, на стале засталіся бутэлькі, слоікі з мёдам і шакаладам, талеркі з чымсьці вострым і перчаным, вязкім і бязважкім.

— Давайце, лесарубы, — засмяялася Соня, — заходзьце, тут нікога няма. Я цэлы дзень нічога не ела. І гэта на ўласным вяселлі, уяўляеце? Зараз нешта знайду, сядайце.

Алег заскочыў на стол, падхапіў капусту, якая ляжала побач, прыцэліўся і запусціў ёю ў мыйку. Трох-

ачковы, стрымана ўзрадаваўся ён. Даніла прыціснуўся плячом да халадзільніка, насмешліва глядзеў на брата, прыслухоўваючыся разам з тым да цішыні ў калідоры. Соня пачала зазіраць у гаршчочкі, нешта вышукваючы, вылоўліваючы адтуль нешта смачнае — рэшткі міжземнаморскіх страў, усходніх вострых прыпраў і паўднёвых рыб, грукатала посудам, пералівала падліўку, запаліла ўрэшце чатыры агні на пліце, якія раскрыліся, бы акіянскія кветкі, кідаючы на столь бэзавыя цені. Здабыла недзе сыр, знайшла лімоны, выцягнула пачаты каньяк. Перадавала ўсё гэта Алегу з рук у рукі, і ён кожны раз заміраў, дакранаючыся да яе пальцаў. Села побач з ім, дастала з-за спіны яблык, кінула Данілу. Той лёгка злавіў. Соня шчодра адпіла, перадала бутэльку Алегу, брала ежу, секла яе вялікім нажом, дзелячыся пароўну ўсім, што ў яе было. Алег больш піў, сочачы за ёй. Соня рэзка надкусіла лімон, і залаты сок пачаў сцякаць па яе падбароддзі, і ніводзін мускул на твары яе не ўздрыгнуў, толькі слёзы выступілі, аднак яна лёгка змахнула іх, беручыся за сыр і зеляніну. Ірвала зубамі чорны хлеб, асцярожна запіваючы яго вішнёвым сокам, ламала пальцамі шакалад, злізвала з далоні клубнічны джэм, увесь час смяялася, так што зубы яе рэзка займаліся белым агнём, і ўсмешка была шырокай і шчодрай, як гэта бывае толькі ў дзяцей. Ды і то не ва ўсіх. Вішні пакідалі на яе вуснах крывавы след, алкаголь рабіў яе дыханне цёплым, ела яна так лёгка і радасна, ажно Алег адчуў, што зусім ап'янеў, што яго прыўзняло і падкінула ўверх. Заўважыў, што вакол холадна, нават агні газавай пліты не маглі прагрэць вільготнае паветра над мыйкамі і маразільнымі камерамі. Яна замерзла, мабыць, падумаў, сцягнуў скуран-

ку і накінуў яе Соні на плечы. Соня захуталася, глыбока ўдыхаючы яго пах, павярнулася і пачала яго цалаваць. Цалавала доўга, і пацалункі яе пахлі лімонам і мёдам. Алег чакаў-чакаў, што ж будзе далей, а не дачакаўшыся, сцягнуў назад сваю куртку, кінуў на халодную паверхню стала, і Соня зусім не пярэчыла, апусцілася на куртку, цягнучы яго за сабою. Цалавала далей, пакуль ён скідаў кашулю. Лімоны падалі на падлогу і цвёрда біліся аб запэцканую джэмамі плітку, фінікі траплялі яму пад руку, ад чаго скура яго станавілася салодкай, алкаголь разліваўся па паверхні стала, безнадзейна заліваючы рэшткі салаты. — У мяне пад сукняй нічога няма, — раптам сказала Соня. — Як гэта — нічога няма? — здзівіўся ён. — А красоўкі? Але яна засмяялася і ўзяла яго руку, паказваючы, што сапраўды нічога няма, хто б мог падумаць. І пакуль яны смяяліся адно аднаму, Даніла ціха адышоў да дзвярэй і вымкнуў святло. Дастаў цыгарэты, добра, падумаў, што мне засталося і не трэба турбаваць брата, курыў, гледзячы ў цёмнае акно і ледзь прыкметна ўсміхаючыся. Спрабаваў ім не перашкаджаць. Спрабаваў на іх не глядзець. Скура ў яе была залацістая, валасы медныя, пяткі ў яе былі жоўтыя, як лімоны.

Дзверы ламалі доўга і ўпэўнена. Жалеза глуха адклікалася пад цяжкім ціскам мужчынскіх плячэй. Але замкі былі надзейныя, а метал — непрабіўны. Таму там, за дзвярыма, у чорных калідорах, чуліся толькі рэзкія праклёны і крыкі расчаравання. Даніла курыў, дабіваючы адну цыгарэту за другой, Алег саскочыў на падлогу, паспешліва апранаючыся, спрабаваў трапіць у рукаў курткі, скакаў на адной назе, другую соваючы

ў чаравік, азіраўся вакол у пошуках чагосьці цяжкага. Расслабся, спакойна сказала яму Соня. Яна сядзела на жалезным стале і, не спяшаючыся, шнуравала красоўкі. Са складак яе сукенкі высыпаўся фундук і манеты. Валасы на галаве нагадвалі чырвонае зарыва, што раздуваецца ветрам. Але голас быў спакойны, а погляд — пяшчотны. Спачатку, калі загрымелі ў дзверы, Алег спыніўся і рэзка павярнуўся на грукат, кінуў насцярожаны позірк на брата, але Даніла нават не паварушыўся, хаваючыся ў цемры, а Соня абхапіла яго галаву рукамі, пацягнулася да яго і зашаптала яму — хутка, ціха, але разборліва — проста ў вуха нешта такое, ад чаго Алег абарваўся ў ёй, і яна абарвалася ўслед за ім, далей штосьці яму нашэптваючы — з удзячнасцю, уцехай і начной стомаю.

— Соня, — голас у яго быў дзіўны, рэзкасць у ім спалучалася з няўпэўненасцю, а раздражнёнасць са здзіўленнем, — ты там?

— Во дае, — рассмяялася Соня, а пасля крыкнула: — так, я тут. Што ты хацеў?

Сеня разгубіўся.

— Адчыняй, — сказаў ён суха.

— Ну добра, — сказала Соня Данілу, — вылазьце праз акно, я ім адчыню. Чуеце?

Даніла маўчаў, Алег таксама не адказаў. За дзвярыма прыслухоўваліся.

— Дань, — паклікала Соня, — ты мяне чуеш?

Алег падышоў да Данілы.

— Што робім? — спытаў ціха.

— Што скажаш, — гэтак жа ціха адказаў той.

— Я не магу яе кінуць, — растлумачыў Алег, — ён жа яе заб'е.

Алег глядзеў і чакаў. Даніла на імгненне завагаўся.

— Дань, — паклікала ўжо крыху нервова Соня. — Вы мяне чуеце? Давайце, ідзіце!

— Ну вось яшчэ, — сказаў раптам Даніла, — буду я праз вокны бегчы ад басоты рознай.

— Правільна, — падтрымаў яго Алег, — яшчэ чаго.

Даніла паляпаў яго па плячы, уключыў святло і адчыніў дзверы, быццам браму абложанага горада.

Нагадвалі яны сапраўдную футбольную каманду, з цёмных тунэляў стадыёна рушылі на святло — да бою і перамогі. Як толькі дзверы перад імі расчыніліся, яны ўсім натоўпам падаліся наперад, адціскаючы Алега і Данілу да жалезных сталоў. Атачылі іх цесным паўколам.

З-за іхніх спін злasліва выглядваў пляменнік, цешачыся, што паспеў усім паведаміць, здолеў папярэдзіць і прывесці ўсіх сюды — на месца злачынства. Сваякі Сені адразу ж кінуліся да Соні, якая непрыкметна паправіла сукенку, дастала аднекуль Алегавы цыгарэты, прыкурыла і цяпер холадна выпускала дым у твар жанчын, якія крычалі ёй нешта, не хаваючы заклапочанасці і адчаю. А футбалісты стаялі і гнеўна пазіралі на братоў, не ведаючы, з чаго пачаць, толькі Сеня пераводзіў погляд з Алега на Данілу, а потым зноў на Алега, потым зразумеў у нейкі момант, што ў яго проста бегаюць вочы. Тады павярнуўся зноў да Алега.

— Ты, — сказаў змрочна, — пайшлі пагаворым. А ты, — кіўнуў Данілу, — заставайся тут: з табою пагаворым пазней.

— А ты, — сказаў яму ў тон Даніла, — пайшоў нахуй.

Сеня хацеў адказаць, але захлынуўся ад злосці і кінуўся на Данілу. Даніла адступіў убок, перахапіў Сеню за шыю і рэзка кінуў на стол. Сеня ўрэзаўся грудзьмі ў жалезную бліскучую паверхню, хрыпла выдыхнуў і споўз на падлогу. Футбалісты рушылі на братоў. Алег паспеў заваліць аднаго, Даніла — двух. Пасля гэтага іх збілі з ног і пачалі дабіваць. Даніла хаваў галаву і спрабаваў роўна дыхаць. Алег выкручваўся і адбіваўся, нічога не кажучы і ні пра што не думаючы. Хаця думаць яму насамрэч было пра што.

Скажам, можна было падумаць пра сваю самаўпэўненасць, пра перакананасць у тым, што ўсё будзе так, як ён сабе прыдумаў. Яна яму ад пачатку спадабалася. Падабалася, што яна нічога не баіцца. Што не баіцца быць адна. Што ў кашальку побач з візітоўкамі дэманстратыўна носіць прэзерватывы. Падабалася, што ў патэнцыйных партнёраў, якім яна на першай сустрэчы пакідала візітоўкі, ад гэтага сціскала сэрца.

Тады, у грузінаў, калі тыя двое наклалі поўныя штаны і ўсё падпісалі, ён адвёз яе дадому, доўга не выпускаючы з машыны, ведаючы, што яна ад яго цяпер не пойдзе. Трымаў і ўвесь час гаварыў, хоць і заўважаў, што яна напружваецца, што ёй гэта не падабаецца, але быў настолькі ўпэўненым у сабе, што трымаў яе за руку і расказваў анекдоты, прымушаючы яе кожны раз больш смяяцца і напружвацца. Але калі палез да яе, нават не выключаючы рухавіка, быццам між іншым, яна накрыла яго вусны халоднай далонню і сказала: усё, Вась, стоп-машына. Ляснула дзвярыма, пайшла да пад'езда, гнеўна пагойдваючыся, аж ён не мог адвесці погляду. Як? — думаў. — Як можна так хадзіць і не па-

даць? Адчыніла дзверы пад'езда, нырнула ўсярэдзіну. Ён сядзеў, не маючы сіл адарваць погляд ад чорнай ночы, што абступіла яго з усіх бакоў. Праз секунду выпырхнула на святло. Гэтак жа пагойдваючыся, падышла да машыны. Адкрыла дзверцы. Ну ты, Рэмба, — сказала, — ты ідзеш? Ён дагнаў яе на сходах. Схапіўшы, паспрабаваў асцярожна пакласці на падлогу, аднак яна спрытна вывернулася — і сама ляжала на ім, прыціскаючы да халоднага каменя. Ён адчуваў, як у паветры гуляе скразняк, як лунаюць спевы ў чужых хатах, як жывёлы і птушкі збіраюцца каля дома, рэагуючы на святло і цяпло, рэагуючы на яе гучныя стогны, якіх яна нават не стрымлівала. Ціха, гаварыў ён ёй, табе ж тут жыць, ага, адказвала яна, не спыняючыся, мне, а каму ж, і далей ускрыквала ад кожнага руху. Толькі раз замерла, калі ўнізе рыпнулі дзверы, здаецца, нехта зайшоў і хутка пабег уверх, ён паспрабаваў падняцца, але Соня зноў накрыла яму вусны далонню, якая ўжо не была такой халоднай і пахла цяпер яе цяплом, а крокі, палунаўшы нейкі час, абарваліся паверхам ніжэй, адчыніліся дзверы, хтосьці павітаўся, кагосьці пусцілі, усё заціхла, і далей не было чуваць наогул нічога, акрамя яе стогнаў. Потым яна пабегла да сябе, а ён да раніцы сядзеў на сходах, не адважваючыся падняцца і пайсці прэч.

Спачатку іх цягнулі па калідоры, б'ючы з усіх бакоў ды ірвучы адзежу, потым выштурхнулі да басейнаў. Тут Даніла вырваўся і заваліў кагосьці аднаго ў ваду. На яго адразу ж накінуліся ўсёй кучай і пацягнулі далей, намагаючыся дацягнуцца і адпомсціць. Калі ўвесь натоўп вываліў у бар, іх спыніў Іван. За ім стаяла некалькі мяс-

цовых. Ці то даведаліся ад кагосьці, ці то проста разумелі, што нечым падобным усё і скончыцца. — Што тут у вас? — спытаў Іван. — Ды вось, — закрычалі ўсе пераможна, — злавілі дваіх левакоў. — Дваіх? — перапытаў Іван. — І што, вы ўсе на дваіх? — Ну так, — крыху няўпэўнена адказалі футбалісты, — мы ж іх злавілі. — Ну і хулі? — не пагадзіўся Іван. — Злавілі — цяпер адпусціце. Знайшлі левакоў. — Ды хуй там! — выгукнуў хтосьці з маладых. — Ідзі сюды, — папрасіў яго Іван, і калі той, нічога не чакаючы, падышоў, схапіў яго за каўнер і, рэзка развярнуўшыся, запусціў у прычыненыя дзверы. Дзверы расчыніліся вонкі разам з маладым, а тыя, што стаялі за Іванам, рушылі наперад. Аднак маладыя не адразу адчулі ўсю небяспеку, таму што кінуліся адбівацца, і нічым добрым для іх гэта не скончылася, палеглі ўсе, толькі Іван, б'ючы наўздагад па стрыжаных галовах, крычаў сваім: маладога, — крычаў, — не біць, у яго свята. Маладога ніхто і не біў, ён так і сядзеў на кухні, сядзеў і плакаў, уткнуўшыся носам у Соніны халодныя калені.

Таксама ён мог думаць пра стому, што ахутвала кожны раз, калі ён раніцай спускаўся па лесвіцы і адчуваў, што да яго крокаў прыслухоўваюцца цяпер жыхары яе пад'езда. Соня ніколі не адпускала яго сярод ночы. Не сыходзь, — пачынала хітрыць, — цярпець не магу спаць адна. Пойдзеш — паклічу каго-небудзь. Ён злаваўся і заставаўся. Раз-пораз засынаў пад яе крыкі, не перастаючы рухацца, і яна нават не заўважала, што ён спаў. Ён сам праз хвіліну не мог паверыць, што заснуў, бо яна была побач, і хоць у цемры нельга было разглядзець яе твар, ён напэўна ведаў, калі менавіта яна

смяецца, калі нервуецца, калі канчае, калі пачынае ўсё зноў. Усё можна было зразумець па яе дыханні, па тым, што яна яму гаварыла, а гаварыла яна ўвесь час, папярэджваючы яго, нешта тлумачачы, да нечага заклікаючы. Ён так прывык да яе голасу, што спыняўся і супакойваўся толькі тады, калі яна змаўкала. Тады ён ляжаў побач з ёй і дакранаўся да яе скуры.

Маладых выводзілі на вуліцу, ставілі пад сцяну, хтосьці паспрабаваў вырвацца, яго адразу ж паклалі на асфальт. Стаяла іх з паўкаманды — рэшта палягла ўнутры, выцягваць іх на паветра не было сэнсу. Мясцовыя стаялі перад імі, гледзячы, каб ніхто не ўцёк, Іван холадна аглядаў шэраг, Даніла, трымаючыся рукою за бок, стаяў побач, Алег заставаўся каля яго. Да Івана падышоў дзядзька Грыша, ён кепска трымаўся на нагах, але трымаўся і не адступаўся ад свайго, спрабаваў Івана ў чымсьці пераканаць, ківаючы ў бок маладых, можна было толькі пачуць, ну што ты, ды нахуя ты, ды гэтых дзёўбняў. Дзядзь Грыш, — адказаў яму на гэта Іван, — ідзіце ў бар: вам там нальюць. І дзядзька Грыша сумна паплёўся, не падымаючы на маладых вачэй. Ну што, пістоны, — пачаў Іван, — я вам казаў? І што было не паслухацца? Маладыя маўчалі. Даніла размінаў кулакі, Алег сплёўваў кроў з пракушаных вуснаў. Астатнія стаялі за Іванам, думаючы: так, усё слушна, ён жа ім казаў, што сапраўды было не паслухацца? Даб'ём? — павярнуўся Іван да сваіх. Але не паспелі яны адказаць, як неба прарэзаў сухі выбліск, аглушыўшы і прымусіўшы ўцягнуць галовы ў плечы, і святочны салют заліў сабой паўнеба, тонка падсвечваючы ў цемры голле дрэў і дахі дамоў, адбіваючыся ў вачах і згаса-

ючы ў чорным азоне. Дзесьці побач радасна зараўлі, крык падтрымалі па квартале. З-за дрэў ды пагоркаў усе віталі святочныя нябесныя агні, якія абпальвалі насякомых і сляпілі мінакоў, робячы ноч нясцерпна прыгожай, а жыццё — невымоўна цудоўным. — Ладна, — паклаў Даніла руку Івану на плячо, — хуй з імі, не звязвацца жа з гэтымі шчанюкамі. — Праўда, — дадаў Алег, дакранаючыся языком да надламанага зуба, — хуй з імі. Іван падумаў, задраў галаву ўгару, разглядаючы жоўтае і зялёнае зарыва над імі, вярнуўся да маладых. Ладна, — сказаў, — хуй з вамі, жывіце. Хтосьці прапанаваў завярнуць за вугал — адтуль лепш відаць. Усе так і зрабілі.

(Аднойчы Данілу душыў пасажыр. Ён тады яшчэ не працаваў на фірму, меў нармальную працу, проста вяртаўся дадому ў моцны дождж, убачыў, што галасуе нейкі пацан, спыніўся, спытаў. Выявілася, па дарозе. Пацан сеў ззаду, Даніла не звярнуў на гэта ўвагі. Калі пераязджалі цераз мост і машына прытармазіла, пацан раптам нахіліўся наперад, зацяснуў Данілаву шыю локцем, перахапіў адну руку другою і што было сілы пацягнуў на сябе. Даніла ад нечаканасці ўдарыў па тармазах. Пацана кінула ўперад, галавою ў бартавое шкло. Даніла заваліў яму па хрыбетніку, выцягнуў пад дождж. Пацан глядзеў на яго шклянымі вачыма. Відаць было, што страху не адчуваў. Відаць было, што не адчуваў наогул нічога. Сядзеў у вадзе, глядзеў уверх на Данілу і з нянавісцю ў голасе шыпеў: підар, підар, ну ты і підар. Данілу раптам павяло — магчыма, быў проста стомлены, магчыма, гэта была злосць, магчыма, нават абраза, вось, маўляў, я яго падабраў, а ён мя-

не цяпер підарам называе, але ён нечакана для самога сябе засадзіў малому па галаве. Потым яшчэ раз, потым яшчэ, ужо не маючы сіл спыніцца. Пацан уціснуў галаву ў плечы. Прыкрываўся рукамі, у нейкі момант паваліўся набок. Галава яго ўпала ў ваду, вочы былі скрываўленыя, з рота лезла пена. Даніла спалохаўся, думаў нават кінуць яго, але нешта прымусіла зноў зацягнуць пацана — бруднага і мокрага — у машыну, пасадзіць каля сябе і адвезці да хуткай. Сказаў, што падабраў на дарозе. Пагаварыў з доктарам. Доктар паглядзеў на яго і ўсё разумеў. Я ўсё разумею, так і сказаў Данілу. — Што ён, біў цябе? — спытаў, убачыўшы сінякі на шыі. — Душыў, — прызнаўся Даніла. — А ты яго? — Я яго не, — адказаў Даніла, — але пару разоў заехаў. — Наркотыкі, — патлумачыў доктар. — Здаецца, ты яму вока выбіў. Жыць будзе, але для чаго? — І што рабіць? — спытаў Даніла. — Нічога, — адказаў доктар. — Нічога не рабіць. Кантраляваць сябе. Часам нашы ўяўленні аб крыўдзе, нанесенай нам, зусім не суразмерныя з тымі дакорамі сумлення, якія будуць грызці нас цэлае жыццё. Але каб зразумець гэта, трэба і пражыць як мінімум цэлае жыццё. Давай, — развітаўся доктар, — я цябе не бачыў.)

Думаць можна было таксама пра абразу ды рэўнасць, пра патрэбу помсты, пра злосць, з якой ён ёй нешта выгаворваў, пра яе грэблівае маўчанне, пра расчараванне, якое яна нават не спрабавала прыхаваць. Ён не мог зразумець, адкуль узяўся гэты футбаліст, які нават шнуркі завязваць не ўмее, навошта ён ёй. Яна гнеўна крычала, што гэта не яго справа, што ён суне свой нос куды не трэба, не трэба яе вучыць, што яму наогул

лепш вымятацца адсюль. Ён вымятаўся, але потым тэлефанаваў, і яны далей сварыліся па тэлефоне, аж пакуль у яго не заканчваліся грошы, а ў яе — цярпенне. Ён збіраўся перахапіць дзесьці гэтага футбаліста і патлумачыць яму, што ён тут лішні, збіраўся (збіраўся ж!), але так чамусьці і не сабраўся: магчыма, яна адгаварыла (супакойся, пераконвала, гэта ж несур'ёзна, ты бачыш), магчыма, сам зразумеў, што футбаліст тут ні пры чым, што ўся справа ў ёй, а з ёй размаўляць немагчыма — яна прывыкла рабіць усё так, як ёй хацелася, яна прывыкла ўсё вырашаць сама, і ніхто не мог на яе паўплываць — таты ў яе не было, мама яе пару гадоў таму памерла, псіхааналітык, з якім яна штотыдзень бачылася і да якога Алег яе таксама раўнаваў, здаецца, проста не разумеў яе, таму хто мог на яе паўплываць, хто мог яе пераканаць? Нічога, — казаў Алег сам сабе, — яна ўрэшце сур'ёзная дзелавая жанчына, яна сама ўсё зразумее рана ці позна, яна не будзе сама сабе псаваць жыццё, усё будзе як раней, яна будзе раздзіраць маё сэрца, пасылаючы мне ўдзень любоўныя лісты, пасылаючы мне ўвечары праклёны, расказваючы мне ранкам свае сны, якія ўсё адно немагчыма зразумець — такія яны простыя і такія цудоўныя.

Прайшлі па вуліцы, павярнулі ўгору. Прайшлі інстытут, цёмныя дамы, пусты школьны двор. Спыніліся каля шапікаў. Даніла ўзяў ваду з газам. Абмываў раны, газ шыпеў так, нібы скура пачынала закіпаць.

— Ну што? — спытаў Алега.

— Ды нармальна, — адказаў той.

— Праўда?

— Так.

— Ну ладна, — Даніла дастаў цыгарэты, працягнуў брату.

Пакурылі, папляскалі адзін аднаго па плячах, разышліся.

Можна было думаць нарэшце пра раніцу пазаўчарашняга дня, пра нізкі туман, які цёплым воскам злепліваў хвоі, робячы лес нябачным і небяспечным. Цёмны каркас будоўлі стаяў на ўзлеску, пасярод поля, нібы недабудаваны лінкар, брыгада спала ў будаўнічых вагончыках, Алег ляжаў разам з усімі, як сапраўдны капітан піратаў, што дзеліць з вясёлым зладзейскім калектывам кансервы, хлеб і алкаголь. Алкаголь той ноччу яны дзялілі амаль да раніцы, пасля чаго Алег разагнаў усіх спаць: выхадных, сказаў, у нас няма, заказчык сур'ёзны, грошы таксама, таму тры гадзіны на сон — і за працу, будзем далей асвойваць аб'ект. Але толькі заснуў, як яго падняў званок. Званіў Даніла. — А ты ведаў, — пачаў здалёк, — што твая знаёмая заўтра замуж выходзіць? — Знаёмая? — не зразумеў спрасонку Алег. — Знаёмая, Соня, — удакладніў Даніла, — у яе заўтра вяселле. Я тут з вакзала яе сваякоў падвозіў. З імі яшчэ хлопчык — тоўсты, мудакаваты такі. Ведаў? — Ясна, што ведаў, — запэўніў яго Алег.

Ён падняўся, хутка сабраўся, нацягнуўшы на сябе рабочую вопратку. З лесу цягнула холадам, таму вырашыў накінуць куртку. Разбудзіў брыгадзіра, папярэдзіў, што вернецца толькі паслязаўтра. Чысціў зубы ледзяной вадою, разумеючы, што перагар усё роўна не пераб'еш, а таму прыйдзецца ехаць цягніком. Ну, што за бяда, падумаў, пяць гадзін — і я дома. Пайшоў да сялян, папрасіў падкінуць да станцыі. Хтосьці пага-

дзіўся. У тумане і змроку дабраліся да вакзала. Начны ён прапусціў, наступнага заставалася чакаць дзве гадзіны. Алег сеў на лаўку і заснуў. Разбудзіў яго сяржант. Доўга распытваў пра дакументы, доўга звяраў з фота ў пашпарце, кудысьці тэлефанаваў, чымсьці цікавіўся, урэшце паведаміў, што цягніка сёння не будзе, паколькі ходзіць ён толькі па няцотных. Дамовіліся, што сяржант падкіне яго да трасы. На трасе стаяў гадзіны тры. Ніхто не хацеў браць застылага сярод туману чувака ў цяжкіх ботах і падазронай куртцы, няголенага і злога. Лёг у траву, паспаў. Патэлефанаваў Даніле, папрасіў прыехаць забраць яго. Той быў не супраць, але Алег так і не змог патлумачыць, дзе стаіць. Дакладней, ляжыць. Пасля абеду яго такі падабрала фура, кіроўца пагадзіўся давезці да бліжэйшага аўтавакзала. Нават грошай не ўзяў, такі напружаны Алег меў выгляд. На вакзале выявілася, што вячэрні аўтобус, мажліва, увогуле не паедзе — не было пасажыраў. Алег прапанаваў кіроўцу заплаціць за трох. Кіроўца адмовіўся. Алег пайшоў да таксістаў. Тыя паглядзелі на яго шчацінне, на сляды крыві і цэменту, якія ён так і не адмыў з чаравікаў, і гэтак жа пачалі адмаўляцца. Але адзін пагадзіўся. Сказаў толькі, што выехаць зможа а дзясятай: мусіць дачакацца пастаяннага кліента, што прыедзе растоўскім начным і прывязе яму нешта смачнае. Ён так і сказаў — смачнае, нібы гаворка ішла аб шакаладным торце. Алег пагадзіўся, сказаў, што пачакае. Пайшоў у буфет. Таксісты пайшлі за ім, стаялі за суседнім столікам, уважліва прыслухоўваліся да яго маўчання. А дзясятай выехалі. Ехалі павольна, час ад часу глухлі. Кіроўца нервавaўся. Алег таксама. Праехалі першую сотню кіламетраў. Заставалася зусім нічога.

Не даязджаючы да горада, ускараскаўшыся на чарговы пагорак, машына задыміла. Кіроўца палез пад капот з такім адчаем, што Алег заплаціў яму колькі абяцаў. Далей пайшоў пешшу. Нічога, гаварыў сам сабе, пару гадзін хуткім крокам, а там метро. Раніцай буду на месцы. Спусціўся ў даліну, выбраўся ўгору.

Ішоў і адчуваў, як горад з кожным крокам робіцца бліжэйшы, усё больш адчувальным становіцца яго дыханне, усё больш прамяністымі — агні. Фуры выязджалі з ночы, дастаўляючы на рынкі ды склады свежую гародніну, марожаныя свіныя тушы, зерне, бавоўну і забароненыя лекі. У вантробах малакавозаў пагойдваліся свежае малако і злітая на складах нафта, хаваліся нявольнікі, якіх перавозілі з рынку на рынак, яны ціха напявалі журботныя песні і думалі пра тое, хто іх зрэшты выкупіць, каму яны дастануцца. Па чыгуначных каляінах кацілася бясконцая чарада вагонаў, гружаная рыбаю і лесам, і сонныя пасажыры выглядалі ў вокны, назіраючы, як сонца залівае агнём траву прыгарадаў. Па рэчышчы падымаліся баржы з вуголлем і чаўны з узброенымі камандамі, якія спрабавалі нячутна праслізнуць скрозь світальны туман непасрэдна да гарадскіх прычалаў. Сонца прабівала туман, і горад набрыньваў святлом, галасамі і гукамі, абуджаючыся са сну і адпускаючы сненні. Горад стаяў на пагорках, у міжрэччы, абмываючыся з двух бакоў. У даліне, што адкрывалася ўнізе, ужо стаялі першыя дамы працаўнікоў ды школы для іхніх дзяцей, цямнелі сцены бальніц, дзе лячыліся пракажоныя, і ззялі белай вапнаю сцены турмаў, у якіх трымалі рабаўнікоў і вар'ятаў. За імі цягнуліся карпусы трактарнага і танкавага заводаў, некананічныя цэрквы, якія забара-

нялася будаваць у верхнім горадзе, чорныя паверхні ўзлётных палос аэрадрома і засеяныя макам палі, што належалі жаночым кляштарам. За аэрадромам пачыналіся платы хлебазаводаў і мясакамбінатаў, што прачыналіся ноччу, забяспечваючы ежай жыхароў горада, далей стаялі шыбеніцы, на якіх вешалі ведзьмаў, за імі было відаць будаўнічы гіпермаркет, і ў адным з яго ангараў незаўважна для вахцёраў спалі на бетоннай падлозе, падклаўшы пад спіны шматкі кардону, пілігрымы, што цягнуліся з Поўдня, з Данбаса і Крыма, каб прыкласціся да ікон у старых саборах горада. Далей ішлі дамы з чырвонай цэглы, абвешаныя спадарожнікавымі антэнамі і таемнымі амулетамі, што адганялі з раёна ашуканцаў і цыган. Жылі ў гэтых дамах пераважна працаўнікі рынкаў ды вакзалаў, раніцай яны выбіраліся на працу, за імі выбягалі шумныя дзеці са зборнікамі псалмоў і падручнікамі па алгебры ў школьных ранцах, жанчыны заставаліся дома, займаліся гаспадаркай, пралі вопратку, шылі, варылі настойкі супраць хвароб і мужчынскай здрады, даставалі з кладовак і халадзільнікаў ежу — чырвоныя перцы, зялёныя сонцы капусты, жоўты сыр, падобны да саспелага месяца. За дахамі іхніх дамоў падымаліся дымы з фабрык і заводаў, гарэлі вогнішчы, на якіх грэлі асфальт і вываравалі вопратку сухотнікаў, і трамваі, напханыя рабочымі, сялянамі ды кур'ерамі, каціліся пад ліпамі і таполямі, разганяючы тапаліны пух, што ў гэтым годзе ўсё ніяк не асядаў, лётаючы над плошчамі.

Старыя кварталы выходзілі проста на раку, на пакаты бераг, зарослы чаротам, у якім хаваліся рыбакі, вылоўліваючы каштоўную рыбу, якая неабдумана зарывалася ў прыбярэжны глей і свяцілася адтуль,

бы крадзены срэбраны посуд. Вакол мастоў сяліліся пераважна жабракі, займаючы памяшканні былых друкарняў і фармацэўтычных складоў, прастытуткі, што здымалі танныя пакоі ў інтэрнатах інстытута чыгуначнікаў, ювеліры і перапісчыкі торы, якія сцерагліся жыць у прыватным сектары, таму сяліліся вялікімі сем'ямі ў сталінскіх дамах уздоўж праспекта. З берага на горад кожную раніцу пазіралі хворыя і бяздзетныя жанчыны, мужчыны без месца жыхарства і беспрацоўныя падлеткі. Дзеці кідалі ў ваду знойдзеных на вуліцы мёртвых птушак, і тыя сплывалі, выклікаючы сваім з'яўленнем жах у жыхароў дачных кааператываў, што цягнуліся ўздоўж левага берага, адразу за прамзонаю і могілкамі для ваеннапалонных.

Уздоўж правага берага стаялі крапасныя сцены — цяжкія і непрыступныя для ворагаў, яны падпіралі сабой узгоркі, стрымліваючы гарадскую забудову. За мостам адразу ж стаяла мытня, гарадская варта ў залатых даспехах і даішнікі з паласатымі жэзламі спынялі фуры і легкавікі, якія спрабавалі пранікнуць скрозь вароты, перарывалі тавар, старанна аглядалі багажнікі і валізкі падарожнікаў у пошуках кантрабанды і забароненай літаратуры. Саміх падарожнікаў правяралі на прадмет чумы і пранцаў, асабліва падазроных адразу заварочвалі і накіроўвалі ў каранцін, у шэрыя баракі Чырвонага Крыжа, пабудаваныя каля аўтавакзала. Раніцай ахова мела асабліва шмат працы — вылоўлівала гандляроў, якія спрабавалі пранікнуць у стары горад падземнымі хадамі і вагонамі метрапалітэна, заварочвала з прычалаў цэлыя атрады матросаў, што, не заплаціўшы мыта і не задэкларавaўшы халоднай зброі, выбіраліся ўверх таемнымі сцежкамі скрозь са-

ды і пустыры за політэхнічным. Гандлёвы люд і вандроўнікі, якія законна плацілі падаткі і траплялі-такі за вароты, падымаліся па ламанай брукаванцы альбо пракладзеным новай уладай асфальтавым пакрыцці да верхніх кварталаў. Тут было болей сонца, аднак меней зеляніны. На цесных вулачках, напоўненых рэкламай і машынамі, былі размешчаны банкі і крамачкі, кругласутачныя шапікі з тытунём і кругласутачныя аптэкі з мікстурамі. У вітрынах зялёнымі і ружовымі кветкамі гарэлі сукенкі і ўпрыгожанні, з крамаў служкі выносілі цяжкія бутэлькі з пітной вадою, спяшаючыся прынесці іх на кухні, дзе кухары ўжо распальвалі агонь, рыхтуючы для гаспадароў вытанчаныя італьянскія ды арабскія стравы. У рэстаранах і кавярнях з'яўляліся першыя наведвальнікі — тыя, што прыбылі з іншых гарадоў або не мелі магчымасці пасля начных прыгод забегчы дадому на перакус, ці тыя, што тыднямі жылі ў гатэлях і начных клубах і хацелі проста пабыць паміж людзей, ідучы на ранішні пах каньяку. У танных сталовых збіраліся студэнты, залівалі півам канспекты, даставалі з-за пазухі паляўнічыя нажы і пагражалі выпусціць вантробы выкладчыкам і дэканам, расказвалі адзін аднаму апошнія навіны і чыталі ўслых нядобранадзейныя вершы. У дарагіх рэстаранах сядзелі бізнесмены і складалі пагадненні, пускаючы сабе лёзамі для галення кроў і ставячы ёю подпісы. Жанчыны на вуліцах пахлі сном і любоўю, дзеці, бегучы ў школу, паўтаралі тыя дзівосныя гісторыі, што прысніліся ім гэтай ноччу. Крыкі іхнія ўздымаліся ў неба і трывожылі паветраныя струмені, якія ўскалыхваліся, заміралі і мянялі кірунак свайго руху.

А ўжо там, куды падымалася ранішняе свежае паветра, у сонечным агні і таполевых аблоках, стаялі цэрк-

вы, мячэці і сінагогі, якія былі здольныя ў выпадку небяспекі змясціць усіх жыхароў горада, стаялі помнікі паэтам і заснавальнікам універсітэта, ляжалі паркі, у якіх гулялі прывезеныя з Азіі і Паўднёвай Амерыкі птушкі і жывёлы, грамадзіліся тэатры, палацы, ратуша, гарсавет і цэнтральны ўнівермаг. Зранку дворнікі мылі сходы, якія вялі да помнікаў і канцэртных залаў, рэгуліроўшчыкі адчайна заварочвалі раварыстаў, што выляталі на плошчу і разганялі зграі галубоў і чырвоных крыклівых папугаяў, прафесары і дарадцы дабіраліся да працоўных месцаў, каб клапаціцца пра гэты горад, каб бараніць яго ад фінансавых рызык і цывілізацыйных небяспек. Бацькі горада выходзілі на вежы, аглядалі зверху напоўненыя сонечным пылам кварталы, лавілі ледзь адчувальны пах ракі, што прылятаў з поўдня, глядзелі, як на крыле самалёта зіхаціць рачная паверхня на поўначы, слухалі птахаў, што кружылі над імі, уздымалі погляды ўгору і прасілі святых аб міласці і заступніцтве. Святыя стаялі ў сіняй нябачнай прасторы, за струменямі ветру і паветранымі ямамі, кармілі з рук птаства, прыслухоўваліся да галасоў знізу, адказвалі бацькам горада прыкладна так:

— Мы робім усё, што ад нас залежыць. А залежыць ад нас далёка не ўсё, таму і спадзявацца трэба не толькі на нас. Большасць жыццёвых бязладзіц і душэўных сумневаў паходзяць ад нашага нежадання штодня падзяляць нашы ўчынкі на добрыя і дрэнныя. Мы маем нашу любоў, але не заўсёды ёю карыстаемся. Мы маем страх і давяраемся яму больш, чым патрэбна. Жыццё мае толькі два шляхі: адзін вядзе ў рай, другі — у пекла. Праўда, у многіх месцах яны перасякаюцца.

МАРЫА

Майстэрню зладзілі ў падвале ЖЭСу. Ніякай шыльды, але каму патрэбна, той ведаў: паварочваеш ад метро, знаходзіш патрэбны дом, ныраеш у цагляную браму і бачыш у сцяне чорныя жалезныя дзверы. Далей альбо грукаеш, альбо тэлефануеш. У майстэрню занеслі праціснутую канапу, на якой спалі працаўнікі, калі не здараліся заказы. Сярод пакоя цямнелі варштаты, уздоўж сцен туліліся сталы, загрувашчаныя банкамі, шчоткамі, сухімі анучамі, пэндзлямі і алоўкамі, а яшчэ выцертым наждаком і тупымі складнымі нажамі з надломанымі лёзамі. Пад столлю разгойдвалася магутная лямпа, на сценах віселі пажоўклыя заводскія плакаты і некалькі ганаровых грамат, атрыманых за поспехі ў грэка-рымскай барацьбе. У майстэрні пахла фарбаю, лакам і старым дрэвам, а яшчэ чужымі памяшканнямі, з якіх прыцягваліся сюды для рамонту і рэстаўрацыі фатэлі, крэслы, шафы і кніжныя паліцы.

Зранку ў майстэрні адчыняліся вокны, што выходзілі на двор, зарослы травою ды дзікім часнаком. Па-

мяшканне напаўнялася паветрам і глухімі гукамі вуліцы. Таксама на падворку раслі пакручаныя яблыні, пад імі працаўнікі змайстравалі дзве лаўкі, на якіх таксама можна было спаць. Яшчэ далей, за дрэвамі, стаялі пакінутыя прыбудовы, зрэшты, прабіцца туды з-за плюшчу і травы было не так проста. А ўжо за імі ўзвышалася цагляная сцяна, частка былых будынкаў, у свой час зруйнаваных і забытых. Сцяна абрывалася на шырокую вуліцу, якая цягнулася ўгору, уздоўж політэхнічнага, у бок цэнтра. Летам квартал зусім пусцеў і двары стаялі ціхія, як цэрквы ў панядзелак. Працы станавілася ўсё меней, рабочыя слухалі радыё на мабільных тэлефонах.

Марыа працаваў тут з зімы. У сакавіку памяшканне было волкае, снег ляжаў пад вокнамі да сярэдзіны красавіка, і яны з напарнікам закусвалі ім — цёмным і цвёрдым — віно з папяровых пакетаў. Напарнік, Яша, працаваў у майстэрні ад самага пачатку, шэфа памятаў з васьмідзясятых — разам працавалі на роварным, разам пайшлі ў вольнае плаванне, потым шэф сеў, Яша яго верна чакаў, як марачка на пірсе, гадоў дзесяць таму, у пачатку двухтысячных, шэф адбіў падвал і зладзіў у ім рэстаўрацыйную майстэрню. Сам знаходзіў заказчыкаў, сам нешта перакупаў, завозіў ноччу вылаўленыя рэчы, прыходзіў ранкам з падазронымі кліентамі, легкадумна ўздымаў цану на старыя камоды, з кімсьці сазвоньваўся, кагосьці пазбягаў, мала з кім сябраваў, мала каму падабаўся, мала гэтым усім пераймаўся. Усю працу рабіў Яша, які меў залатыя рукі і жалезную печань. Гады, зрэшты, не рабілі яго маладзейшым, і Яша заказаў сабе памагатага. Шэф чужых не браў, хоць і сваім не давяраў. І тады яго блізкі прыя-

цель, Коля, параіў ім свайго пляменніка, Марыа. Сказаў, што на працу лепш браць знаёмых: яны прынамсі не будуць уступаць у прафсаюзы. Шэф пагадзіўся, часта гаварыў потым, што зрабіў добрую справу, але гаварыў так, быццам шкадаваў аб здзейсненым. Марык, — звяртаўся ён да новага падмайстра, — трэба заўсёды шанаваць бацькоў. Нават калі іх у цябе няма. Марыа сапраўды рос без бацькі, які ў свой час выехаў з нарыхтоўчай брыгадай на Поўнач і не вярнуўся, таму выхоўвала яго мама як умела і магла, то-бок ніяк. У найбольш адказныя моманты дапамагаў дзядзька Коля: ён адмазаў пляменніка ад войска, ён дапамог яму ўладкавацца на завочнае аддзяленне, ён час ад часу падкідаў працу. Але ставіўся да малога з падазронасцю, трымаючы на адлегласці. Марыа гэта разумеў, таму ў свае трыццаць давяраў толькі лёсу. Хоць даверу той яўна не заслугоўваў.

Праца не была цікаваю, але і асаблівых высілкаў ад падмайстра не патрабавала: Марыа цягаў мэблю, пакрываў лакам дэталі, зачышчаў дрэва. Калі шэф выбягаў па справах, Яша ішоў па віно, а Марыа валяўся на канапе і гартаў старыя газеты, здзіўляючыся прачытанаму. Крама з віном знаходзілася насупраць майстэрні, умураваная ў заводскую прахадную. Яшу там ведалі і не любілі. Да вучня свайго Яша ставіўся з педагагічнай пяшчотай, нават па віно бегаў сам. Выпіўшы, майстар многа расказваў пра жыццё, Марыа слухаў няўважліва, а пачутаму не надта верыў, таму што калі верыць Яшу, выходзіла так, што ў свеце не заставалася жанчын, з якімі ён не спаў, і мужчын, з якімі ён не піў. На працу Марыа прыходзіў у кедах, перапэцканых лакам, шырокіх белых джынсах, гэтаксама залітых каля-

ровай хіміяй, і валанцёрскіх швейцарскіх футболках, якіх яго мама трымала дома цэлую калекцыю. Меў спакойны, крыху замкнуты характар і добрую натуру, працай не пераймаўся, даўно б вызваліўся, калі б не Коля. Колю ён баяўся, Коля прыгнятаў яго сваёй назойлівай абыякавасцю. З усім іншым у Марыа праблем не было: сяброў не меў, з мамай жыў разам, але размаўляў рэдка, паколькі нічога новага мама яму не распавядала, а са старога і даўно вядомага яму мала што падабалася. Любіў спаць удзень, падчас сіесты яму звычайна снілася нешта экзатычнае і пагрозлівае — змеі з галовамі жанчын, лісы, што спявалі опернымі галасамі, дамы ў агні і рэкі, над якімі лёталі цмокі. Прачнуўшыся пасля абеду, ён вылазіў праз акно на двор і сядзеў на лаве. Яго акружалі сабакі, зрэшты, без асаблівага жадання — што можна ўзяць з такога дзіўнага тыпа, які пахне лакам і дрэвам, што ў яго можа быць у кішэнях, акрамя цвікоў, матузкоў, падобных да кулямётных набояў металічных адвесаў і вострых цыркуляў? Часам Марыа заставаўся працаваць ноччу. Уключаў настольныя лямпы, і ў пакой адразу ж цягнуліся казуркі і жукі, апякаючыся і падаючы на падлогу. Марыа блукаў па пакоі, і жукі весела, як арэхі, храбусцелі пад яго нагамі.

Той ноччу ён таксама не спаў, трымаючы ў сабе гэты стан доўгай бессані, стомы, што прыходзіла раніцай, адчуванне непрывязанасці да руху планет у нябёсах. Да трыццаці гадоў ён навучыўся радавацца часу, які мінаў, і не шкадаваць, што ён мінае так хутка. Звычкі яго даўно выпрацаваліся, неспакой рассмактаўся, залежнасці зрабіліся выразнымі. Летам асабліва востра хацелася не засыпаць, зберагаючы ў сабе прывіднасць і часовасць усёй цемры свету. Недзе а шостай раніцы

Марыа канчаткова страціў арыентацыю ў часе: сонца ўжо стаяла над дрэвамі, але і месяц гэтак жа вісеў уверсе, адчуванне было такое, што горад даўно прачнуўся і ўсе займаюцца важнымі справамі, ад чаго Марыа ахапіў незразумелы неспакой, нейкае прадчуванне, быццам планеты выстраіліся над ім, намякаючы на пачатак чагосьці важнага ў яго жыцці, чагосьці, што мусіць пачацца менавіта ў гэтыя дзіўныя дні, у канцы чэрвеня, калі сонцы і месяцы множацца і хаваюцца ў паветры, як лісы ў цёплай траве. Ён зачыніў вокны, выйшаў на вуліцу, дастаў тэлефон, каб паглядзець, які час. Якраз тады яму затэлефанаваў Коля.

Коля гандляваў гароднінай, меў два кіёскі на Конным, два ў цэнтры. У адным з іх працавала мама Марыа. У пачатку лета паспрабаваў адкрыць яшчэ адзін, пяты, і прагарэў. Ад нерваў села падстраўнікавая. Да лекараў Коля вырашыў не звяртацца, традыцыйна лечачыся алкаголем. Учора раніцай пацягнуўся на вяселле да дачкі адной сваёй аднакласніцы, што пару гадоў таму памерла, пакінуўшы пасля сабе добрую памяць і дарослую наследніцу. Вітаў маладых, гаварыў пра сямейныя абавязкі, чапляўся да жанчын, сварыўся з мужчынамі. Ноччу яго скруціла. Апынуўся ў бальніцы. Злаваўся. Сварыўся з доктаркай. Толькі тая пайшла, набраў пляменніка.

— Марычак, — асцярожна і суха падбіраў словы ён, каб не здацца занадта бездапаможным, — гаварыць не магу, тут спяць. Зрабі так: схадзі да мяне, ключы ў цябе ёсць, вазьмі зубную шчотку, вазьмі брытву, вазьмі фен, вазьмі хатні абутак, вазьмі ручнікі, бялізну, часопісы, грэлку, карты (я зараз пра ігральныя кажу, ты разуме-

еш), міску, лыжку, набор нажоў, некалькі свежых кашуль, гальштукі, насоўкі, чайнік, тэрмас, тостар.

— Вы што, пераязджаеце? — перабіў яго Марыа.

— Я ў палаце, — жорстка адказаў Коля.

Марыа спалохаўся. А Коля працягнуў:

— Мяне проста з вяселля забралі. Ноччу. Нават пераапрануцца няма ўва што. Давай, Марычак, давай, — холадна ціснуў ён на пляменніка, — варушыся, варушыся.

Нервовасць перадалася Марыа. Коля ўмеў напружыць, любіў трымаць усё пад кантролем, плёў сістэму роднасных стасункаў, як ліпкую павуціну, і страшэнна крыўдзіўся, калі камусьці здаралася вырвацца з яго далікатных учэпістых абдымкаў. Шмат гаварыў пра родных, гаварыў у цэлым добра, але ставіўся да іх прыгэтым як да вінаватых.

Жыў Коля ў двухпавярховым будынку непадалёк, яму належаў увесь першы паверх. Дом стаяў у глыбіні двара, з вуліцы яго нават не было відаць. Сцены прапускалі вільгаць, балконы правісалі, столь магла даўно абваліцца, аднак трымалася на нейкіх нябачных мацаваннях і падпорах. Па пакоях Коля ўмела расстаўляў вёдры і рондалі, нібы мудрагелістыя пасткі, у якія спрабаваў злавіць каштоўныя дажджавыя кроплі. З часоў савецкай улады ў доме жылі чатыры сям'і. Колева сям'я займала два пакоі на першым паверсе, побач з імі жылі Паўлавы: Паўлаў-тата, інжынер, Паўлава-мама, таксама інжынер, ды іхняя дачка — істэрычка і інтрыганка. Наверсе, непасрэдна над імі, жыў Шалва Шотавіч — грузінскага роду, начальнік цэха на Шаўчэнка, самотны джыгіт з кучай сувязяў. У другім кутку на тым жа паверсе жылі старыя бальшавікі, Коля іх

адрозніваць так і не навучыўся. Мажліва, яны проста добра канспіраваліся. У пачатку дзевяностых Паўлавы выявіліся габрэямі і з'ехалі. Кватэру за капейкі прадалі Колю. Бальшавікоў станавілася ўсё меней. Урэшце засталася нейкая бабулька. Адчувала сябе не лепшым чынам. Час ад часу, убачыўшы сябе ў люстэрку, пужалася. Коля яе падкормліваў. Шалва таксама з'ехаў. Але кватэру не прадаў. Час ад часу, раз у два гады, прылятаў аднекуль з Гамбурга, дзе працаваў у порце. Праветрываў пакоі, сядзеў вечарамі з Колем, распавядаў пра новы побыт, не скардзіўся, хаця Коля ўсё роўна яго суцяшаў. Кватэру Шалва прадаваць адмаўляўся, незразумела чаму, нібы трымаў у запасе варыянт адступлення, ілюзію таго, што ўсё можна вярнуць, што ўсё зноў можа быць добра. Да таго часу Коля застаўся адзін: бацькі памерлі, сёстры — Зіна і Марына — выйшлі замуж, нарадзілі, развяліся, але вяртацца ў сямейнае гняздо не спяшаліся. Марына выхоўвала Марыа і працавала на брата. Зіна жыла каля мора, прыязджала рэдка. Марыа бачыў у гэтым сямейны праклён: мама яго выйшла замуж, але няўдала. І цёця Зіна выйшла замуж, але таксама няўдала. Коля хаваў у халадзільніку вялікія сумы грошай, трымаў у калідорах прывезеную аптавікамі гародніну, спаў на двухмеснай канапе, раскінуўшыся і забыўшыся. З жанчынамі яму не шчасціла, ім з ім — таксама. У яго была аліўкавага колеру скура, вузкія вочы, недаверлівы цяжкі погляд, невыразная ўсмешка, жоўтыя зубы старога вулічнага пса, слабыя лёгкія і заплылае тлушчам сэрца. Сняданкі Коля гатаваў сабе сам. Усё так ці інакш мусіла скончыцца падстраўнікавай.

Ён знайшоў ключы, адчыніў дзверы, прайшоў па калідоры, трапіў у абжытыя Колем пакоі. У памяшканні гарой ляжала зеляніна і стаяў пыл, крыху рэзкавата аддавала лекамі, крыху прыглушана — гарэлай ежай. У першым пакоі над сталом вісела новая модная люстра з некалькімі лямпачкамі. Свяціла, зрэшты, толькі адна. У кутку стаялі дзве пральныя машыны. Абедзве не працавалі. У наступных пакоях стаялі шафы з новым фірмовым адзеннем і старымі дзіцячымі кнігамі. На падлозе ляжалі дываны, густа ўсыпаныя чыпсамі. Далей Марыа наткнуўся на непадключаны провад кабельнага і нявыключаны падаўжальнік з тостарам на канцы. Коля любіў хай-тэк, але былі праблемы з праводкаю. Пакоі ахутваў змрок ад зачыненых жалюзі, і паветра ўтрымлівала ў сабе столькі пахаў і застаялага цяпла, што Марыа не вытрымаў і адкрыў акно. Дастаў пакет, пачаў збіраць рэчы. Пакапаўшыся, знайшоў тэрмас, ручнікі, бялізну. Згадаў пра зубную шчотку. Ванная знаходзілася ў іншым канцы дома. Ён прайшоў пакой з канапай і двума тэлевізарамі (адзін паказваў, на другім быў гук), прайшоў загашнік, дзе Коля трымаў швабры і паляўнічую стрэльбу, выйшаў у прахадны пакой, які выводзіў непасрэдна на прасторную занядбаную кухню, у куце якой, адгароджаная кітайскай каляровай шырмай, стаяла вялікая модная ванная, усталяваная на чатыры цагліны. Колеву кухню ён любіў, тут заўсёды можна было знайсці нешта цікавае — як не ў халадзільніку, што час ад часу выключаўся сам па сабе, то ў старым бабуліным стале, дзе Коля трымаў ласункі і снатворнае. А яшчэ тут стаялі валізкі з часопісамі, кардонныя скрынкі з Колевымі шкарпэткамі і пакеты з супермаркетаў.

Акно было завешана важкім аксамітам, падобным да сцяга, гэта рабіла навакольнае бязладдзе таямнічым, таму Марыа і зайшоў сюды ў прадчуванні таямніц і загадак. А зайшоўшы, тут жа іх і ўбачыў: у ваннай, павярнуўшыся да Марыа спінаю, стаяла юная незнаёмка і марна спрабавала разабрацца з гарачай вадою. Шырма была ледзь адсунута, незнаёмка, падобна, гасцей не чакала. Марыа замёр, зрабіў паўкроку назад, адступаючы за дзверы, і зноў вызірнуў. Святло прабівалася праз дзіркі ў аксаміце, выхопліваючы з прыцемкаў колеры і адценні. На халадзільніку спявала радыё, круцілі нешта надрыўнае, два хрыпатыя жаночыя галасы расказвалі пра цяжкі лёс дзяўчыны з невялікага партовага мястэчка, якая рана зведала журботы і расчараванні. Незнаёмка ў ваннай нават не пачула, што нехта ўвайшоў, стаяла на дыбачках, цягнучыся да нікеліраванай італьянскай насадкі, якую Коля пераматаў уверсе сіняй ізаляцыйнай стужкай, і пагойдвалася, слухаючы сумных жанчын, нібы ў песні гаворка ішла менавіта пра яе жыццё. — У мястэчку, дзе я жыла, — заводзіла першая жанчына, — не было ніякіх забаў, толькі штодзённае бухалава і вечаровы трах у парку культуры, белыя дымы заводаў, чорныя вочы рабочых і зладзейская маліна за начным ліманам. — Так-так, — падпявала ёй другая жанчына, — ніякіх атракцыёнаў, толькі сухое паўднёвае віно і любоў пад выпаленым накіпам зеляніны. І чорныя вочы малатабойцаў, і свежая маліна нядзельных кірмашоў. Марыа вызіраў, спрабуючы лепей разглядзець незнаёмку. Была яна невысокай і тонкай, мела доўгія цёмныя валасы, цяжкія ад вады, падымалася на пальцах, напружваючы цягліцы, але ўсё роўна нічога не магла

дастаць, таму і пагойдвалася так горка, робячы і без таго не надта вясёлую песню зусім безнадзейнай. — Усе ў мястэчку лічылі мяне курвай, — плакала першая жанчына ў радыё, — усе зневажалі мяне за фарбаваныя кудзеры, за залаты ланцужок на безабароннай шыі. І кожны фраер намагаўся зазірнуць мне пад сукню, дакрануцца да майго сцягна ў цемры кіназала. — Сапраўды-сапраўды, — працягвала другая, — чорныя ніткі ў яе валасах тонка свяціліся ў цемры кіназала, і засмучаныя мужчыны праводзілі яе позняй парою, аліўкавымі вечарамі, летуценна заглядаючыся, як цёплай бронзай адсвечвае яе скура. — Але яны любілі яе, — дадавала другая жанчына, быццам нешта важнае, — за яе легкадумнасць і бесклапотнасць. Марыа слухаў і глядзеў. Лыткі ў яе былі стройныя і бязважкія, сцёгны — мяккія, скура — цёмная, так, нібы яна шмат працавала на вінаградніках, шмат хадзіла пад сонцам, не хаваючыся ад ветру і дажджу. А першая жанчына працягвала: неяк, — гаварыла, — я сустрэла яго на святочнай плошчы нашага мястэчка. Быў ён сапраўдным гангстарам, чысціў лохаў па трамваях, ніколі не расставаўся са сваёй фінкаю, перастрэлкі, тайнікі, такія справы, і менавіта яму я аддала сваё сэрца, такое вось каханне. Але ён кінуў мяне, аднойчы рушыўшы па этапе, пакідаючы мяне сам-насам з жорсткай рэальнасцю. — Каханне-каханне, — падхоплівала другая, — рабіла святочнымі яе дні, калі раніцай яна выбягала на плошчу, і мужчыны біліся на нажах за права купіць ёй букет палявых кветак. Але толькі адзін з іх адкрыў яе сэрца — радаснае, як роварны замок, і забраў адтуль таемную спружыну, пазбавіўшы яе голасу, забраўшы яе радасць. І дзе ён цяпер, якімі трамваямі дабіраец-

ца зараз дадому, чаму не прыйдзе і не забярэ яе? Яна перакінула валасы сабе на грудзі, і Марыа разглядзеў некалькі ледзьве прыкметных радзімак на яе спіне, разглядзеў яе далікатныя пазванкі, што востра выступалі з-пад скуры, як азёрныя камяні, паднімаючыся ўгору, трымаючы яе неадчувальную вагу, разглядзеў яе зусім дзіцячыя лапаткі, не мог адвесці ад іх вачэй, зачаравана назіраючы, як яны рухаюцца, як яны заміраюць, разглядзеў яе ключыцу, яе шыю. — І з тае пары, — нагадала пра сябе першая, больш сумная жанчына, — я прыходжу кожны вечар да гэтага бара, што крышуецца мусарнёю, і прадаю сваю любоў грузчыкам і паштарам — усім, хто згаджаецца заплаціць за яе хоць нешта. Бо нічога ў гэтым жыцці не даецца проста так, і за ўсё трэба плаціць. І аплачваючы салодкае каханне, мы звычайна атрымліваем толькі сляды на вадзе, толькі блакітную фарбу, размазаную па твары. — І аплакваючы каханне, — тут жа падтрымала яе другая, — мы плацім удзячнасцю ўсім паштарам, якія не прыносяць нам дрэнных навін. За ўсё трэба плаціць, кожны вечар і кожную ноч, і нашы слёзы — толькі сіняя фарба паветра, блакітныя сляды на вадзе, золата нашай радасці, срэбра нашага маўчання. Песня адразу абарвалася, халадзільнік хіснуўся і замёр, незнаёмка рэзка павярнулася і паглядзела яму ў вочы.

Спачатку яго кінула ў жар, потым лёд скаваў яго рухі, потым ён зразумеў, што ўвогуле не адчувае свайго цела. А незнаёмка ўжо ўсміхалася яму, як старому знаёмаму, і, знайшоўшы цёплы белы ручнік, нядбайна прыкрылася ім, нічога насамрэч не хаваючы, ступіла на размоклы рыпучы паркет, падышла да Марыа і лёгка падала руку.

— Прывітанне, — сказала, адкідаючы валасы за спіну. — Ты Марык?

— Марык, — успомніў ён уласнае імя.

— А я Насця, — патлумачыла яна, — дачка цёткі Зіны.

У бальнічным калідоры Марыа давялося пачакаць: у палаце доктарка якраз тлумачыла Колю, што лекі трэба піць. Коля незадаволена супраціўляўся, нават спрабаваў адкупіцца, прапаноўваў доктарцы грошы, каб тая яго адпусціла. Доктарка крыўдзілася, тлумачыла Колю, што яго тут ніхто не трымае, што лячэнне — справа добраахвотная, калі ты, вядома, не шызафрэнік. Тады крыўдаваў Коля, крычаў, што за тыя паўдні, пакуль яны таргуюцца, ён паспеў бы прадаць паўфуры бананаў. Доктарка пачынала плакаць, Коля прасіў прабачэння і спрабаваў засунуць ёй купюры ў кішэню халата, доктарка вымагала, каб ён лёг і не бегаў за ёй з кропельніцай у руках. Урэшце яна пайшла, кінуўшы ў калідоры на Марыа заплаканы позірк. Марыа зайшоў у палату. Коля ляжаў ля акна ў белых мятых штанах і нясвежай кашулі. Пад ложкам валяліся дарагія брудныя чаравікі. Выгляд у яго быў стомлены, твар, і без таго прыпухлы, пасля ўчарашняга святкавання наогул ацёк і набыў лімонавых адценняў. У Колі было тугое пуза і караткаватыя ногі, увогуле пляменніку ён нагадваў адмоўнага персанажа якога-небудзь індыйскага фільма. У індыйскім кіно такія героі звычайна злоўжываюць уладай. І цярпеннем гледачоў. Коля і цяпер, з іголкай у вене, выклікаў не так спачуванне, як страх: што, як выжыве і пачне помсціць? У палаце з ім знаходзіліся яшчэ трое: адзін інтэлігентны, у аку-

лярах, ляжаў якраз насупраць Колі, чытаў газеты, грыз печыва; каля яго рабацяга, відавочна з завода — рукі ў мазуце, пад вачыма мяшкі, на століку пры ложку кіпяцільнік, быццам ён менавіта ім і лячыўся; а побач з рабацягам пацан у аранжавых шортах, доўгіх белых шкарпэтках, падобных да гольфаў, у паласатай футболцы, з навушнікамі на галаве — ляжаў, слухаў музыку, ні з кім не загаворваў, на правакацыйныя пытанні не адказваў. Можна было падумаць, што ён проста зайшоў паляжаць, адпачыць, паслухаць улюбёную музыку. Марыа адразу адзначыў, што Коля сябе ўмела паставіў: усе трое кідалі на яго час ад часу насцярожаныя погляды, чакаючы, што ж ён прыдумае ў наступны момант, на каго наедзе, адкуль чакаць небяспекі. Марыа за гэта і пабойваўся дзядзькі: ніколі нельга было зразумець, які ў таго настрой, калі ён жартуе, калі збіраецца заехаць табе ў калена. Коля пільна вывучаў суразмоўцу скрозь вузкія шчылінкі вачэй, гаварыў так, нібы рабіў заказ у рэстаране — і слухаць не хацелася, і перапыніць было нельга. Размаўляў ціха, ты заўсёды мусіў прыслухоўвацца да яго слоў, быць уважлівым, каб чагосьці не прапусціць. Пабачыўшы Марыа, падняўся, вышмаргнуў іголку з вены, прыляпіў яе пластырам да кропельніцы.

— Прынёс? — спытаў спакойна, быццам гэта не ён толькі што тут браў на понт доктарку.

— Прынёс, — адказаў Марыа.

— Што там? — зноў спытаў Коля, маючы на ўвазе, відавочна, нейкія хатнія навіны.

— Зіны дачка прыехала, — адказаў Марыа, не ведаючы, як пра гэта казаць: з радасцю ці наадварот — з дакорам і агідаю.

Коля ўзяў адзін з пакетаў, вываліў з яго ўсё на ложак. Павольна, не спяшаючыся, сцягнуў з сябе кашулю, потым штаны. Кінуў усё гэта ў пусты пакет, перадаў назад Марыа. Пачаў апранацца ў чыстае. Марыа адзначыў, што Коля быў загарэлы да пояса, аднак меў бледныя сінюшныя ногі, нібы хтосьці ўзяў розныя часткі і склаў разам такога вось Колю, і цяпер засталося хіба што запампаваць у яго трошкі крыві, і можна будзе адпускаць на вуліцу. Коля нарэшце загаварыў.

— Насця, — сказаў, — і праўда: яна павінна была ўчора прыехаць. Як я забыў, — ён змоўк, пазіраў у акно, засунуўшы рукі ў кішэні. Потым павярнуўся. — Вось што, Марык. Прыглядзі за ёй, пакуль мяне не будзе. Добра?

— Добра, — адказаў Марык. — Што за ёй прыглядваць? Не маленькая.

Марыа заўважыў, што Коля сціскае ў кішэнях кулакі.

— Не маленькая, — адказаў пляменніку, стрымаўшыся, — а ўсё адно прыглядзі. Добра?

— Добра, — супакоіў яго Марыа.

— Я табе давяраю, — сказаў Коля, і Марыа адчуў, колькі злосці было ў гэтых словах. — Купі ёй што-небудзь на вячэру.

Ён дастаў з-пад падушкі пачак грошай, перахоплены гумкай для валасоў, адлічыў некалькі купюр, перадаў Марыа. Уваткнуў іголку ў вену, лёг і незадаволена сказаў:

— Мы ўсе — адна сям'я. У сям'і галоўнае што? Давер. Запомніў?

Было незразумела, іранізуе ён ці гаворыць сур'ёзна, але Марыа на ўсялякі выпадак кіўнуў. Калі выходзіў, заўважыў, што пацан з навушнікамі глядзіць на яго са спачуваннем.

На вуліцы спыніўся і доўга ўсё абдумваў. Зайшоў у кругласутачны праз дарогу, купіў марожанай рыбы. Выйшаў на вуліцу. Потым вярнуўся і купіў пакет віна. Выйшаў. Зноў вярнуўся — узяў яшчэ пакет. Падумаў, успомніў жоўты Колеў твар, аддаў пакет назад. Прыгатую ёй рыбу, падумаў, і пайду. Калі прыйшоў да Колі, сястра бегала па кватэры і спрабавала прыбрацца. Была ў лёгкай кароткай сукенцы. Марыа заўважыў, як яна падобна да сваёй мамы: чорныя валасы, яркае адзенне. Брату ўзрадавалася, доўга і весела абдымалася. Ад яе пахла дзіцячым шампунем. Рыбу кінула ў мыйку на кухні, сказала Марыа пачакаць: яна, маўляў, зараз нешта прыгатуе, галоўнае — разабрацца, што тут у дзядзькі Колі прыдатнае для ежы, а чаго лепей не чапаць. Доўга корпалася ў халадзільніку, выцягвала адтуль застылыя, як халодны цэмент, пакеты з малаком, кавалкі мяса, што колерам нагадвалі нячышчаныя чаравікі, падазроныя банкі з хатнімі саленнямі, падобныя да вядзьмарскіх прыпраў. Выкідвала ўсё гэта ў вёдры са смеццем, заглядвала ў шуфляды стала, станавілася на крэсла і выбірала нешта з верхніх паліц, прасіла Марыа падысці і ўзяць у яе з рук цукар, мёд і марскую соль. Марыа падыходзіў, асцярожна пазіраў на яе знізу, свет яго поўніўся марской соллю, і слёзы выступалі на вачах ад таго, што ён бачыў. Насця нагружала яго соусамі і кансервамі, шнырыла па кухні, нарэшце скінула ўсё гэта на стол і паспрабавала даць рады са знойдзенымі запасамі. Тут Марыа выйшаў з забыцця і пачаў адбіраць у яе кухонныя нажы. Сказаў, давай, малая, ідзі чытаць коміксы, я сам усё прыгатую. І пайду. Мне, сказаў, сёння яшчэ на працу.

— Ты хоць гатаваць умееш? — спытала Насця.

— Кепска, — адказаў Марыа, згадваючы, як нядаўна варыў у майстэрні для напарніка клей і ледзьве не спаліў дом.

— Я цябе навучу, — прапанавала Насця, зноў беручы ўсё ў свае рукі. — Тут усё проста. Галоўнае — спецыі.

Яна даставала рыбу і гародніну, траву, цёмна-чырвоныя парашкі і тоўчаныя карані, усё гэта змешвала і пераціралa, старанна наразала і дробна прасейвала, скідаючы ў вялікі рондаль, які неўзабаве пачаў закіпаць і набываць нябачаныя колеры. Марыа стаяў у яе за спінаю і думаў пра Колю. Успамінаў, што той гаварыў пра давер, спрабаваў здагадацца, што менавіта ён меў на ўвазе. Не зусім разумеў, як паводзіць сябе з сястрой, сумняваўся, ці не пайсці яму ўжо цяпер. Але зноў успамінаў пра Колю і заставаўся на месцы. Каб абстрагавацца, спытаў Насцю, дзе тая навучылася гатаваць. І пачуў цэлую гісторыю. Расла Насця ў прыморскім горадзе, паміж заводам і портам. Жылі яны з мамай у заводскім інтэрнаце. Таты ў іх не было, таму калі мама збягала на працу, Насцю даглядалі суседкі. А суседкі нашы, расказвала яна, былі сапраўдныя ведзьмы. Яны і навучылі Насцю кухарыць, навучылі прымяняць розныя падазроныя прыправы, ад чаго ежа станавілася пажыўнай, хоць і не заўсёды ядомай. З дзяцінства яна запомніла безліч смакаў і пахаў, мёртвых птушак на кухні і халодны падвал, абжыты слімакамі і напоўнены восеньскай гароднінай. Аднойчы суседкі выпадкова зачынілі яе ў гэтым падвале. Яна сядзела там да вечара, пакуль не прыйшла мама. З тых часоў, сказала Насця, я зусім не баюся цемры.

Я таксама не баюся цемры, адказаў Марыа і тут жа ўспомніў, як яму давялося начаваць у гэтай кватэры. Коля паклаў яго ў калідоры на раскладушцы, сам доўга засынаў на канапе, цяжка варочаўся ў сне, размаўляў і прачынаўся, канапа рыпела пад ім, як акардэон. Марыа прыслухоўваўся да Колевага шуму, вылічваў інтэрвалы паміж яго ўскрыкамі, а потым нечакана заснуў. Прачнуўся, падняў галаву і адразу ўбачыў Колю. Той стаяў на кухні, каля акна, зусім без адзення, і пільна ўзіраўся ў чорна-лімонавую ноч. Месячнае святло рабіла яго скуру зялёнай, а чэрап бліскучым. Дыханне яго было цяжкім і драпежным. Ён стаяў нерухома. Потым развярнуўся і рушыў назад у пакой, у цемры не звяртаючы ніякай увагі на Марыа. Ступаў насцярожана і важка. Паркет пахрусткаў, як першы снег пад лапамі зомбі, што выйшаў на паляванне.

Насця расклала ў глыбокія талеркі тое, што зварылася. Пайшла ў суседні пакой. Села на дыван, паставіла посуд перад сабою. Марыа з віном пасунуўся следам, разарваў пакет, віно выбухнула ў яго руках, заліваючы дыван, усмоктвалася ў тоўстую паверхню, кранала ліній і руйнавала сіметрыю ўзораў. Марыа прыбег з сурвэткамі і прыняўся вылізваць гэты чортаў дыван, але Насця спыніла яго, сказала: супакойся, я потым адчышчу, я ведаю адзін таемны спосаб, яшчэ старажытнаіндыйскі, як чысціць кітайскія сінтэтычныя дываны. — Старажытнаіндыйскі? — засумняваўся Марыа. — А адкуль ведаеш? — У нас, — патлумачыла Насця, — часта спыняліся замежнікі. Пераважна маракі і гандляры бурштынам. Яны мяне і чытаць навучылі. Я ўвогуле спачатку вывучыла эсперанта, толькі потым расейскую. Ты ведаеш эсперанта? — спытала,

папраўляючы валасы і абцягваючы сукню. — Дрэнна, — адказаў Марыа.

А сам успомніў, як Коля ўзяўся «вырашаць справы» з нейкімі палякамі, а ён, Марыа, павінен быў весці з імі тэлефонныя размовы. Размаўлялі англійскай, Коля яго і выклікаў як носьбіта англійскай. Аднак гаварыў Марыа кепска, палякі гаварылі яшчэ горш, Марыа іх амаль не разумеў, а тое, што разумеў, Колю яўна не падабалася. Ён стаяў побач з пляменнікам, глядзеў на яго холадна і адчужана, пастаянна перапытваў, злаваўся, ад чаго Марыа панікаваў і разумеў яшчэ менш. Урэшце Коля адабраў у яго слухаўку, злосна растлумачыў усё, што пра яго думае, і ўзяўся весці перамовы сам. Потым паказваў Марыа рахункі за тэлефонныя размовы, нібыта спіс яго, Марыа, дзіцячых грахоў. Давер, думаў Марыа, а як жа.

Пра ежу неяк забыліся, Марыа сядзеў і ўспамінаў усе жыццёвыя непрыемнасці, думаў пра давер і легкадумнасць, думаў пра тое, што яму наогул нячаста даваралі, і ад гэтага яму рабілася яшчэ больш прыкра і несуцешна. Яна сапраўды падобна да сваёй мамы, падумаў. І да маёй таксама. Усе жанчыны ў нашай сям'і чымсьці падобныя — яны так многа гавораць, што ты проста не паспяваеш ім адказваць. Таму яны думаюць, што іх усе ігнаруюць. Як і яго мама, Насця мела дапытлівыя вочы і далікатны твар. Яна гэтак жа лёгка апраналася, не баючыся скразнякоў і не адчуваючы холаду. Гэтак жа хутка падбірала патрэбныя словы, гэтак жа гучна іх вымаўляла. Якім, цікава, быў яе тата?

Насця, аднак, засумавала: брат сядзеў на крывавым дыване і думаў пра нешта сваё. На яе ўвагі не звяртаў. Ці, прынамсі, рабіў выгляд, што не звяртае. І тады яна распавяла яшчэ адну гісторыю.

— Я рана закахалася, — сказала яна. — У нас у горадзе ўсе рана ўлюбляюцца, асабліва жанчыны. Ён быў старэйшы за мяне гадоў на дзесяць. Вось як ты, — яна дакранулася да Марыа. Той няўважліва павёў плячом. — І таму ў нас нічога не атрымалася. Я пераймалася, думала, што гэта мне пакаранне за ранняе каханне. Тады ўзяла і паставіла сабе брэкеты.

— Для чаго? — не зразумеў Марыа. Давер, далей думаў ён, ну-ну.

— Для пакаяння, — патлумачыла Насця. — Каб ні з кім не цалавацца. Два гады я ні з кім не цалавалася. Два гады. Аж пакуль не зняла гэтыя штукі. А ўжо калі зняла... — закаціла яна вочы.

— Што? — перапытаў яе Марыа.

— Цяпер я цалуюся з усімі, — адказала Насця.

— З усімі?

— З усімі.

І тут Марыа нарэшце зразумеў, пра што яна кажа. Давер, падумаў ён. І толькі пасля гэтага пацалаваў сястру. І дзейнічаў настойліва. Сам не разумеў, што прымушае яго займацца такімі дзіўнымі рэчамі. Бо ён ні на хвіліну не забываў пра тое, у чыім памяшканні знаходзіцца, чые дываны тут толькі што заліў. Ні на хвіліну не забываў цяжкага Колевага позірку, сухога галасу. Памятаў, дзе той хавае нажы і заточкі, памятаў, як ён пагражае па тэлефоне, як набрыньвае ад злосці яго шэра-карычневы твар, як надзімаюцца вены на шыі, як, сварачыся, ён хрыпла дыхае, выдзьмухваючы скрозь шырокія ноздры дым і агонь. Памятаў, баяўся, аднак спыніцца не мог. Насця між тым не зусім разумела, што з ім сталася. Ёй падабалася, як ён няўмела цалуецца, падабаўся яго пах, аднак толькі ён браўся за яе

сукенку, толькі заходзіў занадта далёка, цёпла біла яго далонню па руцэ, пяшчотна адштурхоўвала, коратка і папераджальна ўскрыквала, і Марыа адкочваўся назад. Але тут жа ўспамінаў, колькі крыві і віна праліта ў гэтым доме, колькі пораху і залатога пяску спушчана ў каналізацыю, колькі смерцяў і абраз памятаюць гэтыя сцены, і зноў кранаўся яе твару, лавіў яе далоні, пазбаўляў яе адзення. Насця смяялася і адштурхоўвалася, штосьці яму гаварыла, ён нават нешта адказваў, не заўсёды даслухваючы яе пытанні. У нейкі момант яна нават пашкадавала, што зняла свае брэкеты, такі ён быў нястрымны, гэты яе старэйшы брат з усімі сваімі страхамі і даверам. Яна хапалася за яго коратка стрыжаныя светлыя валасы, адводзіла яго галаву, глядзела яму ў вочы. Тады ён зноў прыбіраў яе руку і нешта ёй нагаворваў, каб адцягнуць увагу і падабрацца бліжэй. І яна зноў дазваляла яму амаль усё, не спыняючы яго, нібы чакала нейкага сігналу. А калі гучаў гэты чутны толькі ёй сігнал, тут жа ўпіралася локцямі ў дыван, выгіналася ўсім сваім целам, выслізгвала з яго абдымкаў, адскокваючы ў цемру. Марыа аддыхваўся, супакойваўся і зноў браўся за справу. Працягвалася так некалькі гадзін. Пакуль у яе не скончылася цярпенне. Пасля гэтага ён паспешліва паклаў яе на дыван, кітайскі і сінтэтычны, а яна і не працівілася.

Што я яму скажу і як я пагляджу яму ў вочы? Ён зразумее ўсё, як толькі мяне пабачыць. Мне нават не давядзецца ні ў чым прызнавацца. Ён вырве мне глотку, думаў Марыа. Ці пераломіць мне ногі. Спачатку адну, потым другую. Будзе таптацца мне па рэбрах, зніме з мяне скальп, аслепіць мяне і адпусціць на вуліцу

жабраваць. Я буду сядзець на цёплым асфальце з паперовым кубачкам з «Макдоналдса», буду збіраць капейкі, але нават іх ён будзе ў мяне адбіраць, ссыпаючы сабе ў глыбокія кішэні. Але перад тым раскажа ўсё сёстрам — Зіне і маме. І яны давершаць тое, чаго не адважыўся зрабіць ён: пазбавяць мяне мужчынскай годнасці. У прамым сэнсе. Адрэжуць мне годнасць садовымі нажніцамі. Што ўвогуле на гэта можа сказаць мама? Што яна кажа ў такіх выпадках? Марыа думаў, але ў галаву нічога не прыходзіла. Ды і выпадкаў такіх ён не згадваў. Мама, відавочна, стане на бок пляменніцы, будзе яе супакойваць, будзе суцяшаць. Будуць сядзець разам на Колевых дыванах і прыдумляць, што з ім, Марыа, зрабіць у першую чаргу — павесіць у калідоры або ўсё ж чвартаваць на кухні. Што ж, пагаджаўся Марыа, я сам ва ўсім вінаваты, я сам усё гэта задумаў, ніхто не прымушаў мяне піць з ёй на дыванах, ніхто не прымушаў мяне слухаць яе гісторыі, ніхто не прымушаў мяне ўрэшце ў яе канчаць. У руках Марыа трымаў торбачку са сняданкам, погляд меў змучаны, на шыі — некалькі свежых драпін.

Коля сустрэў яго змрочна. Кіўнуў галавою, моўчкі забраў сняданак. Падазрона агледзеў прыгатаваную Насцяй рыбу, недаверліва прынюхаўся да зеляніны.

— Рыба? — здзівіўся. — Яна ж ведае, што мне нельга.

У палаце нешта здарылася, суседзяў Коля, падобна, запрэсаваў: інтэлігент адразу прынёс ім з Марыа два пакуначкі гарбаты, рабацяга перадаў кіпяцільнік, пацан з навушнікамі зняважліва адвярнуўся да сцяны. Коля сядзеў на ложку і глядзеў кудысьці за спіну Марыа — так што і погляд перахапіць было няможна, і вачэй адвесці не ў сілах.

— Дзеці, Марычак, — сказаў Коля з націскам, — не заўсёды нараджаюцца ў каханні. Часам яны нараджаюцца выпадкова і незапланавана. Тады жыццё іхняе напаўняецца прыгодамі і выпрабаваннямі. Пераважна выпрабаваннямі.

Пра што ён кажа? — запанікаваў Марыа. Няўжо пра ўсё здагадаўся? Чаму дагэтуль не топчацца мне па рэбрах?

— Што ты нейкі сонны? — паглядзеў на яго Коля.

— Не спаў, — патлумачыў Марыа.

— Ну, ясна, што не спаў, калі сонны, — сказаў Коля. — А чаго не спаў?

— Праца.

— Праца, — паўтарыў Коля. — Праца. Добра, калі праца е. Дрэнна, калі яе няма.

Пра што ён? — Марыа адчуў, што пацее. — На што намякае? Толькі Коля нахіліўся да пакета з ежай, Марыа хуткім рухам выцер пот, які па-здрадніцку сцякаў па твары. Зрэшты, Коля вокамгненна падняў галаву. Усё ўбачыў. Марыа адчуў, як кроў прыступіла да горла, потым яшчэ вышэй. Сядзеў перад цёмным і цяжкім Колем, сцякаючы потам і заліваючыся барваю, сядзеў і не ведаў, куды падзець рукі, як прыхаваць драпіны на шыі. Коля, не адрываючы ад яго погляду, моўчкі шнарыў рукою ў пакеце. Дастаў адтуль смажаную рыбіну. Не гледзячы на яе, пачаў жэрці. Соус застыў у кутках яго вуснаў, зеляніна наліпла на падбароддзе, вочы зусім заплылі, твар спух. Яму ж нельга, падумаў Марыа. І мне, мабыць, таксама нельга.

— Што мама? — запытаў Коля, жуючы. Жаваў павольна і старанна, як падпольшчыкі жуюць нататнікі з шыфрамі, каб не даць ворагу аніводнага шанцу.

— Нармальна, — неахвотна адказаў Марыа, ужо перакананы, што яго выкрылі і асудзілі.

— Нармальна? — не паверыў Коля, працягваючы раздзіраць рыбу жоўтымі разцамі. — Скажы, хай набярэ мяне.

Марыа кіўнуў.

— У нашай сям'і жанчыны заўсёды добра гатавалі рыбу, — сказаў Коля, прыдзірліва гледзячы пляменніку ў вочы. Гаварыў ціха, але Марыа не сумняваўся, што ў палаце яго чуюць усе. Нават пацан з навушнікамі. — Рыба патрабуе часу. У нашай сям'і жанчыны заўсёды мелі час. На іх ніхто не ціснуў. Я не ціснуў. І табе не раю.

— Я таксама не ціснуў, — сказаў Марыа пра нешта сваё.

— Не ціснуў?

— Не.

— Гэта добра, — Коля кінуў рэшткі рыбы назад у торбу, даў патрымаць яе Марыа, дастаў з-пад падушкі ручнік, старанна выцер твар. Забраў у Марыа сумку, закінуў яе пад коўдру. — Ціснуць не трэба, — працягнуў. — І хлусіць таксама не трэба.

— Я пайду, — адказаў Марыа, — у мяне праца.

Насця чакала яго, седзячы басанож на сходах. Калі ён падышоў, паднялася, развярнулася і знікла за дзвярыма. Марыа паспяшаўся следам.

Ноччу яна прачнулася, лёгка, каб не абудзіць, прыбрала яго руку, паднялася, не апранаючыся, адкрыла сваю валізу, што стаяла тут жа, на падлозе ў Колевай спальні. Знайшла нейкія таблеткі, запіла іх віном. Марыа прачнуўся, дакрануўся да яе скуры. Насця скаланула-

ся, хутка супакоілася, вярнулася да яго. Ён лёг падбародкам ёй на калені, ляжаў на жываце, разглядаў яе валізу, дакранаўся да розных яе рэчаў. Усё залежыць ад нас, думаў, усё залежыць ад нашага жадання. Цяпер нічога не зменіш, далей будзе толькі так. Ён даставаў кнігі, гартаў іх. Гэта былі падручнікі хіміі ды дэтэктывы. У дэтэктывах звычайна выкарыстоўваліся атруты, па-свойму гэта таксама былі падручнікі хіміі. Даставаў яе вопратку, адчуваў, якая яна жорсткая навобмацак. Насця маўчала і не пярэчыла. Потым дастаў іконку. На ёй была выява святой. З цёмным тварам і ў яркім адзенні.

— Хто гэта? — запытаўся Марыа.

— Святая Сара, — патлумачыла Насця.

— Што за імя такое? — здзівіўся ён. — Габрэйка?

— Егіпцянка, — адказала яму Насця з цемры. — Была такая святая. Выратавала човен з важнымі асобамі.

— Ну, і нашто яна табе?

— Мне яе ў лагеры падарылі. Калісьці даўно, у дзяцінстве, мама адправіла мяне ў каталіцкі лагер.

— Навошта? — не зразумеў Марыа.

— Ну, трэба ж было мяне кудысьці на лета адпраўляць? Пакідаць мяне на лета ў порце яна не адважылася — баялася, што ўцяку. Грошай на нармальны лагер у нас не было, вось мама і адправіла мяне да каталікоў. А Сару мне падарылі на памяць. Там яшчэ надпіс ёсць, бачыш?

— І што там напісана?

— Ну, калі апусціць усе згадкі пра Ісуса і царкоўнае кіраўніцтва, там напісана, што найбольшая небяспека хаваецца ў рэках. Але і самая надзейная абарона

таксама. Таму што рэкі аддзяляюць сваіх ад чужых, адмяжоўваюць святло ад цемры і бароняць нас ад пагроз ды неспадзяванак. Трэба ўсяго толькі трымацца берага і ўмець надаваць першую дапамогу на вадзе. Ты ўмееш плаваць?

— Кепска, — Марыа нават не захацеў успамінаць, як яны з Колем ноччу выцягвалі сеткай рыбу з вадасховішча і як ён, Марыа, звaліўся ў чорную пройму вады, і Коля мусіў вылоўліваць яго, а потым адпойваць спіртам, праклінаючы на чым свет стаіць.

— А я падпрацоўвала на выратавальнай станцыі, — падтрымала яго Насця. — Надавала першую медычную дапамогу.

— Каму? — не зразумеў Марыа.

— Тым, каго ратавала, — патлумачыла Насця.

Зранку яна залатала яму падзёртыя на каленях джынсы, накарміла сняданкам, нашмаравала нейкім растворам драпіны — старыя і зусім свежыя, атрыманыя гэтай ноччу. — Балюча? — спытала. — Нармальна, — адказаў Марыа, адчуваючы, як у скуру ўваходзіць агонь. — Ладна-ладна, — не паверыла Насця, — не трэба казаць няпраўду.

Коля заўважыў яго яшчэ з акна. Вызіраў са свайго трэцяга паверха, нібы адмыслова яго чакаючы. Марыа сабраўся з думкамі, зайшоў у бальніцу. У калідоры ён сутыкнуўся з цікавым пацыентам — той стаяў ля дзвярэй, нешта напружана і нервова абмяркоўваючы, так, нібы ад кагосьці ўцёк, аднак забыўся, ад каго менавіта. За яго чапляліся студэнты-практыканты, на яго натыкаліся пажылыя наведвальніцы, яго недаверліва абыходзілі хворыя ў патрапаных халатах. У адной руцэ

трымаў белы пінжак, у другой — вялікі папяровы пакет. Убачыў Марыа, спыніў яго.

— Курыць ёсць? — спытаў. Голас у яго быў стомлены, але цвёрды.

— Не, — адказаў Марыа.

Пастаялі некаторы час, гледзячы адзін на аднаго.

— Ладна, — сказаў нарэшце пацыент, — не ссы, усё будзе добра.

Марыа падзякаваў.

У палаце ізноў нешта адбылося: пацан з навушнікамі знік, толькі ложак пасля яго стаяў непрыбраны, а інтэлігент прыхапкам кідаў свае рэчы ў чорны пакет, нікога не слухаючы і ні з кім не загаворваючы. Коля паглядаў на яго са знявагай, рабацяга глядзеў на Колю з асцярогай. Марыа выкладваў перад Колем ёгурты і малако, але той нават не глядзеў на іх, адразу ж пачаў распытваць, што там у горадзе, якія навіны, як мама, як праца. Пытаўся, ці не цісне шэф, ці не хоча Марыа звольніцца, а калі хоча, то чым думае заняцца. А калі не хоча, то чаму? Бо думаць пра такія рэчы, гаварыў Коля, трэба заўсёды: жыццё — штука знясільваючая, трэба падтрымліваць адно аднаго, асабліва калі мы адна сям'я. У нашай сям'і, цадзіў Коля, мужчыны заўжды былі ў адным бізнесе. Ніхто б нават падумаць не мог кідаць адзін аднаго, ты разумееш, Марычак? Пра Насцю не пытаўся, але Марыа адчуваў, што менавіта пра яе ён спытаць і хоча. Ну, хоча, і добра — так сабе падумаў Марыа і вырашыў не баяцца. Нічога ён мне не зробіць, вырашыў, пабаіцца. Коля распытваў, гледзячы пляменніку проста ў вочы, і Марыа не вытрымаў: злавіў яго погляд і ўжо не адводзіў вачэй, аглядаючы Колю з усёй сваёй нянавісцю і злосцю. Коля таксама перахапіў гэты

погляд і спрабаваў яго неяк пагасіць, ціснуў на малога цёмнай вагою, аднак Марыа не паддаваўся, адпіраўся і трымаўся, і Коля неўзабаве паплыў і пачаў глядзець кудысьці яму за плячо. І прыкрыкнуў на рабацягу, і перавёў гаворку на антыбіётыкі. Марыа сядзеў перад ім, упёршыся далонямі ў калені, і бачыў Колю такім, якім не бачыў ніколі раней, — пастарэлым, з пажоўклай, нібы старое фота, скураю, са згаслым позіркам, сагнутым, злосным і паламаным, нясвежым і няўпэўненым, хворым і галодным. Марыа думаў спачатку яго пашкадаваць. Ды нахуй трэба, падумаў зрэшты. Чым яны цябе тут лечаць? — спытаў. Коля падумаў, узважыў сітуацыю, загаварыў прымірэнча.

— Мяне нармальна лечаць, Марычак, — адказаў спакойна. — Проста лячыць мяне — гэта тое ж самае, што лячыць павешанага: праблемы са здароўем відавочныя, а тэрапія мала што дае. Ты сам-та як пачуваешся? — спытаў, прыжмурыўшы вока.

— Нармальна пачуваюся, — адказаў Марыа, не надта задумваючыся.

— А што за сляды на шыі? — спытаў яго Коля, як бы між іншым.

— Парэзаўся, — адказаў Марыа. — Калі галіўся.

— Ага, — з разуменнем кіўнуў Коля. — Ты цяпер штодня голішся? Глядзі, горла перарэжаш. Добра, калі хтосьці зможа надаць першую медычную дапамогу. А калі не?

Коля зноў глядзеў на яго халоднымі воўчымі вачыма. Марыа падняўся, суха развітаўся, паабяцаў перадаць усім прывітанне. Стоячы на скрыжаванні, адчуваў на сабе Колеў погляд.

— Што ён можа ведаць пра бізнес? — скардзіўся Марыа ўвечары, седзячы ў Колевай ванне. — Ён нават кіёск новы адкрыць не можа.

Насця сядзела на краі ванны ў трэніровачных шортах і цесным топе, трымала ў руках сухія ручнікі, усміхалася, слухаючы брата.

— Усё ён можа, — не пагаджалася. — Проста яго кінулі.

— Проста ён нічога не ўмее, — не пагадзіўся ў сваю чаргу Марыа. — Ён нават у карты гуляць не ўмее.

— У карты ўсе ўмеюць гуляць, — сказала Насця. — Нават я.

— Ды ладна, — скептычна адазваўся Марыа.

— Хочаш паспрабаваць? — Насця ўстала. Кінула яму ручнікі і выйшла ў калідор.

Марыа абкруціўся ручніком, пайшоў, пакідаючы мокрыя сляды. Насця сядзела з картамі на дыване. Ну, тут ужо я ведаю, што рабіць, падумаў Марыа, успамінаючы, як недарэчна паводзіў сябе ў гульні Коля. Ну, давай, сказаў Насці з усмешкаю. Тройчы прайграў. Разлаваўся. Прайграў яшчэ раз. Парваў калоду, выйшаў на кухню. Насця перачакала і выйшла следам.

— Ну, Марык, — сказала заспакойліва, — не злуй. Усё роўна ў цябе не было шанцаў. Проста я ведаю ўсе гэтыя фокусы. Я ў цыркавую студыю хадзіла.

— Сур'ёзна? — павярнуўся да яе Марыа. Падумаў, што цыркавая студыя — дастатковая падстава, каб прыняць паразу.

— Так, — запэўніла яго Насця. — Марскія карты я, дарэчы, таксама ўмею чытаць. Як святая Сара.

Лежачы побач з ёй і ў цемры пазнаючы яе рухі, Марыа думаў, што мама яго спіць гэтак жа — раскідаўшы адзенне вакол ложка, накруціўшы будзільнік да халоднага звана, забыўшыся пра ўсё на свеце, ні пра што не шкадуючы, ні аб чым не бядуючы, пакідаючы начныя згрызоты ўсім неспакойным і неўратычным. Вось такім, як Марыа. Марыа перабіраў у галаве ўсе словы, што пачуў за гэтыя тры ночы ад Насці, усе яе аповеды і абяцанні. Пралічваў варыянты, спрабаваў выбудаваць схему абароны, знаходзіў нечаканыя аргументы на сваю карысць, вышукваў узважаныя адказы. Ранкам планеты сталі на свае месцы — усё залежыць ад нас, усё кантралюецца нашым сэрцам, ніякай роспачы, ніякага страху, ніякага апраўдання.

Скрозь соннае рэха і ранішнія паветраныя струмені ён адчуў, што святла раптам стала больш, што непадалёк з'явілася яшчэ нечае дыханне — глухое і варожае, і дыхання гэтага станавілася ўсё болей, аж урэшце ім перапоўнілася і прарвалася ранішняя пустэча.

— Марык! — Марыа падскочыў, перакуліўся ў паветры, як кот, прызямліўся на калені, рэзка ўскочыў на ногі, балюча стукнуўся аб будзільнік, які так і не спрацаваў, уступіў у талерку з рэшткамі пасты, перавярнуў на прасціны келіх з віном, зачапіў Насціну валізу, з якой паляцелі гігіенічныя пракладкі, падхапіў падушку, каб чымсьці прыкрыцца. — Марык, сука! — Коля стаяў у пройме дзвярэй, чорна-аліўкавы, грозны, напампаваны антыбіётыкамі і атрутамі, у пакамечаных белых штанах, у жоўтай роварнай майцы.

Ад яго крыку Насця таксама прачнулася і высунулася з-пад коўдры. Пазнаўшы яе, Коля замёр, упадаючы ў шал, і кінуўся наперад, пакінуўшы на падлозе пакеты

з бальнічнымі рэчамі. Марыа перахапіў гэты яго рух, секунды аказалася дастаткова, каб перагрупавацца, развярнуцца ды рвануць наперад — чорнымі калідорамі, запыленымі пакоямі ў напрамку кухні, падалей ад смерці. Коля пераскочыў цераз валізу, паслізнуўся на пасце, рэзка ўехаў у бакавую сцяну. Яго тут жа адкінула ў іншы бок. Марыа ўжо басанож тупацеў па кухонным паркеце. Коля падняўся і пабег да схованкі. Па стрэльбу, а як жа. Марыа ўжо сарваў аксамітавую заслону і марна сіліўся адчыніць акно. Коля адстаў, але зразумела было, што гэта ненадоўга, што зараз ён яго нагоніць і пачне таптацца яму па рэбрах. Марыа зрабіў некалькі крокаў назад. Ззаду пачуліся цяжкія таропкія крокі. Азірнуўшыся, Марыа паспеў заўважыць, з якой спартыўнай зацятасцю Коля дастае з пакамечаных кішэняў набоі, нервова запіхваючы іх у сваю іжэўскую дубальтоўку. Марыа заскочыў на падаконне, уваліў каленам. Шкло хруснула, як сакавіцкая крыга. Згрупаваўся і скокнуў уперад, пакідаючы пасля сабе крывавыя сляды. Нічога ён мне не зробіць, — бег і супакойваў сам сябе, — пабаіцца.

Дзень Марыа прасядзеў у майстэрні. Лячыў калена, ляжаў на канапе, прыслухоўваючыся да галасоў з вуліцы. Глядзеў на мэблю, раскіданую наўкол, дакранаўся да старога дрэва, адчуваў пах старасці. Большасць людзей, думаў, якім належалі гэтыя рэчы, даўно выехалі. Нешта гнала іх з гэтага горада, прымушала пакідаць хаты, выходзіць за крапасныя муры, перабірацца на той бок ракі і распускацца ў прасторы. Што іх насамрэч вяло? Магчыма, беднасць і няўдачы. Магчыма, патрэба разумення. Або няздольнасць жыць у такіх

кліматычных умовах, калі паўгода неба абкладзена хмарамі і дажджамі, а астатнія паўгода паліць цябе чорным агнём. Хтосьці зрываўся, каб знайсці спакой. Хтосьці хацеў пазбыцца спакою. Кагосьці клікаў голас веры. Нехта ішоў, адчуваючы небяспеку. Чаму яны не засталіся, думаў Марыа, чаго ім насамрэч бракавала? Спакою? Упэўненасці? Кахання? Марыа ўяўляў, як яны доўга мусілі да гэтага ісці, колькі розных непрыемнасцей павінна было адбыцца ў іхнім жыцці, колькі расчараванне мелі ўвабраць іхнія душы. Хтосьці з іх адважыўся павольна і балюча, але хтосьці — лёгка і нязмушана, нехта доўгі час не мог прызнацца самому сабе, што ўжо гатовы — гатовы адмовіцца ад усяго, што набыў, і рушыць наперад — за раку, да чужых, у цемру. Яны павінны былі вырашыць кучу пытанняў, уладзіць мноства спраў, знайсці перакупшчыкаў, звязацца з перавозчыкамі, развітацца з блізкімі, узяць усё неабходнае, скінуць усё лішняе. Мэбля была лішняй. На пошукі лепшага жыцця са сваёй мэбляй не адпраўляюцца. Яе пакідаюць тут — парахнець і памірацъ. Магчыма, думаў Марыа, я б таксама мог сарвацца і адправіцца наперад, магчыма, мне б удалося пачаць усё спачатку, знайсці сваё месца, адшукаць сваю тэрыторыю. Я б мог спыняцца ў буйных гарадах, жыць паміж такіх жа ўцекачоў, лавіць свой шанц, выпрабоўваць лёс, не затрымлівацца нідзе надоўга, рухацца далей, да таго блаславёнага месца, дзе сонца над маёй галавою не будзе ніколі заходзіць, дзе дажджы будуць абмінаць маё жытло, дзе зямля для мяне будзе мяккай, а хлеб — салодкім. Вядома, што мог бы, думаў Марыа. Але што рабіць з тым, ад чаго прыйдзецца ў такім выпадку адмовіцца? Як быць з мамай? Як быць з Колем?

Заставацца з імі не надта хацелася, браць з сабой — тым больш. Што важней, думаў Марыа, усё знайсці ці ўсё пакінуць? Добра, што заўжды ёсць выбар, думаў ён, добра, што ўсё залежыць ад нас.

Пад вечар прыйшла Насця. Была яна ў доўгай, да пят, каляровай сукенцы і празрыстай сарочцы. Спрабавала паводзіцца сур'ёзна, аднак ёй гэта не надта ўдавалася. Пабачыла набраклае крывавае калена, узялася лячыць. Марыа мужна трываў, усё ж хутка не вытрымаў і закрычаў. Тады яна лягла на яго, нібы прыкрываючы ад вечаровай спёкі, ляжала і маўчала, супакойваючы. Ляжала, збіраючы яго ў цэлае, не даючы яму разваліцца на гарачыя кавалкі гліны. Марыа паступова заціх і нават пачаў засынаць, як яна загаварыла.

— Паехалі са мной, — сказала яна. — Кідай усё — і паехалі.

— Што я там буду рабіць? — пацікавіўся Марыа.

— Ды што заўгодна, — супакоіла яго Насця. — Хочаш — навучу цябе гатаваць. Хочаш — уладкую працаваць у порт. Магу нарадзіць табе дзіця.

— Сур'ёзна?

— Так. А магу не нарадзіць. Я ўмею перарываць цяжарнасць. Магу яе аднаўляць. Магу загаворваць павукоў і скарпіёнаў. Магу падрабляць подпісы.

— Ну, гэта мне дакладна не патрэбна.

— Будзем жыць у нас. Дапаможаш мне даглядаць дзядулю.

— Адкуль у цябе дзядуля?

— Доўгая гісторыя, — патлумачыла Насця. — Ён зусім стары. Мама хацела ўпісаць яго ў хоспіс, аднак мне стала яго шкада. Я сама яго даглядаю. Ён, калі га-

ворыць, пускае сліну. Але гаворыць пры гэтым мудрыя рэчы, ёсць што паслухаць. Ну як?

— Ды не, — падумаў Марыа. — Лепей ты сюды. Разам з дзядулем.

— Як знаеш, — спакойна адказала Насця. — Вырашай сам.

Раніцай яна пайшла. Намагалася яго не разбудзіць. Але ўсё роўна разбудзіла. Пасярод дня з'явіўся Коля. Прынёс апельсінаў. Доўга сядзеў, маўчаў, хацеў пра нешта спытаць, але стрымаўся. Прапанаваў працаваць разам. Марыа падумаў, пагадзіўся.

ЮРА

Мярцвяк выглядаў яшчэ горш, чым пры жыцці. Сівыя валасы, запалыя вачніцы, востры нос, рэзкія зморшчыны на незадаволеным твары. Кадык тырчаў уверх, пальцы выцягнуліся, пазногці пасінелі. Ён маўчаў апошнія двое сутак, толькі кашаль час ад часу ірваў знутры грудзі. Потым нават кашлю не стала. Ляжаў і павольна дыхаў, як рыба — ужо выцягнутая з сажалкі, аднак яшчэ не залітая алеем. Пасля абеду сэрца спынілася. Малады падыходзіў, схіляўся над ім, зацікаўлена разглядаў. Можна было падумаць, што вывучае малюнкі на бальнічным халаце.

— Ты яшчэ люстэрка прыкладзі, — параіў Юра.

— Сам прыкладзі, — пакрыўдзіўся малады. — Што рабіць? — спытаў. — Ён жа зараз гніць пачне.

— Чаму там гніць, — адказаў Юра. — Скура ды косткі. Пакінь яго.

Юра дапускаў, што той, хто паведаміць лекару, сам і будзе гэтага мерцвяка выносіць. Таму разгарнуў прынесены яму леташні выпуск «Нацыянальнай геаграфіі» і нечакана для самога сябе зачапіўся за матэрыял

пра жывёльны свет Месапатаміі. Месапатамія, думаў, Месапатамія — нешта звязанае з вадою. Нешта з камянёў ды пяску. З жывёльным светам у Месапатаміі складалася не горшым чынам — сцвярджалі ў часопісе. Скаціна збольшага належала кляштарам, жывёл прыносілі багам у ахвяру, у падзяку за шчадроты, вяртаючы такім чынам пазыкі. Прачытаўшы пра пазыкі, Юра занерваваўся і адклаў часопіс убок. Засынаючы, слухаў шорганне малога. Нават не паварочваючыся, ведаў, што той кружляе вакол мерцвяка. Смерць прыцягвае, асабліва чужая.

Пад вечар прачнуўся, вызірнуў у акно. Цёмныя дрэвы, раннія прыцемкі, пачатак ліпеня. Малады сядзеў на суседнім ложку, не адводзячы вачэй ад трупа.

— Мы што, — спытаў, убачыўшы, што Юра прачнуўся, — будзем спаць з ім у адным пакоі?

— Спі ў калідоры, — параіў Юра.

Але той толькі напужана перасмыкнуў плячыма. Маладога звалі Саша. Саня, — сказаў ён падчас знаёмства. Быў насамрэч не такі і малады — гадоў дваццаць, проста выглядаў недасведчаным. Асабліва калі параўноўваць з тымі, хто ўжо памёр. Худы, трэніраваны, гуляў у футбол. Пастаянна грыз пазногці, ад чаго пальцы былі ружовыя. А таксама ў яго былі нястрыжаныя чорныя валасы і трэшчына ў назе. Праз яе сюды і трапіў. Пасля траўмы ў бальніцы параілі абследавацца, як гэта і бывае звычайна. Зрабіў здымак, лекары нешта знайшлі. Саня сцвярджаў, што гэта ў яго ад стрэсу. Лячыўся каля месяца, а ўсё ніяк не мог прывыкнуць. Праведвала яго мама, перадавала прывітанне ад каманды. У стацыянар, падобна, трапіў упершыню. Баяўся мёртвых. Цяпер сядзеў у футбольных шортах

і чырвонай майцы, на лбе ад напружання праступілі вены, мабыць, уяўляў, што яму сёння будзе сніцца. Юра не вытрымаў, накінуў кашулю, выйшаў у калідор, знайшоў доктара. З доктарам яны падтрымлівалі адзін аднаго — доктару хворыя таксама не падабаліся. Каму будуць падабацца дахадзягі, што ўвесь час спрабуюць выплюнуць таблеткі і пранесці ў палату алкаголь? Юра кіўнуў, доктар цяжка падняўся, выйшаў за ім. Ён быў запаволены, як на свой узрост, аднак інтэлігентны і даволі ветлы. Прывык быць сярод хворых, выглядаў паміж імі сваім, адрозніваўся хіба што беласнежным халатам і акулярамі ў тонкай залатой аправе на поўным твары.

— Ну, і куды я яго? — зайшоўшы і схаваўшы пухкія далоні ў кішэні халата, кіўнуў на мерцвяка. — Хай ужо ляжыць да заўтра.

— Можа, у калідор вынесці? — няпэўна прапанаваў малады.

— Яшчэ наступіць хто ўначы, — не пагадзіўся доктар. — Усё, — сказаў, — адбой.

— Адбой дык адбой, — пагадзіўся Юра, стрэліў у калідоры ў нейкага дахадзягі цыгарэту, выйшаў чорным ходам надвор. Сеў на борцік фантана, знайшоў заныканую для такіх выпадкаў запальнічку. Ночы ў ліпені кароткія, нават не накурышся.

Фантан стаяў пасярод вялікага прахаднога двара, насупраць галоўных дзвярэй дыспансера. Ён быў засыпаны леташнім лісцем і недакуркамі. Вады не было. Прычым ніколі. Жоўты будынак выступаў з-за дрэў, вокны на першым паверсе былі цёмныя, з другога, дзе знаходзіліся палаты, падалі жоўтыя плямы святла, выхопліваючы з рук у цемры матылькоў. Дахадзягі

рыхтаваліся да сну. Хацелася заставацца ў змроку. Загасіў недакурак, сабраўся ісці ў палату. Малады чакаў яго, не кладучыся. Паспрабаваў разгаварыць, але Юра адмахнуўся і заваліўся проста на «Нацыянальную геаграфію». Малады пакрыўджана схаваўся пад коўдру, кідаючы ў бок мерцвяка роспачныя погляды. Юра падумаў, што побач з мерцвяком, мабыць, ляжыць яго душа. Ляжаць сабе, прыціскаюцца, як сямейная пара, што так і не набыла двухмесны ложак.

Юра хаваўся тут трэція суткі. Як чалавек навучаны, ён адразу завёў неабходныя знаёмствы — тэлефанаваў ад доктара, браў, не вяртаючы, посуд у сястрычак, мяняўся з хворымі тытунём. Нагадвала трошкі дэмбель. Альбо першую яго адсідку, калі сядзелася лёгка і недакучліва.

Год увогуле не задаўся. Студыю, якую ён толькі адрамантаваў і запусціў, уклаўшы ў яе ўсё, што меў, абабралі. Юра не прыдумаў нічога лепшага, як улезці ў пазыкі. Узяў у Чорнага дваццатку. Чорны сказаў: не хвалюйся, працуй, потым аддасі. Запусціў усё па новай. Прайшло некалькі месяцаў. Трэба было аддаваць пазыку. Але аддаваць не было з чаго. Чорны доўга пра сябе нагадваў. Жартаваў па тэлефоне. Потым пару разоў прыйшоў на студыю. Пытаўся пра страхаванне, супрацьпажарную абарону. Цікавіўся справамі сям'і. Сям'і ў Юры не было: з жонкаю развёўся, дачка выросла і жыла ў Канадзе. Са старым не кантактаваў гадоў дзесяць. Да таго гадоў дзесяць хацеў яго прырэзаць. Пра што тут гаварыць. Жыццё ў рок-н-ролі прадугледжвае нянавісць і праклёны. А Юра ў рок-н-ролі быў гадоў сто. Словам, калі Чорны стаў пасылаць пустыя эсэмэсы, Юра запіў. А калі яго выводзілі, тады і дазнаўся, як

кажуць на тэлебачанні, пра страшны дыягназ. Ну, як страшны, думаў ён, стоячы на парозе паліклінікі, з белым парадным пінжаком у адной руцэ і канвертам з яшчэ вільготнымі плёнкамі ў другой, як страшны — бывае горш. Часам чалавек нараджаецца без голасу. А часам з такім голасам, што лепш бы яго ніхто не чуў. Часам людзям адразаюць лішнія часткі цела, часам гэтыя лішнія часткі ў іх вырастаюць. Незразумела, што лепей. Прынамсі, я не хаджу пад сябе. Ладна, — сказаў сам сабе, — не ссы, усё будзе добра. Перахапіў у кагосьці цыгарэту, пайшоў здавацца ў дыспансер наўпрост у белым пінжаку. Прайшоў санпрапускнік, пазнаёміўся з персаналам, выбіў месца ў добрай палаце — усяго на тры ложкі. У палаце ляжаў малады. Побач з ім валяліся футбольныя газеты. На суседнім ложку хтосьці ціха, але ўпэўнена даходзіў. Чыста, прыбрана, можа быць, — падумаў Юра і вырашыў застацца. Адразу пасябраваў з доктарам, падкаціў да сястрычкі, перакурыў з кантынгентам вакол пустога фантана. Выключыў мабільны. Ад доктара патэлефанаваў некалькім сябрам. Патлумачыў, дзе ён, што прынесці, пра што маўчаць. Сябры потым прыходзілі і стаялі пад вокнамі. Унутр заходзіць баяліся.

— Ну так, стрэс, — гаварыў ён у першы вечар маладому, якому ў прыцемках станавілася асабліва сумна, і ён пачынаў скардзіцца Юру на долю. — Стрэс — гэта калі ты граеш на электрагітары, а ў зале няма электрычнасці. Прывыклі мы на ўсё скардзіцца, расслабіліся, пачалі здаваць. Нават не ведаем, з чаго насамрэч складаюцца нашы ўнутраныя органы. А дабярэшся да іх — там такое зло, што і не ведаеш, ці сапраўды трэба яго лячыць. Яшчэ вылечыш, чаго добрага.

Ноччу за ім зайшла сястрычка Ала. Выклікала ў калідор, доўга шаптала пры месячным святле. Пакінула нумар свайго тэлефона, пабегла дадому. Юра вярнуўся ў палату, дастаў мабільнік. Успомніў пра Чорнага, схаваў. Ляжаў, летуценна гледзячы за акно. Нармальна, думаў, перасяджу месяц, далей будзе відаць. Бальніцы ён любіў — у бальніцах было чыста. Дома ў яго так чыста ніколі не бывала. За апошнія гадоў дваццаць ён ляжаў з двума нажавымі раненнямі, з апёкамі, з ныркамі, з рознымі запаленнямі. Ужо не кажучы пра наркалогію. Таму ніякай панікі не адчуваў: яшчэ адна цэгла ў сцяну, думаў, яшчэ адзін труп у раку. Трошкі ціснуў узрост, крышку трэсла пасля апошніх ранішніх кропельніц, лёгка накатваў сон, змешваючы пахі лісця і казённых прасцін. На суседнім ложку ляжаў дахадзяга. Дыханне яго запавольвалася, быццам рака ў нізіне. У яго яшчэ два дні жыцця, кучу часу, кучу смутку.

Гэта было ў першую ноч, а праз тры дні, як толькі мерцвяка вынеслі і ложак за ім пераслалі, у палату падсялілі новенькага. Што за фізрук? — падумаў Юра, разглядаючы толькі што прыбылага. Гэта быў чалавек у гадах, і адзенне таксама было старое, хоць і акуратна ношанае і рамантаванае. Насіў баваўняны засціранаблакітнага колеру спартыўны касцюм з белымі тонкімі лампасамі. Святочна зіхацелі вастраносыя лакаваныя чаравікі. Тым не менш ён рабіў прыемнае ўражанне. Магчыма, добрай губастай усмешкаю, магчыма, вялікім клоўнскім носам, а магчыма, што і рэшткамі валасоў, хвацка зачасаных цераз пажоўклы чэрап. У руках трымаў два раздутыя пакеты «Х'юга Босс». Пакеты засунуў пад ложак, агледзеўся, з ходу вызначыў,

хто тут за галоўнага. Кіўнуў маладому, падсеў на ложак да Юры, па-змоўніцку кіўнуў у бок Санька, маўляў, што, заёбвае напарнік? Юра дыпламатычна адклаў «Нацыянальную геаграфію», паказваючы: давай, гавары, калі маеш што. Новенькі назваўся Валерам і гаварыў, зазіраючы Юру наўпрост у твар, каб нічога з таго, што ён кажа, не засталося па-за ўвагай. Вочы ў яго былі пад колер касцюма — такія ж замытыя, такія ж блакітныя. Пастаянна слязіліся, быццам ён на нешта скардзіўся.

— Як тут? — спытаў. — Жыць можна?

— Можна, — адказаў Юра. — Калі нядоўга.

— Доўга і не трэба, — пагадзіўся з ім Валера. — Доўга лечаць толькі вар'ятаў — ім на працу не трэба. Я ўсё жыццё з вар'ятамі, — раптам прызнаўся Валера. — Я ў цырку працую, — патлумачыў.

— Клоўнам? — чамусьці адразу спытаў Юра.

— Не, — не пакрыўдзіўся той, — загадчыкам гаспадаркі.

І, вярнуўшыся на свой ложак, тут жа ўзяўся пераказваць гісторыю жыцця. А было яно ў яго, зразумела, поўнае прыгод і небяспекі. Юра яшчэ падумаў, што людзі з такімі шырокімі і безабароннымі ўсмешкамі звычайна і трапляюць у найбольш глыбокія кар'ерныя ямы. Яны глядзяць на свет настолькі шырока адкрытымі вачыма, што проста не бачаць, куды ідуць. Валера расказваў пра салодкі і таямнічы свет цыркавога рамяства, пра строгія парадкі і суровыя звычаі, старажытныя рытуалы ды ўнутрыцэхавую іерархію. Кідаўся датамі, цытаваў паэтаў, успамінаў імёны артыстаў і дрэсіраваных тыграў, дзяліўся спосабамі страхоўкі. Гаварыў больш да Юры, аднак малады слухаў больш уважліва. Магчыма, любіў цырк, магчыма,

проста радаваўся, што на суседнім з ім ложку ляжыць не труп. Юра няўважліва ківаў у адказ, падтакваў ці адмоўна круціў галавою, калі загадчык гаспадаркі заклікаў яго ў сведкі, але неўзабаве закрыўся геаграфічным часопісам, спрабуючы засяродзіцца на жывёлах і птушках Месапатаміі. Дакуль ён будзе гаварыць? — думаў. — Расказвае ўжо гадзіну, а гаворка ўсё яшчэ ідзе аб яго ўступных іспытах. Колькі ж у яго гісторый? — нерваваўся. Валера ў сваю чаргу згадваў сонечныя дні і фіялетавыя ночы, яркія праграмы і гарачых жанчын шасцідзясятых, якія любілі цырк так, як ніводны хрысціянін не любіць сваю царкву. Адпаведна, яго таксама любілі, а як можна было абысці яго ўвагай? Як? — выгукнуў Валера, дастаючы з пакета пачак старых каляровых фотаздымкаў, беражліва сабраных у канверт з-пад фотапаперы. На канверце было напісана «Унібром», Юра адразу ж успомніў гэтыя канверты, што прадаваліся ў часы яго дзяцінства, і падумаў, колькі ж яму, Юру то-бок, гадоў, як многа непатрэбшчыны ён бачыў, як безнадзейна адстаў ад жыцця. Падумаў, калі апошні раз быў у цырку. Гадоў дзесяць таму. Ці больш? Мабыць, дзесяць.

Машка была ўжо цалкам дарослай дзяўчынкай, у цырк ісці не хацела, але ў яе традыцыйна не пыталіся, Юра, вярнуўшыся дадому пасля чарговага заплыву, спрабаваў зноўку будаваць сямейныя адносіны. Цырк нагадваў Рэйхстаг пасля штурму: твары ва ўсіх былі радасныя, аднак памяшканне відавочна мела патрэбу ў рамонце. Халодныя калідоры, жанчыны ў футрах, каньяк у буфеце і жывёлы Месапатаміі на смутнай арэне. Машка плакала, ёй было шкадальвоў, жанчыны смяяліся. Дадому дабіраліся пешшу — не хацелася ехаць

з гэтымі людзьмі ў адным трамваі. Цяпер ён глядзеў на канверт у руках старога і разглядаў яго пальцы — цёмныя ад тытуню, пакручаныя часам і алкаголем, пабітыя і ў шнарах, нібы хтосьці ставіў яму на пальцах пазнакі пасля кожнага пражытага года. А Валера, пабачыўшы, які эфект робіць на прысутных яго аповед, ажывіўся, дастаў з канверта адно фота, відавочна, улюбёнае, пяшчотна-нядбайна кінуў на яго позірк і перадаў маладому. Глядзі, пацан, — сказаў, ледзь стрымліваючы хваляванне, — гэта я ў семдзесят першым. Бачыш, які я быў? І скажы, як пасля гэтага не любіць цырк? Малады, захоплена хмыкнуўшы, перадаў фота Юру. Юра прыклаў яго да разгорнутага часопіса. На суседняй старонцы быў намаляваны дзікі пустынны асляк. На фота Валера меў незалежны выгляд, гордую выправу, пранізлівыя вочы, а галоўнае — густыя валасы на галаве, пірацкія бакі і кавалерыйскія вусы. Юра міжволі параўнаў два фота — Валеры і асляка. Нешта ёсць, падумаў, нешта, безумоўна, ёсць. Аддаў фота маладому, яшчэ нейкі час паслухаў. Калі аповед дайшоў да прыёму родаў у львіц, непрыкметна закрыўся ад усіх часопісам, пачаў лавіць знаёмыя літары, складаць іх у словы, выбудоўваць з гэтага ўсяго сказы, адсейваць пачутае, аддзяляць нагаворанае цыркачом ад напісанага ў часопісе, разблытваць каляровыя шаўковыя ніткі гісторый, развязваць вузлы, цярпліва брысці ў сонечным праменні, трымаючы ў руках выратавальную нітку. Улічваючы пры гэтым тое, што коньмі ў Месапатаміі не ездзілі верхам і не выкарыстоўвалі іх для перавозкі грузаў. Іх запрагалі хіба што ў баявыя і паляўнічыя калясніцы, палявалі з імі на дзікіх птушак і драпежнікаў, што падыходзілі пад гарадскія вежы. Стаўленне да коней нао-

гул было пяшчотным і ўважлівым, іх шанавалі і даглядалі. Кранаюць і прымушаюць задумацца настаўленні тагачасных конюхаў, якія давалі парады па доглядзе за коньмі, настойліва раячы ўладальнікам гэтых цудоўных жывёлін клапаціцца аб іхняй гігіене і дыеце, не перагружаць іх доўгімі скачкамі, а пры першай патрэбе пускаць жывёл у памяшканні, укладваць іх на падлогу побач з сабою, спаць з імі ў адным пакоі, адчуваючы іхняе дыханне, накрываць іх цёплымі тканінамі ў халоднае надвор'е, разумець іхні настрой, выслухоўваць іхні смутак. Сон робіць нас моцнымі, гаварылі конюхі. І бездапаможнымі, дадавалі. Таму іншая справа — зебры. Зебры ў трупу траплялі часцяком не надта законнымі шляхамі. Іх увозілі праз азіяцкія рэспублікі пад выдуманымі імёнамі, дапісваючы ім гады і змяняючы ім у суправаджальных дакументах пол і гісторыі хваробы. У цыркавых загонах іх трымалі разам, яны хутка прывыкалі да вялікай шумнай аўдыторыі, трымаліся гурта, а калі нехта з іх паміраў, абступалі памерлага колам, не падпускаючы працаўнікоў. Так, быццам прыносілі ахвяру справядлівым багам. Вырынуўшы з гэтай ліпкай плыні, Юра цяжка падняўся і пайшоў на перакур. Што за зебры? — думаў незадаволена. — Адкуль узяліся зебры?

Ноччу ён дачакаўся, пакуль усе заснуць, знайшоў сястрычку, якая спала на раскладанцы ў ардынатарскай, застаўся з ёй. Тая ад хвалявання нават не ведала, што гаварыць, толькі забараніла з ёй цалавацца. А больш не забараняла нічога, проста старалася рабіць усё трошкі цішэй, каб не пабудзіць дахадзяг карабельным скрыпам раскладанкі. Валасы яе, жоўтыя і сонечныя, былі такімі доўгімі, што ў розных месцах

пахлі па-рознаму — то гарачым ветрам, то цёмнай рачной вадою. Горла яе здавалася пяшчотным і ўвесь час прастуджаным. Была яна стрыманай і стомленай. Сон робіць нас моцнымі, думаў Юра, засынаючы, і бездапаможнымі, дадаваў, слухаючы яе дыханне.

Вокны выходзілі ў зацень дрэў, галіны краналіся падаконняў, ловячы і пераломліваючы сонечныя прамяні. Час ад часу заляталі восы, аднак, адчуўшы пах хлёркі і смерці, што стаяў у калідорах, не затрымліваліся і вылятралі надвор, трапляючы ў густую ліпеньскую павуціну. Недзе а дзясятай на падворак укочвалася міліцэйская машына. З яе патруль выводзіў Арцёма — вясёлага дэзерціра, злоўленага два месяцы таму. Цяпер яго шпораніцы прывозілі з СІЗА на працэдуры, і Арцём вельмі радаваўся штодзённай магчымасці адпраўляцца ў поўнае прыгод падарожжа ў асяроддзі лянівых мянтоў. Вітаўся з Юрам, крычаў нешта запальчывае сёстрам, агрызаўся на патрульных, увогуле паводзіў сябе так, нібыта ўсё жыццё марыў паляжаць у дыспансеры, а тут нечакана яго мару ажыццявілі.

Раніцай да Юры прыйшлі сябры, чакалі ля фантана, з мясцовымі не размаўлялі. Калі Юра выйшаў, пачалі апавядаць. Адзін з іх, Жора, які працаваў у кругласутачнай аптэцы, паводзіўся больш упэўнена, як чалавек са свету медыцыны, хапаўся за Юраву кашулю доўгімі ўчэпістымі пальцамі, схіляўся проста да ягонага вуха, нашэптваў, маўляў, Чорны цябе шукае, прабівае па знаёмых. Прыходзіў да старога. — І што стары? — зацікавіўся Юра. — Выгнаў яго, — адказаў Жора. — Правільна зрабіў, — пацешыўся Юра. — Ладна, — сказаў ён, — ідзіце, не плявузгайце толькі. У палаце Валера

ўсё выпытваў яго пра Алу, патрабаваў падрабязнасцей, выказваў падтрымку, прапаноўваў дапамогу. Малады ўрэшце не вытрымаў і, грукнуўшы дзвярыма, схаваўся ў калідоры. Усё, не заводзься, — строга сказаў Юра цыркачу, а сам падумаў, што з маладым адбываюцца прыкрыя рэчы. Здаецца, сястрычка яму падабалася. Яна тут, падобна, усім падабалася. Але ў маладога ад яе проста аднімала мову, Юра гэта добра бачыў. Калі заходзіла ў палату, малады чырванеў і маўчаў. Глядзеў на яе валасы, на падстрыжаныя пазногці, заўважаў, безумоўна, шнар на запясці, звяртаў увагу, па-за ўсякім сумневам, на стомлены твар, на залаты медальён і адсутнасць заручальнага пярсцёнка, на высокія абцасы і гучны смех. Яна ўвогуле ўвесь час смяялася, быццам цешачыся ходам лячэбнага працэсу. У яе былі вострыя зубы, пад такімі зубамі хацелася загінуць. І выдыхаў малады толькі тады, калі яна выходзіла. Юра падумаў, што малады мусіў яго ненавідзець. Мабыць, так. Успомніў, як ненавідзеў у дзяцінстве свайго старога, калі ў таго з'яўляліся новыя сяброўкі, як раздражняўся, прыходзячы позна дадому і знаходзячы на падлозе іхнія рэчы, панчохі і швэдры, выцертыя джынсы, яскравыя сукенкі. Яны пахлі дарослым жаночым целам, Юра падхоплівaў гэтую цёплую тканіну, адчуваючы яе лёгкасць, і моўчкі закідваў старому ў пакой. Той злаваўся і лаяўся, але зрабіць ужо нічога не мог — рана ці позна надыходзіць той час, калі кожны хлопчык павінен прыставіць нож да бацькоўскага горла. Пытанне толькі ў тым, што рабіць далей.

Валера тым часам зноў узяўся за сваё. Дачакаўшыся маладога, што моўчкі залез у ложак і адвярнуўся да сцяны, працягнуў расказваць байкі. Цырк, гаварыў

ён, даў мне ўсё. Працу, адукацыю, каханне. Цырк навучыў мяне далікатнаму стаўленню да дзяцей і паважліваму — да старэйшых. Ты гаворыш, як Маўглі, — перапыніў яго Юра, але старога цыркача было не збіць, ён толькі ўсміхнуўся ўсімі сваімі зморшчынамі і пачаў расказваць пра цыркавыя дынастыі, пра слаўныя традыцыі і сямейныя рэцэпты накладання клоўнскага грыму, якія перадаваліся ад бацькі старэйшаму сыну, маляваў жарсці, што віравалі ў грымёрных, раскрываў крывавыя таямніцы і дзяліўся сакрэтамі таемных змоў, гаварыў і гаварыў, нават падчас абыходу не змаўкаў, распавядаў Але пра сваю першую жонку, паказваў доктару фота сваіх дачок, прапаноўваў з адной з іх ажаніцца, а калі ўсе разам высветлілі, што яна ўжо даўно замужам, намякнуў, што ўсё можна вырашыць — была б добрая воля!

Дынастыя, думаў Юра, трымаючы ў руках жменю каляровых таблетак. Стары заўжды хацеў, каб яны працавалі разам. Сапраўдныя мужчыны не займаюцца музыкай, — казаў ён Юру. Сапраўдным мужчынам і без таго ёсць чым заняцца. Аднойчы стары ўзяў яго з сабой на нейкія сезонныя заробкі. Было гэта таксама сярод лета, стаялі спякотныя дні, стары сядзеў з такімі ж рабацягамі, як сам, дзесьці на запасных каляінах, проста на шпалах, чакаючы брыгадзіра, каб ісці і выгружаць з вагонаў скрыні з кансервамі, Юра сядзеў побач, у белай кашулі і цёмных рабочых джынсах, бадай, апошні раз яны сядзелі так блізка адзін да аднаго, пад адкрытым гарачым небам, перадаючы адзін аднаму цыгарэты. Стары дзяліўся з ім сваімі цыгарэтамі, нібы кажучы: цяпер ты з намі, цяпер ты такі, як мы ўсе. Яны ўсе дзяліліся цыгарэтамі і вадою пад

пякучым сонцам, у простай вопратцы, пабітых ботах, сапраўдныя мужчыны з сапраўднымі праблемамі. Ага, падцягваў Валера, нібы пачуўшы яго думкі, разбітыя чаравікі, цяжкія ад поту трэніровачныя касцюмы — працаваць прыходзілася з раніцы да вечара, усё жыццё змяшчалася ў гэтых сценах, прапахлых пахам мужчын і жаночай парфумай, колькі шчаслівых начэй, колькі крывавых ранкаў! За кожнай біяграфіяй стаялі свае крыўды і прызнанні, за кожнымі дзвярыма нараджалася каханне і паміралa надзея, мужчыны зранку кармілі дзікіх жывёл, ломячы ім характары і робячы мяккімі іхнія рухі. А жанчыны стаялі ў халодных калідорах, выношваючы ў сваіх сэрцах планы здрады і ўцёкаў з гэтага балагана. Але нельга ўцячы ад сябе, нельга ўцячы ад свайго смутку, і таму позіркі іхнія былі сумныя, а рухі на манежы — дакладныя і ўпэўненыя.

Ноччу Ала ніяк не магла заснуць, будзіла яго, выцягвала са сну. Прачынаючыся, ён не разумеў, дзе знаходзіцца, адразу ж думаў пра Чорнага, потым навобмацак пазнаваў яе, супакойваўся, прасіў прынесці вады. Яшчэ прасіў расказаць пра бацькоў, цікава, думаў, што ў яе з дынастыяй, чаго ад яе хацелі.

— Таты я не памятаю, — распавяла яна. — Калі ён загінуў, я яшчэ не хадзіла ў школу.

— Пілот? — спытаў дыпламатычна Юра.

— Угу, — пацвердзіла Ала. — Выпрабавальнік. Двойчы лячыўся ў ЛПП.

— Ясна, — з павагай адказаў Юра.

— Я з айчымам заўсёды таварышавала, — працягнула яна. — Але з ім таксама нешта зрабілася. Працуе садоўнікам за горадам. Размаўляе з дрэвамі.

— Можа, яму проста пагаварыць хочацца, — выказаў меркаванне Юра.

— Ясна, што хочацца, — пагадзілася яна. — Ён у в'етнамцаў працуе. Не з в'етнамцамі ж яму размаўляць. Лепей ужо з грушамі.

Ранкам, вярнуўшыся ў палату, Юра паспрабаваў разгаварыць маладога. Той адказваў коратка і жорстка, на кантакт не ішоў. Падобна, злаваўся. Нават Валера замоўк, сядзеў і назіраў са свайго ложка, што адбываецца. Юра не стаў ціснуць. Добра, падумаў, разбяромся. Накінуў кашулю, пайшоў на перакур. Каля фантана Валера яго дагнаў.

— Што з маладым? — запытаў.

— Шалее, — патлумачыў Юра.

— З-за сястры?

— Ну.

— Я так і падумаў, — зразумеў Валера. — Што рабіць будзеш?

— Давядзецца ажаніцца, — сказаў Юра.

— Ты што? — жахнуўся стары. — Ты што, Юр? Ты бачыў? Ты бачыў яе? — перапытаў з жахам.

— Цёмна было, — аджартаваўся Юра.

— У яе дакладна хтосьці ёсць, — роспачна шаптаў Валера. — У такой жанчыны не можа нікога не быць. Вам усім галовы паадбіваюць — і табе, і маладому.

— Маладому за што? — не зразумеў Юра.

— За кампанію. Я табе кажу, — не мог супакоіцца Валера. — Дакладна нехта ёсць. Ты паглядзі, якая яна акуратная.

— Ну, яна на працы.

— Чорта з два, — не пагадзіўся Валера. — Я на працы, ведаеш, што рабіў? І хто мне што казаў? Вось пабачыш, — шаптаў ён, баязліва аглядаючыся вакол. — Ёсць толькі адзін спосаб, — сказаў па-змоўніцку.

— Ну? — Юра выкінуў недакурак.

— Уцячы з ёю.

— Куды?

— Куды-небудзь. Падалей. Мы з маёй першай жонкай так і зрабілі. Я табе фота паказваў?

— Сваё?

— Яе.

— Паказваў.

— Ну вось. Я яе скраў. Проста з рэпетыцыі. Тыграў потым пажарнікі лавілі.

— Ну?

— Уцяклі. У Крым. Але праз месяц вярнуліся.

— Тыгры?

— Мы.

— Навошта?

— Навошта? — перапытаў Валера. — Сам не ведаю. Спалохаліся, запанікавалі. Вырашылі, хай усё будзе як раней. І ўсё стала як раней. То-бок пагана. А вось ты не вернешся. Ты зможаш.

— Не хачу я нікуды бегчы, — занерваваўся Юра. — Мне і тут добра.

— Тут? — Валера кіўнуў галавою на дыспансер. — Тут табе добра?

— З кім ты ўвогуле жывеш? — спытаў яе Юра праз некалькі дзён. Яна зноў была на дзяжурстве, яны сядзелі ў цёмным пакоі, ён курыў, нават не выходзячы надвор. Вазьму, думаў, і спалю тут усё разам з кантынгентам.

— У мяне дома ёсць жывёлы, — патлумачыла Ала.

— Ясна. Як цябе называлі ў дзяцінстве?

— О, — засмяялася яна. — У мяне было фантастычнае імя. Мяне ўсе называлі Акулаю.

— Гэта з-за хатніх жывёл?

— З-за ўсмешкі, — патлумачыла Ала. — У мяне была асаблівая ўсмешка. І куча сяброў. У школе я ледзь не выйшла замуж. У нас усе рана ўлюбляюцца. Асабліва жанчыны. Ён быў на пару гадоў старэйшы за мяне. Вось як ты, — яна дакранулася ў цемры да яго валасоў. Юра здрыгануўся. — Таму ў нас нічога не атрымалася. Я перажывала, думала, што гэта мне пакаранне за дрэнныя паводзіны. Яшчэ ён быў баксёрам. Тады я ўзяла і пераспала з усімі яго сябрамі.

— З усімі адразу? — не зразумеў Юра.

— З усімі па чарзе.

— Любіш бокс? — зацікавіўся Юра.

— Ладна табе, — пакрыўдзілася Ала.

Юра дакурыў, вярнуўся ў палату. Сказаў, што суседзі нервуюцца, калі ён не начуе дома.

Некалькі дзён яе не было. Юра пайшоў да доктара — той патлумачыў, што адпрасілася, нешта з бацькам. Юра ўявіў, як яны на пару з айчымам стаяць і размаўляюць з фруктовымі дрэвамі. Добра было б сапраўды яе забраць адсюль, падумаў. А то як студэнты — спім на раскладанцы. З іншага боку, апошні раз жанчына затрымалася ў яго на доўгі час гадоў пяць таму. Забралі яе санітары. Юра не быў упэўнены, ці гатовы да аж настолькі сур'ёзных адносін.

Малады супакоіўся, трымаў свае крыўды і падазрэнні пры сабе. Юру пазбягаў, больш камунікаваў

з цыркачом. Цыркач, у сваю чаргу, маладога абмінаў, чапляўся да Юры, а калі той браўся за «Нацыянальную геаграфію», лічыў за лепшае проста пахадзіць па калідорах, замінаючы персаналу.

Дзесьці бліжэй да сярэдзіны ліпеня зноў заявіўся Жора. Прыйшоў проста з аптэкі, з начной змены, яшчэ да абходу. Выклікаў Юру свістам, хаваўся за дрэвамі. Цені зранку падалі густа і холадна, Юра звыкла знайшоў кашулю, асцярожна, каб не абудзіць суседзяў, выйшаў на вуліцу. Жора павітаўся, пацягнуў Юру ў цень. Распавёў, што Чорны нервуецца, зноў прыходзіў да яго старога, пагражаў. Стары, вядома, не спалохаўся, але з Чорным былі яшчэ двое. Абяцалі ў наступны раз спаліць дом. Яны спаляць, пераканана гаварыў Жора, ім можна, яны ж пажарнікі.

— Ты б адзваніўся Чорнаму, пагаварыў бы, — настойваў ён.

— Што ты так напружваешся? — не зразумеў Юра. — Цябе Чорны прасіў?

— Ідзі ты нахуй, — пакрыўдзіўся Жора. — Пра старога падумай.

— Ладна, — адказаў Юра, развітваючыся, — падумаю.

Ну, а што тут думаць? — думаў ён. Трэба выбірацца. Трэба дамовіцца з доктарам. Трэба супакоіць маладога. Трэба вырашыць нешта з Алай-Акулай. Трэба пагаварыць з Чорным. З іншага боку, ну што ён зробіць, Чорны? Ну, спаліць старога. Юра сам бензіну на падпалку прынясе. Прывыклі мы ўсе скардзіцца, думаў ён сам сабе, расслабіліся. Усё праз сямейныя пра-

блемы. Што за бацькі? Адзін бічуе, другі з дрэвамі размаўляе.

Суседзі нібы чакалі, калі ён вернецца. Толькі зайшоў у палату, Валера высунуў галаву з-пад коўдры, а малады, наадварот, пад коўдру схаваўся. Юра сеў побач з цыркачом.

— Дык што ты там пра першую жонку распавядаў? — спытаў ён, паляпаўшы старога па калене.

Валера ажывіўся, канчаткова прачнуўся, адкашляўся, сеў побач з Юрам.

— Мая жонка, — пачаў, — была, дарэчы, мясцовай знакамітасцю. Павячэраць з ёй у рэстаране было гонарам.

— А тыграў яна з сабой на вячэру брала? — не паверыў Юра.

— Ну што ты, — пакрыўдзіўся стары, — я ж сур'ёзна. Я калі паступіў у трупу, яна на мяне нават не глядзела. У яе быў такі выбар! Я ў яе з першага погляду закахаўся. А потым мы ўцяклі, ну, я расказваў. Мяне, праўда, ненадоўга хапіла. Малады быў, разгубіўся. Слабак.

— А пасля? — спытаў Юра.

— А потым я яе згубіў. Сам вінаваты, усё разумею. Проста не ўтрымаў яе.

— У сэнсе страхоўкі? — не зразумеў Юра.

— У сэнсе пайшла яна ад мяне. На гастролях.

— Што за гастролі?

— У сацыялістычнай Румыніі. Мы там месяц церліся сярод румын. Я быў малады, самаўпэўнены, зусім не разумеў, што мне трэба, чаго хачу. Забываў пра яе, займаўся сабою. Яна гэта адчувала, нейкі час спрабавала ўсё выправіць, але я нічога не хацеў чуць. Думаю, усё змянілася пасля таго, як мы вярнуліся з Крыма.

Яна ўбачыла, што я слабак, што лёгка адступаю, што не буду за яе грызці зямлю. Не сказала нічога, але зразумела. А потым на гастролях у іх раптам пачалося з адным з нашых, з адміністрацыі. Я нават не паспеў нічога зрабіць. Вярталіся яны разам. Я хацеў вызваліцца. Але зноў жа такі не наважыўся.

— Да, Валер, — паляпаў яго па плячы Юра. — Хто ж так робіць?

Валеру, відаць, падабалася, што ўвесь час гаварылі менавіта пра яго. Нават малады высунуўся з-пад коўдры і сумна слухаў любоўныя гісторыі старога.

— Так і есць, — сказаў Валера. — Думаеш, я сам не ведаю? Нават успомніць сорамна. Жывеш з ёй, думаеш, што гэта надоўга, што ўсё ў парадку. Перастаеш яе заўважаць, забываеш пра тое, што ўсё можа лёгка і хутка змяніцца. А аднойчы менавіта так і адбываецца. І ты не разумееш, а што ж змянілася. Дзе я памыліўся? І пачынаеш вінаваціць усіх навокал. Хоць ніхто, акрамя цябе, ні ў чым не вінаваты. Пачынаеш рабіць глупствы. Намагаешся ўсё выправіць, намагаешся ўсё забыць. А як можна выправіць тое, чаго ўжо няма? І як можна пра ўсё забыць? Ніяк. Нельга ўцячы ад сябе. Нельга ўцячы ад свайго смутку.

Стары нешта зусім расклеіўся, Юра падумаў, што не варта было з яго ўсё гэта выцягваць. Лепш ужо гаварыць пра зебраў. Хацеў падняцца, але Валера лёгка прытрымаў яго за локаць.

— Увогуле гэтыя гастролі... Гэта ж зусім іншы час, іншыя парадкі. Пра нас там проста забыліся. Адпрацавалі месяц, пачалася зіма, трэба вяртацца. Адміністрацыя сабе знікла, а нас пакінулі. Нават бензіну не было — нашы мясцовым увесь прадалі.

— Дык вы б на зебрах назад, цераз перавалы, — пажартаваў Юра. Але, паглядзеўшы на роспачны губаты твар цыркача, выправіўся: — Ну, то-бок на конях.

— Куды там, — горка адказаў той. — Яны ў нас не цяглавыя.

— Як у Месапатаміі, — сказаў Юра.

Гутарка абарвалася, бо і дадаць не было чаго, і нагаворанага аказалася шмат. І ўсе сядзелі, чакаючы абходу і не ведаючы, чым заняцца. А калі ў палату разам з доктарам зайшла Ала, коцячы перад сабою вазок з лекамі, усё стала зусім пагана — так гэта было несвоечасова і недарэчна. А горш за ўсё, што за імі пхалася мама Сані, не адстаючы ад доктара ні на крок, нешта ў яго выпытваючы і чагосьці ад яго патрабуючы. Па твары доктара гуляў нервовы румянец, ён увесь час, хоць і занадта мякка, паўтараў маме, што сюды заходзіць нельга, што гэта забаронена, што гэта небяспечна ўрэшце. Але мама нацягнула на твар павязку і не звяртала ўвагі ні на якія забароны, а доктар быў надта далікатнай ды інтэлігентнай асобай, каб выгнаць яе на вачах сына-футбаліста. У палаце мама зусім асмялела і пачала гаспадарыць. Адразу ж падсела да маладога, патрапала яго па загрыўку, пачала даставаць цукеркі і печыва і пытацца пра самаадчуванне. Была яна настаўніцай, і падобная была да настаўніцы, і паводзілася як тыповая настаўніца: нават калі пытала пра здароўе, узнікала адчуванне, што за няправільныя адказы атрымаеш дрэнную адзнаку. Малады нерваваўся, спачатку адмоўчваўся, потым шэптам прасіў маму не перашкаджаць дактарам, кідаў прыніжаныя і пранізлівыя погляды ў бок Валеры, каб той заступіўся, краем вока назіраў за рэакцыяй Юры, ба-

яўся паглядзець на сястрычку і вельмі бянтэжыўся, адказваючы доктару. А мама доктара нібы і не заўважала, паводзіла сябе як на кантрольнай, толькі і чакала, калі доктар з Алай выйдуць, пакінуўшы яе сам-насам з сынам. Таму калі Ала прыступіла да маладога і высыпала яму ў працягнутую далонь (яна заўважыла, як дрыжаць у яго рукі, заўважыла кроплі нервовага поту, паспела ўбачыць сінякі пад вачыма, зразумела, што ён дрэнна спіць, што яму тут наогул нядобра, што ён бы з радасцю адсюль уцёк, але куды ўцячэш — дома мама, і незразумела, дзе лепш: тут, паміж трупаў, ці там, з яе любоўю; паспела заўважыць усё гэта за імгненне, паспела здзівіцца і запомніць) з дзясятак таблетак, мама, не звярнуўшы на яе ніякай увагі, пачала даставаць з-пад ложка шкарпэткі сына, лаючы яго за неарганізаванасць і неахайнасць. Ала паспрабавала перавесці ўсё гэта на жарт і нават усміхнулася ім так, як яна магла, сваёй неверагоднай усмешкаю, як тут малога прарвала: надта доўга сядзела ў ім гэтая спружына, надта моцна падціскала яна сэрца, выштурхваючы яго з грудзей, надта доўга ён стрымліваўся, надта многа ад яго патрабавалі. Месяц на гэтай койцы, з гэтымі мудакамі, адзін з якіх даўно ўпаў у маразм, выдумляючы розную хуйню пра зебраў і антылоп, а другі, блядзь, увогуле ставіўся да яго як да ўрода, так, быццам ён, блядзь, тут крайні і мусіць за ўсё адказваць, так, быццам да яго, сука, можна ставіцца як да пацана, не заўважаючы, блядзь, ушчыльную, нахуй! Малады выбіў у мамы з рук гэтыя ёбаныя шкарпэткі, запусціў печывам аб сцяну (доктар паспеў ухіліцца, Юра здзіўлена падняўся) і зайшоўся крыкам, тлумачачы гэтай ідыётцы, каб яго, блядзь, не чапалі, каб пакінулі яго, блядзь, у спа-

коі, што ён, блядзь, сам, нахуй, разбярэцца са сваімі шкарпэткамі, і каб яна, старая ідыётка, валіла адсюль і больш не прыходзіла.

Усе замёрлі, не ведаючы, што сказаць. Доктар прытрымліваў за плячо Алу, мама разгублена стаяла пасярод пакоя і хацела заплакаць, аднак не ўмела — развучылася за сорак гадоў педагагічнай дзейнасці. А малады глядзеў на іх усіх з нянавісцю і адчаем і падбіраў ужо словы для новых праклёнаў, калі раптам Юра яго перапыніў.

— Ну ты, — сказаў ён, — клоўн. Што на маці крычыш?

— А табе што? — ашчэрыўся на яго малады, пабачыўшы нарэшце перад сабою саперніка.

— Рот закрый, — параіў Юра.

— Сам закрый, — малады вырашыў не адступаць.

Юра рэзка і моцна заляпіў яму далонню. Малады ад неспадзеўкі не ўтрымаўся, упаў на ложак, проста на цукеркі з таблеткамі, тут жа прыйшоў у шаленства, падскочыў уверх, кінуўся было да Юры, аднак пабачыў яго погляд і спыніўся, не адважыўся. Толькі павярнуўся і традыцыйна выскачыў у калідор. Мама пабегла за ім. Доктар пачакаў, выйшаў следам. Ала паглядзела на Юру строгім поглядам і таксама пакаціла свой вазок. Валера пабачыў каля сябе, на коўдры, кавалак печыва. Падняў. «Юбілейнае», — сказаў, пражаваўшы.

Яна спрабавала яго не пусціць. Сказала, давай заўтра пагаворым. Ужо позна, сказала ўсхвалявана, прытрымліваючы дзверы ардынатарскай, разбудзіш усіх, ідзі. Чорта з два, не пагаджаўся Юра, пяшчотна, але настойліва ломячы дзверы. Урэшце яна адступіла.

— Ну, усё, — сказаў ён, — ты паказала характар, я ўбачыў. Для чаго дзверы трымала?

— Ты ж не ведаеш, — адказала яна, — калі адсюль выйдзеш. І ці наогул выйдзеш. Праўда ж? Нашто тады ўсё гэта пачынаць?

— Як гэта не ведаю? — не пагадзіўся Юра. — Яшчэ б мне не ведаць. Ясна, што выйду. Заўтра і выйду. Знайшла праблему. Вось калі мне апендыцыт выразалі і лекары забылі мяне на стале, таму што гэта якраз на Вялікдзень было, — вось тады я сапраўды сумняваўся, ці выйду.

— Ладна, — перабіла яна, — не залівай, забыліся. Ты нашто малому ўваліў?

— Каб школу не прапускаў, — адказаў Юра. — Што твой айчым? — спытаў.

— Нармальна, — адказала яна. — Хутка будуць збіраць ураджай. Перажывае.

— Ну, правільна, — сказаў Юра. — За што яшчэ і перажываць.

Калі я так апошні раз размаўляў з жанчынай? — думаў ён пасля таго ўжо, як яна заснула, а ён сядзеў, асцярожна паклаўшы яе ногі сабе на калені. — Асабліва ноччу, калі? Ноччу хіба з дыспетчаркамі таксі. А так, каб сядзець побач, дакранацца да яе ступняў, саграваць далонямі яе лыткі, — нават не ўспомню. Сядзеў, прытуліўшыся галавою да сцяны. Яна хутка заснула: трымала нейкі час яго за руку, потым адпусціла, ён падняўся і падышоў да акна, глядзеў на цёмны падворак, асветлены ліхтарамі, ціхі і пусты. А калі вярнуўся, яна ўжо спала. Асцярожна сеў, прыхінуўшыся да сцяны, яна праз сон зноў схапіла яго руку і зноў адпусціла.

Юра чамусьці ўспомніў тую зіму, асабліва доўгую і цяжкую, калі на кухні засталася толькі чорная гарбата і пра нешта іншае можна было нават не думаць. Яны і не думалі: жыццё здавалася лёгкім ды бясконцым, ён быў зусім малады, меў не такія ламаныя косткі, не такое зношанае сэрца. Алёна ставілася проста да іхняй беднасці, нічога, казала, збірай поўныя стадыёны — абавязкова заробіш. Можна пачакаць. Яны тыднямі цягаліся па кватэрах знаёмых, начавалі на падлозе, пілі на зімовых дахах. Залатыя часы, думаў Юра цяпер. Усё толькі пачыналася, усё давалася ім у рукі, і толькі іхняя легкадумнасць і няўважнасць не дазвалялі проста тады вытрасці з сусвету тое, што ім належала па праве. А трэба было вытрасці, шкадаваў Юра, трэба было выбіць з жыцця ўсё да астатняй капейкі. Хто ж ведаў, што ўсё так безнадзейна зменіцца, што ўсё так хутка мінецца. У пачатку сакавіка Алёна такі падхапіла запаленне лёгкіх і надоўга злягла. Грошы хутка скончыліся. Узяць іх не было дзе. Лекаў у хаце не было. Харчы таксама скончыліся. Усе сябры і знаёмыя, з якімі яны дагэтуль вадзілі бясконцыя святочныя карагоды, раптам кудысьці зніклі. Рассмакталіся ў ледзяных бэзавых прыцемках. Алёне станавілася ўсё горш, яна ўжо некалькі дзён амаль не ўставала з ложка, ляжала, накінуўшы на сябе ўсе коўдры і курткі, што былі дома. Ён сядзеў побач з ёй і трымаў яе за руку, проста як цяпер, вось тут, трымаў і адчуваў, як закіпае яе цела, як жар блукае пад скурай, як агонь выпальвае яе знутры. Яна не скардзілася, толькі прасіла не адпускаць, трымаць яе. Ён і трымаў, пакуль ёй не стала лепш. Куды ўсё гэта потым знікла? Як пра ўсё гэта можна было забыцца, як можна было ўсё гэта згубіць? Ён успомніў, калі апош-

ні раз з ёй бачыўся — пару гадоў таму, калі перадаваў штосьці для Машкі, потым шкадаваў, што наогул усё гэта прыдумаў — чорны, змучаны погляд, стома і роспач, безабаронная аголеная шыя, ледзяныя пальцы. У вушах не было завушніц, на руцэ не было гадзінніка. Не было пра што гаварыць, не было пра што пытацца. Нас забівае слабасць, якую мы трымаем у сабе, пазбыцца якой нам так шкада. Яна выжырае нас знутры, як вірус, яна не дае нам прымаць правільныя рашэнні, трымацца за блізкіх нам людзей, яна робіць нас асуджанымі, хоць насамрэч мы такімі не з'яўляемся. Юра адчуў, што засынае. Добра, што не прыйшлося ламаць дзверы, падумаў у канцы.

Дзверы прыходзілася на ноч зачыняць. Каб не было скразнякоў і ў склады, дзе яны спалі, не забягалі дзікія псы. Сабачыя зграі вартавалі пад дзвярыма, хаваліся ў марозным прывакзальным тумане, сноўдаліся па запасных шляхах, задзіраючы пыскі і выючы ў прамерзлае неба Бухарэста. Зіма выдалася ранняй, імжа ляжала на дратах і яблыневых галінах. Склады хутка прагрэлі вогнішчамі. Палілі прынесены з вакзала кардон альбо знойдзеную ў таварняках салому. Жывёліны стаялі ціха, чакаючы штодзённай ежы, ноччу коні шарахаліся ад сабачага выцця, нібы баючыся смерці, якая павінна была за імі прыйсці. Мясцовая ўлада дасылала кожную раніцу царкоўныя дэлегацыі і парламентарыяў, да іх выходзілі акрабаты і гіпнатызёры і доўга таргаваліся. Але каманды адпраўляць іх не было, таму яны далей пільнавалі рэквізіт і пасвілі дрэсіраваных звяроў, час ад часу здзяйсняючы дзёрзкія рэйды на прадмесці і прадуктовыя склады. Абіралі сялянскія ўгоддзі,

вяртаючыся на склады з правізіяй для сябе і жывёл. Спалі, лежачы паміж ільвоў ды лісіц, пілі курыную кроў, каб наталіць смагу. Прыносілі жывёл у ахвяру, просячы ў нябёсаў бласлаўлення і добрага надвор'я. Мясцовае насельніцтва чыніла як магло супраціў, баронячы крамны тавар і хатняе дабро. Урэшце, улічваючы колькасць пісьмовых скаргаў — ананімных і дасланых цэлымі працоўнымі калектывамі, — кіраўніцтва вакзала на ўласную рызыку выдзеліла трупе некалькі плацкартных вагонаў. Перад Раством, загрузіўшы жывёл і рэквізітныя трафеі, цягнік рушыў на Усход. Вагоны былі гружаныя жаночымі футрамі і турэцкімі кілімамі, скрынямі з апельсінамі і гэдээраўскімі балонневымі курткамі. Найгоршае было, што ўвесь гэты час жывёлы нараджалі, колькасць іх паводле накладной не супадала, памежнікі нервавaліся, чыгуначнікі разбягаліся па дамах, прыдарожныя мястэчкі зачынялі перад імі свае брамы, як перад прыходам чумы. Урэшце іх выпусцілі. Яны доўга ехалі, перабіраліся праз Карпаты, тыднямі прастойвалі на маленькіх станцыях Усходняй Галічыны, мяняючы балонневыя курткі на авечы сыр, і ўпарта рухаліся наперад — дадому, туды, дзе іх ужо і не чакалі.

І лежачы на сваёй другой паліцы, накрыўшыся кілімам, адчуваючы над сабою шоргат птушыных крылаў і мудрае змяінае шыпенне, выбіраючы час ад часу з птушыных гнёздаў яйкі і гладзячы воўчыя загрыўкі, гуляючы ў карты з паветранымі гімнастамі і вылоўліваючы ў тамбуры вясёлых макак, Валера думаў толькі адно: трэба вяртацца, трэба вяртацца ў горад, які цябе чакае, які ляжыць паміж рэк, на пагорках, адкрыты небу, засыпаны сінім снегам. Трэба вяртац-

ца, паколькі няма шчасця ў дарозе, няма паразумення паміж чужынцамі. Дома ўсё стаіць на сваіх месцах, дома ўсё адбываецца ўчасна і слушна. Трэба заўсёды вяртацца, іначай навошта было кудысьці ўвогуле рушыць? Усё знаходзіцца паміж рэк, і ўсё адтуль пачынаецца — і ўсе гісторыі, і ўся любоў. Вандроўны агонь алкаголю куляўся ў ім з лёгкага ў лёгкае, пакідаючы пасля сабе сляды, успыхваў і знікаў, абяцаючы аднойчы абавязкова вярнуцца і пра ўсё нагадаць.

Раніцай Юра вярнуўся ў палату, сабраў рэчы. Кіўнуў маладому, маўляў, пайшлі, пагаворым. Той неахвотна выйшаў. Сталі каля акна.

— Паслухай, — пачаў Юра. — Я выпісваюся. Не хачу, каб ты злаваўся.

— Як выпісваешся? — не зразумеў малады. — Ты ж не далячыўся.

— Далячуся, — супакоіў яго Юра. — Ты не псіхуй, добра?

— Ды добра, — супакоіў яго малады, — сам вінаваты, сарваўся.

— Калі назад у каманду? — запытаў Юра.

— Ды няма каманды, — адказаў малады, — расфармавалі. Спонсар бабкі ў гатэль уклаў.

— Ясна, — разгубіўся Юра. — І куды ты цяпер?

— Не ведаю, — сказаў малады. — Давучуся, мабыць.

— Правільна, — пагадзіўся Юра. — Мяне мой стары да сёння дастае, што я не давучыўся. І правільна робіць. Запішы нумар. Трэба будзе студыя — звяртайся.

— Абавязкова, — запэўніў яго малады.

Юра хутка дамовіўся з доктарам. Той памяўся, сказаў, што так не робяць, што гэта не па правілах, што

гэта небяспечна і шкодна, але добра, пагадзіўся, пад тваю адказнасць. Толькі за таблеткамі прыходзь.

У калідоры злавіў Алу. Выйшлі надвор, на вуліцы, адразу за вуглом, знайшлі нейкі спартыўны бар. За сталом некалькі арабаў глядзелі паўтор матча. Бармен з кімсьці размаўляў. Падышла афіцыянтка — хлапечая прычоска, уважлівы позірк. Юра папрасіў прынесці гук. Арабы запратэставалі, аднак афіцыянтка холадна папрасіла іх супакоіцца. Юра падзякаваў ёй у спіну, яна павярнулася, лёгка кіўнула галавою, нібы выказваючы падтрымку.

— Запішы нумар, — сказаў Юра.

— Добра, — Ала хутка пагадзілася.

На ўсялякі выпадак ён адабраў у яе мабільны, набіў туды свой нумар.

— Пазвоніш?

— Пазваню.

— Не забудзеш?

— Не забуду.

— Давай, буду чакаць.

За час яго адсутнасці дома сапсаваліся кансервы і высахлі кветкі. Ні аднаго ні другога не было шкада. Юра пакруціўся па кватэры, паставіў чайнік, схадзіў у душ. Хадзіў па пакоях, абматаўшыся ручніком і пакідаючы на лінолеуме мокрыя сляды. Праходзячы паўз люстэрка, кінуў позірк: жылістае, бітае і ў шнарах цела, парадзелы хаер, ламаны нос, моцны баксёрскі падбародак. Крыху схуднеў, але не страшна. Адарваны палец на левай руцэ, праз які кінуў граць. Абпаленая правая нага. Сухая, абветраная скура. Злы, упэўнены погляд. Усё як заўжды. За апошнія дваццаць гадоў амаль нічога не

змянілася. Успомніў пра Алу. Дастаў тэлефон. Уключыў. Пачаў чакаць. Праз пяць хвілін патэлефанавалі. Высветіўся нумар Чорнага. Юра на імгненне замёр, потым рэзка падхапіў слухаўку.

— Алё, — сказаў.

ФАМА

Усім патрэбна добрая праца, ніхто не любіць працадаўцаў. Усе ўхіляюцца ад выплаты падаткаў, аднак садзяць звычайна таго, хто першы прапанаваў не плаціць. І што ў такім выпадку можа нас вызваліць? Нас можа вызваліць хіба што вера. Усіх атэістаў часцей за ўсё аб'ядноўвае менавіта рэлігія. Рэлігія, як правіла, абслугоўвае спекулянтаў ды сацыялістаў, і нам застаецца хіба што маліцца. І клапаціцца пра бухгалтэрыю. Нешта падобнае Фіма — для сяброў — Фама — думаў кожны раз, калі здаралася спачатку доўга дамаўляцца з заказчыкамі аб сустрэчы, а потым гэтак жа доўга іх чакаць. Навошта наогул дамаўляцца? — думаў ён незадаволена. — Навошта ўдакладняць адрасы, звяраць гадзіны, нерваваца? Ніхто не прыходзіць своечасова, ніхто нікуды не спяшаецца, ніхто не трымае слова. Справы вядуцца абы-як, грошы працуюць самі на сябе, усе мы ў гэтым свеце — пакінутыя і самотныя, усім патрэбна любоў, усім патрэбна ўвага, усім патрэбна добрая праца.

Фіма трымаў невялікую сетку перасоўных кавярняў (ярка размаляваныя душагубкі, што стаялі пад брамамі ўніверсітэтаў), дрэнна падрыхтаваны персанал (студэнты тых жа ўніверсітэтаў, што стаялі каля душагубак і прадавалі карычневага колеру атруту), шмат працаваў, цярпець не мог беспрацоўных. У свеце столькі працы, — казаў падначаленым, — як пры гэтым можна быць беспрацоўным? Падначаленыя затое часта звальняліся. Ён нават не паспяваў запомніць іхнія імёны. Знікалі безназоўнымі.

На гэты раз месца сустрэчы прапанавалі заказчыкі. Добры рэстаран, сказалі па тэлефоне, утульны, прыемны, раніцай там будзе пуста. Фіма ведаў, пра што гаворка, жыў у двух кварталах адтуль. Час ад часу праязджаў міма гэтай падазронай установы, бачыў уладальніка, які хадзіў па вуліцы ў ружовым кімано, размаўляючы пры гэтым па жаночым мабільніку. Але добра, вырашыў, хай будзе. Прыехаў загадзя, прыпаркаваўся. Рэстаран аказаўся зачыненым, адкрываўся толькі праз дзве гадзіны. Фіма перазваніў заказчыкам. Ох, сапраўды? — здзівіліся тыя. Ну, пачакайце нас дзе-небудзь. Спазняемся. Але хутка будзем. Фіма азірнуўся. Сонечны ліпень, пустая вуліца. Побач спартыўны бар. Тое, што трэба, — падумаў Фіма. Ён ведаў гаспадароў, ведаў бармена, быў там некалькі разоў. Гаспадар цяпер сядзеў за наўмыснае забойства (пераехаў брата жонкі, сцвярджаў, што выпадкова: спачатку збіў яго на сваім падворку, потым нібы вярнуўся, каб надаць першую дапамогу, і пераехаў яшчэ раз), жонка асуджанага цягнула бізнес і аплачвала паслугі адвакатаў. Бар знаходзіўся ў халодным падвале. Цэнтр, побач з метро, на падыходах да інстытуцкіх карпусоў,

заўсёды куча студэнтаў. Фарбаваныя сцены, на сценах дзве плазмы. На вуліцы, пад шыльдай, — пірацкі сцяг. Публіка пярэстая: студэнты старэйшых курсаў, якія вучыліся ў другую змену, таму першую маглі праседжваць у бары, арабы, якіх у іншыя ўстановы не заўсёды пускалі, улічваючы знешні выгляд, некалькі мясцовых алкаголікаў, што забрыдалі ўвечары, на другі тайм, паколькі піць два таймы запар было для іх фінансава цяжка. Бармена звалі Антон, ён выконваў працу ўласна бармена і афіцыянта. Ну, і міліцыю выклікаў у выпадку чаго. Фіма з ім вітаўся, той заўсёды моўчкі ківаў у адказ. Быў негаваркі, ніколі нікуды не спяшаўся, але ўсё трымаў у памяці, быў акуратны ў разліках і карэктны ў паводзінах з алкаголікамі. Праўда, дзіўна апранаўся: у аранжавыя футболкі і зялёныя джынсы, альбо ў белыя кашулі і кароткія шорты, альбо ў рваныя швэдры і паласатыя штаны. Ага, ну і насіў завушніцы ў абодвух вушах. Пры гэтым рэдка галіўся і амаль не ўсміхаўся. Наведвальнікі лічылі бармена підарам. Бармен быў пра іх такой жа думкі.

Фіма зайшоў, прывітаўся з Антонам. Той звыкла кіўнуў у адказ. Чорт, — падумаў Фіма, — ён кожны раз вітаецца так, нібы хацеў пабачыць кагосьці іншага. У бары, нягледзячы на ранні час, было весела. У кутку пад плазмаю сядзелі арабы. Мабыць, не хапіла грошай на авіябілеты, таму летнія канікулы вырашылі перасядзець тут, у падвале. Глядзелі паўтор учарашняга футбола. На Фіму глянулі варожа — высокі, сутулы, касцюм недарагі, хоць і акуратны. Не надта ўмела, хоць і старанна завязаны гальштук. Новы тэлефон, стары механічны гадзіннік. Агледзеўшы, вярнуліся да футбола. Фіма нават заліп у экран разам

з імі, потым успомніў, што ўчора ўсё гэта ўжо глядзеў, ведае, чым усё скончыцца, таму падышоў да Антона, разгаварыўся. Нечакана з кухні выйшла дзяўчына. Доўгія ногі, цёмныя джынсы, белая блузка, хлапечая стрыжка. Фарбаваныя ў чорны пазногці. Прывіталася з Фімам, як з даўнім прыяцелем, адабрала ў Антона шклянкі з сокам, панесла пары, што сядзела ля выхаду. Фіма паглядзеў ёй услед, спыніўся на пары. Мужчына нерваваўся, падобна, хацеў курыць, але курыць нельга, забраў у жанчыны мабільны, пачаў нешта запісваць. Пісаў павольна — на руцэ не было аднаго пальца. Жанчына насупраць таксама нервавалася. У яе з пальцамі было ўсё ў парадку. Дзяўчына пакінула ім сок, ужо збіралася ісці, калі чалавек за сталом лёгка яе прытрымаў, кінуў пару слоў. Яна кіўнула ў адказ, узяла на суседнім століку пульт, панізіла гук на плазме. Арабы нервова загалёкалі, аднак яна павярнулася і ціха штосьці ім адказала. Арабы адразу змоўклі. Як яна з імі! — падумаў Фіма.

— Адкуль яна? — спытаў.

— Афіцыянтка, — неахвотна патлумачыў Антон. — Оля зваць. Тыдзень як узялі. Сам не паспяваю.

Перазванілі заказчыкі. Спыталі, дзе ён. У бары, патлумачыў Фіма, гляджу футбол. — Які лік? — спыталі заказчыкі. — Фінальны ці ў дадзены момант? — перапытаў ён. Паслухайце, сказалі заказчыкі, мы тут затрымаліся перад мостам. Як да вас дабірацца? Фіма пачаў тлумачыць, але тут падышла Оля. — Ты што? — сказала Фіму. — Там жа рамонт, ім трэба налева, да праспекта, там уверх, потым направа. Дай сюды, — сказала, забіраючы ў Фімы тэлефон. Хутка ўсё патлумачыла, згадала некалькі вуліц, назвала некаль-

кі крам, якія трэба праехаць, школу, ваенкамат. Аддала тэлефон, пайшла да арабаў, доўга з імі пра нешта гутарыла. Арабы глядзелі на яе ўстрывожана, але паводзілі сябе ціха. Фіму здзіўляў яе спакой, ён прывык, што праца афіцыянткі, як правіла, звязана з істэрыкамі. Арабы, падобна, нечым яе папракалі, аднак яна ледзьве прыкметна дакранулася далонню да пляча аднаго — і той адразу змоўк. Да другога нахілілася, пра нешта перапытваючы, і ён пачаў адмаўляцца і апраўдвацца. Іншыя, не заўважаючы, што за імі назіраюць, выпальвалі позіркамі паветра, высякалі з азону іскры, не гледзячы ёй у твар, ловячы яе рухі, слухаючы яе абразы.

Хвілін праз пятнаццаць зноў перазванілі заказчыкі. Усё, сказалі, усё адмяняецца. Выявілася, на мосце ў кагосьці ўехалі, цяпер стаяць, чакаюць ДАІ. Папрасілі прабачэння, яшчэ раз пацікавіліся лікам. Фіма развітаўся з Антонам, пачакаў, пакуль падыдзе Оля, хацеў нешта ёй сказаць, але разгубіўся, не знайшоў патрэбных слоў, толькі працягнуў ёй руку, як на дзелавой сустрэчы. Яна засмяялася, сціснула яму руку, і ён, не стрымаўшыся, трошкі нязграбна, але выключна па-сяброўску, не выходзячы за межы дазволенага, абняў яе, лёгка правёўшы рукою па спіне. А ўжо калі выявілася, што бялізны пад блузкай яна не носіць, Фіма і зусім разгубіўся і неяк паспешліва выскачыў на вуліцу. Знайшоў свой фіат. Сеў. Пачакаў. Набраў Антона.

— Гэтая афіцыянтка, — сказаў, — Оля — хто яна?

— Ты далёка? — перапытаў яго Антон пасля паўзы.

Праз хвіліну выйшаў, сеў побач, асцярожна прыкрыўшы дзверцы.

— Курыць ёсць? — спытаў Фіму.

— Кінуў, — апраўдваючыся, адказаў той. — Жуйку жую. Не дапамагае. Будзеш?

Антон з гідлівасцю паглядзеў на жуйку, махнуў рукой, маўляў, давай.

— Ну, значыць, Оля, — пачаў, засяроджана разжоўваючы свой сцімарал. Звонку выглядала, быццам ён перажоўвае кожнае слова. — Карацей, яна прастытуткай працавала. Было такое.

— А ты адкуль ведаеш? — зажаваў у адказ Фіма.

— Ды яна ў суседнім пад'ездзе жыве, — патлумачыў Антон. — Я яе сто гадоў ведаю. Я яе сюды і прывёў. Думаеш, багата жадаючых тут сядзець?

— Ну, а што ж яна пайшла з прастытутак?

— Адкуль я ведаю? — незадаволена адказаў Антон. — Прастытуткі — яны як баксёры, кар'ера ў іх яскравая, але кароткая.

— Я зразумеў, — адказаў Фіма.

Ён адчыніў акно. Стрэліў сцімаралам у паветра. Антон таксама адкрыў, таксама стрэліў. Моўчкі паціснулі адзін аднаму рукі, разышліся.

Ці так ужо кепска быць прастытуткаю? Ці такая ўжо гэта жыццёвая параза? — думаў Фіма, прыходзячы ў сябе. Што нас адштурхоўвае ад гэтых жанчын? Грамадская знявага? Працаўнікоў пракуратуры грамадства зневажае куды больш. Калі падумаць, — казаў ён сабе, — хто ўвогуле ідзе ў прастытуткі? Людзі цяжкай долі, супярэчлівага жыццёвага шляху. Пакінутыя палюбоўніцы, здраджаныя нарачоныя, недалюбленыя дзеці. Студэнткі, пазбаўленыя сямейнай падтрымкі. Працаўніцы, выкінутыя са швейных цэхаў. Маці-адзіночкі, жанчыны-алкагалічкі, сіроты, прыхадні ды ўдо-

вы. Становяцца ўдовы прастытуткамі? Напэўна, становяцца — чым ім яшчэ займацца? І хто я такі, каб іх асуджаць? — думаў Фіма. — Якія ў мяне падставы думаць пра іх дрэнна? Больш за тое, ёсць падазрэнне, што большасць з іх жывуць жыццём куды цікавейшым за маё, больш насычаным, поўным прыгод і небяспекі. Відавочна, у прастытуткі ідуць жанчыны, якія маюць патрэбу ў любові. Бясспрэчна. Толькі так. Жанчыны, здольныя дзяліцца пяшчотай, здольныя выклікаць рэўнасць і спыняць дэпрэсію. Упэўнены, што сярод прастытутак часта трапляюцца натуры адукаваныя і начытаныя, якія такім дзіўным спосабам выяўляюць сваё захапленне перад светам, звяртаюцца да больш глыбокага ды поўнага яго пазнання. Ясна, што большасць з іх ведае псіхалогію і медыцыну, здольныя здымаць стому і вяртаць памяць, большасць з іх носіць шаўковую бялізну ці пірсінг у найбольш нечаканых месцах. Усе яны закаханыя ў музыку ды сваю працу, усе яны навучаны гэтыя заняткі аб'ядноўваць. Вечарамі яны вяртаюцца ў свае пакоі, лёгка і весела накладаюць каштоўны макіяж, надзяваюць маскі і ўпрыгожанні, сцелюць чырвоныя прасціны ў чаканні смелых і шчодрых мужчын. Адчыняюць вокны і ўпускаюць у памяшканне зялёныя круглыя месяцы, што серабраць ім скуру і робяць зубы іхнія белымі, як бітая парцаляна. Яны паляць у пакоі травы, каб мужчынам потым сніліся лясы і чорныя рэкі з невядомымі гарадамі, яны не спяць ноччу і засынаюць днём, як вампіры. Раніцай збіраюцца на тэрасах, апавітых вінаградам, і гавораць пра спевы ды астраномію, знаходзяць на чорных палотнішчах перадсвітальнага неба сузор'і, назіраюць за птушкамі, адгадваюць надвор'е на бліжэйшыя дні, п'юць салодкі ром.

Пасля разыходзяцца па дамах, набіраюць поўныя ванны прахалоднай вады, ляжаць там гадзінамі, і калені іхнія свецяцца ў цёмнай вадзе, нібы месяцы.

Наступным ранкам ён зноў прыехаў. Доўга завязваў святочны гальштук, ледзьве пры гэтым не задушыўся. Прыпаркаваўся пад пірацкім сцягам, набраў Антона. Той выбег заклапочаны і змрочны, моўчкі паціснуў руку, узяў прапанаваны сцімарал.

— На месцы? — спытаў Фіма.

— На месцы, — адказаў Антон.

— Я зайду?

Антон засяроджана зажаваў.

— Слухай, — сказаў, памаўчаўшы, — яно табе патрэбна?

— А што такое? — не зразумеў Фіма.

— Для чаго табе?

— Для раўнавагі, — растлумачыў Фіма.

Антон моўчкі вылез, грукнуўшы дзверцамі. Фіма пасядзеў, пачакаў, вылез следам. У бары было пуста. Ён кіўнуў Антону, той раздражнёна адвярнуўся. Выбраў месца насупраць барнай стойкі. Паказвалі той жа футбол, што і ўчора. Фіма падумаў, што за гэтыя тры дні паспеў вывучыць саставы каманд. Але глядзеў на экран з непадробнай цікавасцю. Оля выбегла хвілін праз дзесяць. Аб нечым пашапталася з барменам, зноў знікла, нават не паглядзеўшы ў залу. Фіма занерваваўся. Глядзеў матч, з агідаю чакаючы нулявую нічыю.

Праз некаторы час яна падышла. Спытала, што ён будзе піць. Фіма разгубіўся. Што ж ёй сказаць? — падумаў. Нешта спытаў, чымсьці пацікавіўся, міжволі палез па кішэнях.

— Што там? — спытала яна.

— Трубу пасеяў, — незадаволена адказаў Фіма.

— Давай цябе набяру.

Оля дастала пабітую і пераматаную скотчам нокію. Фіма прадыктаваў, яна набрала. Пачакалі. На бары Антон, скрыгочучы, праціраў посуд. Фіма збянтэжана сказаў нешта на развітанне, выходзячы, махнуў Антону, нават не стаў чакаць адказу. Ды і не было ніякага адказу. Труба ляжала ў фіаце, на падлозе, пад стырном. Фіма падняў, паглядзеў уваходныя, набраў яе нумар.

— Ты сёння калі заканчваеш? — спытаў.

— А што? — яна нават не здзівілася.

— Давай заеду за табой?

— Ну, заедзь, — лёгка пагадзілася Оля.

Ён хацеў нешта дадаць. Але што тут можна дадаць?

У ліпені гэтыя пустыя дамы здаюцца асабліва занядбанымі. Трава на падаконнях губляе свежасць, суха паказваючы кірунак ранішніх скразнякоў. Дрэвам у пад'ездах бракуе вільгаці. Горыч бітага каменя, сонечная ліпкая павуціна, вулічныя псы — чуллівыя і павольныя, як цяжарныя жанчыны: ліпень падаўжае цені і выпальвае колеры, доўгія вечары наступаюць раптоўна і нечакана, старыя мужчыны сядзяць у ціхіх дварах, залітых вячэрнім святлом, скура іхняя становіцца цёплай, зморшчыны робяцца глыбокімі, лета перавальваецца на той бок горада і абагравае на процілеглым беразе чырвоную цагляную кладку старых складоў і заводскіх прахадных. Сонца сплывае за плынню, бы скінуты з моста кватэрны злодзей, небасхіл да ночы праймаецца выблiскамі. У канцы ліпеня паміраюць старыя беспрацоўныя ў сваіх захлам-

леных пакоях, пазбаўленыя ўвагі і любові, паколькі ўся любоў гэтых дзён дастаецца маладым. Дзяўчаты млеюць ад спёкі, спускаюцца да вады, трымаюцца яе свежасці, асцерагаючыся прыбярэжнай зелені. Вуліцы асабліва звонкія, таму кожны неасцярожны крок і раптоўны крык палохаюць галубоў на дахах і разамлелых ад сонца бяздомных, што селяцца на лета ў закінутых разбомбленых памяшканнях. Хочацца гаварыць ціха, каб цябе ніхто не пачуў, а пачуўшы — не зразумеў.

Ён яшчэ не паспеў прыпаркавацца, а Оля ўжо падняла па лесвіцы. Убачыла яго фіат, села на пярэдняе сядзенне. Фіма пацягнуўся цалавацца, яна суха дакранулася да яго выгаленай шчакі. Усё як паміж сябрамі. Альбо паміж мужам і жонкай, што дамовіліся расстацца. На ёй была кароткая сукенка. Ногі яе ад гэтага здаваліся яшчэ даўжэйшымі. Яна ўвесь час папраўляла прычоску, жмурачыся супраць вечаровага сонца.

— Курыць можна? — спытала.

— Я кінуў, — адказаў Фіма.

— Маладзец, — адказала на гэта Оля, дастала цыгарэты і запаліла. Паглядзела на яго разгублены твар, скептычна хмыкнула, апусціла са свайго боку шкло.

— Куды паедзем? — Фіма справіўся-такі са сваім хваляваннем і ўзяўся за справу.

— Ды нікуды, — адказала Оля. — Давай тут пастаім.

— Тут? — не зразумеў яе Фіма. — Ну давай.

— Ты нешта хацеў? — спытала Оля, нават не паглядзеўшы ў яго бок.

— Проста пагаварыць хацеў, — адказаў Фіма.

— Добра, — пагадзілася яна, — гавары.

І адвярнулася да акна.

Яна крыўдуе, зразумеў Фіма. Магчыма, Антон ёй усё расказаў. Магчыма, яна здагадваецца, што я пра ўсё ведаю. Магчыма, думае, што я стаўлюся да яе як да былой прастытуткі. Магчыма, менавіта гэта яе і прыгнятае. Сапраўды, свінства з майго боку — гуляць на яе мінулым, карыстацца яе памылкамі. Яна даўно пачала новае жыццё, а тут я. Ясна, што яе гэта крыўдзіць. У ніякім разе нельга ёй казаць, што я пра ўсё ведаю. Нават намёкамі, нават жартам. Трэба, каб яна супакоілася, каб зразумела, што я не збіраюся яе шантажаваць. Лепш гаварыць пра нешта нейтральнае.

— Раскажы пра сябе, — папрасіў Фіма. — Чым ты цікавілася ў дзяцінстве? Хлопцамі?

Чорт, — падумаў, — цяпер яна мяне пашле.

— Хіміяй, — адказала Оля.

— Хіміяй? — здзівіўся Фіма. — Разумею: формулы, колбы, кіслоты. Багата ў цябе сяброў было?

Чорт! — зноў спахапіўся.

— Так, — адказала на гэта Оля, — у нас цэлы гурток быў.

— І чым вы там займаліся? — пацікавіўся Фіма. — Сапраўды хіміяй?

Чорт! Чорт!

— Мы ставілі доследы.

— Эксперыментавалі разам?

!!!!!!!!!!!

— Мы ўсе, — сказала раптам Оля, — былі закаханыя ў хіміка. Ён быў стары і прыгожы. Табе падабаюцца старыя мужчыны?

— Старыя? Што ты! — неяк недарэчна адказаў Фіма, ліхаманкава думаючы, пра што гаварыць далей.

— У яго былі прыгожыя пальцы, — не дала яму працягнуць Оля. — Калі ён дакранаўся да мяне, мне станавілася холадна. А потым я ўся пачынала гарэць.

— Ён дакранаўся да цябе? — не зразумеў Фіма.

— Так, — пацвердзіла яна. — Мне было пятнаццаць. Мне хацелася даведацца пра ўсе таямніцы жыцця. Адчуць усю асалоду гэтага свету. Таму я выбрала менавіта яго — дарослага і дасведчанага, з прыгожымі пальцамі. Ён быў маім першым мужчынам.

— Як гэта? — не адразу зразумеў Фіма.

— У плане сэксу, — павярнулася да яго Оля. — У нас з ім гэта адбылося проста ў класе пасля ўрокаў. На мне была зусім кароткая форма, яму нават не прыйшлося мяне распранаць.

Оля дастала новую цыгарэту.

— А потым? — Фіма цяжка праглынуў сліну і аслабіў вузел гальштука.

— А потым ён памёр, — ахвотна патлумачыла Оля. — Не адразу, вядома, не пасля нашага з ім сэксу. Недзе праз год. Сэрца. Мы класам хадзілі на пахаванне. Пасля яго засталася прыгожая ўдава. Трошкі паўнаватая, але наогул нічога, як на яе ўзрост. Падкінеш мяне дадому? — спытала нечакана.

У дарозе яны маўчалі. Але і дарога была кароткаю.

Удовы, думаў Фіма, удовы — тыя напэўна. Удовам туды прамая дарога. Іх там чакаюць з распасцёртымі абдымкамі. Удовы — найлепшыя каханкі. Найвыслівейшыя. Найнеспакойнейшыя. Яго першай жанчынай была ўдава. Гэта была ледзьве не адзіная яе перавага. Знаёмая бацькоў. Кандыдат навук. Большасць знаёмых яго бацькоў былі кандыдатамі навук.

У дзяцінстве Фіма быў перакананы, што кандыдаты навук складаюць большасць насельніцтва гэтага горада. А дацэнты складаюць яго меншасць. Дацэнтаў сярод іхніх знаёмых таксама хапала. У іх была салідная сям'я, Фіма вырастаў у прыстойным асяроддзі. У прынцыпе, маючы такую колькасць знаёмых кандыдатаў, цяжка было пераспаць упершыню з кімсьці іншым. Удава сама праявіла ініцыятыву, прапанавала сяброўства, абяцала пратэкцыі пры паступленні, давала кансультацыі. Адна з кансультацый у яе дома завяршылася нейкім занадта хуткім сэксам. Фіма не супраціўляўся. Хай будзе кандыдат, — падумаў ён. Потым яна сапраўды дапамагла пры паступленні, хоць паміж імі больш нічога не было. Спадзяюся, ёй не спадабалася, — думаў Фіма. Але з удовамі пасля гэтага быў асцярожны. З удовамі ніколі не ведаеш, як выйдзе, — думаў ён цяпер, курачы на балконе і разглядаючы залатыя агні ў старых будынках над ракою. З удовамі ён быў асцярожны настолькі, што, нават пачаўшы ўласную справу, стараўся браць на працу толькі замужніх. Пажадана сярэдняга ўзросту. Пажадана з залатымі зубамі. Гэта дысцыплінавала.

Уначы ён напісаў ёй паведамленне. Нешта аб тым, што гэтай позняй парою, калі над вуліцамі ў ліпкім паветры праносяцца дэманы і дым на кухнях гусцее, пахнучы макам і шакаладам, ён, як стары змардаваны пірат, вызірае сярод бэзавай ночы агні яе памяшкання і адчувае сваім вострым пацучыным нюхам, як пяшчотна пахне яе скура, адчувае, як яна лёгка правальваецца ў свае сны, быццам у крохкі і бязважкі калядны снег, і пакуль крышталі марозу запякаюцца на яе вус-

нах, ён нясе сваю вахту, ахоўваючы яе спакой і разганяючы дэманаў сваімі кубінскімі цыгарэтамі. Перачытаў, падумаў, што пра мак — гэта лішняе. Вырашыў паведамленне знішчыць. Нацiснуў нешта не тое, эсэмэс такі даслаўся ёй. Стаяў і са страхам чакаў: адпіша ці не. Недзе а чацвёртай ранку, калі апошнія дэманы расталі ў ранішніх прыцемках, тэлефон сеў.

Яна перазваніла сама, пасля абеду.

— А што ты пра шакалад пісаў? — пацікавілася.

Фіма пачаў апраўдвацца, прыдумляць блытаную таямнічую гісторыю пра падзеі мінулай ночы, пра падазроных знаёмых і іхнія сямейныя праблемы, пра познія званкі і начныя істэрыкі, пра марныя спробы ўсіх супакоіць і памірыць, пра выклікі таксі і паездкі праз начны горад, пра адкрытыя пагрозы і ўрачыстыя клятвы. Шакаладу ў гэтай гісторыі месца яўна не было, ён зусім заблытаўся і проста прапанаваў сустрэцца.

У грузін, куды яны прыйшлі, яна прывіталася з афіцыянтам, той пазнаў яе, весела адгукнуўся, важна кіўнуў Фіму. Адразу пачаў нешта раіць, ад чагосьці адгаворваць. Фіма спецыяльна апрануўся неафіцыйна, то-бок у летнюю кашулю і светлыя штаны, і без гальштука адчуваў сябе няўпэўнена — нібы пёс, якога ўпершыню на ноч спусцілі з ланцуга. Больш за ўсё яму хацелася назад — на ланцуг. Адкуль ён яе ведае? — думаў, падазрона гледзячы на афіцыянта. Гэта неяк звязана з яе мінулым? Колькі мужчын засталося ў гэтым яе мінулым? Яна што, з усімі імі будзе вітацца? Фіма нерваваўся і неяк нечакана для самога сябе напіўся. Олю гэта цешыла, маладзец, казала, пі, табе так лепш. Ён піў, але пільнасці не губляў, галоўнае, на-

гадваў сабе, не прагаварыцца, не даць ёй зразумець, галоўнае — без намёкаў. Спачатку загаварыў пра работу, назваў заказчыкаў прадажнымі сукамі, прыкусіў язык, перайшоў на палітыку, распавёў гісторыю пра дэпутатаў ад партыі ўлады, якія карыстаюцца паслугамі хлопчыкаў па выкліку, зноў абарваўся на паўслове, згадаў крымінальную хроніку, выпадак з закрытай саўнай, у якой накрылі святароў, але тут нават яна папрасіла яго замаўчаць. Урэшце перайшоў да навін спорту. Паглядзеў на афіцыянта, сказаў, што той, відавочна, былы баксёр — такі ў яго мяты нос. Так і ёсць, пацвердзіла Оля, ён баксёр. — А адкуль ты яго ведаеш? — не вытрымаў-такі Фіма. Будзе што будзе, плаваў ён у алкагольным тумане, але я павінен гэта ведаць. — Ну як адкуль? — адказала Оля. — Ён да нас у бар ходзіць. За «Манчэстэр» заўзее. Дзіўна, праўда? Ён прыходзіць да мяне, я прыходжу да яго. Такое ўражанне, што ўся публіка рэстаранаў — гэта афіцыянты з іншых устаноў. Табе падабаюцца афіцыянты? — спытала.

— Афіцыянткі, — адказаў Фіма паспешліва. — Афіцыянткі падабаюцца.

— О, — падхапіла Оля. — Мне таксама афіцыянткі падабаюцца. У мяне была калісьці адна афіцыянтка. Звалі яе Кірай, яна жыла на Трактарным, займалася ёгай, магла доўга не дыхаць. Доўга-доўга. Ты думаеш: усё, трэба выклікаць хуткую, уставаць, апранацца, бегчы за міліцыяй. І тут яна выдыхае. Я адчувала сябе сумна і пуста, мне было васямнаццаць, і жыццё здавалася мне нясцерпным. Менавіта тады я з ёй і пазнаёмілася. Хочаш, цябе пазнаёмлю?

— Хачу, — п'яна заківаў галавой Фіма, — вельмі хачу.

— Пазнаёмлю, — паабяцала Оля. — Проста цяпер, хочаш?

— Хачу, — зноў пагадзіўся ён і дапіў рэшткі грузінскага чырвонага проста з бутэлькі.

Ён хацеў пазнаёміцца з усімі яе сяброўкамі, пабачыць усіх яе мужчын, паглядзець у вочы ўсім яе знаёмым, хацеў абдымацца з баксёрамі і мерацца сіламі з барцамі, біцца на нажах з барменамі і гуляць у косці з паркоўшчыкамі. Хацеў даведацца ў яе сябровак, што яны гаварылі ёй, перш чым яна ішла з імі ў ложак, як яны пераконвалі яе, што абяцалі. Хацеў даведацца ў яе мужчын, як яна выглядала раней, без гэтай хлапечай прычоскі, якога насамрэч колеру яе валасы, як яна выглядае зранку, без усёй гэтай чорнай фарбы, што яна кажа са сну, пасля ўсяго таго, што было ноччу, як яна загаворвае пасля знясілення і маўчання. Хацеў перагаварыць з яе школьнымі настаўнікамі, хацеў, каб яны распавялі яму пра яе паспяховасць, пра яе паводзіны, пра яе захапленне хіміяй і спортам, пра колер і крой яе школьнай формы. Хацеў выпіць з настаўнікам працы і паразумецца з настаўнікам гісторыі, хацеў паглядзець у вочы завучу і расцалаваць класную кіраўніцу, хацеў апынуцца ў яе жыцці, апынуцца там поруч з ёй, так блізка, каб адчуваць, як кроў перацякае пад яе скурай. Хацеў далучыцца да ўсіх яе таямніц, да ўсіх загадак, якія яна хавала ў памяці, хацеў ведаць на памяць усе яе шматлікія гісторыі, хацеў выпраўляць яе памылкі, развейваць яе сумневы, стаць часткай таго, што з ёй адбывалася, адкрыць для сябе яе жыццё, быццам знойдзеную ў чужым памяшканні валізу, сядзець і перабіраць каштоўныя сведчанні чужых перажыванняў і чужога смеху. Хацеў усім кіраваць, хацеў мець да ўсяго дачыненне.

На вуліцы яна доўга адгаворвала яго ад аўтамабільнага шпацыру за горад. Урэшце ён пагадзіўся. Добра, сказаў, дзе твае афіцыянткі? Спачатку яны спыніліся ў туркаў насупраць. Там ён падцягваў бясконцую любоўную песню за нейкай тлустай вусатай бліскучай дзевай на экране і намагаўся пакінуць гасцінца каму-небудзь з наведвальнікаў. Наведвальнікі былі выключна туркамі, разабрацца, хто з іх працаўнік, а хто — кліент, было не так проста. Потым Оля пацягнула яго па розных падазроных месцах. Яны заглядвалі ва ўсе тыя норы і скляпы, якія яна магла ўспомніць, былі, зразумелая справа, у арабаў, зазірнулі, вядома ж, да в'етнамцаў, браталіся з працаўнікамі «Макдоналдса», якія даўно да такога прызвычаіліся, пілі на брударшафт з працаўнікамі тубдыспансера, марна спрабавалі заказаць шампанскае ў саўне «Здароўе», згадвалі дзяцінства ў падвале насупраць сінагогі, намагаліся знайсці дзяўчат па выкліку ў дзіцячым кафэ. Якраз там ён перавярнуў сабе на калені малочны кактэйль і доўга замочваў плямы горным бальзамам. Прасіў запісаць прадаўцоў піцы яму свае адрасы, лавіў каньячныя выпарэнні ў грузін, да якіх яны зноў вярнуліся, паколькі на той час усё было зачынена. Ужо там з'явілася жывая музыка, і ён танцаваў ірландскія народныя танцы, замінаючы афіцыянтам і выклікаючы яе захапленне.

А дзесьці апоўначы апынуліся ля яго дома, і ён цвёрда, як яму здавалася, сказаў: ты нікуды не пойдзеш, ты павінна застацца са мной. Толькі так. Сказаў гэта так цвёрда і пераканаўча, што яна не стала пярэчыць, добра, адказала, так і будзе, ідзі наперад і паказвай дарогу, бо ўжо сіл маіх няма цябе цягнуць. Ён развярнуўся і пайшоў, цяжка арыентуючыся ў ліпеньскай цемры

і слухаючы шэпты ва ўласнай галаве. А каб яна не згубіла яго і не адстала сярод ночы, увесь час гаварыў, гаварыў, каб яна ішла на яго голас, каб рухалася за ім і не засталася адна. Гаварыў, што хоча ўбачыць сяброўак яе мужчын, біцца з баксёрамі і ламаць косткі паркоўшчыкам. Гаварыў, што абавязкова пераканаецца, з кім яе сяброўкі ідуць у ложак, і дазнаецца, што ім для гэтага паабяцалі. Гаварыў, што ведае ўсё пра чорную фарбу хлапечых прычосак і знясіленне школьных настаўнікаў, намякаў, што ад яго не схаваеш манеру ды паводзіны, сцвярджаў, што абавязкова павінен пацалавацца з настаўнікам працы і выпіць з класнай кіраўніцай. Пагрозліва намякаў пра кроў, што цячэ занадта блізка, скептычна адгукаўся аб сваіх шматлікіх гісторыях. Пад канец завёў размову пра каштоўныя валізы ў чужых хатах, патрабаваў прынесці іх яму проста цяпер, не мог супакоіцца з гэтымі валізамі, гаварыў пра іх са смехам і перажываннямі. Гаварыў і думаў так: галоўнае — не азірацца, галоўнае — не змаўкаць, пакуль я буду ісці і гаварыць, яна будзе ісці за маім смехам, пакуль я буду мець што сказаць, яна вымушана будзе слухаць, яна дойдзе да канца, і даслухае да канца, і застанецца са мной гэтай ноччу. Усё ж яна павінна даведацца, чым гэта ўсё скончыцца, павінна ж дачакацца развязкі. Галоўнае — гаварыць і не спыняцца. Ён больш-менш цвёрда падышоў да пад'езда, залішне шырока прачыніў дзверы, даволі бестурботна ступіў у цемру. Цяжка падымаўся па сходах, павольна падбіраў ключы, прадбачліва не ўключаў святло. Гаворачы і не аглядваючыся, прайшоў па калідоры, скінуў чаравікі, прайшоў у пакой, зняў з сябе кашулю, заваліўся ў ложак.

Яна пастаяла ўнізе, на вуліцы, пачакала. Пачуўшы, як рыпнулі дзверы яго кватэры, супакоілася, пайшла.

Ён прачнуўся рана. Ва ўласным ложку. Знайшоў у кішэні рэкламу з «Макдоналдса». Здзівіўся. Скура яго аддавала горным бальзамам, футболка была запэцкана соевым соусам. Перазванілі з працы, сказалі, што заказчыкі хочуць сустрэцца. Ён падумаў, вырашыў сустрэчу перанесці. Потым падумаў і вырашыў нічога не пераносіць. Але паглядзеў на футболку і ўсё-ткі перанёс.

Оля пачала пісаць недзе пад абед, калі яму стала лепей. — Пра якія валізы ты казаў? — пыталася. — З табой усё ў парадку? Ты нікога не абрабаваў? — Здаецца, не, — адказаў ён, — хаця ўсё можа быць. — Ты напалохаў мяне гэтымі валізамі, — напісала яна зноў, — я сядзела на тэрасе, абвітай вінаградам, гаварыла з сяброўкамі пра спевы і астраномію, назірала за птушкамі і ўсё не магла заснуць. Нават ром не дапамог.

Якое цікавае і таямнічае ў яе жыццё, думаў ён, павольна прыходзячы ў сябе, колькі ўсяго нечаканага і загадкавага адбываецца з ёй кожную ноч. Як яна жыве? Хто яе сябры? Колькі ў яе знаёмых? Ёй, напэўна, лёгка з імі, яны любяць яе, ім заўсёды ёсць пра што пагаварыць. Сабраўшыся, яны ўспамінаюць вандроўкі і прыгоды, недарэчныя вечарынкі і ночы кахання, марскія ўзбярэжжы і волкія гарадскія сутарэнні. Яны гавораць пра любоў і здраду, паказваюць новыя ўпрыгожанні і распавядаюць пра апошнія подзвігі, іхнія кішэні набіты банкнотамі і чыгуначнымі квіткамі, яны заўсёды гатовыя сарвацца з месца і растварыцца ў прасторы, ірвучыся насустрач сонцу, уцякаючы ад стомы і расча-

равання. Як бы мне хацелася таксама ўсё гэта мець, горка думаў ён, як бы мне хацелася жыць так, як яна: лёгка, нязмушана і вынаходліва. Ні ад кога не залежаць. Ні ў чым сабе не адмаўляць. Мець справу з каханнем, мець справу з жарсцю. Што я бачыў у сваім жыцці? Хіба мне даводзілася калі-небудзь перажываць смяротную небяспеку? Хіба мне выпадала хаця б калісьці перажыць шалёную закаханасць? Я нават не спаў з ніводнай афіцыянткай! З дачкой дырэктара рэстарана спаў, а з афіцыянткамі — ніводнага разу!

Дачка дырэктара рэстарана была яго першай жонкай. Адбылося гэта неяк само сабою: пазнаёміліся ў кагосьці на вяселлі, потым схадзілі разам да кагосьці на памінкі, былі ў кагосьці на дні нараджэння, сустракалі з кімсьці Новы год. Недзе пераспалі, неяк прывыклі адно да аднаго. Яна прапанавала ажаніцца, ён не пярэчыў. Яе тата падарыў яму фольксваген. Шчыра кажучы, калі б была такая магчымасць, ён узяў бы толькі фольксваген. Шкада, але пасля разводу давялося яго вярнуць.

На наступны дзень, пасля абеду, ён выцягнуў яе за горад. Расказваў пра работу, згадваў смешныя выпадкі з мінулага, сам і смяяўся. Каля восьмай яна папрасіла адвезці яе дадому. На выхадных ён запрасіў яе да сябе. Яна адмовілася, прапанавала проста недзе пасядзець. Ён зноў нешта расказваў, спрабаваў яе разгаварыць. Яна рассеяна адказвала, часам не зусім яго разумела, але ветліва слухала. На наступным тыдні было шмат працы — ён вызваляўся дзесьці а дзявятай, набіраў яе, яна адказвала, што сёння не можа, сустракаецца з сябрамі, ідзе да сяброўкі, чакае знаёмых. Дамовіліся сустрэцца ў пятніцу. Сустрэліся. Ён доўга ёй нешта

плёў, блытана тлумачыў нейкія простыя, як яму здавалася, рэчы, горача ў нечым запэўніваў, упарта нешта паўтараў. Ну, добра, — пагадзілася яна, — пайшлі да цябе. Пакажаш свае валізы.

Піць яна адмовілася, і што было ў такім выпадку рабіць, ён не ведаў. Яна спытала пра работу, ён пачаў расказваць, але і сам зразумеў, наколькі сумна ўсё гэта гучыць. Дарма я яе сюды прыцягнуў, думаў, усё больш нервуючыся, выглядаю цяпер ідыётам. І паводжуся як ідыёт. І ўжо ліхаманкава думаў, што б такое прыдумаць, што б прапанаваць, каб яна пагадзілася адсюль сысці, куды яе павесці, чым запоўніць час. Оля падышла да паліцы з кнігамі, дастала нешта прыгодніцкае.

— У цябе ёсць дзеці? — спытала.

— Дзеці? — здзівіўся ён. — Не, дзяцей няма.

— Чаму? — пацікавілася яна.

— Не ведаю, — разгубіўся Фіма. — Ніхто не хацеў, я сам не падумаў. Неяк так. Ты пра кнігі пытаешся? — зразумеў ён. — Гэта мае, дзіцячыя. Даўно хацеў выкінуць, мама папрасіла пакінуць. У свой час іх не так проста было дастаць.

— Я ведаю, — адказала Оля, — нашы старэйшыя чыталі гэтыя кнігі. Так мае быць, правільна? Мужчыны з дзяцінства павінны прывыкаць да кепскай літаратуры, бо менавіта яна вучыць іх быць сапраўднымі мужчынамі.

Узяла кнігу, села з ёй на падлогу. Ён сеў побач. У дзяцінстве, сказала Оля, мяне гэта хвалявала. Я думала: трэба ж, яны ўсе чытаюць аднолькавыя кнігі. Мабыць, гэта не проста так, мабыць, я шмат чаго проста не магу зразумець, пакуль таксама не прачытаю іх. Хоць, прачытаўшы, усё адно нічога не зразумела. За-

тое потым, размаўляючы з імі ўсімі, назіраючы за іхнім сталеннем, маючы з імі справу, улюбляючыся ў іх, я заўсёды знаходзіла нешта з гэтых кніг — у размовах, у паводзінах, у дурыках, якія яны рабілі. Не так многа рэчаў нас аб'ядноўвае. І праўда, згаджаўся ён, не так многа. Нават кнігі, якія мы чыталі, аб'ядноўваюць не заўсёды. Вось у мяне, пачаў расказваць ён, ніколі не было сяброў. Я таварышаваў з тымі, з кім раілі бацькі. Калі мы з імі заставаліся сам-насам, нам не было пра што гаварыць. Сядзелі, разглядалі рыбак у акварыуме. І ніякія кнігі нас не аб'ядноўвалі. А вось у мяне, падхапіла яна і таксама пачала распавядаць пра рыбак. І пра іншых жывёл, якіх яны знаходзілі на вуліцах і цягнулі дадому. І пра бацькоў, што выкідвалі на вуліцу ўсіх гэтых псоў, вожыкаў і чаротавых катоў, даводзячы дзяцей да слёз і расчаравання. І пра сваіх старэйшых, што першымі сыходзілі з дому і пачыналі жыць дарослым жыццём. І пра тое, як ёй хацелася быць да іх падобнай, як яе зачароўвалі рытмы ды механізмы іхняй жыццядзейнасці, іхняя незалежнасць, іхняя самастойнасць. І пра асабістыя праблемы сябровак, і пра мужчынскія праблемы сяброў, і пра складаную сістэму роднасных стасункаў, і пра заблытаныя прынцыпы любоўных трыкутнікаў. Было ўжо недзе а трэцяй ночы, Фіма трымаўся як мог, але пасля таго, як яна загаварыла пра трыкутнікі, моўчкі забраў у яе з рук кнігу і гэтак жа моўчкі пачаў сцягваць з яе футболку. Яна здзівілася і паспрабавала падняцца, але ён трымаў яе за рукі і цягнуў да сябе. Ну, што ты? — папрасіла яна. — Не трэба. Але яго гэта толькі падштурхнула наперад. Галоўнае — не спыняцца, у чарговы раз падумаў ён і зноў рашуча ўзяўся за футболку. Яна яшчэ паспрабавала неяк запярэчыць,

мякка яго адштурхоўвала, але калі тканіна трэснула пад яго рукою, не стрымалася і засадзіла яму каленам проста паміж ног. Фіма роспачна ўскрыкнуў і заваліўся на падлогу. Яна адпаўзла назад, цяжка дыхаючы і папраўляючы сваю хлапечую прычоску. Паступова супакоілася. Ён таксама заціх, ляжаў, не адважваючыся падняцца.

— Ты як? — спытала яна хрыпла.

— Нармальна, — адказаў Фіма, не паднімаючыся.

— Прабач, не хацела так моцна, — запэўніла яна.

— Нічога, — адказаў ён, трымаючыся за траўмаванае месца, — бывае.

— Я пайду? — спытала яна.

— Давай адвязу цябе, — прапанаваў Фіма.

— Дайду, — запэўніла яна. — Ты сапраўды ў парадку?

Ён бадзёра падняў руку, маўляў, усё нармальна, бывае горш. Калі яна ўжо выходзіла, павярнуўся і спытаў:

— Памятаеш, ты пісала мне пра спевы і астраномію?

— Пра якую астраномію? — не зразумела Оля.

— Не ведаю. Проста пра астраномію. Пра ром, пра птушак.

— Што ты выдумляеш? — засмяялася яна. — Давай, папраўляйся. Заўтра пазваню.

Ён чакаў зранку, прачнуўшыся. Чакаў, прыехаўшы ў офіс. Не вытрымаў, набраў яе. Яна не адказала. Праз паўгадзіны набраў яшчэ раз. Потым пачаў пісаць. Потым зноў тэлефанаваў. Занервавaўся, не вытрымаў, вырашыў з'ездзіць пагаварыць. Не адважыўся ўвайсці, набраў Антона.

— Зараз выйду, — коратка адказаў той.

Выйшаў праз пяць хвілін, сеў на пярэдняе сядзенне, дзверцы не закрываў, сачыў за пірацкім сцягам, быццам асцерагаўся, што адтуль нехта выйдзе незаўважаным.

— Карацей, яе сёння не было, — загаварыў Антон, нават не гледзячы на яго. — Думаю, у яе з братам зноў праблемы.

— Што за праблемы? — не зразумеў Фіма.

— Карацей, — сказаў Антон, памаўчаўшы. — Ёсць у яе брат. Рэдкасны мудак. Мамы ў іх розныя, яны брат і сястра па бацьку. Жыў недзе на Поўначы, вярнуўся гадоў пяць таму, калі яе старыя памерлі. Маўляў, старэйшы брат, родная кроў. Прэсуе яе па-страшнаму. Яму нагаварылі аб ёй рознага, ён яе цяпер з хаты не выпускае. Яна ўчора ў цябе была?

— Ну, — не адважыўся запярэчыць Фіма.

— Ну, вось ён яе, мабыць, і не пускае цяпер нікуды.

— Яна ж не малое дзіця, — здзівіўся Фіма.

— Ты б бачыў, — адказаў на гэта Антон. — У яго на скуры жывога месца няма — усё ў шнарах. І валасоў зусім няма — ні на галаве, ні на целе.

— Ты спаў з ім ці што? — раздражнёна выпаліў Фіма.

— Я з ёй спаў, — патлумачыў Антон.

— Як гэта? — не зразумеў Фіма.

— Ну, ты што, не разумееш? — растлумачыў яму Антон. — Я з ёй спаў. Яна мне наогул падабалася. Прастытутка? Хуй з ім. У мяне палова аднакласніц прастытуткамі сталі. Прычым другая палова ім зайздросціць. Я за ёй ужо ў старшых класах бегаў. Я спортам займаўся, каб яна звярнула на мяне ўвагу.

— Ведаю, яна баксёраў любіць.

— Якіх баксёраў? — пакрыўдзіўся Антон. — Гэта брат яе любіць баксёраў. Ды ладна, што я табе расказваю. Словам, яна мне заўсёды падабалася. А калі ў нас з ёй усё нарэшце атрымалася, вярнуўся яе брат.

— І што?

— І што? І зламаў мне нос. Глядзі, — Антон павярнуўся ў профіль. — У мяне нават перапонка пашкоджана.

Антон зранку, відавочна, пагаліўся. Але, мабыць, спяшаўся. Ці проста прывык рабіць гэта не надта ўважліва: на шыі былі парэзы, на сківіцы цямнелі валасінкі. Каўнер кашулі быў нясвежы, кольчык у вуху пацямнеў ад часу. Больш за ўсё яму, мабыць, хацелася схавацца за барнай стойкай і нікога да сабе не падпускаць. Пачакае, — злосна падумаў Фіма.

— У цябе ёсць яго нумар? — спытаў.

— Адкуль?

— Ведаеш, дзе ён можа быць?

— Ну дзе, — неахвотна адказаў Антон. — У сябе, у гаражах. Тут, за ракою, — паказаў ён уніз, — ёсць гаражы, ведаеш?

— Ну.

— У яго там СТА. Пабачыш прыбіты да сцяны сабачы чэрап — гэта яго месца. Толькі навошта гэта табе?

Фіма не адказаў. Антон пачакаў. З бара хтосьці вызірнуў — напалоханы погляд, нячэсаныя валасы, цёмная скура. Антон сарваўся, кіўнуў на развітанне, знік за дзвярыма. Фіма пакінуў машыну, спусціўся па вуліцы, перайшоў мост, прайшоў заводскую агароджу, выйшаў на гаражы.

Гліна, было шмат гліны, нібы тут нешта збіраліся выпальваць на агні. Нібы тут ніколі нічога не расло і па начах сюды прыходзілі памерлыя, спаталяючы го-

лад сухімі глінянымі камякамі. Чорныя скаты, укапаныя ўздоўж дарогі, бясконцая белая цагляная сцяна, шчодра распісаная біблійнымі цытатамі — пад нагамі рассыпалася гліна, над галавою палала сонца, у траве ляжалі газеты і мёртвыя каты, пахла пеклам і рачной вадою. Уезд быў перакрыты іржавым шлагбаумам, побач стаяла будка вахцёра — трэснутае шкло, каляндарыкі, лістоўкі, пераматаны ізаляцыйнай стужкай кавалак шланга, прачыненыя дзверы, чорная кроў, што ўелася ў цэментавую падлогу. Вахцёра не было. Фіма пакруціўся, зазірнуў унутр. Вахцёр шмат курыў, вядома, дрэнныя цыгарэты, вядома, не выходзячы на вуліцу. Вопратка яго, мабыць, не адмывалася ад тытуню. Разбітая дарога вяла наперад, злева і справа цягнуліся шэрагі белых цагляных гаражоў. Фіма падумаў і пайшоў налева. Ішоў уздоўж металічных дзвярэй, разглядаў цяжкія навясныя замкі. Дзе-нідзе ля сцяны ляжаў металалом, часам угары праляталі наполаханыя птушкі. Не было нікога відаць, паўсюль стаяла цішыня, і рабілася ад гэтага жудасна. Фіма прайшоў да канца, упёрся ў цагляную агароджу, павярнуў направа, выйшаў на наступны шэраг, убачыў бакавую вулачку, звярнуў туды. Зноўку прайшоў да канца, зноў павярнуў направа. Гаражы цягнуліся бясконца і безнадзейна. Дзе яны ўсе? — падумаў ён. — Мае ж тут нехта быць. Спыніўся, прыслухаўся. Па выгаралай траве перабягалі яшчаркі, пад шыфернымі стрэхамі шаргацелі ластаўкі, вецер працягла трубіў у адтуліны і пустоты металічных дэталяў, нібы спавяшчаючы сонны горад аб набліжэнні нябачнага ворага. Раптам далёка наперадзе мільгануў каляровы выбліск. Фіма рвануў на рух. Паспеў заўважыць, як за рог паспешліва звярнуў нехта

ў стракатай кашулі. Фіма прабег да рага, вываліўся ў суседні праход, зноў паспеў заўважыць спіну незнаёмца. Той хутка ішоў уздоўж гаражоў у яскравай пляжнай кашулі, шэрых штанах і тэпцях на босую нагу. У руках трымаў нешта цяжкае і металічнае. Фіма было супакоіўся і думаў хутка дагнаць незнаёмца, аднак чалавек нечакана нырнуў у бакавы праход, таму Фіма зноў панічна кінуўся наперад. Дабег, таксама павярнуў, панёсся вузкім праходам, паміж высокімі сценамі, тамсям трушчачы начышчанымі чаравікамі бітую цэглу і наступаючы на пустыя пачкі з-пад цыгарэт і выкарыстаныя прэзерватывы. Мужчына наперадзе ўсё не рабіўся бліжэйшым, нейкім чынам у яго выходзіла ўвесь час заставацца недзе наперадзе, мільгацець кашуляй, збіваць камяні пад нагамі. І як Фіма ні паскараў крок, дыстанцыя паміж імі не змяншалася. І тады Фіма наважыўся.

— Гэй! — крыкнуў ён.

Голас сярод цішыні трэснуў і раскалоўся. Незнаёмец, зрэшты, яго пачуў. Спыніўся, вярнуўся. Фіма падумаў і рашуча рушыў наперад. І тады незнаёмец кінуўся ўцякаць. Фіма кінуўся следам. Цішыня напоўнілася цяжкім тупатам. Мужчына наперадзе дабег да сцяны, на скрыжаванні замітусіўся, не ведаючы, куды яму далей, аднак скочыў улева і знік за рагом. Фіма пачуў, як аддаляюцца яго крокі. Таксама дабег да рага. Незнаёмца не было. Фіма бег наперад, прамінаючы шэрагі гаражоў і кожны раз спадзяваючыся пабачыць пярэстага мужчыну. Але той проста знік, быццам і не ён тут толькі што напалохана спыняўся, быццам не ён мітусіўся на ростанях. Фіма цяжка дыхаў, аднак упарта бег наперад, імкнучыся любой цаною дагнаць незна-

ёмца, спыніць яго, распытаць урэшце, што ў іх тут адбываецца. У нейкі момант адчуў, што праход паміж гаражоў ледзь прыкметна забірае ўлева і што ён вось ужо нейкі час бяжыць па крузе. Ужо думаў спыніцца і павярнуць назад, як раптам убачыў у адным з гаражоў напаўадчыненыя дзверы. Спыніўся, перавёў дыханне, падышоў, зазірнуў усярэдзіну.

У цемры пахла змазкаю і паленай поўсцю, сонечнае праменне, прабіваючыся з-за яго спіны, рассыпалася па чырвонай лакаванай паверхні легкавушкі. Гэта была «капейка», якая сумленна адпрацавала свой доўгі век, але не заслужыла спакойнай старасці, нешта было ў яе мінулым такога, за што яна пакутавала нават цяпер, пасля сваёй смерці. Што смерць была жорсткай, Фіма зразумеў адразу, як толькі пабачыў гэты металічны фарш пасярод гаража. Дэманы схапілі ў свой час гэтую машыну і доўга гулялі ёю ў рэгбі, кідалі яе з рук у рукі, запускалі ёй у гарачае неба. Жаваны метал, унутранае рыззё, чорная паленая гума, дробна перамолатае шкло — легкавік быў падобны да цела хрысціянскага святога, закатаванага рымскімі легіянерамі. Фіма прыглядзеўся. За машынай вісела ваўнянае покрыва. Нябачны скразняк час ад час лёгка пагойдваў яго цяжкі цёмны ветразь, быў там, відавочна, яшчэ нейкі нябачны выхад, варта было паспрабаваць. Фіма абышоў разламаную «капейку», асцярожна адвёў рукою ваўняную заслону. І не памыліўся: быў там яшчэ адзін пакой, завалены банкамі з-пад фарбы і бутэлькамі з-пад лаку. Асцярожна прайшоў, заўважыў наступныя дзверы, прыадчыніў іх. Увайшоў у наступнае, значна меншае памяшканне. У кутку стаяў канцылярскі стол, на ім ляжалі старыя пажоўклыя газеты.

Прайшоў усярэдзіну, уважліва агледзеўся па баках. Наступныя дзверы былі амаль непрыкметныя, толькі пройма ў сцяне цямнела, як шнар. Фіма падышоў, наваліўся на дзверы плячом. Тыя цяжка паддаліся, заскрыгаталі, адчыніліся. У вочы ўдарыла гарачае насычанае сонечнае святло. Фіма ступіў на вуліцу і закрыўся рукою ад балючых прамянёў. Але адразу ж адчуў чыёсьці дыханне. Адвёў руку, аднак заслепленыя вочы адмаўляліся хоць нешта адрозніваць. Прысеў, захінаючыся ад сонца і папераджальна выкінуўшы руку наперад. Перачакаў, усё гэтак жа адчуваючы побач нечую прысутнасць. Паступова зрок вяртаўся, у вачах заскакалі жоўтыя кругі і чорныя планеты, выступілі слёзы, сфакусавалася рэзкасць. Фіма падняўся. Проста перад ім, на адлегласці двух крокаў, цяжка дыхаючы і высалапіўшы сухія языкі, пільнавалі цёмныя вулічныя псы, прынюхваючыся і паскугольваючы ад напружання ды спёкі. Дзверы за плячыма, цяжка грукнуўшы аб іржавы метал, зачыніліся. Адступаць не было куды. Псы пазіралі на яго пуста і рашуча. Бліжэй не падыходзілі, хоць і вачэй не адводзілі, рыхтуючыся ў любы момант кінуцца і перагрызці яму горла. Старэйшы, найбольш рваны і мускулісты, быў шэрага колеру, меў лоб у шнарах і спярэшчаны чорным цяжкі язык. Адразу за ім стаялі двое маладых — падобных паміж сабой крывавымі нагамі і жоўтай жорсткай поўсцю. Гэтыя выглядалі яшчэ больш пагрозліва, і зразумела было, што кінуліся б на яго проста цяпер, проста чакалі каманды старэйшага. Трошкі далей, за іхнімі спінамі, драпежна выгінала хрыбет маладая сука з халоднымі ікламі, з высокім загрыўкам. Побач з ёй рыкаў зусім малады шчанюк з моцнымі, як на свой узрост, лапамі, з чырво-

нымі плямамі на жываце. А збоку прыкульгваў стары валацуга з перабітай пярэдняй правай, з адчаем і люстасцю ў вачах, са слінаю, запечанай на пашчы, з калючкамі, што ўеліся ў разарваны нос. А зусім ззаду стаяў яшчэ адзін малады, бліскучы і чорны, крыху напалоханы, але рашучы і заведзены, яшчэ не надта пацяганы і збіты, аднак ужо цяпер гатовы даказаць старэйшым усю сваю рашучасць, даказаць ёй, той, што стаяла побач, сілу сваіх цягліц, вастрыню сваіх разцоў, сур'ёзнасць сваіх намераў. Яна таксама гэта адчувала, але не падавала віду, павярнулася спінаю да яго і рыкала, нервова рэагуючы на кожны Фімаў рух. Старэйшы павольна павёў шыяй, замёр і пачаў хрыпла выдыхаць усю сваю чорную агрэсію, Фіма зразумеў, што гэта канец, што вось зараз усё напэўна і пачнецца, што старэйшы паведаміў сваім аб тым, што далей цягнуць няма сэнсу — трэба проста парваць гэтага чужога, што забрыў на іхнюю тэрыторыю. І пацягнуўся ўжо да Фімы, ледзь прыкметна загроб лапамі мёртвую гліну, гэта канец, зразумеў Фіма, гэта сапраўдны канец, і адвесці яго немагчыма, трэба проста ўспрымаць усё такім, якім яно з'яўляецца, то-бок жорсткім і несправядлівым. Ён паглядзеў важаку ў вочы, каб смерць не заспела яго знянацку. І важак таксама злавіў гэты ягоны позірк з павагаю, аднак без аніякіх паслабленняў: усё мае быць так, як мае быць, кожны атрымае тое, што заслугоўвае, літасці не будзе нікому, выключэнні прыніжаюць, і калі Фіма, сціснуўшы зубы і кулакі і зрабіўшы паўкроку наперад, падрыхтаваўся адчуць на горле салёны подых сабачай пашчы, аднекуль збоку з'явілася жанчына. Была яна высокага росту, з цёмным тварам, старэйшага ўзросту, апранутая ў сіні мужчынскі

плашч, на нагах мела цяжкія чаравікі. У руках трымала мноства торбаў і пакункаў, якія нават валакла за сабою па гарачай гліне. Пакункі гэтыя былі набіты старадаўнім адзеннем і пустымі бутэлькамі, вылаўленай па сметніках ежай і старажытным кухонным начыннем — гаршкамі, нажамі, талеркамі і лыжкамі. Усё гэта ляскатала і перакочвалася, і сама яна, здавалася, таксама ляскатала ўсімі сваімі суставамі, і пыл стаяў там, дзе яна праходзіла, і пахла ад яе старой хатай, у якой памёр немалады чалавек. Яна прабегла па Фіму пустым позіркам, быццам і не бачыла яго, быццам яго тут і не было зусім. Псы насцярожыліся і замерлі. Далей рыкалі і шчэрылі пашчы, аднак ужо хутчэй па інерцыі, не жадаючы адступацца ад ахвяры, якая так легкадумна трапіла ім у лапы.

— Бальтазар! — паклікала жанчына старэйшага, з ілбом у шнарах.

Той незадаволена тузануўся было ў бок Фімы, аднак голас яе падзейнічаў на яго дзіўным чынам: нібы паралізаваў яго ўпэўненасць, спыніў яго лютасць. Адвярнуўшыся ад Фімы, Бальтазар пацягнуўся мордаю да жанчыны, тая працягнула яму сваю высахлую цёмную руку, гладзячы пабітую галаву. Пасля рушыла наперад. Зграя паспяшалася следам, знікаючы за рагом і пакідаючы пасля сябе пах сухой поўсці.

Пад вечар яна пазваніла яму. Выбачылася, дамовілася пра сустрэчу. Ён прапанаваў прыехаць, забраць яе проста цяпер. Не трэба, — адказала Оля, — заўтра ўсё роўна пабачымся. Падумала, што мужчыны ніколі надоўга не затрымліваліся ў яе жыцці. Здаралася так, што яна сама звяртала на іх увагу, вылучала сярод іншых.

Дакраналася ўпершыню да іхніх далоняў, зазірала ўпершыню ў іхнія вочы, запамінала іхнія зморшчынкі, вымаўляла іхнія імёны. Дазваляла ім застацца побач з сабою. Пазнавала іхнія звычкі, іхнія паводзіны, прыслухоўвалася да іхняй мовы, выслухвала іхнія расповеды пра прыгоды, перамогі і няшчасці, коратка, але выразна перарывала ўсе іхнія спробы даведацца пра яе больш, чым яна хацела расказаць. Лёгка кпіла з іхняй храбрасці, пяшчотна бянтэжылася ад іхняй даверлівасці, жорстка адказвала на іхнюю агрэсію. Падстройвалася пад іхняе дыханне, падштурхоўвала іх да рашучых дзеянняў, губляла з імі адчуванне часу, пакідала іх зрэшты сам-насам з іхнімі бедамі і скрыўленымі ўяўленнямі пра каханне і вернасць. Сумавала па іх потым, успамінала іх, забывала, зноў аднаўляла ў памяці ўсё, што яны гаварылі ёй, у чым яны ёй кляліся, што яны з ёю рабілі. Ёй хапала сілы, каб не вяртацца да іх, і ставала розуму, каб не забываць пра іх назаўжды, хаваць глыбока пад скурай памяць пра кожнага з іх, пра іхнія ўпэўненасць і імпэт, слабасць і неабавязковасць, уважлівасць і закаханасць, зменлівасць і ханжаства. Мужчыны ў гэтым горадзе, — думала яна, — нараджаюцца для абароны і заваёўніцкіх паходаў. Іх выхоўваюць у пакоры і стрыманасці, іх з дзяцінства вучаць трываць холад ды спякоту, боль ды голад. Яны вырастаюць, каб бараніць крапасныя сцены горада, каб будаваць цэрквы і гандлёвыя склады, прымнажаючы гарадскі дастатак і славячы ўсіх святых, клапоцяцца пра наш горад. Да абавязкаў іхніх належыць падтрымліваць у працоўным стане газавую сетку і водаправод, дбаць пра жанчын і дзяцей, карміць вулічных жывёл і адганяць дзікіх птушак ад фруктовых дрэў. Прызначэннем іхнім ёсць

любоў, богі адкрываюць сэрцы кожнага з іх для закаханасці і лютасці, настройваючы іх на бясконцыя радасці і пакуты. Таму ім застаецца кахаць і спадзявацца, верыць і расчароўвацца, чакаць і не адступацца, дзякаваць і пераконваць, губляць усё, што набылі, і пачынаць кожны раз усё спачатку. Спадзяваючыся, што на гэты раз любоў ім не здрадзіць, а смерць адступіцца.

МАЦВЕЙ

Дзесяць гадоў таму час для мяне спыніўся, рашуча адмаўляючыся рухацца далей. Механізмы знерухомелі, сэрца білася так, быццам рабіла паслугу: без прэтэнзій, але і без гарантый. Раздражняла ўсе, нават пах уласнай адзежы. Трыццаць гадоў выявіліся пасткаю — ніякай уцехі ад занурэння ў невядомае, ніякай радасці ад працягу пачатага. Толькі ранішні агонь у галаве, пасляабедзенная пустэча ў горле, рэзкае вечаровае святло. І жорсткая, на ўзроўні веры нянавісць да тых, хто спрабуе зрабіць табе добра, жорсткая помста ўсім, хто спрабуе табе дапамагчы. Да трыццаці я паспеў двойчы развесціся. Паспеў бы і ў трэці раз, але за мяне больш ніхто не йшоў. Жанчын палохалі мае звычкі, напружвала тое, што я амаль ніколі не спаў, а калі спаў — доўга не прачынаўся. Яны сядзелі нада мною ў халодных прыцемках на старых прасцінах, перапужана лавілі маё дыханне, правяралі пульс, спешна тэлефанавалі знаёмым, пыталіся парады, асцярожна чапалі мяне за плячо, пераварочвалі на бок, каб я не захлынуўся ўласнай жоўцю. Мне ў гэты час сніліся

пясчаныя дзюны, яны перацякалі цераз маё жыццё, не пакідаючы пасля сябе нічога, акрамя спёкі і задухі. Сніліся мне змеі і земляныя птушкі, сніліся надпісы, зробленыя на цёмнай гліне, сніліся маўклівыя дзеці, якія збіралі паміж сухіх галін атрутныя ягады і працягвалі іх мне, нібы просячы: давай, паспрабуй, ты не ведаеш, ад чаго адмаўляешся, ніколі ў жыцці ты не адчуваў гэтага дзіўнага смаку, такі смак толькі ў смерці, гэта лепш за любыя вострыя прыправы, гэта саладзей за любыя мікстуры, ты толькі паспрабуй, прачніся і паспрабуй. Прачынацца пасля гэтага, зразумела, не хацелася.

Часам жанчыны не вытрымлівалі ды ішлі па сваіх справах, часам сядзелі, ветліва чакаючы. Але потым усё роўна ішлі. Часам вярталіся і далей сядзелі на салёных, як ветразі, прасцінах. Насычанае асабістае жыццё, адным словам. Пасля абеду я збіраўся з сіламі ды йшоў на эфір. Запускаў разбіты, напоўнены вірусамі камп'ютар, перабіраў дыскі, намагаўся прыбрацца на рабочым стале, бяссільна кідаў усё гэта і выходзіў у калідор, скажам, з гарбатай, скажам, перакурыць. Свечка політэхнічнага, дзе знаходзілася студыя, узвышалася над дрэвамі, адсвечваючы адзінкавымі агнямі аўдыторый. Цемра стаяла ў завулках, пахла волкасцю і ранняй вясною, хацелася ніколі не пакідаць гэты горад і ніколі ў жыцці, ніколі і нізашто не вяртацца ў студыю.

Дзесяць гадоў таму яна скончыла ўніверсітэт і паспрабавала глядзець на свет дарослымі вачыма. Свет кепска факусаваўся. Бацькі яе яшчэ доўгі час думалі, што яна далей вучыцца. Упарта будзілі яе на першую

пару. Тата яе быў прафесійным беспрацоўным. Здаецца, нядрэнна пры гэтым сябе адчуваў. Мама працавала на пошце. Таму пра пошту з маміных слоў яна ведала ўсё, магла распавядаць пра яе гадзінамі. Калі б гэта кагосьці цікавіла, зразумела. Узімку яна ўладкавалася на працу ў нейкі дабрачынны фонд, аднак фонд аказаўся недастаткова дабрачынным, нават працаўнікам сваім нічога не плаціў, таму і працай назваць гэта было цяжка. На студыю яе прывёў Вадзік Сальманела, яны сустракаліся ўжо каля месяца, хоць нават пасля ўсяго таго, што паміж імі было, Вадзік дазваляў сабе яе не пазнаваць, асабліва пасля канцэртаў: аглушаны і прыбіты, напампаваны кепскім бухлом, з сарваным горлам, ён, як сапраўдны рок-стар, мог прайсці і дэманстратыўна яе не заўважыць. Яна нервавалася, плакала. Яму гэта, падобна, падабалася. Ёй, падобна, таксама. Можна атрымліваць радасць ад усяго, нават ад стасункаў з мудакамі.

Яна ўвайшла следам за ім, нават не прывіталася, моўчкі села ля дзвярэй, злосна дастала мабільнік, упэўнена пачала набіваць паведамленні. Вадзік кінуў ёй пад ногі свой скураны заплечнік і дэманстратыўна пра яе забыўся. Светлыя валасы, белы плашч, які яна кінула на падлогу, ружовыя абветраныя пальцы, радзімкі на шыі, школьны швэдар, з-пад якога востра прабіваліся ключыцы, недаверлівы погляд, напружаныя рухі, дзіцячы выраз твару, нячышчаны абутак, прыгожыя калені.

— Дачка? — кіўнуў я Вадзіку замест вітання.

— Хуй там, — адказаў ён незадаволена, і эфір такім чынам пачаўся.

Роўна дваццаць хвілін, не лічачы музычных паўз, Вадзік гаварыў пра рок-н-рол, дух бунтарства, эстэты-

ку свабоды, песні пратэсту і пашырэнне свядомасці. Яна сядзела ў куце і толькі незадаволена хітала галавою. На правай руцэ ў яе быў пластмасавы бранзалет. Увогуле падобна было, што яна прыйшла ў мамінай адзежы. Пасля эфіру мы стаялі з Вадзікам у калідоры, разглядалі агні, ён дастаў каньяк, я адмовіўся — піць пасля яго з адной бутэлькі было проста страшна. Бедная дзяўчынка, — падумаў я.

— Колькі ёй гадоў? — спытаў.

— Халера яе ведае, — адказаў Вадзік, — я ў пашпарт не глядзеў.

— Як яна ўвогуле? — спытаў я далей.

— Ды ніяк, — адказаў ён. — Нічога не ўмее, нічога не хоча.

— Разыдзецеся — скажы, — папрасіў я. — Я яе навучу.

— А як жа, — засмяяўся Вадзік.

Я заўважыў, як ён хутка старэе. Лопнутыя капіляры, запаленыя дзясны, чорныя зубы. Рыба гніе з галавы, — падумаў.

Чаму я насамрэч мог яе навучыць? Што я ўмеў? Пазбягаць адказнасці, абмінаць небяспеку, гаварыць пра рэчы, якія мне нецікавыя, мець зносіны з людзьмі, ад якіх нічога ў гэтым жыцці не залежыць. Чаму яе мог навучыць ён? Таксама нічому добраму. Мы проста гаварылі адзін аднаму неабавязковыя рэчы, спрабавалі трымацца ўпэўнена і нахабна, нікому насамрэч не верачы, нікога насамрэч не прабачаючы. Пару месяцаў таму Вадзік спрабаваў павесіцца. Захрас у пятлі, правісеў нейкі час, пакуль прыйшлі знаёмыя і апусцілі яго з нябёсаў на зямлю.

Дзевяць гадоў таму яна прыйшла на адкрыццё выставы з Густавам, цярпліва праштурхоўваючыся следам за ім праз натоўп сяброў і знаёмых. У Густава на шыі матлялася новая камера, час ад часу ён фатаграфаваў нейкую з даўніх сябровак, якіх тут у яго было каля двух дзясяткаў. Мы доўга з ім абдымаліся, распытвалі пра навіны, хоць і так усё адзін пра аднаго ведалі: свет цесны, жыццё кароткае, людзі схільныя да пляткарства. Яна падстрыглася, ёй гэта пасавала. Раптам выявілася, што ў яе цікавы твар. Калі яна адводзіла вочы, рысы яе абвастраліся, быццам пад скурай у яе раставала крыга і перацякала вада. На ёй была скуранка і яркія аранжавыя панчохі. Са стаптанымі балеткамі ўсё гэта выглядала трошкі дзіка. Мабыць, яна шмат ходзіць, падумаў я, разглядаючы яе абутак. Яна перахапіла гэты мой погляд, напружылася. Мяне, зразумела, не пазнала, размову, вядома, не падтрымала, аднак пагадзілася выйсці перакурыць.

— Ты з усімі маімі сябрамі сустракацца будзеш? — спытаў я.

Яна памаўчала, мабыць, думаючы, крыўдзіцца ці не. Вырашыла не крыўдзіцца.

— У цябе добрыя сябры, — сказала. — Ты б у іх павучыўся манерам.

Трэба ж, — падумаў я, — мяне вучыць манерам чалавек, які спаў з Вадзікам Сальманелам.

— Не крыўдуй, — сказаў.

— Не буду, — адказала яна і пайшла ўнутр грэцца.

Праз некаторы час Густава ўзялі ў прэс-службу мэра. Потым звольнілі. Камеру ён прадаў. Кватэру таксама. Жыццё пазбаўляе не толькі ілюзій.

Восем гадоў таму яна паступіла на завочнае аддзяленне. Знаёмыя выкладчыкі скардзіліся, гаварылі, што яна зусім не разумее фінансаў, хоць мы і самі, гаварылі яны, не надта іх разумеем. Ніхто нічога не ведае, скардзіліся, ніхто ні ў чым не разбіраецца, мы ўсе імітуем веды, імітуем пачуцці, жывём ілюзіямі. Хоць плаціць за ўсё гэта прыходзіцца жывымі грашыма.

Некалькі разоў мы перасякаліся з ёй на канцэртах, аднойчы сутыкнуліся ў падземцы, неяк я бачыў яе ў кампаніі хасідаў. Здаецца, яна рабіла для іх экскурсію. Хасіды былі падобныя да вялікай сям'і, што купляе кватэру ў цэнтры і не разумее, чаму тут да сёння не вывелі прусакоў. У яе зараз зноў былі доўгія валасы, ад чаго яна выглядала больш дарослай і дасведчанай. Хоць гаварыла гэтаксама з недаверам і з выклікам, нібы дакazваючы нешта дарослым, нібы спрабуючы пераканаць усіх хасідаў гэтага свету ў дарэчнасці і неабходнасці прапанаванай ёю фінансавай аперацыі.

Сем гадоў таму я змяніў станцыю. Для мяне гэта быў сур'ёзны крок, я доўга вырашаўся. Новае радыё цалкам магло закрыцца ўжо праз некалькі месяцаў пасля адкрыцця. Аднак гэта была сапраўдная сур'ёзная праца. Трэба было вырашаць. Пару гадоў таму я б нават не стаў пра гэта думаць. А тут раптам спытаў сябе: колькі можна сядзець і рабіць тое, што табе не падабаецца, колькі можна гнуць на кагосьці спіну, залежаць ад кагосьці, пад кагосьці падстройвацца? Давай, казаў я сабе, вырашай, табе не дваццаць гадоў. Узрост Хрыста, час тварыць цуды і падымаць з магіл пракажоных.

Я наткнуўся на яе выпадкова травеньскім ранкам у цэнтры. Яна сядзела на сходах, пад аддзяленнем бан-

ка, яшчэ закрытым у такі ранні час. Выглядала разгублена. Аднак не плакала. Сядзела, падпёршы галаву кулаком, глядзела ў нікуды. На запясці ў яе матляўся невялікі гадзіннік, хаця спытай яе, якая гадзіна, упэўнены, яна б не адказала. Проста не зразумела б пытання. Пабачыла мяне, стомлена кіўнула. Нешта прымусіла мяне спыніцца. Мабыць, тое, што яна кіўнула першай. Я не чакаў. Сеў побач з ёй. Пачаў пытацца пра справы, пра вучобу, пра агульных знаёмых. Яна ківала ў адказ, штосьці гаварыла, але не надта ахвотна. Зрэшты змоўкла.

— Нешта здарылася? — спытаў я.

— Ды не, — адказвала яна. — Проста мяне ўсю ноч трахалі.

— Цэлую ноч? — не паверыў я.

— Цэлую ноч, — пацвердзіла яна.

Я не ведаў, што ёй сказаць. Пачакаў. Але яна таксама маўчала. Палез у сумку, дастаў тэтрапакет з малаком. Працягнуў ёй. Яна зубамі разарвала паперу, піла доўга і прагна. Знясільваючы гэта, мабыць, занятак, — падумаў я, — усю ноч трахацца. Заўважыў, як дрыжаць яе пальцы, быццам пасля актыўных заняткаў у спартыўнай зале. Заўважыў, як напружваюцца жылкі на яе шыі, калі яна закідае галаву, п'ючы з пакета. Заўважыў цёмныя кругі пад яе вачыма, такія бываюць толькі ў жанчын, якія нараджаюць ці проста недасыпаюць, так ці інакш — такія глыбокія празрыстыя кругі бываюць толькі ў жанчын, якія пераймаюцца тым, што робяць, якія баяцца зрабіць штосьці не так. Са стомленага і адстароненага выразу яе твару можна было зразумець, як добра і цяжка ёй сёння было, як яна перажывае з-за таго, што адбылося, як нікольк не шка-

дуе аб тым, што адбылося. Ад яе пахла цёплай вадою душавой кабіны, чужым мылам, ранішнімі цыгарэтамі. Кроў, здавалася, пакінула яе пальцы, выцекшы з іх на бяспечную адлегласць. Затое вусны яе — пакусаныя і прыпухлыя — цёмна гарэлі пад ранішнім сонцам, яна іх і далей пастаянна прыкусвала, нібы ўвесь час згадваючы, што з ёй было гэтай ноччу, нібы гэтая ноч для яе ўсё не заканчвалася. Мне нават здалося, што яна больш за ўсё і хацела, каб гэтая ноч не заканчвалася, здалося, што разам з цемрай ад яе адступіла нешта вельмі важнае, нешта, пра што яна неадкладна пачала шкадаваць — сядзела тут невядома колькі, незразумела для чаго і шкадавала пра згубленае, сумавала з нагоды толькі што набытага. Я, мабыць, занадта адкрыта разглядаў яе вусны, яна ажно захлынулася малаком, яно пацякло па яе падбароддзі, яна хутка выцерлася і далей прыкрывала вусны далонню, гаварыла нібыта не мне, прыглушана і рвана, дакраналася рукою да ранак на тонкай чуллівай скуры, спыняла кроў, што праступала пасля кожнага неасцярожнага выгуку альбо пытання, нервавалася, разумела, што я бачу, як яна нервуецца. Паспрабавала загаварыць пра нешта іншае, я адразу ж падтрымаў размову, стараўся не глядзець на яе, намагаўся дэманстраваць лёгкасць ды бестурботнасць, а сам толькі і думаў: «Яе трахалі цэлую ноч! Цэлую ноч! Цэлую ноч яна была гатовая любіць і разумець, цэлую ноч яна не спала і пакутавала, цэлую ноч яна гаварыла нейкія словы, выслухвала чыесьці прызнанні, запамінала абяцанні, не стрымлівалася і выкрыквала словы радасці. Цэлую ноч ёй было добра, цэлую ноч ёй не давалі спаць, цэлую ноч яе пазбаўлялі спакою. Яна ўпадала ў сон і вырывалася адтуль на-

зад — у чорнае паветра, яна лавіла нечае дыханне, адчувала чыесьці дотыкі, спрабавала падстроіцца пад нечыя рухі, прыслухоўвалася да чужога сэрцабіцця, прывыкала да чужога паху, да чужога голасу, да чужой любові!»

Я забраў у яе малако, прыклаўся да пакета.

— У цябе няма якой-небудзь працы? — раптам спытала яна.

— Спытаю ў начальства, — паабяцаў я ёй.

Працягнуў ёй пакет. Яна адмоўна пахітала галавою, маўляў, досыць з мяне на сёння. Я ўстаў, развітаўся, пайшоў дадому. Малако па дарозе выкінуў.

Начальства чамусьці адразу пагадзілася яе ўзяць. Цяпер мы працавалі разам. Яна сядзела ў суседнім пакоі і выкачвала з сеткі навіны. Лёгка з усімі перазнаёмілася, хутка абжылася, завяла сабе сяброўак. Мела добры характар і дрэнную памяць. Амаль ніколі не злавалася, амаль ніколі не скардзілася. Не ўпэўнены, што праца ёй падабалася. Не ўпэўнены, што яна наогул лічыла гэта працай — бясконцае сядзенне ў сетцы, пастаянныя перакуры і тэлефонныя размовы, яркае сонца за раскрытымі насцеж вокнамі, галасы на лесвіцы, аўтамабільная сігналізацыя, якая раптоўна гучала ў свежым ранішнім паветры. Да мяне яна ставілася з удзячнасцю, што мяне добра-такі раздражняла, паколькі пазбаўляла нашы адносіны ўсялякай перспектывы. Мы віталіся зранку, пілі палены каньяк падчас чыіхсьці дзён нараджэння, потым яна некуды знікала, а я рабіў выгляд, што так і мае быць. Спрабаваў яе кудысьці запрасіць, прапанаваў кудысьці разам пайсці, пагаварыць пра нешта, акрамя працы, аднак яна зга-

джалася настолькі няўважліва і тужліва, што жаданне ісці знікала само сабою. Ладна, — думаў я, — што за інтым у творчым калектыве? Хай працуе. Ты ж, — гаварыў я сабе, — размаўляючы пра яе з начальствам, насамрэч не думаў, што таксама будзеш трахаць яе цэлымі начамі? Ці думаў? — пытаўся я ў сябе. Давай, прызнавайся. Ну, думаў, думаў, — прызнаваў я ўрэшце, — зразумела, думаў. Пабачыўшы яе тады, знясіленую і бяскроўную, пра што яшчэ што можна было думаць? І гады тры таму абавязкова б давёў пачатае да канца, па-за ўсякім сумневам падлавіў бы яе на працоўным месцы і запусціў бы свае халодныя далоні ёй пад аранжавую футболку, натыкаючыся пальцамі на цвёрдыя каменьчыкі яе радзімак. Няхай бы адпіралася, няхай бы жалілася начальству, няхай бы напісала заяву аб звальненні. Што мне з гэтага? Дзіўна, — пагаджаўся я з сабою, — менавіта так усё і было б. Нават не ведаю, што мяне стрымлівае цяпер.

Але нешта і сапраўды стрымлівала. Настолькі, што аднойчы, ужо амаль ноччу, пакідаючы студыю і праходзячы міма яе працоўнага месца, я са здзіўленнем выявіў, што яна пакінула адкрытай сваю пошту. Спрабаваў пераканаць сябе не чытаць убачанае, проста развярнуцца і сысці. Не пераканаў. Сеў за яе месца. Паспрабаваў пераканаць сябе яшчэ раз. Што з табою? — звярнуўся сам да сябе. — Ты ж не будзеш з ёй потым вітацца. Урэшце падняўся, выключыў яе камп'ютар, зачыніў за сабою дзверы.

А потым, пад канец лета, адбылася такая гісторыя. Гэта была нейкая вечаровая вытворчая нарада, што непрыкметна перарасла ў п'янку. А я ўжо ад самага ранку

быў у добрым настроі і цяпер з аптымізмам глядзеў у вокны, дзе ў прыцемках, бы радыятары, астывалі цяжкія дрэвы, знясіленыя за дзень белым жнівеньскім сонцам. Нешта ў мяне яшчэ зранку здарылася радаснае — сустрэча з даўнімі сябрамі дзесьці пасярод вуліцы, нечаканае завісанне ў разгар працоўнага дня, п'яныя абдымкі і салодкія ўспаміны пра ўсіх, каго даўно не бачылі, хто безнадзейна знік у невядомым кірунку, абяцанні больш не губляцца і падтрымліваць сувязі, клятвы і настаўленні, слёзы і стрыманы мужчынскі спеў. Карацей, на нараду я прыйшоў, даючы ўсім вялікую фору. А ўжо падчас неафіцыйнай часткі, у сяброўскай нязмушанай абстаноўцы, мяне варта было б ад чагосьці перасцерагчы і хаця б да нечага заклікаць. Так сталася, што яна, вядома, увесь час сядзела побач, проста каля мяне, на чыімсьці працоўным стале, заваленым справаздачамі і газетнымі выразкамі, і я цэлы вечар адчуваў, вядома, яе цяпло і мяккасць, і ўва мне, вядома, зрывала апошнія засцерагальнікі, таму што калі ж яшчэ, думаў я, як не цяпер, ніколі больш, пагаджаўся я, толькі сёння. Я гаварыў толькі з ёй і слухаў толькі яе, толькі ёй распавядаў гераічныя гісторыі і толькі яе меркаваннем з нагоды пачутага цікавіўся. У нейкі момант усё гэта, зразумела, стала выглядаць занадта яўна, і яна, як асоба, якая дбае пра сваю рэпутацыю, але і, ясная рэч, не хоча пакрыўдзіць добрага прыяцеля, выявіла ініцыятыву і прапанавала ісці. Сказала, што мы можам сядзець тут хоць да раніцы, слухаючы цяжкае дыханне дрэў за акном, ніхто, зразумелая справа, не будзе нас за гэта асуджаць, аднак час ужо позні, і калі ёй асабіста ўсё роўна, таму што жыве яна тут побач і ад грамадскага транспарту не залежыць, то

вось маім лёсам шчыра пераймаецца. Бо яшчэ зусім трошкі — і метрапалітэн закрые свае светлыя брамы для грамадзян пасажыраў, і як я буду вырашаць праблему транспартавання, яна нават не ведае, зразумелая справа, калі я проста не дадумаюся выклікаць таксі. Але я не дадумаюся, праўда ж? — запытала яна мяне даверліва. Не дадумаюся? — перапытаў я сам сябе. Не дадумаюся, — адказаў я выразна — ёй і сабе. Тады яна схапіла мяне за руку і пацягнула па рэдакцыйных калідорах, вывела старымі камунальнымі сходамі, прайшла са мной праз занядбаны цёмны двор, пад нізкімі, як зімовыя хмары, дрэвамі, пад нечаканым начным дажджом. Перабегла са мной вуліцу, апынулася са мной у парку. І менавіта там я паспрабаваў яе спыніць і сказаць усё, што трэба было ў гэтай сітуацыі сказаць. Ну і зрабіць усё, што трэба было зрабіць. І менавіта тады з-за дрэў выйшлі два сумныя патрульна-паставыя цені. І менавіта так усё гэта завяршылася. Яна паказвала журналісцкае пасведчанне, я дэманстраваў прыёмы самаабароны, яна тэлефанавала ў рэдакцыю і перадавала тэлефон патрульным, я спрабаваў забраць у іх гумавую дубінку і перадаваў праклёны з самага пекла. Яна намагалася даць ім грошы, я абзываў іх пры гэтым прастытуткамі. Забралі нас, зразумела, абаіх. Зрэшты, яе адразу ж пагадзіліся адпусціць. А вось мне прапанавалі застацца да раніцы з імі, у апорным пункце. З ёю зрабілася істэрыка, яна расплакалася, пачала іх прасіць. Мяне гэта яшчэ больш натхняла стаяць да канца. Калі адзін з патрульных адвярнуўся, каб узяць нейкі бланк, я сарваў у яго з пояса газавы балончык і пусціў пад стол вясёлы струмень. Усе былі вымушаны выйсці ў калідор,

патрульныя далі мне пару разоў па рэбрах, яна, здаецца, дадала б, калі б магла. Нейкім чынам у іх з патрулём нечакана пачалі складвацца добрыя стасункі — усе яны глядзелі на мяне з непрыхаваным раздражненнем, усе асуджалі мае паводзіны. Мне гэта падабалася: нарэшце я заўважыў у яе вачах хоць нейкую цікавасць. Няхай гэтая цікавасць палягала ў жаданні як мага больш балюча даць мне па шыі — яна глядзела на мяне, яна не адводзіла погляд, усе глядзелі на мяне, мяне ненавідзеў увесь апорны пункт, я быў героем, дзеля гэтага варта было жыць. Праветрылі памяшканне, вярнуліся. Загадалі дастаць усё з кішэняў. Я неахвотна пагадзіўся. Яна стаяла побач і ўважліва сачыла за маімі рухамі, нібы баялася нешта прапусціць і не зразумець. Ёй было даволі холадна ў яе футболцы і мокрых пасля начнога дажджу кедах, яна абхапіла сябе рукамі за плечы і, знерухомеўшы, пазірала, як я дастаю вялікую звязку ключоў з прычэпленымі ў якасці талісманаў некалькімі аўтаматнымі гільзамі. Ключоў у мяне было шмат. Мусіў даглядаць за дзвюма кватэрамі ў цэнтры: уладальнік адной, мой школьны прыяцель, сядзеў, уладальнік іншай, былы напарнік, хаваўся, каб не сесці. Я меў адмычкі ад некалькіх паштовых скрынь, паколькі даглядаў старых суседзяў, што жылі паверхам вышэй і на вуліцу амаль не выходзілі, аднак упарта выпісвалі нейкія навуковыя выданні. Дзеці іх не наведвалі, я быў бадай што адзіным, хто памятаў іхнія імёны. За ключамі на стол паляцеў нататнік. Патрульны ад нечага рабіць пагартаў яго, наткнуўся на некалькі знаёмых прозвішчаў, нясмела адклаў убок. У нататніку былі нумары тэлефонаў, мабыць, усіх дэпутатаў гарсавета. Прынамсі, дастат-

ковая іх колькасць, каб стварыць у сесійнай зале працаздольную большасць. Можна было каму-небудзь з іх патэлефанаваць, папрасіць аб дапамозе. Але права аднаго званка мяне пазбавілі, а ўсе мае тры тэлефоны ўжо ляжалі перад патрульнымі. Адзін быў растаптаны падчас першамайскай дэманстрацыі і пераматаны скотчам. На іншым сцерліся літары, і я мог хіба што прымаць уваходныя. Трэці быў ружовага колеру са стразамі — мне яго пакінула сястра, калі прыязджала ў госці. Хацеў яго выкінуць, а вось не паспеў. Патрульныя пазіралі на ўсё гэта з усё большым недаверам. Дастаў візітоўкі дзіцячых лекараў, якім нядаўна спрабаваў дапамагчы, запрасіўшы іх на эфір, візітоўку нейкага праваабаронцы, які прыходзіў час ад часу і скардзіўся на жорсткае абыходжанне з вулічнымі жывёламі, візітоўку маладой юрысткі, што бараніла правы работнікаў трамвайнага дэпо, візітоўку ўладальніка грузінскага рэстарана, які ўсё запрашаў на шашлыкі, але я ўпарта не йшоў, ведаючы, якія грошы за ім стаяць, чый гэта бізнес і чыя на ім кроў. Далей выцягнуў некалькі флэшак, з дзясятак батарэек, жуйкі, ментолавыя ледзяшы і чамусьці металічны судзейскі свісток. Свісток іх зацікавіў. Яны круцілі яго ў руках, перадавалі адзін аднаму, урэшце адзін з іх, мабыць, малодшы, адпаведна, больш прыбіты, не вытрымаў, засвістаў. Другі яго абарваў. Найбольш мяне хвалявалі прэзерватывы. Яны ляжалі ў задняй кішэні. Спачатку я спадзяваўся, што іх не заўважаць, аднак патрульныя ішлі да канца, патрабуючы атрымаць усё да апошняга цэнта. Яна маўчала, запамінаючы мае мокрыя, даўно не стрыжаныя валасы, чорную футболку з антыўрадавым лозунгам, цёмную кофту, залітую кавай, джынсы,

красоўкі. Быццам ніколі гэтага ўсяго не заўважала, не звяртала на ўсё гэта ўвагі, не бачыла слядоў крыві на рукаве, не заўважала кропель гарачага асфальту на абутку, не ведала, чым я займаюся ў гэтым жыцці, што мяне цікавіць, каго я ненавіджу, з кім ваюю. Заставаліся прэзерватывы. І вось тут была галоўная праблема. З аднаго боку, супакойваў я сябе, гэта добра, што яна ўбачыць у мяне прэзерватывы. Яна адразу зразумее, што я сур'ёзны і адказны мужчына, а не пацан, трымаю ўсё пад кантролем, настроены на сур'ёзныя адносіны. Уласна, якое там настроены, пярэчыў я сабе, занепакоены, я б сказаў — пастаянна цягаю з сабой гандоны, нават на працу іх бяру. Зразумела, што ў мяне ў галаве, зразумела, чаго мне ад яе трэба. Хаця, аргументаваў я сабе далей, прысутнасць у кішэні прэзерватываў сведчыць аб пастаяннай баявой гатоўнасці, аб ненадакучлівай мужнасці і непрыхаванай суровасці. Я сапраўдны мужчына, і саромецца гэтага смешна. Хоць, нагадваў я сабе, прэзерватывы гэтыя я цягаю ўжо месяцы два. Яны настолькі зацяганыя і пацёртыя, што казаць варта не столькі пра мужнасць, як пра бездапаможнасць. Таму я дэманстратыўна ўзяўся за пасак, зняў яго, перадаў патрульным. Удавіся на ім, — пажадаў у канцы. Яна ўжо не слухала — гнеўна выскачыла ў калідор, люта грукнуўшы дзвярыма. Можна было даставаць прэзерватывы.

Раніцай мяне адпусцілі. Вядома, спрабавалі прысароміць, пэўна, што спрабавалі патлумачыць свае дзеянні, само сабою, апраўдваліся, па-за ўсякім сумневам, трохі нервавaліся. Вярнулі візітоўкі, вярнулі флэшкі, вярнулі свісток. З ім я і прыйшоў на працоўнае месца.

Яна сядзела за сваім камп'ютарам. Я папрасіў яе выйсці пагаварыць. Яна моўчкі пагадзілася. Узяла сваю каву, выйшла ў калідор, села на шырокі падаконнік. Я прыладзіўся побач.

— Прабач, — сказаў, — нешта я сарваўся ўчора.

— Бывае, — адказала яна, зрабіла глыток, апякла паднябенне, закашлялася, занервавалася. — Я проста хвалявалася.

— Ды ладна, — сказаў я, забраў у яе каву, апякаючы пальцы, адставіў кубак.

Паспрабаваў яе пацалаваць. Яна дэманстратыўна дастала жуйку, пачала жаваць, гледзячы кудысьці ўбок. Ладна, — падумаў я, — не надта і хацелася. Хоць насамрэч хацелася. Вядома, хацелася.

Восенню яна звольнілася. На яе месца ўзялі сына дырэктара. Праз месяц нас накрыў АМАП. Уварваліся ў дырэктарскі кабінет, забралі дакументацыю. Дырэктар прапанаваў калектыву распачаць галадоўку. Я пагадзіўся. Зрэшты, я адзін і пагадзіўся. Дырэктар падумаў і паехаў да мэра, дамаўляцца. Пачыналіся вясёлыя часы.

Шэсць гадоў таму, узімку, я сустрэў яе каля ювелірнага. Бег на сустрэчу, глядзеў пад ногі, раптам бакавым зрокам убачыў яе. Адразу пазнаў. Яна пафарбавалася. Ёй гэта не пасавала. Зрэшты, ёй усё гэта не пасавала — доўгае футра, пэўна, з чужога пляча, нейкія грэнадзёрскія боты, мужык у скуранцы, што глядзеў на яе цяжка, аднак трымаў за руку, не адпускаў. Я кіўнуў, яна зрабіла выгляд, што не заўважыла, рэзка павярнулася да свайго мужыка, сказала яму нешта вясёлае. Я пайшоў да-

лей, тым жа бакавым зрокам заўважыўшы, як вочы яго звузіліся, нібы ён глядзеў у баявы бінокль, як ён моцна сціснуў яе руку, як ад прыкрасці зарыпела яго скуранка.

Пяць гадоў таму я бачыў яе выступ на мясцовым тэлебачанні. У цітрах яе называлі грамадскай актывісткай. Яна выступала за вызваленне з СІЗА нейкага бізнесмена, які зрабіў, аказваецца, для горада вельмі шмат, а вось тут нядаўна, аказваецца, быў прыхоплены праваахоўнымі органамі па, аказваецца, падазрэнні ў нявыплаце і перахоўванні, у чым асабіста яна, аказваецца, бачыць помсту з боку канкурэнтаў і спробу дыскрэдытаваць яго дабрачынную дзейнасць на карысць харкаўчан. Яна ўжо, аказваецца, падала апеляцыю і звярнулася, аказваецца, да бацькоў горада. Менавіта на іх, на бацькоў, яна і разлічвае, хоць паводзяць сябе яны як мудакі. Гэтага апошняга яна не сказала, аднак у поглядзе яе чыталася менавіта гэта. Увогуле пра вязня гаварыла з такой цеплынёю ў голасе, што нават вядоўца не вытрымаў і пусціў рэкламу.

Чатыры гады таму я з'ехаў з горада і не згадваў пра яе наогул. Але потым усё ж вярнуўся, згадаў.

Тры гады таму мне распавялі пра яе гісторыю. Аказваецца, скончыўшы завочнае і знайшоўшы нейкую прыстойную працу, яна набрала крэдытаў. Пад шалёныя працэнты. Купіла кватэру ў новым доме, збіралася туды пераязджаць. І вось нечакана ўлетку ўсё прадала, сабрала зберажэнні, пазычыла нейкую суму ў роднай цёткі і хутка разлічылася з крэдыторамі. Пасля гэтага пачаўся фінансавы крызіс.

Два гады таму я сустрэў яе ў грузін. Сядзела адна, глядзела фільм на лэптопе, піла чырвонае сухое. Убачыла мяне, напружылася, але памахала рукою, запрашаючы да сябе. Я падсеў, яна некаторы час распытвала пра здароўе, сказала, што звольнілася, што займаецца духоўнымі практыкамі. Каратэ? — перапытаў я. Яна пачала тлумачыць. Я ўжо збіраўся сказаць нешта прыемнае і адваліць, калі яна раптам прытрымала мяне за локаць і сказала, каб я на яе не крыўдаваў, што яна заўсёды адчувала да мяне цяпло і падзяку, што я сапраўдны сябар, а вось яна няўдзячная свінота, якая ніколі не цаніла майго сяброўскага да яе стаўлення, а цяпер вось пакутуе ад гэтага, мучыцца, бо гэта няправільна, і так не павінна быць, і сябры маюць падтрымліваць адно аднаго, праяўляць сваё прыязнае стаўленне, бо менавіта на прыязнасці і шчырых пачуццях трымаецца сапраўднае яднанне паміж сябрамі. Мне падалося, што яна проста тут, перада мною, займаецца сваімі духоўнымі практыкамі, я крыху нязграбна яе перабіў, сказаў, што таксама заўсёды ставіўся да яе з цяплом і падзякай і што цешуся з нашага шматгадовага сяброўства. Пад канец нават прыабняў яе, ледзьве не разліўшы яе чырвонае сухое. Мы абмяняліся нумарамі, дастаўшы тэлефоны: яна — срэбраны і лакаваны, я — чорны і пераматаны скотчам.

Праз год яна перазваніла. Я доўга не браў слухаўку, запісана яна ў мяне не была, званкі з невядомых нумароў я намагаўся ігнараваць. Нешта падказала адказаць. Яна была цярплівай, дачакалася. Голас у яе быў заплаканы. Павіталася, выбачылася, так і сказала: прабач, сказала, што турбую, мне проста няма да каго звярнуцца, бацькі зусім старыя, працы ў мяне няма, сяброў,

як выявілася, таксама. У мяне з цёткай бяда — упала, зламала нагу. У яе ўзросце гэта пачатак смерці. — Чаму ты мне тэлефануеш? — не зразумеў я. — У цябе ж ёсць знаёмыя лекары, — патлумачыла яна, — я памятаю, ты пастаянна меў зносіны з нейкімі лекарамі. — Гэта былі дзіцячыя лекары, — патлумачыў я. — Якая розніца? — горача запярэчыла яна. — Можа, яны параяць якога адмыслоўца, што спецыялізуецца на такіх аперацыях? Я баюся, што ў звычайнай бальніцы яе проста загубяць. Прабі, ты ж можаш. Ну, тут яна, вядома, расплакалася, я паспрабаваў яе суцяшаць, але яна адключылася. Я прабіў, мне сапраўды параілі лекара, папрасілі пачакаць, звязаліся з ім, перазванілі, сказалі, што ён у курсе. Галоўнае, папярэдзілі, няхай бабулька скажа, што яна ад цябе. Я перазваніў ёй, маўляў, такія справы, вось нумар, набярэш, скажаш, што ты ад Мацвея, усё будзе добра. І давай я пад'еду, дапамагу.

Яна стаяла пад бальніцай. Плакала, выціралa слёзы вільготнымі сурвэткамі, пальцы дробна дрыжэлі, нервова капалася ў сумачцы, шукала тэлефон, нешта перабірала, змахвала з твару валасы, што зноў адраслі і нават паспелі выгараць пад летнім сонцам. Кінулася мне на шыю, аднак неяк суха і абыякава, ажно я сам адышоў назад. — Не ведаю, — сказала, — што рабіць: з аперацыяй нібыта ўсё ў парадку, але дактары не дазваляюць з ёй заставацца. Што рабіць? — пыталася. — Чакаць тут? — Давай я цябе дадому адвязу, — прапанаваў я. Яна бездапаможна азірнулася на вокны бальніцы. Позні летні вечар. На ўсю бальніцу святло гарэла хіба ў двух вокнах. Нечакана адно з іх пагасла. Яна пагадзілася ехаць дадому.

Гэта быў, наколькі я зразумеў, цётчын пакой. Жыла яна, як можна было здагадацца, менавіта тут. Захламленая і запоўненая кнігамі трохпакаёвая кватэра ў доме на Тэатральнай. Чацвёрты паверх. Перад пад'ездам яна на імгненне завагалася, потым прапанавала зайсці. Унізе паміж дрэў свяціліся апельсінавыя ліхтары. Паветра пахла дажджом. Хоць дажджу не было.

Цэлую ноч яна піла гарбату і распавядала жахі. Пераважна пра пошту. А потым пра цётку. Пра тое, што цётка рана страціла мужа, які быў жакеем і разбіўся падчас спаборніцтваў. Для цёткі гэта быў удар, пасля якога яна так і не прыйшла ў сябе. Хадзіла потым цэлае жыццё на іпадром. Брала з сабою малую. Разам яны садзіліся на трамвай, тады яны яшчэ ездзілі ў парк, садзіліся побач, цётка ўвесь час маўчала, малая не адважвалася ў яе пра нешта пытацца, выходзілі ля іпадрома, ішлі на трыбуны, цётка маўчала і глядзела на далёкія непрыкаяныя фігуркі жакеяў, малая чытала праграмкі, выбірала, за каго заўзець, перажывала, нервавалася, ішла потым дадому няўцешная і знясіленая. Цётка так і не выйшла замуж, хоць у яе, выяўляецца, былі мужчыны. Малая, выяўляецца, заўсёды пра гэта здагадвалася, цётка, выяўляецца, не надта іх і хавала. З дзяцінства малой запомніліся гэтыя юныя твары курсантаў, падлеткава ссутуленыя постаці студэнтаў і практыкантаў, дзіцяча разбіты абутак пэтэушнікаў у калідоры, маладзецкі парэзаныя таннымі брытвамі падбароддзі старшакласнікаў і злосных дэзерціраў. Малая зусім нічога пра іх не ведала, яны ўзнікалі час ад часу ў цёмных калідорах, натыкаліся на яе, выходзячы з прыбіральні, палохаліся яе, стоячы ў непрычыненым душы, усміхаліся ёй, заходзячы з халоднага бал-

кона ў цёплую пракураную кухню. Цётка пра іх нічога не расказвала. А малая ні пра што не любіла распытваць. Толькі калі заставалася ў цёткі начаваць, тая кудысьці тэлефанавала і пра штосьці перадамаўлялася альбо выходзіла ў вітальню і доўга і пераканаўча там з кімсьці гаварыла, вяртаючыся потым да малой і чытаючы ёй на ноч што-небудзь прыгодніцкае.

Так працягвалася да раніцы: яна ўспамінала і распавядала, гаварыла і ўдакладняла, і кожная шчаслівa завершаная гісторыя цягнула за сабой наступную, а кожны ўмела закручаны сюжэт патрабаваў працягу і паглыблення. І ўсе мае спробы перапыніць яе заканчваліся нічым, а ўсе мае намаганні развітацца і вырвацца вонкі былі асуджаныя на няўдачу — яна трымалася за мяне моцна і ўпэўнена, распавядала мноства інтымных дэталяў, як блізкаму сваяку, хвораму на рак: усё роўна ён і так усё пра ўсіх ведае, усё роўна ён нікому нічога не паспее пераказаць. Але як толькі я спрабаваў неназойліва дакрануцца да яе рукі, дык яна падхоплівала свой цёплы кубак, толькі я хацеў паправіць пасму яе валасоў, што спадала ёй на вочы, дык яна лёгка адхілялася назад і выглядвала ў акно, слухаючы начны спеў сірэн, што лунаў ад ракі. Раніцай папрасіла паехаць разам з ёй. І як я мог ёй адмовіць?

У бальніцы я спрабаваў заснуць у агульнай чарзе. Пахла ёдам. Мне здавалася, што я на моры ў красавіку. Некалькі гадзін яна правяла з цёткай, потым пабегла па аптэках шукаць нейкія прэпараты. Я пагадзіўся яе пачакаць. Пад вечар лекары паведамілі, што старая страціла прытомнасць. Хто б мог падумаць, — здзіўляўся лекар, — здаецца, усё ішло як трэба. Спадзяюся, — сказаў ён, — усё будзе добра. Але вы на ўсялякі

выпадак рыхтуйцеся да найгоршага. Адклікаў мяне ў бок, папрасіў забраць яе дадому. Я так і зрабіў.

Ноч яна прасядзела на балконе. Я прыносіў ёй гарбату, прыносіў заспакаяльныя, прыносіў віно, прыносіў цыгарэты. Яна дзякавала, намёртва ўхапіўшыся пальцамі ў агароджу балкона. Я хацеў расшчапіць іх і пакласці яе спаць, аднак паспрабуй расшчапіць пальцы жанчыне, якая рызыкуе страціць усё. Прынёс плед, накінуў ёй на плечы, сеў побач, падлічваў да раніцы метэарыты. Налічыў два.

Наступным ранкам, а восьмай, затэлефанаваў лекар. Супакоіў, сказаў, што сітуацыя нармалізавалася, папрасіў дакупіць лекаў. Я прапанаваў ёй застацца дома, паабяцаў сам усё зрабіць. Яна, вядома, адмовілася. Трэці дзень на нагах даваўся насілу. Але чым далей, тым меней шанцаў у мяне было ад усяго гэтага адмовіцца. Паўдня мы ганялі па аптэчных складах і шапіках, другія паўдня яна прастаяла пад дзвярыма аддзялення. Дадому мы трапілі недзе апоўначы. У яе зноў былі далікатныя глыбокія кругі пад вачыма ад слёз і недасыпання. У мяне пачыналіся галюцынацыі.

— Давай спаць, — сказаў я ёй.

— Ты ідзі, — сказала яна, — спі. Я ўсё роўна не змагу. Столькі ўсяго адбылося ў апошні час.

— Ну, тады я з табою пасяджу, — больш за ўсё мне не хацелася пакідаць яе адну на балконе. — Раскажы што-небудзь. Што там у цябе з завочным?

— Усё добра, — адказала яна ціха.

— Хто ты цяпер паводле адукацыі? — спытаў я.

— Падатковец, — адказала яна аўтаматычна.

— З цябе атрымаецца добры падатковец, — сказаў я ёй. — А чым увогуле займаюцца падаткоўцы?

— Збіраюць падаткі, — адказала яна і падала мне руку.

І потым з'яўляецца гэтае пачуццё страчанага часу. Вырастае ў табе, як рыф, захрасае ўпоперак горла, мучыць, знясільвае. Я пазнаёміўся з ёй дзесяць гадоў таму, — думаў я, калі яна ў апошні раз ускрыкнула і заціхла, гледзячы на мяне ў цемры, нібы ўдакладняючы, ці нікому я выпадкова не распавяду цяпер пра сапраўдны колер яе валасоў, пра іх крохкасць і пасечанасць, ці не стану я выхваляцца перад сябрамі і знаёмымі, што бачыў яе адкрытай, ці не буду я потым нагадваць ёй усе яе выгукі і стогны, усю яе грубасць і пяшчоту, усе выгіны і вострыя выступы пад яе скурай. Дзесяць гадоў таму ёй было дваццаць, яна яшчэ нічога не ўмела, але яна лёгка вучылася і старанна паўтарала хатнія заданні. Дзе быў я ўвесь гэты час? Чым такім важным я займаўся? Чаму я не даведаўся нічога пра яе звычкі і паводзіны яшчэ тады — дзесяць гадоў таму? Чаму я толькі зараз убачыў, як яна рэзка прыбірае валасы, адварочваючыся да акна, як яна раніць пазногцямі ўласныя далоні, калі хоча стрымацца і не выдаць сябе, чаму толькі цяпер я даведаўся, што яна любіць размаўляць у цемры, гаварыць, рэагуючы на галасы і цёплы рух у прыцемках, чаму я столькі часу не знаходзіў у сабе сілы злавіць яе, прымусіць яе застацца, прымусіць яе рабіць тое, што ёй падабаецца? Дзесяць гадоў — час дастатковы, каб усё забыць і прыдумаць зноўку, каб раскласці неба на часткі і паспрабаваць сабраць яго яшчэ раз, ні на імгненне не сумняваючыся ў поспеху ўласнай задумы. Што адбылося з усім тым часам, што мінуў, на што ён быў выкарыстаны? Што сталася з намі за ўвесь гэты час? Я раз-

глядаў зблізку тонкія зморшчыны пад яе вачыма. Такія зморшчыны абавязкова з'яўляюцца ў людзей, якія многа смяюцца. Якія смяюцца многа і доўга, — дадаў я ад сябе. Яе твар набыў пэўнай вастрыні і дарослаці, яна амаль перастала карыстацца касметыкай, хоць усё роўна здавалася, нібы яна пастаянна фарбуецца. Магчыма, праз выразныя вочы, магчыма, праз цьмянасць скуры, што не рабілася маладзейшай. Яе ключыцы былі такія ж вострыя, пазногці былі гэтак жа пашчэрблены ў штодзённых сутычках, калені былі ў драпінах, лыткі былі ў сіняках, нагадвала яна цыркавую гімнастку, што апошнія дзесяць гадоў лётала ў паветры, б'ючыся і хапаючыся за згусткі і разломы наэлектрызаванай пустэчы. Калі стамлялася, прасіла прынесці вады. Голас яе перасыхаў, шаптала яна хрыпла, аднак ледзь чутна, быццам баючыся разбудзіць яшчэ каго-небудзь, хто спаў у гэты час. Змочвала вусны, уцешна пераводзіла дыханне і зноў шукала мяне сярод перакручаных мокрых прасцін. А чацвёртай ранку, выгаварыўшыся і супакоіўшыся, пачала засынаць. Гаварыла скрозь сон, успамінала нейкія імёны, паказвала на тонкія шнары на шыі, дастала цыгарку, папрасіла агню, так і заснула. Я асцярожна выняў у яе з пальцаў цыгарэту, паклаў побач з ложкам, на крэсла, дзе матляўся яе дзіцячы станік і ляжалі мае нявыкарыстаныя прэзерватывы. Падумаў, паклаў побач запальнічку. Разбярэцца зранку, — падумаў. Трэцяя ноч без сну рабіла рэчы празрыстымі, а прыцемкі — жывымі. Сэрца спяшалася так, нібы баялася спазніцца на цягнік. Яно ірвалася наперад, як сабака, якога доўга трымалі на ланцугу. Целам, ад левага лёгкага да правага, пракочваліся салёныя хвалі, глуха б'ючы па аблямоўцы і незадаволена адкоч-

ваючыся назад. Раз-пораз у цемры ўспыхвалі іскры, часам праляталі агністыя жукі. Трэба было ісці адсыпацца. Я сабраў свае рэчы, у калідоры, як здолеў, апрануўся, знайшоў красоўкі, выйшаў на лесвіцу. У пад'ездзе было светла і звонка, нібы ў шахце, з якой выбралі вуголле, а затым напоўнілі шклом і сонечным пылам. За вокнамі пачынаўся сухі жнівеньскі ранак. Я рушыў уніз, лічачы прыступкі, збіваючыся з ліку і лічачы ізноў. Унізе, за дзвярыма, на вуліцы, пачуў нейкі рух. Псы, — падумаў, — гэта вулічныя псы чакаюць мяне, каб перагрызці мне горла за ўсіх, каго я ў гэтым жыцці абразіў. Спыніўся, адважыўся, штурхнуў дзверы нагою. Яны са скрыпам расчыніліся. Святло ўдарыла мне ў вочы. Так, нібы я выйшаў з лабірынта, у якім блукаў апошнія дзесяць гадоў.

Было іх шмат. Я нават не бачыў тых, што стаялі ззаду. Але адчуваў іхняе цяпло, ад якога ноздры і горла браліся лёдам. З паўсотні іх было напэўна, а то і больш — вочы яшчэ не прывыклі да яркага ранішняга святла, абрысы іхнія чорна застывалі, нібы выразаныя са старога жалеза. Адзетыя былі па-вулічнаму, усім гадоў па дваццаць-трыццаць, кароткія валасы, зручны спартыўны абутак, лёгкія курткі з капюшонамі, цёмныя шырокія трэніровачныя штаны. Стаялі нерухома, чакаючы, відавочна, майго з'яўлення. Злавілі, — падумаў я і прытуліўся спінаю да цаглянай сцяны.

Усе пільна разглядалі мяне, глядзелі мне ў вочы, лавілі мае панічныя рухі. Нарэшце адзін з іх, старшы, загаварыў.

— Адсюль? — кіўнуў ён галавою на вокны ўгары.

— Ну, — сказаў я.

— Даўно тут жывеш?

— Нядаўна, — шчыра адказаў я.

— Чорнага ведаеш?

Я завагаўся. Хто яны? — падумаў. — Што ім гаварыць? Чорнага я ведаў. І ён мяне ведаў. Але я не ведаў, добра гэта ці дрэнна. Вырашыў гаварыць як ёсць.

— Ведаю, — сказаў.

— Ведаеш, дзе ён? — старшы падышоў да мяне зусім блізка і сцішыў голас.

— Ды адкуль? — здзівіўся я.

— Сапраўды? — перапытаў старшы, ушчыльную наблізіўшы да мяне свой твар. Ад яго пахла бензінам.

— Сапраўды, — я стараўся не адводзіць погляду.

— Ну ладна, — гэтак жа ціха сказаў старшы, — даведаешся — скажы.

— А вы хто? — не ўтрымаўся я.

Старшы на імгненне адхіснуўся і паглядзеў на мяне, не прыхоўваючы здзіўлення. Потым зноў нахіліўся і ціха загаварыў. Амаль зашаптаў. Я лавіў нейкія яго словы, іншыя наўзамен безнадзейна праляталі міма мяне. Перапытваць я не адважваўся, слухаў тое, што мог пачуць, здзіўляючыся і запамінаючы. Бо гаварыў ён рэчы важныя. Настолькі важныя, што мне і чуць іх было не абавязкова — я і так усё ведаў.

— Мы мытнікі, — сказаў старшы. — Мытнікі і вартаўнікі. Мы збіраем даніну з тых, хто вінаваты, збіраем яе для таго, каб ва ўсім была раўнавага. Мы забіраем лішняе і вяртаем тое, чаго не стае. Мы палюем на вінаватых і падтрымліваем нясмелых. Мы атрымліваем мыту з ашчадных і шчодрых, з легкадумных і каварных, мы збіраем яе ў верхнім горадзе і бедных кварталах за ракою. Мы бяром з прадпрыемцаў і банкіраў значныя штомесячныя сумы, але не грэбуем і медзя-

камі рабочых, шаўцоў і перакупнікаў. Мы складаем манету да манеты, банкнот да банкнота, мы фіксуем кожны грашовы перавод і захоўваем кожную фінансавую распіску. Паколькі ведаем: нішто не можа заставацца неаплачаным, нельга пакідаць пасля сябе ў гэтым жыцці ніякіх пазык, нельга ісці з гэтага жыцця вінаватым. Мусіш вярнуць усё, што табе не належыць, мусіш разлічыцца за ўсе, што атрымаў. Але мы збіраем не толькі грошы і каштоўнасці. Штомесяц мы збіраем нявыплачаную злосць, збіраем лютасць і жорсткасць, збіраем смеласць і застылае пачуццё помсты. А галоўнае — мы збіраем усю нявыплачаную любоў гэтага горада, усю без астатку, усю да апошняга ўздыху. Мы ўсе тут, у гэтым горадзе, і я, па вялікім рахунку, ёсць мытнікі любові. Мы збіраем яе кожную раніцу, мы адшукваем яе кожны вечар, мы знаходзім яе кожную ноч. Таму што не можа быць любові нявыплачанай, любові, пакінутай пры сабе, таму што ўся любоў належыць гэтаму гораду, таму што горад трымаецца на гэтай любові, напаўняецца ёю, нібы дажджом увосень, грэецца ёю, бы каменным вуголлем узімку. Без яе, без гэтай любові, горад проста памрэ ад холаду і смагі, яго пакінуць апошнія жыхары, яны выйдуць з яго, як з лабірынта, не ў стане далей блукаць гэтымі вуліцамі і закуткамі без аніякай мэты. Таму — што б ні здарылася, што б з намі ўсімі ні адбылося, якія б цяжкія часы нам ні давялося перажываць, якія б нягоды ні сышлі на нашы дахі — мы ўпарта і настойліва збіраем гэтую вялікую нябачную мыту, дабіраем яе атам да атаму, подых да подыху, смерць да смерці. Знаходзячы агульную мову з тымі, хто нічога не ўтойвае. Пераконваючы тых, хто нам не давярае. Знішчаючы тых, хто нам пера-

шкаджае. Так і перадай Чорнаму, — старшы павольна адвёў галаву, адступіў убок, вярнуўся да сваіх, нешта ім сказаў, вярнуўся, рушыў да ракі. Астатнія рушылі за ім. Засталіся бензінавыя плямы, у якіх адбівалася выгаралае неба жніўня.

Праз тыдзень яна пераехала да мяне. Рэчаў не брала, сказала, што наогул не ўпэўненая, ці ў нас нешта атрымаецца. У нас атрымалася. Але праз пару месяцаў яна зладзіла грандыёзную сварку. Усё як заўжды — агонь паўстаў ніадкуль, але зжор усё, выпальваючы нашы ўспаміны, як караблі ў порце. Яна доўга крычала і крыўдзілася. Я таксама крыўдзіўся, але хутчэй на самога сябе. Сыходзячы, яна сказала, што зменіць нумар тэлефона, каб я не званіў. Я прасіў не рабіць гэтага, паабяцаў не званіць. Але пад вечар патэлефанаваў, праверыў. Яна сапраўды змяніла нумар. Ну і добра, думаў я, далей злуючыся на самога сябе, добра, што я для яе памёр, добра, што ўсё гэта адбылося так хутка, добра, што не было ўсёй гэтай цяганіны з высвятленнем адносін. Вельмі добра, думаў я, вельмі добра. Хаця што добрага, калі падумаць?

Праз месяц яна вярнулася. А ўзімку зноў пайшла. На гэты раз папрасіла даць ёй час на разважанні. Падчас разважанняў нечакана выйшла замуж. Са мною, вядома, адносін не перапыняла. Я пачаў раўнаваць яе да яе ж мужа. Нашто ён табе? — пытаўся. — Навошта ты яго трымаеш? Ты ж проста мучыш яго. Яна пагаджалася, але, ясная рэч, расстацца з ім не магла. Ды ён бы і сам не пайшоў. Я хацеў з ім пагаварыць. Яна забараняла, ладзіла істэрыкі, гаварыла, што пакончыць з сабою, калі ён пра мяне даведаецца. Вядома ж, абя-

цала, што ўсё ўладкуе, абяцала, што ўсё будзе добра. Вясною з мужам развялася. Навошта ты ўвогуле за яго выходзіла? — пытаўся я. Яна тлумачыла, гаварыла нешта пра абавязкі, якія трэба вяртаць тым, хто нас любіць, пра любоў, якая рухае намі ўсімі, пра выплату і разлікі, сумленнасць і справядлівасць. Я разумеў, што яна і далей з ім бачыцца, мне пра гэта, ясная рэч, не гаворачы. Так пачалося лета. У чэрвені яна сказала, што зацяжарыла. Ясная рэч, не ад мяне. Ясная рэч, не ад яго.

БОБ

«Амерыка падаецца мне краінай сапраўды роўных магчымасцей, — паведамляў Боб Кошкін, пішучы кароткія, аднак змястоўныя электронныя лісты родным і блізкім. — Аснову гэтай роўнасці я бачу ў надзейнасці канстытуцыйных нормаў і сталасці дэмакратычных прынцыпаў. Я веру ў жывучасць і гнуткасць амерыканскай ліберальнай сістэмы, бачу будучыню за выраблены мі ёю прынцыпамі ўзаемадзеянняў вялікага капіталу з дзяржаўнымі механізмамі фінансавага рэгулявання. Адзінае, што выклікае ў мяне пэўныя перасцярогі, ды нават не перасцярогі — адзінае, што мяне па-сапраўднаму забівае, — гэта колькасць тут неграў».

Два месяцы таму, у пачатку лета, ён высадзіўся на аэрадроме Джона Кенэдзі і рушыў наперад, пачуваючыся так, як, мабыць, пачуваўся ў свой час Калумб: гайданка яшчэ не адпусціла, думка пра акіян выклікала спазмы, аднак пад нагамі ляжала Амерыка і час было пачынаць яе заваёўванне і акультурванне. Дабраўшыся да горада, Боб вызваніў былога адна-

класніка, які ўжо з добры дзясятак гадоў аціраўся на Іст-Вілідж. Аднакласнік прыбыў на сустрэчу праз паўгадзіны наўпрост у лазневым халаце. Боб меў на сабе каўбойскі капялюш з намаляванымі па крузе карпацкімі аленямі, лёгкі пінжак ды яркія стракатыя шорты. Па шортах аднакласнік яго і пазнаў. Абняліся, нават расцалаваліся. Звонку падобныя былі на пару трансвестытаў, што сустрэліся пасля доўгага расстання. Прычым трансвестыт у шортах сустрэчы радаваўся, а трансвестыт у лазневым халаце лічыў за лепшае яе максімальна адцягнуць. Дадому Боба аднакласнік не павёў. Селі ў кітайцаў, замовілі гарбату. Боб разлічваў, што за яго заплацяць, аднакласнік разумеў, што пэўна прыйдзецца. Боб дастаў з татавай скураной валізы, аблепленай гэдээраўскімі налепкамі з далікатнымі жаночымі галовамі, сувенірную талерку, чамусьці з відамі Крыма. — Гэта табе, — сказаў ён. Аднакласнік падзякаваў, убачыў від Ай-Петры. — О, — сказаў ён, — я ў Ялце ўпершыню на трыпер захварэў. На трэніровачных зборах. Бобу стала няёмка. — Забраць? — кіўнуў ён на талерку. — Не-не, — пачаў спірацца аднакласнік, — па-свойму гэта прыемныя ўспаміны.

«Памяць, — заўважаў потым Боб у сваіх паведамленнях, — здольная прыміраць у нашым уяўленні рэчы, на першы погляд несумяшчальныя і супрацьлеглыя паводле свайго лагічнага напаўнення. Часам я думаю: з якіх сумных эпізодаў складаецца наша свядомасць, з якіх несуцяшальных выпадкаў! Мабыць, менавіта ўсёахопнасць памяці і незваротнасць успамінаў і прымусілі чалавецтва прыдумаць спорт, мастацтва ды анестэзію».

Аднакласнік правёў яго да метро і пайшоў сабе, трымаючы пад пахаю падараную талерку, нібы па-

тухлы німб. У той жа вечар цягніком Боб дабраўся да блаславёнай Філадэльфіі. Знайсці сваякоў выявілася зусім нескладана: Кошкіных у тэлефоннай кнізе было ўсяго двое — цётка Амалія і дзядзька Саша. Дзядзька Саша, праўда, запісаны быў як Алекс, але Боба гэта ўжо не магло спыніць — ён адразу ж набраў сваякоў і натрапіў на крыху сварлівы дзявочы голас. Гэта аказалася яго кузіна Ліліт. Боб доўга тлумачыў ёй мэту свайго прыезду і ступень іхняга сваяцтва, глытаючы галосныя, не трымаючыся думкі, ціснучы перадусім на дзіцячыя ўспаміны і ўласцівую іхняй сям'і гасцінасць. Так, — крычаў, — менавіта так: міжнароднымі авіялініямі Украіны! Крыжовым паходам скрозь усе дзьюці-фры! Не еў двое сутак! Не меў ніякіх сумневаў, што знайду вас і змагу сціснуць у братэрскіх абдымках. Ліліт патлумачыла, як ехаць. Параіла не ехаць зайцам — яны ні за што плаціць не будуць.

Кошкіны аселі ў Філадэльфіі даўно і надоўга. З аднаго боку, хутка вывучылі мову, з другога — не забывалі пра ўласныя карані. А паколькі карані былі шчодра пераплецены, вялі яны даволі дзіўны лад жыцця. Дзядзька Алекс працаваў на вялікую фірму, што займалася прадуктамі харчавання, цётка Амалія была педагогам. Ці была яна пры гэтым беспрацоўнай, Боб не зразумеў. Радасць сям'і, шаснаццацігадовая Ліліт, вучылася і марыла стаць зубным лекарам. «Усё так, — пісаў з гэтай нагоды Боб, — узровень нашых жыццёвых патрэб мае вызначацца ўзроўнем нашых магчымасцей. Менавіта таму я ўсё жыццё марыў стаць каралевай карнавалу дзе-небудзь у Бразіліі». Кошкіны даволі выбарачна прымалі амерыканскую рэчаіснасць. Нягледзячы на гады, праведзеныя на чужыне, далей

святкавалі ўсе савецкія святы. Але і ўсе праваслаўныя таксама. І несумненна габрэйскія. Таму Велікодныя вечары для іх непрыкметна перацякалі ў Дзень салідарнасці працоўных. Дзядзька Алекс аднойчы нават выйшаў у гэты дзень на дэманстрацыю, паддаўшыся на ўгаворы сяброў з нейкага дзіўнага хасідскага анархічнага гуртка. Чацвёртае ліпеня, Дзень незалежнасці, яны таксама святкавалі, паколькі чамусьці лічылі гэтае свята габрэйскім. Калегі дзядзькі Алекса па працы не пярэчылі, казалі, што матывацыя ў гэтым выпадку — не галоўнае, галоўнае — святочны настрой.

Нечаканае з'яўленне Боба выклікала ў сям'і Кошкіных замяшанне. Прыхадзень з Усходу палохаў сваімі бакамі і рознакаляровымі шортамі. Хацелася адразу папрасіць яго паказаць зваротны квіток. Кошкіны даўно перарвалі адносіны з заакіянскай сям'ёй, сам дзядзька Алекс успамінаў роднага брата, то-бок Бобавага бацьку, выключна ў негатыўным кантэксце, то-бок выключна як мудака. Было для таго некалькі прычын: па-першае, тата Боба быў партыйным, па-другое, быў невыносным, па-трэцяе, прадаўшы сямейнае лецішча, з малодшым братам дзяліцца не захацеў. Таму ліхія ўспаміны пра ранейшае жыццё засталіся, здавалася б, у далёкім мінулым. І вось гэтае мінулае зноў ступіла на іхні парог, і як на яго рэагаваць — было пакуль не зразумела. Дзядзька Алекс у першы вечар на ўсялякі выпадак прыгатаваў святочную пасту, таму ўся сям'я сядзела за вялікім сталом і пераглядвала прывезеныя Бобам сямейныя фотакарткі. На фотакартках маладыя Кошкіны — Бобаў тата Сева і яго малодшы брат Шурык — белазуба зазіралі жыццю ў недаверлівыя вочы, дзёрзка кідаючы выклік няпэўнай будучыні.

Тата Сева быў падцягнуты і самаўпэўнены, Шурык — друзлы і жаноцкі. Дзядзька Алекс на фотакарткі пазіраў з агідаю, усе мы ахвяры таталітарнай сістэмы, — гаварыў ён, тыкаючы жоўтым пазногцем у чорна-белую выяву, — вы толькі паглядзіце на мой жывот. Жанчыны з цікавасцю разглядалі яго круглявае чэрава, гаворачы, што для ахвяры ён выглядаў даволі ўкормлена. Якое ўкормлена, — адбіваўся дзядзька Алекс, — я з дзяцінства боксам займаўся, у мяне вось нос у двух месцах зламаны, — дэманстраваў ён усім свой вялікі ладны нос, — перапонка пашкоджана. Жанчыны адразу ж пачалі выказваць сімпатыю да Боба і горача падтрымлівалі размову. Цётка Амалія — пышная і ласкавая пасля сухога каліфарнійскага — захоплена разглядала фота з канца сямідзясятых, усе гэтыя пляжныя сцэны і пікніковыя замалёўкі, злосна каментуючы прычоскі і купальныя касцюмы галоўных дзеючых асоб. Больш даставалася, вядома, дзядзьку Алексу. Як у любой сям'і, што згубіла свой шанц на спакойны развод, адносіны паміж імі трымаліся на ўзаемным прэсінгу, таму цётка Амалія раптам запаліла ўсе берагавыя агні і ўзялася дабіваць няшчаснага дзядзьку Алекса, указваючы таму на неадпаведнасць жыццёвых запытаў ды сацыяльнага статусу. Алекса хапіла ненадоўга: недзе паміж пастай і какосавым печывам ён з усімі развітаўся, пажадаў нябозе салодкіх сноў, выказаўшы цвёрдае перакананне ў тым, што Амерыка, як калыска дэмакратыі, зробіць з яго чалавека, тобок што ён не паўторыць памылак яго прыдуркаватага брата Севы, а стане годным членам адкрытага грамадства. Цётка Амалія запрапанавала лічыць гэта тостам. Ліліт прысунулася да Боба з левага боку.

Апынуўшыся паміж дзвюх жанчын, Боб раптам расслабіўся і супакоіўся. Нарэшце ён здзейсніў тое, пра што прасіў яго бацька, — знайшоў рэшткі раскіданага светам сямейства, сабраў разам усіх Кошкіных, аднавіў раўнавагу, адчуў голас крыві. Бо што такое сямейныя адносіны? Памяць пра памерлых, клопат пра працяг роду. Дарэчы, пра працяг роду, — падумаў Боб і асцярожна акінуў вокам Ліліт. Тая нагадвала сваю маму — мела такія ж шырокія сцёгны, такую ж высокую прычоску і яркія вусны. Мама й дагэтуль выглядала даволі прыстойна, асабліва для свайго ладу жыцця. Гледзячы на яе, можна было прадбачыць, што чакае Ліліт праз нейкіх дваццаць гадоў. То-бок можна было прадбачыць, што нічога добрага яе не чакае. «Адсутнасць дастаткова празрыстых механізмаў, — разважаў на гэты конт Боб у лісце да таты Севы, — што забяспечваюць наша прасоўванне сацыяльнымі ліфтамі, часта звяртае нас да спраў прынцыпова больш інтымных, такіх як сямейнае жыццё, царкоўная заангажаванасць ці проста штодзённыя медытацыі. Хаця ў большасці выпадкаў усё заканчваецца наркалогіяй». Ліліт цэлы час сядзела поруч, потым і зусім прыціснулася да яго сваім гарачым сцягном, адпускала крытычныя рэплікі адносна мясцовых філадэльфійскіх парадкаў, хваліла Боба за яго выразныя жыццёвыя перакананні, жавала гумку і пахла нейкімі забойнымі араматычнымі масламі. Добра было б яе заваліць, — думаў Боб, распавядаючы жанчынам пра праблемы посттаталітарызму ды ксенафобіі ў родным горадзе. — Праўда, яна мая стрыечная сястра. Як гэта будзе трактавана? Тут, у краіне перманентнай дэмакратыі, такія рэчы, мабыць, і не вітаюцца. Неяк гэта зусім ужо па-ўсходня-

му — спаць з уласнай стрыечнай сястрою, ёсць у гэтым нешта такое безнадзейна наша, посттаталітарнае. Урэшце ён павярнуўся да цёткі Амаліі, адчуваючы пякучы агонь дзявочага цела і прагна ловячы ноздрамі арамат ызаванае паветра. Цётка Амалія тым часам таксама распалілася, курыла ментолавыя цыгарэты, корпалася нажом у астылай, нібы нябожчык пасля доўгай і няўдалай аперацыі, пасце і распавядала пра тулянні іхняй сям'і, пра доўгія гады выгнання, пра падарожжы ў таварных вагонах і карабельных трумах, пра буферныя зоны і хімічную апрацоўку адзення, пра пах свабоды і роўныя магчымасці, пра выцісканне з сябе раба, пра перманентную дэмакратыю як перадумову жыццёвай раўнавагі ды мультыкультуралізм як аснову мірнага суіснавання нават з неграмі. Бліжэйшыя нам паводле духу і маральных установак, — гаварыла яна Бобу крыху рэзкаватым нецвярозым голасам, — бясспрэчна, украінцы. Яны ўсе нацыяналісты. Гэта нас аб'ядноўвае. Боб не бачыў у яе словах асаблівай логікі, аднак сама тэма размовы яму падабалася. На пытанне, што там, на бацькаўшчыне, якія навіны, якая сітуацыя, распавядаў наступнае: безумоўна, мы ўсе ёсць сведкамі гістарычных катаклізмаў, што няўмольна і незваротна змяняюць жыццё горада і характар яго жыхароў. Пасля доўгіх гадоў барацьбы да ўлады ў мегаполісе прыйшлі жрацы, штукары і чэравамоўцы. Скарыстаўшыся пакінутымі без нагляду сацыяльнымі ліфтамі і апынуўшыся на верхавіне палітычнай піраміды, яны ўзяліся за вырашэнне найбольш надзённых праблем гарадскога самакіравання. Так, перш за ўсё былі папраўлены ды ўмацаваны гарадскія муры, асабліва з усходняга боку, адкуль звычайна чакаецца небяспека ў выглядзе

качавых памежных плямёнаў. Адразу пасля адбыліся глабальныя змены ў гарадской забудове, у прыватнасці, праз галоўныя вуліцы ў цэнтральнай частцы горада былі прабіты два новыя праспекты, адзін з якіх працягнулі ад усходняй брамы да заходняй, а другі — ад паўночных мастоў да паўднёвых лагчын. У месцы, дзе яны перасякаліся, была пабудавана піраміда, што сімвалізавала архітэктурную адэкватнасць і фінансавую празрыстасць новай улады. Звыклым стала правядзенне масавых акцый пакланення культу продкаў ды штонядзельнае асвячэнне рачной вады з мэтай далейшага яе выкарыстання ў камунальнай гаспадарцы. Павялічылася колькасць сцягоў. На сцягах, — сцвярджаў Боб, — намаляваны перш за ўсё львы, шакалы ды баявыя пеўні, што павінна было сведчыць аб цвёрдай устаноўцы новай улады на далейшую сацыяльную ломку. Нягледзячы на ўсе відавочныя і бясспрэчныя рэформы, праведзеныя ў апошні час, праблема посттаталітарызму ды ксенафобіі, паводле ірваных сведчанняў Боба, нікуды не знікла. Таму, скажам, я, — суха канстатаваў ён, — пазбаўлены найменшага шанцу на прасоўванне ўгору хоць бы якімі, хоць бы грузавымі сацыяльнымі ліфтамі. І ўсё, што выпадае на мой жыццёвы лёс, — гэта сумнае гібенне ў цесных завулках прыгараднага гета, цяжкі цяжар неадаптаванасці, несуцяшальнае сузіранне грамадскай дыферэнцыяцыі ды рэлігійнай нецярпімасці. Гэтыя сукі, — плакаўся Боб, хапаючы цётку Амалію то за руку, то за калена, — ніколі, вы чуеце, ніколі не дазволяць мне цвёрда стаць на ногі!

Цётка Амалія слухала, нервова сціснуўшы вусны. Ліліт гладзіла яго па плячы, ад чаго Боб плакаўся яшчэ больш зацята. І толькі недзе бліжэй да поўначы, пасля

чарговай бутэлькі каліфарнійскага, ён завёў размову пра двухгаловых працаўнікоў муніцыпалітэта, у чые абавязкі ўваходзіць курыраванне сектара адукацыі і спальванне вядзьмарак на цэнтральным рынку, цётка Амалія такі сабралася з духам і прапанавала ўсім ісці спаць, пажадана дома, пажадана асобна. У канцы выказала выразную ўпэўненасць, што Боб зрабіў правільны выбар і што Амерыка, гэтая калыска мультыкультуралізму, такі зробіць з яго чалавека. Калі ён, вядома, будзе па-чалавечы сябе паводзіць.

На пасту зранку было балюча глядзець.

Так пачаліся яго філадэльфійскія будні. Займацца асабліва не было чым, да працы яго пакуль ніхто не заахвочваў, зваротны самалёт, квіток на які Боб на ўсякі выпадак узяў, быў толькі праз два месяцы, можна было пазнаваць рэчаіснасць і паглыбляцца ў невядомае. У першыя дні пасля прыезду Боб сфатаграфаваўся з помнікам Сталонэ і наведаў украінскі клуб. У клубе займеў дыскусію пра нацыяналізм з народжанымі ў выгнанні ўкраінскімі юнакамі. Боба з улікам яго шчодрых рудых бакаў ды цяжкім вымаўленнем прынялі за ірландца. Яшчэ дзівіліся, адкуль гэты грэбаны ірландзец ведае прозвішчы ўсіх украінскіх дэпутатаў. Мераліся сілаю на кулаках, спявалі бандэраўскія песні. Боб спрабаваў пры гэтым гучна пратэставаць, але ўсім здавалася, што ён падпявае, столькі ў яго голасе было запалу і чыста ірландскай любові да Украіны. Пад канец Боб заснуў. Седзячы. Яму выклікалі таксі. Паўстала пытанне, куды яго везці. Знайшлі яго мабільны, убачылі на застаўцы фота з помнікам Сталонэ. Туды і адвезлі.

Звычайна позняй ноччу, калі ўся сям'я Кошкіных разбрыдалася па доме, Боб чытаў лісты з бацькаўшчыны. «Дарагі Боба, — пісаў яму тата Сева, — ніколі і ні пры якіх абставінах не вяртайся ў гэты богам забыты горад! Паспрабуй зрабіць усё, каб застацца там — у краіне штодзённай дэмакратыі, у майго замудоханага брата Шурыка. Гэты горад не варты тваёй любові і памяці. Досыць таго, што ён учыніў са мною, пазбавіўшы веры, надзеі ды партыйнага стажу. Нізашто сюды не вяртайся! А калі ўсё-ткі вернешся, вельмі цябе прашу пашукаць у якіх-небудзь кітайцаў запасныя дыскі для маёй газонакасілкі». Мама пісала менш патэтычна, аднак не менш трывожна. Паведамляла, што ў горадзе перашэптваюцца пра дэфолт і новае адключэнне святла. Нібыта банкаўскія аўтаматы выдаюць толькі буйныя купюры, і тыя мечаныя. І ў пітной вадзе нібыта знойдзена нейкая мутаваная разнавіднасць інфекцыйнай палачкі, і гэта нягледзячы на штонядзельнае асвячэнне рэчак ды азёр, Бобачка, гэта нягледзячы на ўсю іхнюю сацыяльную ломку! Пагаворвалі таксама, што бацькі горада атрымалі кітайскія пашпарты, таму перадача ключоў ад гарадскіх брам прадстаўнікам кітайскай кампартыі была пытаннем часу. Намякалі таксама, што вось-вось павінны пачацца перабоі з цукрам ды мукою. Адным словам, — завяршала мама, — жыццё поўнае памылак і таямніц, і трэба мець жалезныя нервы ды халоднае сэрца, каб даслухоўваць ранішнія навіны хаця б да прагнозу надвор'я. Таму з нецярпеннем чакаем цябе на нашай гасціннай зямлі!

Куды больш цікава і непасрэдна пісаў Жорык — іншы ягоны стрыечны брат, дыпламаваны медык, пра-

цаўнік адной з кругласутачных аптэк. Жорык пісаў доўгія павучальныя лісты, пускаўся ў маралізатарства, не грэбаваў лірычнымі адступленнямі. Пісаў, што Фама, іхні сусед па пад'ездзе, пачаў сустракацца з былой прастытуткай. Увесь пад'езд пераймаецца. А Марык, іхні далёкі сваяк праз цётку Марыну, па ходу спіць са сваёй стрыечнай сястрою. Ніколі не ведаеш, — каментаваў гэтыя выпадкі Жорык, — якія сюрпрызы рыхтуе табе лёс. Галоўнае пры гэтым — не здзіўляцца. Не забудзь пры нагодзе перадаць прывітанне Лілічцы, нашай мілай кузіне.

Але пра кузіну Бобу нагадваць не было патрэбы. Ліліт пасялілася ў яго сэрцы, развёўшы там суцэльнае бязладдзе. З думкай пра яе ён засынаў, з думкай пра яе прачынаўся. Зранку доўга ляжаў на надзіманым матрацы, дзе яго размясцілі сваякі, і слухаў, як яна прачынаецца за сцяной і пачынае ліхаманкава збірацца на навучанне, як шукае вопратку, як фарбуецца, як хапаецца за мабільны. Увечары, кладучыся спаць, з заміраннем разбітага сэрца слухаў, як яна трындзіць з кімсьці па скайпе, як рыхтуецца да сну, як лёгка шамаціць яе адзенне, як яна салодка засынае, як да яе ў сне прыходзяць кінагероі ды прафесійныя футбалісты. Некалькі разоў ён бачыў, як яна выходзіла са свайго пакоя напаўраздзетая, аднойчы яна папрасіла яго зашпіліць ёй станік, але ён не даў рады, яшчэ і Амалія праходзіла міма, дык нязручна было ўсім траім. Час ад часу ён знаходзіў на кухні яе трусікі і ўспрымаў гэта як пацвярджэнне існавання ўсіх святых. Часам яна прыходзіла толькі пад раніцу, і тады Амалія ладзіла сварку, а Боб ляжаў на матрацы і вар'яцеў ад рэўнасці і суперажывання. Дзень незалежнасці святкавалі ціха і па-сямейнаму. Ліліт бы-

ла безуважлівая, з Бобам амаль не гаварыла, бацькоў ігнаравала. Боб прыкладаўся да сухога каліфарнійскага і вёў дыскусіі з дзядзькам Алексам адносна ўплыву амерыканскай дэмакратыі на стабільнасць нафтавага рынку. Амалія паддала ўжо раніцай і цяпер была цалкам на баку Боба. На тым і разышліся. З Ліліт нічога не атрымлівалася. Боб безнадзейна захандрыў. Яшчэ раз наведаў украінскі клуб. Там яго зноў прынялі за ірландца, але на гэты раз чамусьці пабілі. Сонца над Філадэльфіяй свяціла адчужана. Паветра было прасякнута безнадзейнасцю. Хацелася павесіцца, лепш за ўсё ў яе пакоі, лепш за ўсё ненадоўга. Ён спрабаваў пісаць ёй лісты. Спрабаваў падсцерагчы ноччу каля яе дзвярэй. Аднак усё было марна, і лета праходзіла, зносячы за сабою ўсе ягоныя надзеі ды спадзяванні. Ліліт на вакацыях наогул страціла сумленне і дадому прыходзіла хіба што за свежым адзеннем.

І вось недзе ў пачатку жніўня, калі да самалёта заставалася нейкіх чатыры дні, цётка Амалія запрапанавала зладзіць паці. На паці прыйшлі ўласна Амалія і Боб. Ліліт іхнюю кампанію рашуча праігнаравала, а дзядзька Алекс закруціўся дзесьці па працы, аднак ператэлефанаваў і параіў пачынаць без яго. Амалія піла і скардзілася на сямейнае жыццё, на мужчынскую чэрствасць і дзіцячую няўдзячнасць, Боб як мог яе падтрымліваў, так-так, гаварыў: чэрствасць, няўдзячнасць, чорт ведае што. Бліжэй да дванаццатай Амалія вырашыла перазваніць дачцэ. Адразу ж пачала сварыцца, крычала, плакала, пагражала. Нечакана перадала слухаўку Бобу. — Што там у вас адбываецца? — пачуў ён спакойны і крыху халодны голас Ліліт. Боб

азірнуўся вакол. Амалія плакала ў кутку, не выпускаючы з рук сваю ментолавую. Стол быў застаўлены пустой тараю. — У нас паці, — патлумачыў ён кузіне. — Добра, — адказала тая, — тады робім так: пакладзі яе спаць. І сам кладзіся. Я хутка буду. Голас яе ўжо не гучаў так металічна, больш за тое — Боб зразумеў, да чаго яна вяла. Вядома, падумаў, вось яно, яна ўсё спланавала, яна ўсё прадумала, менавіта так — кладзіся, аднак не засынай, дачакайся мяне, я хутка буду, я ўжо спяшаюся. Гаварыла яна, што ўжо спяшаецца? Ясна, што гаварыла, ён чуў гэта на ўласныя вушы. І тады Боб дапамог Амаліі падняцца на другі паверх, а калі тая ўпала на ложак, не здымаючы вечаровага хатняга халата, кінуўся да сябе і пачаў рыхтавацца да прыходу Ліліт. Прыбраў брудную вопратку, аднёс на кухню нямыты посуд, запаліў свечку, ад яе загарэліся нейкія часопісы, заліў усё гэта вадою, потым спешна праветрываў пакой, доўга зачыняў акно, не змог, застаўся спаць на скразняках. Чакаў дзесяць хвілін, потым дваццаць, потым сорак. Паступова яго ахоплівала роспач. Вочы стаміліся разглядаць цемру. Раптам у калідоры нешта рыпнула. Дзверы, адразу ж зразумеў ён, уваходныя дзверы. Гэта яна. У калідоры пачуліся няўпэўненыя крокі, хтосьці пару разоў наткнуўся на сцяну, дзверы ў яго пакой таксама рыпнулі, цёплая жаночая постаць праслізнула скрозь морак і апусцілася побач з ім. І перш чым пачаць падрыхтаваную прамову пра неперабарлівасць смагі ды немінучасць спакусы, ён заўважыў над сабою крыху паблеклыя кучары цёткі Амаліі, і з жахам заўважыў ментолавую цыгарэту ў яе правай руцэ, і з адчаем адчуў яе левую руку на сваім жываце, а перш чым цётка Амалія паспела зрабіць для

яго хоць нешта калі не прыемнае, дык, прынамсі, карыснае, нервы яго не вытрымалі, ірвучыся, як капронавыя струны, і назапашаная ім за гэтыя два месяцы туга і пакута вырваліся вонкі, абрываючы ўсе спадзяванні цёткі Амаліі на доўгую бяссонную ноч, абрываючы ўсе разлікі Боба на любоў і ўзаемнасць. Амалія, да яе гонару, нічога не сказала. Толькі села зручней побач з ім, дастала з кішэні халата наступную цыгарэту і стала чакаць. Боб у гэты час гаварыў. Намагаўся гаварыць упэўнена і суха, так, каб і не апраўдвацца, і разам з тым усё ёй патлумачыць, так, каб не выглядаць смешна, але пажадана ўсё-ткі перавесці ўсё ў жарт. Доўгае ўтрыманне, тлумачыў ён, схіма і медытацыі, мы — воіны-манахі — маем справы не столькі з жанчынамі, колькі з халоднай зброяй, таму і нядзіўна, што адбылася такая аказія. Але не трэба сябе дакараць, — раіў ён Амаліі, — не трэба сябе ні ў чым вінаваціць: ты ўсё зрабіла правільна, зрабіла як здолела, зрабіла як прывыкла рабіць у сваім нешчаслівым жаночым жыцці. Проста ён прывык трошкі да іншых стасункаў і да іншага градуса жарсці, а што ён мае на ўвазе, ён прадэманструе ёй проста цяпер — Боб гаварыў усё больш упэўнена, паколькі дзесьці глыбока ў сваім разбітым і наспех склееным сэрцы адчуваў гатоўнасць працягнуць гэтае спаборніцтва. Таму перахапіў яе левую руку і прыклаў да свайго жывата. Амалія было ажывілася і нават адклала ўбок цыгарэту, але варта было ёй намацаць у цемры тое, пра што распінаўся Боб апошнія сорак пяць хвілін, як усё паўтарылася так, як і ў першы раз, і Амалія толькі скрушна выціралa руку аб лацкан халата, а Боб роспачна забіўся пад падушку ад сораму і безнадзейнасці. Раптам уваходныя дзверы сапраў-

ды рыпнулі. Гэтым разам то была-такі Ліліт. Боб пачуў пад горлам халодны крыштальны перазвон. Гэта асыпаліся рэшткі яго сэрца. Амалія паднялася і, не хаваючыся, выйшла ў калідор. Штосьці спытала ў дачкі, штосьці ёй расказала. Ліліт лёгка засмяялася, потым зайшла ў свой пакой. У цішыні гучна шчоўкнуў унутраны замок у яе спальні.

Раніцай Боб паведаміў усім, што мусіць ехаць наўпрост сёння, бо да адлёту дамовіўся аб некалькіх важных сустрэчах у НЁ, таму не можа марнаваць ні хвіліны каштоўнага часу. Падзякаваў за гасціннасць, прапанаваў заплаціць за сапсаваны кран у душавой, абяцаў пісаць. Нічога, — думаў ліхаманкава, — перасяджу тры дні ў аднакласніка. Галоўнае — падалей ад гэтай ганьбы. Як ні дзіўна, сваякі праводзілі яго пяшчотна і тужліва, заклікалі паехаць хаця б на наступны дзень, адгаворвалі, спакушалі, давалі наказ на дарогу. Найбольш праз яго ад'езд разбедаваўся чамусь дзядзька Алекс. Найменш — Ліліт. Амалія правяла яго да парога і пяшчотна пацалавала ў вусны.

Уся справа ў жанчынах, — думаў ён, назіраючы, як цягнік вырываецца з невясёлых прыгарадаў на шырокія прасторы, — усё ў нашым сэрцы мяняецца ад нашых з імі стасункаў, ад нашай імі зацікаўленасці. Жыццё ніколі не дае гарантый, — думаў Боб, — у большасці выпадкаў яно просіць паверыць на слова. І калі ты давяраеш яму, калі становішся адкрытым і безабаронным, яно трушчыць усе твае спадзяванні, як вялікая вада трушчыць прыбярэжныя рыбацкія паселішчы. Усё маё заваёўванне дзікай і непакорлівай Амерыкі абарвалася праз залішне далікатныя і рашучыя жаночыя

рукі, праз занадта глыбокае і пракуранае дыханне адной жанчыны ды недастаткова дарослую, на жаль, нават зусім па-дзіцячаму бессэнсоўную легкадумнасць іншай. І хто дапаможа мне ў гэтай сумнай сітуацыі? На каго можна спадзявацца? Блізкія не дапамогуць мне нічым, бо не справа блізкіх займацца праблемамі тваёй эрэкцыі. Сябры не вырашаць маіх праблем, хіба што падзеляцца сваімі ўласнымі. Што яны могуць мне расказаць, што параіць? Адзін з іх спіць са сваёй сястрою, другі — сустракаецца з былой прастытуткай. А што мне да прастытутак? — разважаў Боб, усё больш запальваючыся. — Што такое прастытуцыя, калі падумаць? Бясспрэчна, гэта жыццёвая параза, досвед падзення ды пакоры. Тады што нас прыцягвае да гэтых жанчын? Што нас прымушае падаваць ім руку дапамогі, што падштурхоўвае нас да паразумення з імі? Грамадская знявага? Бясспрэчна — грамадская знявага. Мужныя і адважныя мужчыны ў апошнюю чаргу звяртаюць увагу на грамадскае ханжаства ды двайныя стандарты. Хутчэй наадварот — яны дзейнічаюць насуперак рэлігійным ды маральным догмам. Яны трымаюцца тых не менш мужных і адважных жанчын, паколькі менавіта побач з імі адчуваюць паўнату пражывання і глыбіню пачуцця. Бо хто наогул ідзе ў прастытуткі? Улюбёнкі лёсу, моцныя, цэласныя натуры. Нястрымныя каханкі, шчаслівыя нарачоныя, любімыя дзеці. Студэнткі-выдатніцы, працаўніцы-ўдарніцы. Шматдзетныя маці з невычэрпнымі запасамі пяшчоты, удовы, што ўсынаўляюць сірот і любяць сухое дыханне шампанскага. Дык пра каго ж мне і думаць, — думаў Боб, целяпаючыся ў тамбуры на пад'ездах да НЁ, — як не пра іх? Каго ж мне славіць у сваіх

штодзённых духоўных практыках? Бо большасць з іх жыве жыццём значна больш асэнсаваным за маё, жыццём, поўным грамадскай дарэчнасці ды грамадскай актыўнасці. Упэўнены, што сярод іх найбольш часта трапляюцца экалагічныя актывісткі і палітычныя дзяячкі, культуртрэгеркі ды царкоўныя харысткі. Бясспрэчна, большасць з іх знаецца на палітэканоміі ды сувязях з грамадскасцю, бясспрэчна, для большасці з іх блізкімі ёсць неаліберальная мадэль эканамічнага развіцця ды балонская сістэма адукацыі. Усе яны закаханыя ў харавыя спевы ды камандныя віды спорту, усіх іх яднае захапленне сёрфінгам, вялікім тэнісам ды здаровым ранішнім бегам. Зранку яны збіраюцца ў басейнах ды спартыўных залах і славяць наканаванне за магчымасць быць датычнымі да часу і прасторы, за шаленства быць пагружанымі ў цёмнае рэчышча эпохі, за мёд на вуснах і ружы пад нагамі, за радасць зносін з найбольшымі вынаходнікамі ды энтузіястамі нашай гераічнай пары. Боб раптам адчуў, што трызніць. Магчыма, нават услых. Добра, што вакол адны чорныя: ніхто нічога не зразумее. Яго і белыя звычайна кепска разумелі, а што ўжо казаць пра гэтых. Так ці інакш, пачыналася прастуда, пачыналася прагназавана, як кастрычніцкія дажджы. Трэба было лячыцца. Трэба было вяртацца дадому.

Яшчэ на вакзале ён заўважыў некалькіх стрыманых, але радасных кітаянак, якія сядзелі ў фаст-фудзе над сваёй локшынай. Іх парцалянавыя шыі навучана згіналіся над ежаю, нібы сведчачы жаночую пакору ды няспешнасць. У падземцы яму трапілася кампанія італьянак, што роспачна разглядалі карту горада і спрачаліся так горача, нібы чыталі ўслых раннія футуры-

стычныя маніфесты. Ад іх пахла цяплом і пяшчотным, ледзь адчувальным потам, які нагадваў Бобу рачныя поймы і штучныя азёры яго роднага горада, кабінкі для пераапранання і жнівеньскія пляжы з іхнім сонцам і антысанітарыяй.

Аднакласнік слухаўку не браў. І на лісты таксама не адказваў. І дома яго таксама не апынулася, хоць Боб на гэта і разлічваў, хутка знайшоўшы ў нэце неабходны яму адрас. Нічога, — намагаўся ён не гарачыцца, — перасяджу да заўтра, павінен жа ён адгукнуцца. У кішэні яго шортаў ляжаў пашпарт, зваротны квіток і апошняя сотня. Марнаваць грошы на хостэл не хацелася. Боб павалокся гарачымі вуліцамі, верачы ў знакі і не губляючы веры ў людское прызначэнне. На скрыжаванні яго неасцярожна зачапіла сваімі чорнымі раскудлачанымі валасамі шалёная пуэртарыканка. У маленькай грэцкай краме, куды ён забрыў па ваду, да яго прыціснулася, выходзячы, светлавалосая і лёгка апранутая немачка з далікатным светлым пушком на трэніраваных сцёгнах, з рэльефным жыватом, з пірсінгам, што матляўся на носе, быццам пярсцёнак з інфармацыяй на лапцы хатняга голуба. Ён цягнуў у руках валізу, якая станавілася ўсё больш цяжкай, і марыў пра перапынак, марыў пра гарачую гарбату і халодную жаночую скуру. Пад вечар набрыў на ўкраінскі клуб. Там яго напаілі палякі. Выпіўшы, ён спрабаваў заплаціць сам і за сябе, і за сваіх сяброў, аднак палякі наадрэз адмовіліся, запэўніўшы, што для іх гонар спаіць такога пякельнага ірландца, што Ірландыя наогул краіна-сястра Польшчы. Бо ў вас такія жанчыны! — захоплена крычалі яны, зайздросна пазіраючы на яго бакі. — У вас такія жанчыны! Рудыя і гарачыя, бы вавёркі! Бледна-

скурыя, як медузы! Высокія, быццам карабельныя хвоі. Усеяныя рабаціннем, нібы сузор'ямі, за якімі капітаны вядуць свае караблі!

Начаваць, зрэшты, Боба з сабой не забралі, абмежаваліся словамі падзякі ды чарговым захапленнем з нагоды ірландскіх жанчын. Навошта яны мне пра гэта гавораць, — плакаў Боб, лежачы на прагрэтай за дзень лаўцы пад востраканцовай пратэстанцкай царквою, — навошта яны выкручваюць з мяне душу? Што мне да ірландскіх жанчын? У мяне ні разу не было ірландскай жанчыны. Нават паўночнаірландскай ні разу не было! У мяне не было ніводнай пуэртарыканкі, ніводнай бразільянкі, ніводнай перуанкі. Я не ведаю, якая на смак іхняя любоў, якая яна навобмацак, як яна вымаўляецца іхнімі вуснамі. Я проста хачу дадому — у горад сонца, які я пакінуў так легкадумна, ад якога я так неабачліва адышоў на небяспечную адлегласць, ажно страціў любое яго адчуванне. І ўсе іншыя адчуванні я таксама даўно страціў, — дадаваў у думках Боб, бо менавіта так яно і было: ён не адчуваў уласнага горла, не адчуваў языка, не адчуваў болю, не адчуваў жыцця. З тым і заснуў. Снілася яму каралева Англіі.

Ранак прынёс палёгку ды надзею. Тэмпература спала, па целе клекатала застаялая за ноч кроў, галубы сядзелі на валізе і выдзёўбвалі вочы жанчынам на налепках. Аднак у парку насупраць рабіла нейкія свае неверагодныя практыкаванні юная цемнаскурая дзяўчына. І ногі яе пры гэтым запляталіся ў такія невераемныя вузлы, што ў Боба ўраз знік увесь ранішні настрой і вярнулася ўчарашняя туга і няўпэўненасць. Ідучы да аднакласніка, ён старанна абыходзіў сонечных афіцыянтак, што выносілі крэслы і засцілалі ста-

лы бялюткімі абрусамі, абыходзіў сталых паштарак, што пазіралі на мінакоў уважліва і трапятліва, як на патэнцыйных уласнікаў паштовых скрынак. Абыходзіў зусім старэнькіх манашак, што зіхацелі керамічнымі сківіцамі, абыходзіў поўных жанчын-паліцэйскіх, у чые рукі хацелася аддацца і чыімі кайданкамі хацелася навекі быць скаваным. Аднакласніка зноў не было дома. Роспыты ў суседзяў не далі нічога добрага, хутчэй наадварот — з суседняй кватэры выбегла японка, выскачыла, нядбайна прыкрываючыся коўдраю, ды што там прыкрываючыся — размахваючы ёю, нібы сцягам. Вока Боба мімаволі, аднак учэпіста слізганула і па цёмных голеных лытках, і па залатых ад святла сцёгнах, і па ўсім, што было ў яе яшчэ, і няхай было ў яе ўсяго не так шмат, улічваючы, скажам, узрост, але і гэтага аказалася дастаткова, каб ён увайшоў у стан цяжкай меланхоліі, падзякаваў незразумела за што, развітаўся невядома навошта і пабрыў у бліжэйшы парк, дзе прасядзеў да вечара. Увечары натрапіў на царкоўную ядальню, павячэраў, распавёў жанчынам, што разлівалі суп, пра свае бадзянні. Жанчыны слухалі ўважліва, аднак супу больш не прапаноўвалі. Прастытуткі, — злаваўся сам сабе Боб, — сапраўдныя прастытуткі. Хіба гэтаму вучыць іх іхняя вера? Хіба да гэтага заклікаюць іх іхнія пастыры? Чаму б не пакінуць мяне ў гэтай чортавай ядальні да раніцы? Прастытуткі, — толькі і паўтараў ён, — ага, прастытуткі. Адзіныя, хто зразумее мяне ў гэтым горадзе, — гэта менавіта яны. Адзіныя, на каго можна спадзявацца. Адзіныя, хто мне сапраўды дапаможа. У мяне засталася гэтая чортава сотня, не везці ж мне яе дадому? — спрабаваў лагічна разважаць ён. Сувеніры? У нас іхнія сувеніры

каштуюць танней. Хостэл? Для слабакоў. Я проста павінен тут знайсці сабе жанчыну. Я павінен усё выправіць, павінен усё аднавіць, павінен пусціць свежую ваду па старых рэчышчах. Я проста павінен вылавіць якую-небудзь сурынамку. Альбо эфіопку. Эфіопка ўдыхне мне ў горла радасць і спакой. Менавіта так і будзе. Ці, — разважаў ён далей, лежачы на той жа лаўцы і падклаўшы пад галаву валізу, — японка. Японкі ўмеюць языком уваскрашаць памерлых. Яны падымуць мяне, як Лазара, адчысцяць мяне ад гліны і цёмнага багавіння, ссунуць з месца мае ўнутраныя органы, застылыя цяпер, быццам замерзлыя паравозы. Альбо, — ужо зусім у сне працягваў ён, — бразільянка. Каралева карнавалу. Са ступнямі гарачымі, як перагарэлае вуголле. З далонямі вільготнымі, як прыбярэжнае каменне зранку. Гнуткая і трывалая, яна давядзе мяне да брамы аэрапорта, пасадзіць на неабходны рэйс і стане потым пісаць жартаўлівыя кароткія лісты ні пра што. Ноччу пайшоў дождж. Прачнуўся Боб з тэмператураю і закладзеным носам. Да самалёта заставаліся суткі.

Але нават закладзеным носам ён усё роўна адчуваў пахі і дымы гэтага горада, яго жнівеньскую скуру — выпаленую сонцам, адбеленую акіянам. Глядзеў на вулічных птушак — на дзіва спакойных для такіх гармідарных умоў, глядзеў на ёгаў ды манахаў, назіраў за драконамі на дахах і гіенамі ля смеццевых бакаў, прыкрываўся рукою ад крывавага ранішняга праменя, хутаўся ў абвіслы ад дажджу пінжак, аднак не станавілася яму ні ўтульней, ні цяплей. І ўжо калі паўстала думка ехаць у аэрапорт і чакаць там суткі да загрузкі, паклікаў яго гурт жыццярадасных выпівак, якія заўважылі яго яшчэ раней, аднак з уласцівай сапраўдным выпіва-

кам далікатнасцю не адважваліся адарваць ад самакапання і сумных світанкавых рэфлексій. І вось, калі пабачылі, што справы зусім кепскія і што выгрызаюць чалавека гэтага знутры дэманы ранішняй няўцехі, тады гукнулі яны яго, і паклікалі, запрашаючы да агульнага банкету, і пачаставалі дзіўным напоем. Як называецца напой, не ведалі і самі абарыгены, сказалі толькі, што атрутай гэтай гандлююць палякі ў сваёй краме, назву ж яе не могуць вымавіць нават яны — польскія прадаўцы. У польскай мове столькі шыпячых, — у захапленні крычалі яны Бобу, усё падліваючы і падліваючы, — што мы нават баімся сабе ўявіць іхнюю службу Божую! Бог, мабыць, прачынаецца кожны раз ад псалмоў з такой колькасцю шыпячых! — казалі яны Бобу, і той ім нават нешта на гэта адказваў, аднак яго ніхто не слухаў, усе толькі гаварылі і гаварылі, і гіены перабягалі ў цянёк, а жоўтыя змеі звівалі сабе гнёзды ў металічных сметніках. Сонца палала над званіцамі і рэкламнымі шчытамі, адбівалася ў высокіх вокнах, дзе стаяла цёплае паветра, дзе пакоі напаўняліся жыццём і на пажарных лесвіцах гулялі жнівеньскія скразнякі. Жанчыны, ідучы па вуліцы, усміхаліся яму, ветліва махалі яму хусткамі і капялюшыкамі, выкрыквалі нешта радаснае і пяшчотнае, нешта настолькі шчыльна злепленае з шыпячых і ётаваных, што Боб не наважваўся дакрануцца да гэтых залатых сотаў іхняй мовы, напоўненых радасцю і асалодаю. Менавіта з патрэбай радасці і асалоды ён і прачнуўся, менавіта іх ён патрабаваў як мага больш, менавіта па іх ён, падняўшыся і знайшоўшы побач некранутую нікім старую татаву валізу, пайшоў скрозь позні вечаровы прыцемак наперад — у пошуках грамадскага транспарту, у пошуках братэрскай любові.

Знайшоў ён іх у Бронксе, куды дабраўся, перасекшы раку. Стаялі яны пад будынкамі банкаў і закрытых крамаў з адзеннем. Можна было нават падумаць, што менавіта ў гэтых крамах яны і апранаюцца. Боб заціх, насцярожана павёў носам, як бывалы вулічны пёс, падумаў развярнуцца і рушыць назад, аднак разумеў: калі не цяпер, то ўжо ніколі, буду потым дакараць сябе за слабадушнасць, буду шукаць апраўданні сваім страхам і комплексам. Давай, Калумб, варушы ластамі, — падштурхнуў ён сябе насустрач усім пуэртарыканкам і сурынамкам Бронкса. Перахапіла яго, зрэшты, нейкая невысокая ростам, фарбаваная ў чорнае, вастраносая і худая рыба-траска з непраўдападобна вялікім і, адпаведна, прывабным бюстам і такім аксамітным голасам, што сэрца яго зноў адгукнулася з нябыту. — Хочаш адпачыць? — запытала траска даверліва. — А што ты робіш? — спытаў яе ў адказ Боб, з заміраннем сэрца прыслухоўваючыся да западання яе голасу. — За паўсотні зраблю табе добра, — паабяцала яна, робячы рукою такія рухі, быццам чысціла зубы. — За дзвесце — усё астатняе. Не бойся, усё па-сапраўднаму, усё легальна, тут побач. Цябе як зваць? Боб адказаў, яна не запомніла. У сваю чаргу паведаміла, што яе завуць Мэл. — Мэм? — перапытаў ён. — Забудзься, — сказала яна, — не істотна. Сышліся на паўсотні. Мэл-Мэм упэўнена ўзяла яго пад руку. Павяла вуліцаю. Сяброўкі яе адводзілі ад іх вочы. — Далёка яшчэ? — спытаў Боб. — Тры сотні метраў, — супакоіла яна. — Але мне цяжка ісці. Боб нарэшце звярнуў увагу на яе высокія абцасы. Ісці ёй, мабыць, сапраўды было нялёгка. А ісці было патрэбна. — Я выклічу таксі, — запрапанавала яна. Боб напружыўся, аднак не пярэчыў.

Яна махнула рукою. Таксі нібы гэтага і чакала. Селі, праехалі два дамы, спыніліся. Заплаці яму, — ціха папрасіла яна. Боб ткнуў таксісту дзясятку. Той весела падзякаваў. Таксіст яго чамусьці супакоіў. Мог жа завезці за горад, — падумаў Боб, — і там расчляніць. Я б прынамсі так і зрабіў. За кітайскім рэстаранам нырнулі ў браму, прайшлі праз падворак, абмінулі бліскучыя металічныя бакі са смеццем. Падняліся па сходах, адчынілі цёмныя непрыметныя дзверы. Ля ўвахода на крэслах сядзелі двое ахоўнікаў. Слізганулі нядобрымі няўважлівымі позіркамі, вярнуліся да сваёй размовы. Яна выхапіла ў аднаго з іх ключ, пацягнула Боба па крутых сходах угору. На сценах віселі чырвоныя ліхтары, падлога была заслана белым кудлатым кілімам. Нагадвала фоталабараторыю. Асабліва пахамі. Прайшлі ў канец калідора, яна адчыніла дзверы, зайшла першай, ён зазірнуў следам. У пакоі было сыра і напаўцёмна. Злева стаяў невялікі пусты столік, справа цямнеў велізарны ложак з нейкімі дзіўнымі драўлянымі выгінамі, шаўковымі покрыўкамі ды іншай хрэнню. Падобны ложак стаяў у спальні дзядзькі Алекса, — раптам успомніў Боб, і стала яму ад гэтага ўспаміну яшчэ больш сумна. Збоку прачыненыя дзверы вялі ў невялікі душавы пакой. Там гарэла святло, віселі чыстыя ручнікі. Яна адразу ж узялася ўпарадкоўвацца, як гасцінная гаспадыня. — Значыць, так, — сказала, — ты хочаш у душ? — Трэція суткі, — адказаў Боб. — Добра, — пагадзілася яна, — дай мне трошкі грошай, я куплю алкаголю. Тут трэба купляць алкаголь, — патлумачыла. — Які алкаголь ты будзеш? — Ёсць што-небудзь польскае? — пацікавіўся Боб. — Даведаюся, — паабяцала яна, узяўшы грошы. — А што

ў цябе з носам? — зрэагавала на застуджанае Бобава шморганне. — Наркотыкі? — Бокс, — патлумачыў Боб, — пашкоджана перапонка. Яна моўчкі развярнулася і выйшла.

Вядома, яна не вернецца, — думаў ён, лежачы на ложку і разглядаючы цені на столі, — ясна, што яна даўно пакінула гэты дом і растала ў невядомым кірунку. Напэўна, я ніколі больш яе не ўбачу. Вядома, пры сустрэчы я яе проста не ўспомню. Мэм, мэм, дзе ты цяпер? Навошта ты зацягнула мяне на гэтыя пякучыя прасціны? Навошта ты кінула мяне пасярод гэтай задушлівай ночы — без любові, без саўдзелу, нават без алкаголю?

Дзверы ціха адчыніліся, і яна праслізнула ўнутр. — Як ты тут? — спытала. — Што душ? — Працуе, — коратка адказаў Боб. Яна не зразумела і працягнула яму яго шклянку, поўную залатой атруты. Калі не памру — здабуду неўміручасць, — падумаў Боб і выпіў. А далей яна ўзялася за справу. Узялася заўзята, аднак у гэтай заўзятасці было штосьці механічнае, штосьці дэкаратыўна-аздобнае, несуцяшальнае і цалкам бесперспектыўнае. Па-першае, яна прымусіла Боба легчы і не рухацца, увогуле складалася ўражанне, што яна баялася яго актыўнасці, баялася яго здольнасці самастойна перасоўвацца, насцярожана сачыла за яго грымасамі, прыслухоўвалася да клёкату ў яго горле, асцярожна прамацвала — нібы між іншым, нібы дзеля яго ж задавальнення — кішэні яго вар'яцкіх шортаў: ці няма там выпадкова якіх-небудзь псіхатропных сродкаў альбо, на крайняк, такой-сякой халоднай зброі. Па-другое, яна адразу ж узялася стагнаць. І гэта — не перарываючы працэсу! Стагнала заведзена і зацята. Боб у нейкі момант адчуў сябе немаўлём, якога закалыхваюць.

Нават падняў галаву, каб паглядзець, ці ўсё з ёй у парадку. З ёй усё было ў парадку, у адрозненне ад яго: яна старанна працавала над ім, дапамагаючы сабе ў дзве рукі, быццам здабывала агонь з адсырэлага дрэва. Урэшце таксама падняла галаву, перахапіла яго погляд. Цяжка спынілася, закінула назад пасму валасоў, што спала на твар. — Што, — запытала, — зашмат алкаголю? — Так, — адказаў расчаравана Боб, — і яго таксама. — Ну, паслухай, — яна паставілася да справы адказна, чымсьці гэты каўбой з ірландскімі аленямі на капелюшы яе такі зачапіў, не хацелася адпускаць яго ні з чым, — давай так: дакінь яшчэ паўсотні, дазволю ўзяцца за грудзі. — Што дазволіш? — не зразумеў Боб. Але яна ўжо вызваліла свой дзівосны касмічна-сінтэтычны бюст. І ўжо гайдала ім у сіне-ружовых прыцемках гэтай фоталабараторыі, і што яму заставалася рабіць. Дабяруся да самалёта зайцам, — падумаў Боб. Мэм, — сказаў ціха, але ўпэўнена, — вось усё, што засталося. Тут няма паўсотні, але ж і я нічога ўжо не хачу, пагадзіся. І яна пагадзілася. Узяла яго апошнія мятыя купюры і зноў стала да працы, нібы ў апошні раз, з цвёрдым намерам не адступаць да пераможнага канца. А калі і гэта не дапамагло, зноў адарвалася на імгненне і сухім (але такім аксамітным, такім глыбокім!) голасам працаўніка натарыяльнай канторы паведаміла, што — калі ён у бліжэйшы час не скончыць — давядзецца плаціць яшчэ, а паколькі плаціць яму няма чым (і яна выдатна гэта разумее!), то яна нават не ведае, чым усё гэта скончыцца. Ну, самі ведаеце, як гэта звычайна бывае. І тут можна было б сказаць, што ён пачаў прыгадваць нейкія патаемныя, нейкія прыхаваныя і недагавораныя відзежы і перажыванні, якія адбыліся

з ім у гэтым жыцці, што ён разгледзеў у празрыстай нерухомай цемры, скажам, найпрыгажэйшыя жаночыя твары, што дастаў з закуткаў мінулага свае найбольшыя мары ды спадзяванні, але не, нічога падобнага: механіка жаночай пяшчоты, працягласць інтымнай працы робяць звычайна сваю салодкую справу, таму не прайшло і некалькіх хвілін, як усё шчасліва для ўсіх прысутных завяршылася, без аніякіх фінансавых ускладненняў, без аніякіх нясплачаных даўгоў і нявыкананых абавязкаў. Яна выціралася папяровымі ручнікамі, ён пазіраў на яе цёмную постаць і згадваў, як пальцы яго натрапілі на тонкі, ледзь адчувальны шнар пад яе грудзьмі, відавочна, пасля таго, як яна запампавала сабе пад скуру ўвесь гэты пластылін, ад чаго грудзі яе сталі пяшчотнымі і пругкімі, вось толькі шнары нікуды не зніклі. І не знікнуць ужо ніколі.

Потым яна нейкі час сядзела з ім у напаўасветленым пакоі, усяляк робячы выгляд, што ніхто нікуды не спяшаецца, што да кліента тут ставяцца з павагаю, што яе цікавіць не толькі тое, як ён гэта робіць (тым больш каго гэта магло зацікавіць?), але і чым ён жыве, таму яна спрабавала з ім пагаварыць і расказала пра сябе, сказала, што сама яна стаадсоткавая амерыканка (вялікая радасць, падумаў ён), з прыстойнай сям'і (яно і відаць, прыйшло яму ў галаву), скончыла нармальны каледж (гадоў трыццаць таму), была ў шлюбе (з підарам нейкім, відавочна), але так сталася, што лёс закінуў яе сюды (не самы горшы для цябе варыянт), і вось зараз яна павінна займацца гэтай не надта шляхетнай справай (так займайся ж, хулі), але яна верыць, што ўсё стане на сваё месца (ну, гэта наўрад ці) і яна атрымае-такі вышэйшую адукацыю (хіба што

ва Украіне, мэм). — А вашы жанчыны, — спытала яна ў Боба, — яны якія? — Нашы жанчыны, — адказаў ёй на гэта Боб, — маюць адну дзіўную ўласцівасць: яны цяжараюць па-за сэксам. — Як гэта? — не зразумела яна. — Так, — пацвердзіў Боб, — яны расплоджваюцца, як кветкі: ветрам і сонечным праменнем. Яны выкарыстоўваюць для гэтага пчол і матылькоў, яны падстаўляюцца ўвесну сонцу і месяцоваму ззянню і нясуць сваю цяжарнасць лёгка і радасна, быццам новае веданне, атрыманае ў вышэйшай школе. — Ну, а сэкс? — не зразумела яна. — А сэкс, — патлумачыў Боб, — яны ўспрымаюць як вышэйшую праяву сваёй любові, як найтанчэйшую мяжу сваёй прывязанасці, за якую так страшна заступіць, але ад якой так цяжка адмовіцца. Яны і вырастаюць дзеля таго, каб любіць, выхоўваюцца дзеля таго, рыхтуюцца да вялікай пары кахання і адданасці, да шчымлівай залежнасці ад чаканняў і расставанняў. Мужчыны ведаюць пра гэта і таксама рыхтуюцца да таго, што ім прыйдзецца ў іхнім жыцці мець справу з жанчынамі, пяшчота якіх з'яўляецца невычэрпнай, а запал — некіруемым. Там, дзе я жыву, — сказаў ён, — столькі любові, што мужчынам няма сэнсу кідаць сваіх жанчын: усё адно рана ці позна яны закахаюцца ў іх зноў. Каму патрэбныя лішнія рухі?

— Паслухай, — перапытала яна, — а ты дакладна не на наркотыках?

У браме, пры выхадзе на асветленую вуліцу, яго ўжо чакалі. Гэта быў вялікі сурынамец ці, магчыма, нават эфіоп — было цёмна і пагрозліва, Боб выйшаў, і той проста заступіў яму шлях. Ну што, малец, — сказаў, толькі Боб паспрабаваў яго абысці, — ты ж ведаеш, што

я па тваю душу, не абыдзеш, не абмінеш. Боб спыніўся. У цемры чорнага амаль не было відаць, так, нібы пустата злівалася з пустатою і з пустаты прамаўляла пустата. Давай, — сказаў ён Бобу, — вываpочвай, што ў цябе ў кішэнях. Ведаю, што ты баксёр, але і я не такі просты, як табе здаецца. Бобу ён простым якраз і не здаваўся. Боб яго наогул не бачыў, толькі чуў. Але ўжо з упэўненасці гэтага голасу разумеў, што адступаць проста няма куды. І спадзявацца тут, у гэтай частцы свету, сярод гэтай цемры і пустэчы, таксама няма на каго. Разумеў, што падманлівы лёс закінуў яго так далёка, што далей ужо нічога няма — свет абрываецца і заканчваецца, і пачынаецца толькі яго адсутнасць. І што адсюль можна толькі вяртацца назад. Але для гэтага трэба неяк паразумецца з сурынамцам. У сэнсе эфіопам. — У мяне нічога няма, — сказаў ён зморана, — ты ж сам ведаеш. — Нічога я не ведаю, — запярэчыў яму чорны, — давай, вываpочвай кішэні. Інакш тут і застанешся. І тады Боб сказаў яму: добра, — сказаў, — чорт з табою, у мяне для цябе такі нешта ёсць. І дастаў аднекуль з патаемнай унутранай кішэні шортаў крыху зацяганы, аднак яшчэ даволі пахучы скрутак, нешта, па-за сумневам, каштоўнае, нешта далікатна і ўмела загорнутае ў жоўтую газету, надрукаваную на іншасветнай мове, то-бок такой, якой тут ніхто не разумеў, якою тут ні з кім немагчыма было паразумецца і нікому нельга было засведчыць.

«Смерць, — пісаў Боб непасрэдна перад адлётам, седзячы ў тэрмінале і чакаючы пасадкі, — часта ўводзіць нас у зман сваёй прысутнасцю. Часам мы ўспрымаем яе з'яўленне на свой рахунак, хоць з'яўленне яе не аба-

вязкова датычыцца менавіта нас. Смерць прысутнічае ў нашым жыцці як любоў, як давер або настальгія. Яна з'яўляецца ніадкуль, яна рухаецца сваімі напрамкамі, і годзе нават марыць неяк на гэтыя напрамкі ўплываць. Застаецца хіба што верыць і спадзявацца. Застаецца любіць і прымаць жыццё такім, якое яно ёсць. То-бок нясцерпна неверагодным. То-бок неверагодна нясцерпным».

ЛУКА

У канцы жніўня яна зноў патэлефанавала.

— Чуў, што з Лукой? — спытала. — Рак горла. А ён зусім не хоча лячыцца.

— Чуў-чуў, — адказаў я. — Ты для гэтага тэлефануеш?

— Так. У яго дзень нараджэння паслязаўтра. Ён прасіў, каб усе былі. Думаю, хоча развітацца. Ты паедзеш?

— Калі прасіў — ясна, што паеду. А ты?

— Я таму і званю. Паехалі разам.

— Паехалі, — адразу пагадзіўся я. — Ты на машыне будзеш?

— Ды не, я электрычкаю збіралася. Таму і прашу цябе паехаць разам.

— Правільна, — падтрымаў я яе, — хто на дзень нараджэння ездзіць машынаю. Ніякага табе алкаголю.

— Які алкаголь, Мацвей? — пакрыўдзілася яна. — Я на чацвёртым месяцы.

Яна чакала мяне каля кас. Доўгія валасы, завязаныя ў моцны вузел — для надзейнасці, для бяспекі, для зручнасці. Красоўкі, джынсавы камбінезон, цёплы швэдар. Зусім непрыкметная цяжарнасць, сур'ёзны твар. Стаяла сонца, аднак яна была апранутая, нібы для доўгага начнога паходу. Я ў сваёй заношанай футболцы адчуваў сябе побач з ёй як пляжнік на атэльнай рэцэпцыі. Яна першай працягнула руку, потым не ўтрымалася, ахапіла мяне рукамі за шыю — досыць стрымана, каб я сабе чагось не надумаў, але і даволі шчыра, каб не забываў, куды мы ідзём.

— Падарунак які патрэбны? — спытаў я, не адпускаючы яе.

— Які падарунак? — адказала яна здзіўлена.

— Ну, кветкі, напрыклад.

— Ты яшчэ вянок купі, — незадаволена сказала яна. — Возьмем віна, — дадала прымірэнча, адштурхоўваючыся ад мяне, як ад борціка ў басейне, — там на станцыі будзе крама.

У паўпустым вагоне яна сама выбрала месца — з сонечнага боку, у напрамку руху цягніка. Сядзела, пазірала, як вагоны выкочваюцца за межы станцыі, як застаюцца ззаду апошнія, здавалася, бясконцыя цыстэрны з хімікатамі, як цэглу заступае зеляніна, як з-за фабрычных агароджаў раптам вырываецца гарызонт — зялёны і лясісты, як пачынаюцца прадмесці, як усплываюць чарговыя прыпынкі, на якіх таўкуцца пад паабедзенным сонцам выпадковыя пасажыры — рыбакі, гандляркі і дачнікі. Цягнік рушыў далей, поўз паміж соснаў, павольна, нібы баяўся прыцягнуць чыюсьці ўвагу, заміраў на перагонах, стаяў на пясчаных насыпах. Яна маўчала. Я таксама не надта памя-

таў, на чым мы спыніліся ў апошні раз і з чаго варта працягваць размову. Праехалі возера, усунуліся паміж дачных кааператываў. За акном пачыналіся лясы, над імі стаялі шчодрыя хмары. Раптам стала многа неба. Жнівень, — падумаў я, — калі ён паспеў мінуць?

Цягнік спыніўся, мы сышлі на платформу. Было ціха, шырокія ўскосныя прамяні залацілі паветра, замінаючы бачыць рэчы такімі, якімі яны былі. Трэцяя пасля абеду. Ніводнай жывой душы. Найлепшы час для ўрачыстых наведванняў памерлых. Узялі ў прывакзальнай торбу віна, рушылі ўздоўж каляін, пясчанай сцежкаю. Яна ішла папарадзе, хоць дарогі не ведала. Хада яе змянілася: глядзела яна пераважна пад ногі, нібы баялася збіцца са шляху. Гэта цягнулася даволі доўга. Некалькі разоў яна спынялася, каб перадыхнуць. Яшчэ раз ёй у красовак трапіў камень, яна абаперлася на маё плячо, скакала на адной назе, смяялася, вытрасаючы яго. Дабраліся да пасёлка, я спытаўся дарогу, пайшлі шукаць патрэбны адрас. Вуліца выходзіла непасрэдна на рачны бераг, трошкі ніжэй ад таго месца, дзе дзве ракі зліваліся ў адну і плынь станавілася падобнай да мармуру: светлыя пражылкі перапляталіся з цёмнымі, цьмяны струмень — з празрыстым. Тут яна канчаткова згубілася, дастала тэлефон, перазваніла камусьці, перапытала, ну вось, — сказала, паказваючы на дом, насупраць якога мы і стаялі, — гэта ён і е. Дом стаяў за старымі дрэвамі, з вуліцы яго і не заўважыш. Быў плот, было шмат кветак, стаяла цішыня. Адчынілі весніцы, прайшлі падворкам. Падобна на тое, што стары карыстаўся газонакасілкай. Двор нагадваў футбольнае поле, на якім, праўда, было забаронена гуляць. Сам дом быў невялікі, быццам са-

браны з розных дэталяў: цалкам прыстойныя аконныя рамы і прыцягнутыя аднекуль дзверы, чырвоная цэгла ў кладцы сцяны з украпінамі белай, драўляныя бэлькі, жалезныя клямары — так, быццам нехта разваліў некалькі будынкаў і сабраў з іх адзін. Магчыма, не самы лепшы. Яна падышла да дзвярэй, пацягнула іх на сябе. Дзверы не адчыняліся. Яна пагрукала. Я зазірнуў у акно. Усярэдзіне ля сцяны стаяў ложак, каля акна — пусты стол, засланы абгортачнай паперай. З дрэва ўпаў яблык — цяжка і мерна. Мы азірнуліся. Ён стаяў і моўчкі глядзеў на нас. На твары дадалося зморшчын, бараду, падобна, падстрыгаў сам. Цёмна-зялёная кашуля з закасанымі да локця рукавамі, баявыя, выцертыя на каленях джынсы, растрэсканыя ад нястомнай хады красоўкі. Змучаныя вочы, пакусаныя вусны. Чорныя рукі, доўгія пальцы, пажоўклыя пазногці. Скура колеру сухой гліны. Шэсцьдзясят гадоў за спінаю. Смерць і знікненне напарадзе. Чацвёртая дня. Сонца для нас на сёння амаль не заставалася.

Дваццаць гадоў таму ён не насіў гэтай барады. І зморшчын у яго было куды менш. Хоць рукі былі такія ж — цёмныя ад працы, з фарбаю пад пазногцямі, з парэзанымі далонямі, з набрынялымі ад напружання венамі. Як быццам ён маляваў пальцамі. Ды і ва ўсім іншым ён мала змяніўся — заўсёды джынсы, нават на адкрыццях і афіцыйных сустрэчах, заўсёды красоўкі, заўсёды стаяў у цябе за спінаю, нібы кажучы: можаш спатыкнуцца, я падстрахую. Дваццаць гадоў таму ён быў маладым і агрэсіўным, нікога не баяўся, нікога ні пра што не прасіў. Ён і цяпер, здаецца, нікога не баяўся. Але і яго цяпер таксама ніхто не баяўся.

А тады, дваццаць гадоў таму, ён прымушаў з сабою лічыцца, нельга было проста так яго абысці. З васьмідзясятых ён выкладаў у дзіцячай студыі, у падвале, у цэнтры. Вучыў дзяцей маляваць. У дзевяностых пачаліся фінансавыя праблемы, аднак дзеці гэтак жа хацелі маляваць, таму ён і далей іх навучаў. У канцы дзевяностых студыю такі прыкрылі. З таго часу, ужо больш за дзесяць гадоў, ён быў беспрацоўным і пачуваўся, здаецца, выдатна. З ім былі знаёмыя ўсе. У яго была купа сяброў. З ім таварышавалі нават міліцыянты. У яго было шмат каханак. Я асабіста ведаў некалькі з іх. Яны прыносілі яму ў майстэрню ежу і свежае адзенне, яны чысцілі яго красоўкі, яны плакаліся адна адной, калі ён, не папярэдзіўшы нікога, знікаў з горада. У яго быў сын ад першага шлюбу, займаўся бізнесам, нармальна выглядаў, тату любіў. Выстаў ён не праводзіў, але дома ва ўсіх былі яго працы. У апошнія гады будаваў сабе гэты дом. Выкупіў у кагось сад і паміж дрэў пачаў мураваць гняздо. Сын дапамагаў, прапаноўваў пабудаваць нармальны дом, гатовы быў за ўсё заплаціць, але ён адмаўляўся, казаў, што зробіць усё сам. Хтосьці яму ўсё-ткі дапамагаў, часам сын прыязджаў на выхадныя і цягаў цэглу, адключыўшы мабільны, каб не турбавалі. Ён не спяшаўся, здаецца, яму падабалася менавіта будаўніцтва, сам працэс. У мінулым годзе сын такі прывёз брыгаду працоўных, і тыя за месяц усё скончылі. Увесну ён пераехаў сюды жыць. Дакладней, паміраць.

— Лука! — крыкнула яна і кінулася да яго.

Ён засмяяўся ў адказ, яна павісла ў яго на шыі, я падышоў следам. Ён апусціў яе на зямлю, абняў мяне.

— Вы першыя, — сказаў, працягваючы смяяцца. — Спадзяюся, не апошнія.

Мы сапраўды былі не апошнімі. Па вуліцы падкаціў на сваім джыпе сын. З цэлым багажнікам харчоў. Прывёз Луку маленькі, нейкі дзіцячы магнітафон, дасыпаў да яго кучу батарэек, каб стары слухаў улюбёную музыку там, куды яго закінуць акалічнасці. Скажам, у бальніцы. Прывёз з сабою таксама даўніх прыяцеляў Лукі — падслепаватага Зураба, з якім Лука нейкі час жыў у адной камуналцы на Рэвалюцыі, і высокага худога дзядзь Сашу, што рабіў Луку ў свой час, у далёкіх васьмідзясятых, заказы на афармленчыя работы ва ўстановах грамадскага харчавання. Зураб, здаецца, не зусім разумеў, куды яго прывезлі, але з Лукою вітаўся ветліва, доўга і моцна ціснуў яму руку, ляпаў па плячы, нават выпусціў са свайго паўсляпога вока суровую слязу. Затое дзядзь Саша, высахлы, па-армейску выстрыжаны, са сваёй нязменнай пасівелай палоскаю вусоў, у сваім традыцыйным чорным пінжаку камінара, усё выдатна разумеў, прыхоўваў як мог свае расчуленне і спачуванне, абдымаў Луку, абдымаў Зураба, голасна гаварыў, не змаўкаў ні на хвіліну, нават сын Лукі не вытрымаў, добра, сказаў, вы пагутарыце, я буду на стол накрываць. І пачаў цягаць пакункі з ежаю пад яблыні, дзе ўжо стаяў, засланы той жа шэрай абгортачнай паперай, вялікі пусты стол.

— Я дапамагу, — сказала яна і ўзялася за працу.

— Хай гатуюць, — сказаў Лука, — не трэба ім перашкаджаць. Пакажу вам яблыні.

Зураб з дзядзь Сашам пайшлі наперад, я рушыў за імі, Лука ледзь адчувальна прытрымаў мяне за локаць.

— Што ў вас? — спытаў ціха, кіўнуўшы галавою ў бок стала, дзе яна якраз расстаўляла посуд.

— Не ведаю пакуль што, — адказаў я.

— Яна цяжарная?

— А ты адкуль ведаеш? — здзівіўся я.

— Заўважна, — растлумачыў Лука. — Цяжарныя жанчыны спакойныя і засяроджаныя на сабе. Яна такой ніколі не была. І што ты думаеш?

— Нічога не думаю, — прызнаўся я.

— Гэта што — не тваё дзіця?

— Хутчэй за ўсё.

— А чыё?

— Не ведаю.

— А яна ведае?

— Не ўпэўнены, — выказаў меркаванне я.

— Не кідай яе, — параіў Лука. — Кінеш — будзеш потым шкадаваць. Паспрабуй яе ўтрымаць. Яно таго вартае. Ну, пайшлі.

Сярод травы ляжалі цёплыя яблыкі. Некаторыя з іх Лука падбіраў, трымаў у руках, клаў назад у траву.

Паступова ўсе збіраліся. Прыехала Марына, агульная знаёмая, стомленая пасля працы, з вялікім букетам кветак. Прыпхаўся Жора. Я яго не бачыў з вясны, апошні раз, калі сустракаліся, ён скардзіўся, што праходзіць практыку ў кругласутачнай аптэцы ля метро, але не ўпэўнены, ці возьмуць яго туды на пастаянную працу, але вось узялі, усё склалася добра, Жора выглядаў упэўнена, цешыўся, раздаваў усім медыцынскія парады, што, улічваючы сітуацыю, выглядала некалькі недарэчна, але хто звяртаў увагу на сітуацыю, усе звярталі ўвагу на свежы жнівеньскі вечар, на раку, што працякала ў некалькіх дзясятках метраў, на саспе-

лыя яблыкі і вечаровае неба. Разам з Жорыкам з'явіўся ягоны стрыечны брат Боб у афіцыйным касцюме, з акуратнай фрызураю, падобны да маладога пратэстанта. Боб толькі што вярнуўся з падарожжа па Амерыцы, але паводзіў сябе так, быццам вярнуўся як мінімум з пекла. Дзяліўся ўражаннямі, што яго, відавочна, перапаўнялі. Падарыў Луку бутэльку каліфарнійскага сухога. Пасля Боба прыйшоў і яго найлепшы сябрук Саша Цой — малады паэт-бунтар, сын карэйскіх выгнаннікаў, актыўны ўдзельнік паэтычнай студыі пры габрэйскім цэнтры. Уручыў Луку рукапіс. Лука абяцаў прачытаць, калі з'явіцца час. Прыйшоў, накульгваючы, Паша Чынгачгук з жонкаю Маргарытай. У Маргарыты быў поўны кошык рыбы, яна адразу ж пабегла да дома, на кухню, гатаваць. Паша застаўся накульгваць паміж дрэў. Агульнае ажыўленне выклікала з'яўленне Алкі-Акулы — усеагульнай улюбёнкі, музы ўсіх бедных ды вартых жалю. Яна прынесла шакаладны торт, доўга абдымалася з Лукою. Той глядзеў на яе з пяшчотаю і смуткам. Я ўспомніў, як калісьці даўно, сто гадоў таму, падчас нейкай папойкі, Лука распавядаў мне даверліва, што менавіта ён быў першым мужчынам Акулы, менавіта ён навучыў яе ўсяму таму, чым яна потым шчодра дзялілася з сябрамі ды знаёмымі. — Верыш, — казаў, — яна прыйшла да мяне ў мамінай сукенцы. У яе не было нармальнага даруслага адзення. — А адкуль ты ведаеш, што сукенка было маміна? — спытаў я яго. — Дык я і з мамаю таксама спаў, — патлумачыў мне тады Лука. З Алкаю прыйшоў Юра, мой даўні знаёмы, былы гітарыст з адарваным пальцам на левай руцэ, са злосным адкрытым позіркам. Піць адмовіўся. Сказаў, што лечыцца. Не сказаў, ад чаго менавіта. Хоць

усе і так ведалі: сухоты. Прыйшла Кіра, сяброўка Лукі. Была сумная і самотная, на ланцужку мела срэбраны пярсцёнак. Таксама прынесла Луку кветкі. Той спытаў, чаму яна адна. Кіра патлумачыла, што разышлася з сяброўкай, але ўсё ў парадку і не трэба пра гэта. Апошнім прыехаў Іван, які доўгі час здаваў Луку пад майстэрню адну з лабараторый на заводзе, дзе ён, Іван, афіцыйна лічыўся ледзь не намеснікам дырэктара. Суха павітаўся з усімі, доўга ціснуў руку Лукі. Пачаў яшчэ больш гарбаціцца, здаецца, яшчэ больш схуднеў. З ім прыехала яшчэ некалькі гасцей. Аднаго з іх я бачыў калісь падчас вулічных пікетаў, праўда, не мог успомніць, за каго ён тады стаяў. З ім яшчэ нейкая знаёмая Лукі, з папярэдняга жыцця, з даўняй памяці. Апошняй з вуліцы зайшла маладая яшчэ дзяўчына. З доўгімі, афарбаванымі ў чорны валасамі, у светлай сукенцы, лёгкіх басаножках. Прывіталася толькі з Лукою. Больш тут, здаецца, нікога не ведала. Яе таксама ніхто не ведаў. Усе спачатку звярнулі на яе ўвагу, пачалі перашэптвацца, шматзначна пераглядацца. Лука заўважыў гэта, відаць, яму стала непрыемна, таму ён гучна запрасіў усіх да стала. Дзяўчына зрабіла крок убок, пад яблыневае галлё, і ўраз пра яе ўсе забыліся. Потым села з усімі да стала. Сядзела, маўчала, піла віно.

За сталом адразу загаманілі і заспрачаліся. Асабліва гучна крычаў Боб. Яму было што расказаць суайчыннікам, ён на ўласнай скуры адчуў іншасветны подых агню, і цяпер, усіх перабіваючы і даверліва цягнучыся да ўсіх, захлынаўся, пераказваючы дзівосныя падрабязнасці свайго нядаўняга паходу за акіян, у халоднае сэрца Амерыкі. Усе паступова сціхлі, бо разумелі: лепш яго выслухаць і падтрымаць, чым

перабіваць і перакрыкваць. Лука сядзеў і пасміхаўся, пераводзячы погляд ад Боба да незнаёмкі, што сядзела па другі бок стала.

Амерыка, сцвярджаў Боб, абмываецца дзвюма гарачымі акіянскімі плынямі. Гэта вызначае яе клімат і складанасць характару яе жыхароў. Гэта ўплывае на флору, але таксама і на фаўну. Дзікія жывёлы Амерыкі цалкам мірныя і пераважна прыручаныя. Лісы забягаюць у прадмесці ды спяць на аўтобусных прыпынках. Ноччу выюць на месяц, перашкаджаюць спаць. Птушкі звіваюць сабе гнёзды на балконах і ў дзіцячых каляскаў. Чарапахі дабіраюцца да сістэмы каналізацыі, там і дажываюць свой доўгі век. Гарачыя акіянскія плыні прабіваюцца скрозь глебу ў глыбіню мацерыка. Скажам, той жа Нью-Ёрк стаіць на распаленых водах і вільготнай гліне. На вуліцах там пахне серай, а сонца хаваецца ў цёплым тумане. Над горадам стаіць заўсёдны змрок, і ў змроку гэтым растуць чорныя водарасці і высокая аранжавая трава. І ёсць толькі адзін горад, што можа паспаборнічаць з Нью-Ёркам у змрочнасці, — гэта, вядома, Сан-Францыска: горад, заснаваны непасрэдна святым Францыскам, што прыехаў сюды ў свой час з афіцыйным візітам і застаўся на гэтых пясчаных берагах, каб умацоўваць тубыльцаў у веры і распальваць сярод ночы агні, на якія рухаліся скрозь акіянскую спякоту расійскія ды кітайскія гандлёвыя караблі.

— Ну добра, — сказалі яму на гэта ўражаныя слухачы, — а з жанчынамі? Як у Амерыцы з жанчынамі?

А Боб нібыта чакаў гэтага пытання. Таму адразу ж і адказаў. З жанчынамі, сказаў, там асаблівая гісторыя. Найбольш там, вядома, сурынамак. Ды эфіопак. Су-

рынамкі па звычцы носяць ваду ад ракі ў вялікіх гліняных гарлачах. Жывуць вялікімі сем'ямі, без мужчын. Мужчын падпускаюць да сябе, хіба каб зацяжарыць. Працуюць пераважна ў сферы абслугоўвання. Сілкуюцца садавіной ды зелянінай. Рана старэюць, але ўсё роўна застаюцца прывабнымі. Іншая рэч — эфіопкі, — працягваў Боб. — Тыя, наадварот, паміж сабою трымаюць дыстанцыю, а гуртуюцца вакол цэркваў, якіх — у адным толькі Нью-Ёрку! — набудавана эфіопскімі хрысціянамі прыкладна больш за сотню. З чужынцамі не кахаюцца, — сумна адзначыў Боб, — я спрабаваў. Жывуць доўга. Сустрэць эфіопку, якой ужо за дзевяноста, — даволі проста і нескладана. Адны кажуць, што гэта ад вады, якую яны п'юць. Іншыя запэўніваюць, што ад малітваў. Але найбольш дзіўна, — перабіваў Боб сам сябе, — паводзяць сябе ўсё ж такі японкі. Кажуць, што яны здольныя лячыць уласнай слінаю. Пагаворваюць, што яны не хварэюць наогул. Мяркуюць, што ў іх няма на гэта часу. Ва ўсіх іх мармуровая скура, над усімі імі стаіць ледзьве бачнае ззянне, а некаторыя з іх, — падсумаваў Боб, — увогуле маюць па дзве галавы.

Усе на імгненне прыціхлі, не ведаючы, як рэагаваць на пачутае. Як тут з дому выйшла Маргарыта, несучы дзве вялікія талеркі з прыгатаванай рыбай, і гэта вярнула ўсіх у добры настрой, і ўсе зноў загаварылі, каментуючы, пярэчачы альбо, наадварот, падтрымліваючы ўсё тое, пра што тут толькі што расказваў Боб. І дзядзь Саша крычаў, што так і ёсць, што паўсюль людзі, што няма, па вялікім рахунку, ніякай розніцы, з кім дзяліць надзею ды віно — з сурынамкай альбо з эфіопкай. Хоць з эфіопкай усё-такі лепей. А Марына ціхім голасам пярэчыла яму і казала, што галоўнае — гэта сям'я,

а ўсё, што робіцца па-за сям'ёй, можа рабіцца і без нашага ўдзелу. Паша Чынгачгук з ёй пагаджаўся, а Кіра адмоўна хітала галавою і распавядала пра здрады, якія мы схільныя чыніць, і забыццё, якое нас часта ахоплівае. І Алка таксама падхапіла пра забыццё, але сказала, што ніякае забыццё нічога не значыць супраць сапраўднай закаханасці.

— Правільна, — адказаў на гэта раптам Лука, што ўвесь гэты час маўчаў, прыслухоўваючыся да іншых.

Усе адразу змоўклі, успомніўшы, што іх тут, уласна, сабрала. Было ўтульна і ўрачыста. Святло з веранды гублялася сярод лісця, выхоплівала цяжкія мужчынскія рукі і ціхія жаночыя твары. Лука сядзеў у канцы стала, цені рабілі рысы яго твару вострымі, а зморшчыны глыбокімі. У барадзе крывава цямнелі кроплі віна. Злева ад яго сядзеў Іван, справа — Зураб. Слухалі, не гледзячы на яго. А Лука дачакаўся агульнай цішыні і працягнуў:

— Гэта вельмі правільна — тое, што ты сказала. Забыццё наогул нічога не значыць. І смерць нічога не значыць.

— Смерці няма! — упэўнена выгукнуў Саша Цой.

— Смерць ёсць, — не пагадзіўся з ім Лука. — І вы нават не ўяўляеце, як блізка яна ад нас. Справа не ў гэтым. Ні наша смерць, ні наша знікненне, ні наш пераход у царства мёртвых не маюць ніякага значэння з улікам іхняй непазбежнасці. Ну сапраўды, смешна не ўспрымаць месячныя цыклы. Смешна не пагаджацца з кірункам руху рэк. Іх варта ўспрымаць як данасць і ўспрымаць спакойна, як усё няўхільнае. Адзінае, што па-сапраўднаму мае вагу, — гэта наша закаханасць, любоў, якую мы ў сабе трымаем, якую мы носім пры сабе, з якой мы жывём. Бо ты ніколі не ведаеш, коль-

кі табе яе адпушчана, колькі яе ў цябе ёсць, колькі яе цябе чакае. Знаходзіць яе — радасць, губляць яе — непрыемнасць і няшчасце. Мы ўсе жывём у гэтым дзіўным горадзе, мы ўсе тут засталіся, мы ўсе рана ці позна да яго вяртаемся. І жывём, носячы ў сабе гэтую любоў, нібы віну, нібы памяць, што змяшчае ў сабе ўвесь наш досвед, усе нашы веды. І гэтая прысутнасць яго ў нашым дыханні, на нашых паднябеннях ёсць хіба не найбольшай інтрыгаю ў нашым жыцці. Кожную раніцу я прачынаюся і згадваю ўсіх тых жанчын, з якімі мне давялося перасякацца і мець справу. Вясёлых і занепакоеных, бесклапотных і бездапаможных, некранутых і цяжарных. Мне здаецца, што самым важным для мяне заўсёды былі менавіта зносіны з імі, магчымасць ці немагчымасць дзяліцца з імі сваёй закаханасцю, усёй сваёй любоўю. Усё іншае так ці інакш узнікала з прычыны гэтай закаханасці, а значыць, не мела, па вялікім рахунку, ніякай вагі, ніякага сэнсу. Таму і казаць пра ўсё іншае не мае ніякага сэнсу. І вось цяпер, — падсумаваў Лука, — пасля ўсяго таго, што я вам сказаў, вы ўсе мусіце ісці купацца!

Усе так і зрабілі. І шумнай гурбою пачалі выбірацца паміж дрэў, дзякуючы гаспадару за такія мудрыя, хоць і крыху патэтычныя словы. І хтосьці нёс з сабою віно, а хтосьці ўключаў ліхтарыкі на мабільных, каб знайсці сцежку і спусціцца да берага. Яна таксама паднялася з-за стала і пачала збіраць пустыя талеркі.

— Хадзем? — паклікаў я яе.

— Ідзі з усімі, — лёгка адмахнулася яна. — Я дапамагу тут і падыду пазней.

Я пачакаў, развярнуўся і пайшоў у цемру. Перайшоў вуліцу, прайшоў пад дрэвамі, выйшаў да ракі. Уздоўж

берага было раскідана адзенне і пустыя бутэлькі, а з глыбіні вечаровага паветра, аднекуль з чорнай волкай прасторы, чуліся смех і віскат, і вясёлы плёскат вады, і ўпэўненыя ўзмахі рук, што выграбалі сярод плыні. Жаночыя целы срэбна адсвечвалі пад месяцовым праменнем, і ад п'яных воклічаў станавілася цёпла і радасна. Я пазнаваў іх, стоячы на беразе, гукаў іх, крычаў ім проста ў чарнату. Яны адказвалі адтуль, то набліжаючыся, то зноў адплываючы да супрацьлеглага берага. Так, быццам рака прыносіла сюды з горада ўсе знаёмыя мне галасы, увесь смех, усе спевы. Ад гэтага ўзнікала пачуццё спакою і ўпэўненасці, бо ўсё было тут, побач, на адлегласці некалькіх крокаў. І ніякім чынам гэта не магло знікнуць, ніколі гэта не магло завяршыцца, колькі б я тут ні стаяў, колькі б часу ні прайшло.

Але паволі яны выбіраліся на бераг, хтосьці хутка падхопліваў адзенне і нацягваў яго на мокрае цела, хтосьці абціраўся прадбачліва прынесенымі ручнікамі, а хтосьці проста прыкладваўся да бутэлек, у якіх яшчэ нешта заставалася, хапаў адзенне — добра, калі сваё, — і брыў назад на падворак, на святло. Вечар быў позні. Я чуў, што нехта развітваецца з гаспадаром, нехта пачынае спяваць, у жаночых галасах з'явілася гаркота, у мужчынскіх — агонь. Машыны ад'язджалі, галасы змаўкалі. Рабілася ціха. Рабілася ўсё больш месяца, усё больш прахалоды.

Я зусім не пачуў, як яна падышла. Проста з'явілася з-за маёй спіны, лёгка дакранулася да пляча, ну што, — спытала, — што ты тут стаіш? Я не адразу знайшоў, што адказаць, а яна скінула з сябе пазычаную ў кагосьці куртку, сцягнула швэдар, сцягнула красоўкі, нейкі час корпалася з камбінезонам, але ўрэшце скінула

яго таксама. Скінула футболку, на імгненне завагалася, але бялізну таксама кінула зверху на цёплую яшчэ адзежу. Нясмела намацваючы дно, ступіла ў ваду. Потым весела войкнула, нырнула, паплыла.

— Гэй, — крыкнула з цемры, — што ж ты не ідзеш?

— Плыві-плыві, — адказаў я ёй. — Я твае рэчы пасцерагу.

— Як хочаш, — адказала яна.

Я падумаў, як гэта добра, што я ў рэшце рэшт тут апынуўся — на гэтым беразе, ля гэтай вады. Стаяць і назіраць, як яна распранаецца і заходзіць у раку, ведаць, што ў любую раку можна насамрэч уваходзіць бясконца. Можна бясконца доўга трымацца вільгаці, што цябе ахоплівае, можна бясконца доўга чакаць вяртання ўсіх, каго ты ведаў і каго любіў. Рака прынясе ўсе чутыя табою інтанацыі, рака захавае ўсё пакінутае на берагах цяпло, рэкі ўмеюць чакаць, умеюць пачынаць усё з пачатку. Таму што існуе пераемнасць рэчышча, пераемнасць плыні, і ніхто не можа спыніць усю гэтую масу вільготнага святла, усю гэтую веліч цяпла і холаду. Мне застаецца толькі дачакацца яе тут, на беразе, і вяртацца разам з ёю назад, у горад, як вяртаюцца да яго штодня тысячы бежанцаў і працаўнікоў, падарожнікаў і прыхадняў, усе гэтыя брыгады нанятых чорнарабочых, якія цягаюцца па свеце, будуюць вежы і турмы, але рана ці позна ўсё роўна прыходзяць сюды — на гэтыя берагі, пад гэтыя праменні месяца.

Я падумаў, што доўга буду трымаць у памяці пах гэтай вады, пах гліны і травы, пах дыму і восені, пах жыцця, якое яшчэ не скончылася, і смерці, якая яшчэ не настала. А вось што яна будзе ўспамінаць пра гэта ўсе?

Ці згадае яна цішыню, якая стаіць над намі? Ці згадае яна сваё дыханне, якое вырастае цяпер сярод гэтай цішы? Бо ўсё залежыць ад нас. Перш за ўсё — наша жаданне хоць нешта памятаць. І наша жаданне не памятаць нічога.

Ужо калі яна выйшла, калі я падхапіў яе на беразе і дапамог знайсці адзежу, калі мы вярталіся назад, да дома, яна сказала:

— Апошняя электрычка, мабыць, паехала. У Лукі ёсць месца. Застанешся са мною?

— Вядома, застануся, — адказаў я.

Падыходзячы да дома, мы пачулі музыку. Рэзкія пераможныя гукі луналі аднекуль з-за яблынь. На падворку было пуста, усе раз'ехаліся. Мы пайшлі на музыку. Не даходзячы, спыніліся пад дрэвамі. Каля стала, у траве, стаялі крэслы. На адным з іх сядзела незнаёмка, якая чамусьці засталася. Сядзела, адкінуўшы назад валасы і спакойна паклаўшы рукі на калені. А перад ёй радасна і злосна танцаваў Лука. Ну, як танцаваў? Было гэта нешта накшталт пога — вясёлыя адчайныя скачкі ў неба, адрыванне ад паверхні, спробы заскочыць у цемру. Скакаў Лука высока, хоць давалася яму гэта цяжка — кашуля яго набрыняла потам, жылы на шыі напружыліся, аднак ён скакаў і выкідваў угару рукі, скакаў і апускаўся ў мокрую траву, скакаў пад хрыплыя гукі з падоранага магнітафона. Гэта была яго любімая Паці Сміт, якую ён слухаў заўсёды, калі меў добры настрой. Але калі меў кепскі настрой, то слухаў таксама яе, там, дзе яна гаварыла, што Ісус памёр за чыесьці грахі, але, напэўна, не за мае. І Лука скакаў, нібы цешачыся ад усяго гэтага — напэўна не за мае, і напэўна

не за твае, дзяўчынка, бо якія ў цябе грахі, якое ў цябе збавенне, мы сплацім усе нашы даўгі, мы дамовімся з усімі мытнікамі гэтага свету, мы разлічымся за ўсё, да апошняга слова, да апошняга выдыху.

А яна сядзела і ўважліва глядзела на яго. Слухала яго, не адводзячы погляду, ківала галавою, з усім пагаджаючыся. Не аклікаючы яго, не спыняючы. Чакаючы колькі трэба.

ЧАСТКА ДРУГАЯ

Удакладненні ды абагульненні

Спачатку быў толькі зялёны змрок.
Ціша й нічога, яе акрамя.
Колькі ўсяго ён губляе знарок,
перш чым адбудзецца першы крок,
ды ўсё ж вымаўляе яе імя, —

як адчыняе начное акно
і ловіць напружана кожны рух,
спадзеючыся, што ўсё адно
нябыту халоднае палатно
не абміне яго цёплых рук.

І ўсё, што адбудзецца з імі цяпер, —
гальфстрымы і айсбергаў мёртвых ільды,
штодзённы рух паветраных сфер,
спеў кашалотаў і крык хімер,
колеры, водары, знакі, сляды,

карэнне траў і лістота дрэў,
птушыны свіст і азёрны плёск,
слухмянай жывёлы рыканне і спеў,
руда і вугаль, сумнеў і спадзеў,
гул кірмашовы сталіцаў і вёсак,

агонь, што спальвае караблі,
смерць на шаўковых сцягах перамен,
светач, што згас невядома калі,
мёртвы, што шэпча з летняй зямлі,
кроў, што блукае па рэчышчах вен:

прыйдзе ўсё, што павінна прыйсці,
і знікне, што знікнуць павінна было,
як мыта за першыя межы ў жыцці,
за голас ветру ў начным трысці,
за выдых у вызваленае цяпло.

Ведае ўсё, што чакае на іх,
ды ўсё ж вымаўляе яе імя —
зычнымі ўголас, галоснымі ўслых
творачы ў небе першы ўскалых
сонца і зорак, і сэрцаў малых —
жарсцю, пяшчотай — імі дзвюма.

Марат памёр ува сне.
Калі сакавік пракладае дарогу вясне.
Калі растаюць снягі
і пакідаюць рэкі свае берагі,
як пакідаюць дзеці наседжаныя дамы
пасля цяжкое зімы.

Марат трэнаваўся на «Спартаку»,
верачы тэхніцы болей, чым кулаку.
Загартаванае цела й сур'ёзны твар —
дасканалы набор,
мабыць, ён быў напраўду найлепшы баксёр
у паўсярэдняй вазе,
насіў наколку з Фідэлем на левай назе.

Імам прамовіў над целам, сярод гурмы:
«Прарок не журыўся ніколі, не будзем і мы.
Прарок добра ведаў: зло пажырае зло.
Будзе так, як будзе. Заўсёды так і было.
Вось і Марат мае што сказаць
пра віны начэй і дзён.
Прарок і выдумаў пнеўманію
для гэткіх, як ён».

Маратава мама маўчала ў кутку.
Брат слухаў малітву з гаркотай на языку.
Імам, паклаўшы далонь
на худое плячо,
сказаў яму колькі слоў:

«Усё, што знікае, калісьці ўзыдзе ізноў».
«Не знікае нічога, — яму запярэчыў брат. —
Я забяру сабе капу, з якою біўся Марат.

Я ведаю, ад чаго ён памёр.
Шторанку ён біўся з хімерамі, як баксёр.
Штодня ён збіваў у кроў кулакі.
Штовечара чуў, як зоркі над ім
згасаюць навыперадкі.
Адно найсмялейшыя з нас заступаюць за тую мяжу.
Хто бачыў яго на рынгу, той знае, пра што я кажу.

Як можа знікнуць тое, што ёсць?
Што з ім рабіць таму, хто заўсёды дае нам досць?
Знікнуць можа хіба што страх.
Рэшта ў нас застанецца — малодшых братах,
што разаб'юць сабе сэрца байца,
стоячы да канца».

Брат адступіў убок.
Ён быў маладзейшы на год і штокрок
паўсюдна хадзіў за ім,
лічыў Марата галоўным ва ўсім.
Цяпер адышоў, замаўчаўшы, каб напаказ
не плакаць, бо, пэўна, саромеўся нас.

Калі выносілі цела, пачаўся снег.
Ён падаў пад ногі з цёмных нябесных стрэх.
Імам напарадзе крочыў, як прывід бяды.
Ранняй вясной не найлепей хадзіць на клады.
Жанчыны паціху плакалі, а сябры
чулі, як зоркі згасаюць над імі ўгары.

Баі без правілаў — цяжкі заробак святых,
калі суддзя штось крычыць і натоўп заціх.
І маладыя апосталы б'юцца
супраць мясцовых,
то-бок супраць чужых.

І Ісусу таксама бінты намотваюць на кулакі,
і штурхаюць у кола, нібыта ў воды ракі,
і супраць яго выходзіць юны партовы грузчык,
і, вітаючы, не падае рукі.

І калі Ісус падае на цыркавое сукно,
калі апускаецца ў пекла, кудысьці на дно,
цела ягонае робіцца крохкім, як хлеб,
а кроў — сухой, як віно.

Ды хтосьці крычыць яму ў спіну: «Давай, туды!
Згадай усё, што казаў нам, як быў малады!
Калі ты не ўстанеш, пра гэта дазнаецца кожны,
адразу і назаўжды!

Падымайся і біся — ты ж б'ешся, як бог!
Не дай гэтай сволачы шанцаў! Валі яму па зубох!
Твая дарога да мэты
складаецца з перамог!

Ніякай літасці тым, хто дрыжаў між рэчак і траў!
Ніякай Божае ласкі таму, хто хлусіў і краў!
Давай, ты ж столькі разоў
падаў і паміраў!

Яны ж усе тут — здраднікі ды слабакі!
Замест сумлення ў іх — жабры,
замест крыл — плаўнікі!
Валі іх, Госпадзе, трушчы аб іх кулакі!

Валі іх за слабасць і плач, за няздатнасць перамагчы!
За тое, што кожны пра ўсё забывае ўначы!
І нават уласнаю смерцю
любуюцца, як гледачы!

Яны ўсё адно не слухаюць ні нас, ні цябе,
нічога іх не ўратуе, нічога іх не грабе,
нішчы іх, Збаўца, пакуль яны самі сябе
не вынішчылі ў барацьбе!

За іх ляноту й прадажнасць — валі іх, мацней, люцей!
Нішчы за пакаленні ссучаных паўлюдзей!
За хцівасць на сподзе малітваў,
за хітрасць на дне іх надзей!»

...І ён падымаецца, сплёўвае чорную кроў,
падымаецца, потым падае, пасля падымаецца зноў,
і грузчыкі шэпчуцца, ну вось, ён зноўку
смерцю смерць пабароў.

І валіць правым прамым проста пад дых!
За кожнае ліха ў сэрцы гэтых і тых!
Паколькі бокс і напраўду — справа ўпартых
і маладых.

І юны бамбіза падае па-за жыццё,
паспеўшы сказаць яму дзякуй, і цешыцца, як дзіцё,

маўляў, шчаслівы, хто верыць
у збавенне і ў забыццё.

І ручнік да твару яму прыклаўшы ў імя айца,
апосталы скажуць, што верылі да канца.
А тыя, што ставілі на яго,
і далей будуць ставіць
таксама —
на дасведчанага байца.

Дзядзь Саша працаваў на Фрунзе, у кабаку,
ды знаўся на справе, пухам яму зямля.
Любіў казаць: «Сапраўднаму мараку
гонар флоту важнейшы за рэпутацыю карабля.

Таму дзе б ні кінуў ты якар, дзе б ні зайшоў у порт,
трымай сваё сэрца адкрытым для ўсіх вятроў.
Нават калі будзеш зранку бляваць за борт,
трымайся толькі за тое, што ўвойдзе ў кроў.

Нават калі ты будзеш вісець паміж рэй,
нават паміж паверхняю ды акіянскім дном,
памятай, што заўсёды, за кожнай з дзвярэй,
хтосьці чакае цябе з надзеяю ды віном!»

Нам дастаецца ведаў не так і шмат,
а што дастаецца, не вельмі патрэбна ў жыцці.
Ды я быў гатовы без роздуму, наўздагад,
паверыць яго міражам і за імі ісці.

Таму што ўсе яго выдумкі, п'яных казак сувой,
лютасць праклёнаў ды гневу чарнільная муць
былі пра тое,
што нельга здаваць сваіх, калі ўвяжуцца ў бой,
і дараваць чужым, калі цябе б'юць.

Я памятаю бяседнікаў тых гадоў,
каго патрулі выводзілі ў золкай імгле
да сакавіцкіх адлігаў і лістападаўскіх халадоў
ад справядлівасці й шчасця пры кожным стале.

Цёмныя твары прафесараў і рабацяг,
што яго байкі слухалі пра Чарнаморскі флот, —
хтосьці з іх на памыйцы вывесіў белы сцяг,
хтосьці даўно памёр ад голаду і сухот,

хтосьці пакінуў юдоль, дзе пануе зло,
ды пайшоў адваёўваць страчаны Ерусалім.
Але не згадаю нікога, бо гэтакіх не было,
хто не гатовы загінуць быў разам з ім.

«Давай, дзядзь Саша, — крычаў кожны з іх, —
нам яшчэ дасца з Гасподніх даброт.
З гэткай дзяржавай не зладзіш уласны флот.
Гэты горад з ягонымі рэкамі і залатым пяском
яшчэ памяне нас паленым каньяком.
Гэтым святлом яшчэ палыхне Млечны шлях,
чорная ружа яшчэ сатлее ў дзявочых руках.
Сэрца згарае ў кожным, як высахлае лісцё.
Смерць надыходзіць толькі тады,
як заканчваецца жыццё».

Яны заступалі за рог
і знікалі за міг.
Я, мабыць, адзіны збярог,
што засталося па іх.

Золата ў паясках.
Жывёлы, дзеці, жанкі.
Дрэвы ў летніх пясках.
Крыніцы на дне ракі.

Каманду расфармавалі яшчэ ў мінулым сезоне —
уласнік вывеў актывы й купіў гатэль у Егіпце.
Вароны з гракамі хадзілі насуплена па газоне.
І прывід паразы вастрыў аб старыя мячы свае кіпці.

Саня, наш правы край, найлепшы ў камандзе,
нават заплакаў, збіраючы рэчы на базе.
Трымаў свае буцы і скардзіўся на аўтамаце,
склаўшы рукі, нібыта суніт пры намазе.

Ды ладна, дзівіўся я, гэтак паводзіцца — днішча,
быццам ён тут адзіны, каго на адчай прабіла.
Брат Сані быў правы, сядзеў і марыў наш горад
знішчыць
за тое, што выбралі мэрам такога дэбіла.

І тата, здаецца, сядзеў і таксама быў правы.
Я нават не ведаю, як яму з імі жылося.
Усё, што ў жыцці меў ён добрага, —
хіба што траўмы,
старыя шчыткі й цёмны колер даўгога валосся.

Тады я кажу яму: Сань, істэрыку супыні ты,
харэ пра нашы працоўныя ныць рэзервы,
што мы стаім тут, быццам і праўда суніты,
давай, Сань, пайшлі, крыху падлекуем нервы.

Уладкуемся на завод, зладзім якуюсь прыгоду,
пойдзем у аспірантуру ці працаваць аховаю.
Маючы выбар, заўжды абірай свабоду.
Ад абароны ў меншасці — тактыка паспяховая.

А ён адказаў мне: якая праца, пра што ты?
Якая ахова, што ты такое гаворыш?
Усё, што я меў у жыцці, — чужыя вароты.
Адзіны мой фан — стары вартаўнік, мой кораш.

Усё, што ў мяне было, — гэта нумар на спіне
і месца ў аснове, за якое я рваў свае жылы.
І чым мне цяпер займацца ў гэтай краіне?
Як разабрацца паміж сваімі й чужымі?

З кім наагул мне тут біцца і разбірацца?
Кіну ўсё нахуй, перабяруся ў Расію,
буду гуляць, дзе паставяць, праца ёсць праца,
буду ўцякаць ад маразму, буду чакаць амнезію.

...Я ведаў, што ён не паедзе, кінуўшы поле бою,
што кожная з нашых страт — насамрэч непазбежнасць,
што нельга ўцячы ад сябе са сваёй журбою,
што мы — гэта наша нянавісць, любоў і залежнасць.

Ніхто нічога не зробіць з нашымі згадкамі й снамі,
не зменшыць хуткасці зор, не зменіць сонца памеры,
не спыніць нічога, і ўсё застанецца з намі,
колькі б мы ні жылі і як бы мы ні памерлі.

Наша начное неба, птушкі на небакраі,
нашыя гарады, рэкі, палі і суддзі...
Ніхто і ніколі нічога пра нас не згадае,
ніхто і ніколі нічога нам не забудзе.

Вось я зноў пішу пра яе,
апавядаю пра балконы
ды яе хатнія размовы.

Вось я згадваю, што яна
хавала ад мяне,
што захоўвала між старонак
анталогіяў усіх тых выклятых паэтаў,
якія старанна псавалі
нам жыццё.

«Мінулым летам, — казала яна, —
нешта сталася з маім сэрцам.
Яно пачало дрэйфаваць, быццам карабель,
каманда якога памерла
ад ліхаманкі.

Рухалася ў глыбіні майго дыхання,
падхопленае плыняй,
атакаванае акуламі.

Я казала яму:
сэрца, сэрца, ніякія ветразі ды канаты
не дапамогуць табе.
Сузор'і вісяць надта высока,
каб можна было знайсці дарогу.
Сэрца, сэрца,
зашмат мужчын
наймалася ў тваю каманду,
зашмат іх сыходзіла ў брытанскіх партах,
губляючы душы
зялёнымі слязамі алкаголю».

Так і я —
згадваю яе лыткі, за якія гатовы
быў біцца да крыві,
і паўтараю за ёй:
сэрца, сэрца,
хворае на ліхаманку,
адужвай хутчэй,
ідзі на папраўку,
столькі яшчэ пякучага кахання нас чакае,
столькі яшчэ прыўкрасных трагедыяў
схавана ад нас у адкрытым моры.
Сэрца, сэрца,
мне так радасна слухаць,
як ты б'ешся,
падобнае да лісіцы —
спайманай,
але не прыручанай.

Прынцэса носіць
аранжавыя кліпсы
і цёмны мяшок,
у якім трымае свае скарбы.
Часам апавядае:

— Гэта касметыка, якую мне
купіў тата. Гэта цыгарэты,
якія бяру ў старэйшай сястры.
Гэта срэбра, што засталося
ад мамы, яна насіла яго,
пакуль не памерла.
— А гэта, — пытаю, — хто гэта на фота?
— Мае сяброўкі, — адказвае, —
яны ненавідзяць мяне за мае
залатыя валасы і чорную бялізну,
якой няма ў ніводнае з іх.
Мае сябрукі, яны здольныя
разарваць мяне на кавалкі
за ўсю тую летнюю вільгаць,
што грэецца ў маім
сэрцы.

У чым сутнасць паэзіі?
Пісаць пра тое, што ўсім даўно вядомае.
Казаць пра рэчы, якіх мы пазбаўленыя,
агучваць нашыя расчараванні.
Гаварыць так, каб выклікаць
злосць і любоў, зайздрасць, нянавісць
і спачуванне. Гаварыць
пад месяцам, што вісіць

над намі, ціснучы ўсім сваім
жоўтым рэхам.

Кожная дарослая жанчына мае
ў сабе гэты механізм,
гэтую салодкую мелодыю,
якую можна пачуць, толькі
разламаўшы сэрца,
якую, толькі разламаўшы сэрца,
можна спыніць.

Гэтая лісіца
плача ўначы на месяц
і абмінае ўсе мае пасткі,
так, быццам нічога не адбылося,
так, быццам яе гэта не датычыць.

Калісьці яна насіла на шыі
ўпрыгожанні, ад чаго іх каштоўнасць
толькі ўзрастала.
Плед, у які яна захіналася,
быў полем сланечнікаў,
і па ім хадзілі птушкі,
выбіраючы познія зярняткі
пяшчоты.

І калі яна злавалася,
гнеў падымаўся па яе венах,
быццам вільгаць па сцябліне ружы.

Самае галоўнае ў каханні —
не верыць таму, што кажацца.
Яна крычала: «Пакінь мяне ў спакоі»,
спрабуючы сказаць:
«Разарві маё сэрца».
Яна адмаўлялася
размаўляць са мной,
насамрэч адмаўляючыся
выдыхаць паветра.

Так, быццам хацела зрабіць
мне яшчэ горай, чым ёсць.
Так, быццам найбольшая наша праблема
была ў паветры,
якім мы дыхалі.

Я ёй кажу:
— Што ты малюеш увесь час?
— Гэта мужчыны, — адказвае яна, —
а гэта жанчыны.
— Чаму жанчыны ў цябе заўсёды плачуць?
— Яны, — адказвае, — плачуць па ветры,
які хаваецца ў іх валасах,
плачуць па сабраным вінаградзе,
ад якога даўкімі былі іх языкі.
І ніхто — ні мужчыны ў пракуранай вопратцы,
ні дзеці з карабкамі запалак,
дзе ляжаць залатыя скарпіёны неслухмянасці, —
ніхто не здолее іх суцешыць.

Каханне мужчын і жанчын —
гэта атрыманыя намі пяшчота і бездапаможнасць,
доўгі пералік падарункаў і стратаў,
занурэнне ветру ў травеньскае валоссе.

Ах, як горка пакладацца на таго,
каму давяраеш, як соладка расчароўвацца
ў тым, хто дакранаўся ўначы да тваіх вуснаў.

Бо ёсць рэчы капрызныя і нябачныя,
і як бы ні расфарбоўваў іх,
выходзіць заўжды тое самае:
зорка вісіць над табой,
паветра пераклпае цяплом.
Колькі святла хавае ў сабе
кожнае жаночае горла.
Колькі хавае змроку.

Найлепшае, што было гэтай зімой, —
яе сляды на першым снезе.
Найцяжэй было канатаходцам:
як ім трымаць раўнавагу
з гэтымі сэрцамі, што цягнуць убок?
Добра было б мець два сэрцы,
можна было б завісаць у паветры,
можна было б затрымліваць подых,
ва ўпор разглядаючы
зялёных медузаў снегу.

Найлепшае, што было гэтай зімой, —
дрэвы з птушкамі.
Вароны былі падобныя да тэлефонных
апаратаў, якімі карыстаюцца
д'яблы радасці.
Сядзелі на дрэвах, а дрэвы ўзімку,
як жанчыны пасля разводу, —
цёплыя карані пераплятаюцца
з халоднымі каранямі,
цягнуцца ў цемру,
патрабуюць святла.

Добра было б
навучыць тых варон спевам
і малітвам, каб заняць іх
хоць чымсьці ў гэтыя мокрыя
сакавіцкія раніцы.

Найлепшае, што магло здарыцца,
здарылася менавіта з намі.
«Гэта ўсё сакавік, — казала

яна расчаравана, — гэта ўсё
таму, што сакавік:
увечары доўга шукаеш
па кішэнях рэкламныя ўлёткі,
а зранку смарагдавая трава
расце пад ложкам,
горка і палка
пахнучы
мячамі для гольфа».

У летку
яна ходзіць па пакоях,
ловіць вецер у фортках,
быццам нязграбны рыбак,
што ніяк не паладзіць
ветразі.

Падпільноўвае скразнякі,
ставіць на іх пасткі.

Але скразнякі кажуць ёй:
надта пяшчотныя твае рухі,
надта гарачая кроў,
з такой вытрымкай
што ты можаш злавіць
у жыцці!

Надта высока ты
ўздымаеш далоні,
ловячы паражнечу.
Усё, што вылецела ў нас
з рук, — толькі пустата.
І ўсё, на што
не хапае цярплівасці, —
толькі вецер, які лётае
над горадам.

Сонца ў ранішнім небе,
падобнае да апельсіна
ў школьным ранцы:

адзінае, што мае сапраўдную вагу,
адзінае, пра што думаеш,
калі робіцца асабліва
самотна.

Калі б я быў паштальёнам
у яе квартале,
калі б я ведаў, адкуль
ёй прыходзяць заказныя
лісты,
магчыма, я лепей
разумеў бы жыццё,
ведаў бы, як яно запускаецца ў рух,
хто яго напаўняе спевам,
хто напаўняе слязамі.

Людзі, што чытаюць газеты,
людзі з цёплымі
сэрцамі, добрымі душамі,
старэюць, нікому пра гэта
не паведамляючы.
Калі б я быў паштальёнам
у гэтым квартале,
я б нават пасля іх смерці
паліваў кветкі
на сухіх балконах,
карміў дзікіх катоў
на зялёных кухнях.

Каб, збягаючы па сходах,
чуць, як яна скажа:

паштальёне, паштальёне,
усё маё шчасце
змяшчаецца ў тваёй торбе,
не аддавай яго
малочнікам і жалезным удовам,

паштальёне, паштальёне,
смерці няма,
і па-за смерцю нічога няма.

Ёсць надзея,
што ўсё будзе так,
як мы захочам,
і ўпэўненасць,
што ўсё адбылося так,
як мы хацелі.
Ах, які ў яе
горкі, бязважкі голас.

Ах, які ў яе
немагчымы,
неразборлівы почырк.
Такім почыркам добра
падпісваць смяротныя выракі:
ніхто нічога не выканае,
ніхто ні пра што не здагадаецца.

Яна любіць хадзіць басанож, засынае на жываце,
каб лепей чуць, як нафта рухаецца пад зямлёю,
як нараджаюцца дрэвы ў цемры і пустаце
і вада падымаецца й перацякае проста пад ёю.

Яна ведае ўсе падвалы і дахі,
усе прахадныя двары
і маршруты кватэрных зладзеяў,
што горад трымаюць за вымя,
яна ўмее лавіць паветраных змеяў
і дырыжаблі ўгары
з пастухамі хмар і паветранымі вартавымі.

І кожны падлетак хацеў бы яе за плячо злавіць,
хоць ведае, што няма асабліва чаго лавіць,
бо схопіць толькі рэшткі яе цяпла,
не верачы, што яна і напраўду толькі што тут была.

І кожны забойца пойдзе за ёй у цямрэчу саму,
з надзеяю, што яна будзе сніцца яму,
з пэўнасцю, што падмане памяці каляя,
не разумеючы,
кім ёй напраўду
даводжуся я.

Таму што хавае далоні
ў чужых кішэнях, як скарб,
ведае кожнага кантралёра ў начных трамваях,
і толькі дзеля таго вітаецца з імі, каб
парушыць іх адзіноту, якая да ранку трывае.

І кантралёр разгублены ўшчэнт цяпер,
прыкуты да ўласных страхаў, як да галер,
квіткі раздае безнадзейна, глядзіць у акно:
дзе гэтая пасажырка, якой даўно ўсё адно, —

на якім прыпынку выходзіць у чорны змрок,
па якім нешчаслівым каханні расплакацца незнарок,
шкадаваць пра якія страты, а пра якія не,
і ў якіх менавіта словах пра гэта расказваць мне.

Я е айчым яшчэ той быў вар'ят,
працаваў з в'етнамцамі, ім даглядаючы сад,
хоць дрэвы, здаецца, і так няблага раслі
за фабрыкай, на прадмесці, з цёплай зямлі.
Лічыў галінкі, як зэкі лічаць гады,
паляваў на лісіцаў,
сабакаў падкормліваў у халады.
Усе называлі яго звар'яцелым, і нават яна
казала: я ж так лічу не адна,
але я люблю яго і ён патрэбны мне,
чаму ж ён хаваецца вечна ў зацені, у старане,
чаму, калі ён выходзіць на сонца, у яго такая хада,
быццам ён ведае,
скуль да нас прыйдзе бяда.

Гаспадары не помнілі, якое ў яго імя,
яго не пазнавалі знаёмыя, яго забыла сям'я,
ім пужалі дзяцей, якія не баяліся ўсё адно,
выбягалі за ім на старое чыгуначнае палатно
і выцягвалі яйкі з птушыных гнёздаў, калі ён хварэў,
нібыта выкручвалі лямпачкі, развешаныя між дрэў.

Я бачыў яго толькі раз, у няпэўным восеньскім дні,
заўважыў, як ён ішоў, са спіны, з далечыні,
ён крочыў, трывожачы зоркі ў гнёздах нябёс, —
каб абразаць галінкі, драбіну цяжкую нёс,
і постаць была пакорлівай, стома й нічога звыш.
Я думаю, так Ісус нёс на сабе свой крыж.

Я падумаў тады яшчэ — добра яму ісці,
не ведаючы пустаты, бо хопіць працы ў жыцці,
помнячы ўсё, што было, прымаючы ўсё, што ёсць,

добра ўяўляючы заўтра, якога яму будзе досць.
Ён верыць: нічога не зменіцца,
нікому адсюль не ўцячы,
і цягне драбіну сваю то на тым, то на гэтым плячы.

Я сказаў яму ўслед:

рабі, што належыць табе,
праца — адно толькі частка ў людской барацьбе,
вера — адно будаўнічы пясок у замесе гадоў,
а без садоўнікаў дрэвы не будуць даваць пладоў.

— Як добра, — думае ён, — што я для яе памёр,
добра, што хутка забудзе мяне зусім,
добра, што ўсё не трывае да гэтых пор,
добра, што не прыйшлося мне быць пры тым.

Добра, што ўсё яна вырашыла за нас
і што я не прасіў рабіць, як хутчэй,
не назіраў, як яна вагаецца ўсякі раз,
не мусіў бачыць пры гэтым цёмных яе вачэй.

Цяпер галоўнае — знікнуць,
выбраць іншы маршрут,
галоўнае — не вяртацца туды, дзе дагэтуль жыў,
не падыходзіць заблізка да знаёмых атрут,
не палохаць знаёмых,
не расчароўваць чужых,

не кранацца іх рэчаў, не падглядаць іх сноў,
не разгортваць іх кніжак, не каштаваць іх віна,
не бачыць іх позіркаў, не чуць іх начных размоў,
не адчуваць таго,
што яны самі не адчуваюць здаўна.

Добра, што зараз можна лётаць праз коміны,
праходзіць праз полымя, падаць у пустату,
адчуваць трапяткую матэрыю, што напаўняе ёй сны,
заўважаць у паветры канаты, што трымаюць яе на ляту.

Добра, што смерць не належыць
да нашых набыткаў ці страт,

добра, што нам не здраджваюць нашы сляды,
і што нічога нельга вярнуць назад,
і што нічога нельга згубіць назаўжды.

Што было? —
зялёнае цяпло,
вечаровага неба
аранжавае крыло.

Поўня — золата ў малацэ,
блакітная рыба ў рацэ,
чорныя цені
на ейнай шчацэ.

Што рабіць са святарамі?
Яны, як худобу, пасвяць свае цэрквы,
пускаюць іх у смарагдавую траву, глядзяць,
як цэрквы цяжка кладуцца ў рачны мул,
хаваючыся ад чэрвеньскага сонца.
Ходзяць за цэрквамі, выганяючы іх з чужой
пшаніцы, заварочваюць дадому, туды, дзе
запальваецца агонь вечаровых сядзібаў.
Спяць на мяшках і кнігах,
слухаючы соннае дыханне жывёлы,
ува сне згадваючы твары жанчын, што прыходзілі і
апавядалі пра самыя патаемныя грахі,
пыталі парады, чакалі даравання.

Што ён можа табе параіць?
Усё яго жыццё — выпас рэха,
пошук выгану і начоўка пад чорным небам.
Можаш спяваць з ім разам, можаш
спаць поруч з ім,
накрыўшыся пехацінскім плашчом,
можаш сушыць на вогнішчы мокрую вопратку,
мыць у рацэ свае кашулі,
якія ён гатовы вывешваць у царкве, як плашчаніцы.

Што рабіць з атэістамі?
Яны кажуць — напраўду я веру, веру ўва ўсё, што
было сказана, але ніколі і нізашто,
ні пры якіх абставінах,
ні ў якім разе ў гэтым не прызнаюся,
таму што гэта мая справа,
і датычыць яна толькі мяне.

І хай ён сто разоў пры гэтым
абражаецца і пагражае,
гневаецца і адварочваецца на сваім распяцці,
усё роўна — куды ён без мяне?
Што ён будзе рабіць адзін?
Ён мусіць змагацца за маю прысутнасць,
асуджаны біцца за маё збавенне,
не можа не лічыцца з маімі сумневамі, з маёй
непаслядоўнасцю, з маёй шчырасцю.

Што рабіць з табой?
Можаш спяваць разам з намі,
станавіцца з намі ў кола, класці рукі нам на плечы:
мы адзіныя ў нашым спеве,
адзіныя ў нашай любові,
у нашай самоце,
у нашым расчараванні.

Дык што рабіць з намі ўсімі?
Калі б ён не мусіў вартаваць сваю хатнюю царкву,
калі б не быў павінны ісці за ёй, выганяючы
з жоўтых палёў,
ён меў бы куды болей часу на нашыя
прыкрасці і нашыя знакі.

Любоў знішчае
ўсе нашыя ўяўленні пра раўнавагу.
Можам забывацца і адступаць убок,
можам адмаўляцца ад таго, што казалі,
можам цалаваць ноч у чорныя вусны —
мы адзіныя, каго кранаў начны агонь,
мы адзіныя, хто верыць,

мы адзіныя, хто ніколі
ў гэтым не прызнаецца.

Можаш казаць пра ўсё, што табе сніцца,
можаш казаць, можаш не баяцца цемры:

усё роўна нехта цябе пачуе,
усё роўна ніхто табе не паверыць.

Горад, у якім яна закахалася,
гарыць сцягамі,
ляжыць пад заснежанымі пераваламі.
Паляўнічыя выганяюць дзічыну
з пратэстанцкіх сабораў,
блакітныя зоркі падаюць у возера,
забіваючы марудную рыбу.
Ах, гэтыя вуліцы,
над якімі завісаюць канатаходцы,
ах, як яны балансуюць за школьнымі
вокнамі, выклікаючы захапленне,
як ухіляюцца ад азёрных кірляў,
што выхопліваюць у яе з рук
залатыя бязважкія чыпсы.

Там, дзе мы з ёй калісьці жылі,
мы не мелі часу на спакой і сузіранне.
Мы біліся аб вострыя чарот ночы,
скідвалі вопратку, нібы баласт, у чорную шахту ліфта,
каб пратрымацца ў паветры яшчэ адну ноч,
ненавідзячы і не выбачаючы,
не прымаючы і не верачы,
гнеўна пераживаючы найлепшыя дні
свайго жыцця.

А вось горад, у якім яна ўрэшце схавалася,
пяшчотна кранае яе за руку
і адчыняе перад ёй свае склады і сховы.
Ах, гэтыя парты, куды сыходзяць вывезеныя
ў трумах сенегальцы,
чорнае мяса сэрцаў,
слановая костка вачэй,

ах, гэтыя падвалы, пакаваныя сырам,
гасцінныя пратэстанцкія гарады,
у якіх можна пераседзець Страшны суд,
такія тут адукаваныя адвакаты,
такія непрыступныя муры.

Бо там, дзе мы з ёй
калісьці грэліся на кухнях,
каля сініх крыніцаў агню, пасля нас не засталося
ніякага следу. Час, стары канатаходзец,
сто разоў падаў, сто разоў падымаўся,
з паламанымі ключыцамі і жалезнымі зубамі,
яму без розніцы, у якім кірунку рухацца, —
заліжа раны і зноўку танчыць між кірлямі.

Але горад, у якім яна змагла захавацца, —
якія тут стракатыя сукенкі ды кашулі,
якая аксамітная скура ў пілотаў
і кітайскіх студэнтак.
Ах, гэтае свежае горнае паветра,
гэтае адчуванне крыві пасля
балючых пацалункаў.

Яна нічога не забыла там, адкуль паехала.
Ніводнага голасу, ніводнага праклёну.
Жыццё — вясёлае перацягванне каната.
З аднаго боку яго цягнуць анёлы.
З іншага — адвакаты.
Адвакатаў больш.
Але і паслугі іх каштуюць даражэй.

Святы Францыск
збудаваў гэты горад для сёрфераў і герояў.
Ён прыводзіў сюды
караблі каралеўскіх флотаў і спыняў іх
у ціхіх бухтах, над якімі стаялі туманы.
Іспанцы выскоквалі на бераг,
і расійскія маракі
ў ратавальных чаўнах, і золаташукальнікі
з Кітая прашывалі ноч ліхтарамі,
дзівячыся ценям на пагорках.
І кожная закладзеная царква
была як стомлены голас —
свабоды хопіць усім,
калі вы не будзеце трымаць яе для сябе,
дзяліцеся хлебам і вугалем на зіму,
глядзіце на сонца праз бутэлькавае шкло акіяна,
золата хопіць на ўсіх,
але каханне дастанецца толькі самым адважным!

Тысячы гадоў патрэбна для таго,
каб выбраць з зямлі ўсе даброты,
тысячы начэй неабходна,
каб вывучыць звычкі мясцовае скумбрыі,
тысячы слоў патрабуе той, хто размаўляе з вечнасцю.
Чума сыходзіць у святочны порт,
і за ёй высыпаюць з касцёлаў дзяўчаты і падлеткі,
зухаватыя й залатаскурыя, з першымі таямніцамі
і каталіцкімі гімнамі —
дзяліцеся кнігамі ды яскравай вопраткай,
дзяліцеся ёй, дзяліцеся кавай ды гароднінай,
у гэтым горадзе мы ўсе абароненыя
моламі ды мурамі цвердзі,

столькі радасці прывезена сюды з усяго свету,
што нам рабіць з ёю,
што нам рабіць з ёю?

Я ведаю, што святы Францыск ахоўвае яе,
калі яна з'яўляецца тут
на канферэнцыях ці ў бібліятэках,
ахоўвае яе кожны раз, калі яна ходзіць па крамах,
лічачы капейкі, на якія мае пражыць да ад'езду,
ахоўвае ад ворагаў, ахоўвае ад сяброў.
І нервуецца, калі я яму падказваю:
дзяліся з ёй сваім цярпеннем,
дзяліся стомай, дзяліся радасцю,
у гэтым горадзе на каго ёй яшчэ пакласціся,
як не на цябе,
у гэтым жыцці пра каго нам з табой яшчэ размаўляць,
як не пра яе,
каго нам яшчэ ахоўваць,
каго раўнаваць,
Францыск?

Якія твае грахі, жанчына?
Хто стане лічыць швы на цёмным фоне,
там, дзе вены павольна ўпадаюць у далонь?
Каму прыйдзе ў галаву пытаць дарогу
у тых невядомых, чыімі галасамі ты гаворыш у сне?
Каму хопіць адвагі стаяць пры тваім узгалоўі,
разглядаючы, як пад тваім горлам
варочаюцца раз'юшаныя змеі?

Якія твае беды, якія твае таямніцы?
Нельга нічога схаваць,
нельга вярнуць страчанае.
Дык навошта прасіць прабачэння ў костак,
якія ляжаць у садзе пад ружавымі кустамі?

Але яна адказвае: заўсёды
знойдзецца хтосьці,
хто нагадае пра кожную з нашых страт.
Заўсёды знойдзецца хтосьці, хто не дасць нам спакою,
здабываючы з нашага цела страх, быццам карэнне.

Ужо блізка восень. І па цэрквах
стаіць мёд спеваў і галасоў.
Усіх хрысціянаў яднаюць выявы святых,
падобныя да партрэтаў у сямейным
фотаальбоме —

блізкае і зразумелае нам з дзяцінства святло
суправаджае
нас на працягу жыцця,
найбліжэйшыя велікамучанікі — тыя, што
вымалі табе стрэмкі з дзіцячае далоні.

Які твой клопат, жанчына? Дзе твае мужчыны?
Здраджаныя і пакорлівыя, гнеўныя і непрытомныя,
яны прамаўляюць тваё імя, нібы назву мікстуры,
якая не зменшыла іх пакутаў.
Месяцы, што раслі ды паміралі за тваім акном, —
хтосьці збіраў іх і складаў у купу,
нібы восеньскую цыбулю.

Але яна пярэчыць: месяцы, што памерлі,
не могуць нічому навучыць,
і пагаслыя зоркі, быццам вочы філолагаў,
марна намагаюцца прабіцца
скрозь цямрэчу свету.

Ні святла, ні пустэчы, ні агнёў на рацэ,
ніводнага імені, якое б згадвалася гэтай ноччу.
Каханне — гэта ўменне перабіраць камяні ў начной
вадзе.
Каханне — гэта ўменне глядзець, як усё нараджаецца.
Як памірае.
Як нараджаецца зноў.

Жанчыны, што жывуць за ракой,
дзе ілістая глеба
і чырвонай цэглай брукаваныя вуліцы,
прачнуўшыся, ідуць на бераг,
чакаюць, што вада прынясе ім гэтым ранкам —
выпушчанае кімсьці з рук пранне,
пушчаныя па плыні кошыкі з гароднінай
ды немаўлятамі.

Вада складаецца з таямніцаў, трэба
быць уважлівым, каб цябе не зацягнула ў глыбокія
студні,
туды, дзе чакаюць прывіды з рыбінымі галовамі
і пяшчотнымі хвастамі — закаханыя і здраджаныя.
Калі б існавалі масты,
калі б можна было перабрацца на той бок,
я даўно быў бы ўжо там.
Як можна забыць пра цябе,
знаходзячы сляды тваіх пазногцяў на перадплеччы,
і як можна згадаць твой твар,
калі ты заўжды прасіла выключыць святло?

На гэтых берагах, за цэхамі ды кацельнямі, гараць
нябёсы,
і памерлыя дзяўчаты ў стракатых цыганскіх спадніцах
стаяць у паветры над дахамі, зазіраючы ў коміны,
спяваючы ў іх, як у старыя лямпавыя мікрафоны.

Жанчыны, што жывуць на іншым беразе, —
ім ніхто не расказвае пра маладых прыблудаў,
што кожны вечар хаваюцца ў разлітым
яблыневым золаце, падглядаючы,

як яны скідваюць свае бязважкія сукенкі і выцягваюць
з валасоў шпількі ды атручаныя грабянцы.

Хто трапіў сюды, будзе штодня
рыбачыць, закідваючы сеткі сярод туману,
каб класці ім да ног чырвоныя сэрцы,
вырываючы іх з рыбін,
нібы туліпаны.

Калі б толькі можна было трапіць на той бераг,
прайсці паўз халодны цень электрычнай станцыі,
пабачыць птушак, якія цягаюць з падаконняў
завушніцы і нацельныя крыжыкі.
Адчуць, як уначы з ракі выходзіць змрок.
Ведаць, што зранку ён адступіць назад.

Зімы зусім не падобныя ўжо на зімы,
зімы цяпер прыходзяць чужымі снамі, —
такія прыкрыя выпадкі вяжуцца з імі,
такія гісторыі дзіўныя робяцца з намі,

такія расстанні і страты вярэдзяць памяць,
такія чаканні, вяртанні парою позняй,
такія абразы, што памяць ужо не сцяміць,
якая першай была, якая апошняй,

такая пэўнасць у тым, што ўсё робіш слушна,
такая прага адпрэчыць усе відавочныя крокі,
халодны, як войны, снег ляжыць непарушна,
такія аблогі трываюць, такія здараюцца ўцёкі,

такія сінія дрэвы, такія смарагдавыя планеты,
такое святло на пагорках, такое сутонне ў даліне,
што нават калі ты не побач, я ведаю, дзе ты
і чым ты занята а гэтай і кожнай гадзіне,

ведаю, што цябе мучыць зімовымі вечарамі,
што ты згадваеш з радасцю, што — са смуткам,
што бачыш, калі ідзеш начнымі дварамі,
што чуеш за кожным усплёскам, голасам, гукам,

што адчуваеш, калі падыходзіш да гэтага дома,
што знаходзіш у калідорах, на сходах,
чым пераймаешся перад пакоем вядомым,
ловячы пільна кожны шолах і подых.

Кепска, што ён дагэтуль чакае й нагадвае.
Добра, што можна маўчаць, бо тэмы закрыты.
Птушка ў паветры грабеньчык у косах нагадвае.
Снег пад нагамі нагадвае дрэварыты.

Калі снягі сыходзяць, кожны раз
у травеньскай імгле начной пары
жанчыны ў кухнях супыняюць час
і вараць месяцы, нібы сыры.

І гатавання дым увышыню
праз коміны апоўначы ідзе,
і месяцам так цяжка ад агню,
што пакідаюць колы на вадзе.

Бо кожны месяц мае свой куток
між імбрыкаў, нажоў ды абрусоў,
іх назвы — доўгія, нібы глыток,
вільготны ад жаночых галасоў.

Яшчэ не ведаючы іх вагі,
захутаныя ў ціхі спеў і плач,
жанчыны іх нясуць на берагі,
дзе тояцца забойца і ўцякач.

Сузор'і рыбакоў і пастухоў
ліюць святло, начныя спевакі,
на прыбярэжных птушак цёмны схоў,
на срэбранікі рыбінай лускі.

Ды боязна жанчынам на зямлі:
губляюць днём, каб згадваць уначы
таемны скарб, што ім перадалі
гравёры, антыквары і ткачы.

Каб доўга варажылі пры агні,
настойваючы тысячы атрут,
пакуль даспее мул на глыбіні
і ціша замарозіць кожны кут.

І зорнае святло гарыць чысцей,
і хопіць жоўтых месяцаў на ўсіх.
Расце трава, прымаючы гасцей,
расце трава, трымаючы жывых.

Я гавару: што з таго, што нічога не зразумела?
І што пачынаць наноў будзе справай цяжкою?
Кожнай душы абжываць трэба ўласнае цела,
і кожныя дзверы вядуць да свайго пакоя.

У кожнай прасторы лунаюць свае радыёперадачы.
Кожнае сэрца красуе водарасцямі і кветам.
І што з таго, што ўжо сёння ўсё можна прадбачыць?
І што ніколі не ведаеш, як расказаць аб гэтым?

Я ж колісь ішоў навобмацак у гэтым вечным змярканні,
я ведаю, як змагацца з нападамі й траўмамі.
Але і пасля ўсяго
ўва мне засталося так шмат кахання,
што я мог бы спыніць чуму пад гарадскімі брамамі.

Я ж ведаю, як згасае агонь у жаночай прамове.
Я сам падліваў атруту ў тое цяпельца.
Ды нават цяпер
у мяне яшчэ столькі злосці і столькі любові,
што мог бы падняць з магілаў павешаных і тапельцаў.

І пойдуць са мной, у ноч залатую, усе да рэшты —
кожны стомлены клоўн і кожны самнамбул-нябога.
Таму што з таго, што не ведаеш, як пачнеш ты?
І што з таго, што ў нас не выйдзе нічога?

А яна мяне слухае, злёгку гайдаецца.
Кудысьці сыходзіць, каб потым вярнуцца нанова.
Маўчыць, ува ўсім са мной пагаджаецца.
Смяецца, не верыць ніводнаму майму слову.

Хай не кране прастуда тваё пяшчотнае горла,
не абарвуцца ніколі твае начныя матывы.
Д'ябал будзе стаяць над табою
з медным салдацкім горнам,
супыняючы ля ўзгалоўя вусцішныя прылівы.

Хай ніколі не знікне пах ветру з тваіх футболак,
хай назаўжды застанецца ў тваім валоссі.
Я буду ўваходзіць у шэпт сірэнаў, быццам у золак,
пазнаючы твой подых у іх шматгалоссі.

На перасыльных пунктах будзеш са мною ў хлебе,
з уцякачкамі чорнымі на спартовых матах,
у перасохлым паветры і ў перамёрзлай глебе
пах твой паўночны ўчую кожнай згадкай — як шмат іх!

Буду спяваць у памяць безнадзейнай краіны,
што ва ўласнай атруце неўзабаве патоне,
буду нагадваць прахожым пра іх правіны,
буду ўгрызацца зубамі ў шматколернае сутонне.

Сонца ўстае кожны ранак на ўсходзе, за рынкам,
ёсць на кожную страту свая прычына.
Але нідзе не будзе такой цішыні, як над тваім будынкам,
нідзе не будзе такога месяца, як за тваімі плячыма.

І хай цябе грэе турбота, як віно, скаштаванае разам,
і хай гаворыць пяшчота тваёй нязмушанай мовай:
дзеці будуць вучыцца любові, вымаўляючы сказ за сказам
на ёй, зразумелай, неперакладальнай, летняй, зімовай.

Што ты будзеш згадваць пра тыя часы?
Ведаеш, памяць змывае ўсе галасы,
нішчыць імёнаў ды назваў апошні запас.
Але ты ўсё роўна згадвай,
згадвай пра кожнага з нас.

Згадвай, як трызнілі ўсе мы абліччам тваім,
нават калі пагарджала каханнем — згадвай аб ім,
нават калі ты смяялася з нашых хвароб,
нават калі была ўпэўнена ў марнасці нашых спроб,

нават калі не пазнаеш нікога ў твар,
нават калі раздражняў цябе наш баявы штандар,
мова нашых прызнанняў,
жыцці нашых святых,
колькасць у нашых кватэрах зброі, віна ды кніг.

Згадвай, пра што мы пісалі табе ў лістах,
згадвай, колькі палегла нас у чужых гарадах,
згадвай, хто з нас прадаўся, прагніў наскрозь,
згадвай хоць бы між іншым,
згадвай хоць бы кагось.

Згадвай, як мы лавілі словы твае,
столькі паразаў і цудаў дзеля цябе аднае,
згадвай адвагу і вернасць, згадвай наш нораў ліхі,
нашу любоў пры сабе насі, як старыя грахі.

Без цябе анічога не будзе, хочаш ці не.
Нашых сэрцаў падводныя міны чакаюць на дне.
Згадвай пра кожныя ўцёкі і пра любую з атак —
колькі згадаеш, і хоць бы да смерці, і хоць бы так.

І тады яна кажа:
я ведаю, чым гэта ўсё завершыцца,
усё завершыцца тым, што ўсё нарэшце завершыцца.
Я буду пакутаваць,
ты — усё новых мёртвых лавіць,
адпускаючы тых, што зловяцца першымі.
А я адказваю:
болей не будзем трываць пакуты мы.
Хай болей нікому не выпадзе жыць пакутамі.
Нашто тады ў небе існуе паэзія —
шлюзамі, шахтамі, бухтамі?

Навошта тады мы сшываем зямлю і аблокі
радкамі калядак, навошта ладзім уцёкі?
Бо кожны нармальны паэт
загойвае словам раны,
спыняючы крывацёкі.

Тады яна кажа:
чаму ж нармальны паэт паводзіцца, быццам ёлуп?
Жыве дурны, як варона,
і гіне, як брудны голуб.
І нават тое, што можна спыніць, —
не супыніў ніколі б!

А я ёй кажу: бо з крылаў чужых не здабудзем святла мы,
бо і ў святых што да мовы свае неспасціжныя планы,
бо і нармальных амаль што няма, а хто ёсць —
зладзеі ды шарлатаны.

Загаворваюць боль жывёлам і дзецям,
ловяць птушынае пер'е, што застрае між вещцем,
жывуць сабе, выбіраючы
між сметніцай і тагасвещцем.

Таму ўсё завершыцца тым,
што ўсё пачнецца спачатку,
западаючы ў горла, адкладаецца на сятчатку,
напаўняючы нас забыццём і любоўю,
адразу,
у самым зачатку.

Бо ўсё ўрэшце залежыць ад нас.

Дакранаешся да паветранай абалонкі,
парушаеш раўнавагу.
Усё, страчанае намі, усё знойдзенае,
усё паветра, што пампуюць дудары лёгкіх, —
які ўсё гэта мае сэнс
без нашага болю і расчаравання?
Якую гэта мае вагу без нашай радасці?

Бо ўсё ўрэшце датычыць тваіх пальцаў.
Дакранаешся да яе адзежы і ведаеш: нічога
нельга будзе вярнуць назад, аднойчы
названае імя перайначвае галасы,
пераплятае карані слоў,
каб табе адгэтуль біцца над мёртвымі мовамі,
спрабуючы з іх дапамогай
паразумецца з жывымі.

Дакранаешся да яе рэчаў і разумееш: за кожным
словам, за кожным учынкам стаіць
немагчымасць вяртання.
Адвага і смутак кіруюць намі —
незваротнасць кахання, неадчытанасць боль-
шасці
з цёмных прароцтваў і прадбачанняў.
З намі адбываецца толькі тое, чаго мы хацелі,
або тое, чаго мы баяліся. Пытанне толькі,
што пераважыць — жаданне ці страх.

Ноч будзе звінець ад музыкі на скрыжаванні
нашых пальцаў, пакой будзе напаўняцца святлом
з прынесеных слоўнікаў.
Бо ўсё ўрэшце палягае на ўменні
размаўляць на мёртвай мове пяшчоты.

Святло складаецца з цемры,
і залежыць толькі ад нас.

І таму, што дарогу гэтую нам давядзецца класці
да канца, і таму, што яна ў нас апошняй не стане,
мы апяваем працу,
якая нас падзяліла на касты і класы,
мы апяваем памерлых,
пасля якіх застаецца адно маўчанне.

Мы будуем дарогу між раз'яднанымі гарадамі,
мы брукуем яе ў завіруху, пракладаем у спёку летам,
перагукаемся ў тумане ўпэўненымі галасамі,
ніколі не эканомячы на нянавісці і цыгарэтах.

Бо кожная з гэтых дарог — наша радасць і стома,
бо кожны з прыпынкаў — наша цішыня і самотнасць,
бо мы заўсёды ведаем, хто нас чакае дома,
ведаем, што такое адданасць і незваротнасць.

Бо кожнаму з нас будзе што расказаць пасля смерці,
хоць кожны з нас верыць у ейную недасяжнасць,
пакуль пад гарачым небам працягваем курткі дзерці.
Я маю сэрца — і ўласна таму разумею ягоную важнасць.

Я маю голас — і ўласна таму здольны паразумецца,
каб тая дарога напраўду была не такою цяжкою,
таму што над ёй заўсёды паходня цёплага месяца,
які заўсёды можна крануць рукою.

Таму і мацуем дарогу глеем і цішынёю,
працягваючы, як нітку, пакідаем яе за сабою,
між голасам і маўчаннем, нябёсамі і зямлёю,
між цемраю і святлом, між забыццём і любоўю.

Пяць гадоў вахты, пяць гадоў цяжкай працы.
Гарачыя вены, скура ў чорным загары і брудзе.
Вярнуся, то стану расказаць, не буду спыняцца,
пакуль хоць адзін разявака аповеды слухаць будзе.

Я раскажу аб далёкім горадзе ды краіне,
аб сезонных брыгадах чорнарабочых найманых,
з якімі мы ўвесь гэты час муры падымалі ў вышыні,
як падымаюць на ногі жаўнераў па цяжкіх ранах.

Я раскажу, як будзілі нас да працы сірэны,
як мы спалі ў касцёлах пад арханёльскай трубою,
і крыжы на касцельных дахах былі чуйныя, як антэны,
каб нам слухаць, пра што святыя кажуць паміж сабою.

Розніцы не было нам, скуль прыйшлі нашы гурмы.
Розніца была ў небе, што ўгары навісала.
Мы будавалі на Ўсходзе цэрквы і турмы,
мы будавалі на Захадзе шпіталі і вакзалы.

Я ведаю, колькі напраўду каштуе праца.
Я ведаю, сэрца мае колер і смак апельсіна.
І покуль трывае праца, варта супраціўляцца,
у летнія цёплыя высі цягнуцца, быццам расліна.

Я раскажу, як Госпад стаў між нашых плямёнаў,
узяў ды перасварыў нашыя цэхі й брыгады,
падзяліў нас паводле мовы, колеру ды імёнаў,
змусіўшы нас цяпер будаваць вулічныя барыкады.

І любоў у яго дараносіцах будзе заўсёды салёнай,
і ў цэрквах яго залатых
ірландцы стаяць разам з лемкамі.

І мая любоў, забытая мной у сквотах начных Вавілона,
плача па мне ўсімі сваімі
мовамі і дыялектамі.

Ды калісьці, скажу я яму, мы станем зноўку да працы,
зноў цягнуць на руках будаўнічае будзем каменне,
чорнарабочыя ўсіх краін, найміты ды паўстанцы.
Нас раз'ядноўвае толькі наш страх і нашыя працадаўцы.
Нас яднае толькі
наша нянавісць і наша цярпенне.

Вяртацца зноў да тых рэкаў, на тыя абшары,
дзе ў брамах чакаюць мытары, як абаронцы.
Евангелісты ў цэрквах тут маюць такія цёмныя твары,
нібы збіраюць штодня вінаград на сонцы.

Мужчыны тут ходзяць па вуліцах спрэс у золаце,
і смерці нават нязручна браць у нябыт іх.
Жанчыны ўначы не спяць у чорнай згрызоце,
хаваючы вочы ў цені фарбаў блакітных.

Дзеці тут вучацца змалку такім небяспечным
рамёствам,
што, вырастаючы, робяцца беспрацоўнымі.
Тут здаўна пакланяюцца войнам, як боствам,
жэняць герояў з магіламі, кветкамі поўнымі.

Фуры з Поўдня ў горад увозяць заразу.
Страты падлічваць начамі — жабрачая праца.
І ўсё, што мне выпадае кожнага разу, —
помніць пра ўсіх і заўсёды сюды вяртацца.

Казаць сабе:
вось і восені крок нязмоўкны.
Вось, нібы сцяг палкавы, наша дрэва начное.
Вось яе цёмны будынак. Вось яе вокны.
Можа, чакае сустрэчы.
Можа, нават са мною.

ЗМЕСТ

ЧАСТКА ПЕРШАЯ
Біяграфіі ды гісторыі 7

Марат 9
Рамэа 50
Іван 89
Марыа 124
Юра 157
Фама 187
Мацвей 220
Боб 249
Лука 279

ЧАСТКА ДРУГАЯ
Удакладненні ды абагульненні 297

Tytuł oryginału: Miesapatamija
Autor: Siarhij Žadan
Przekład: Vital Latyš, Andrej Chadanovič
Redakcja: Uljana Imša

ISBN 978-83-969297-0-9

Выдавецтва «Янушкевіч»
Імпрынт Januškevič Publishing

Andrei Yanushkevich Publishing
ul. Podleśna 8/10, 05-091 Ząbki
januskevic.books@gmail.com

Ząbki 2023
Wydanie pierwsze

Druk i oprawa Abedik S.A.

Сяргій Жадан

МЕСАПАТАМІЯ



Сяргій Жадан (нар. у 1974) — украінскі пісьменнік і грамадскі дзеяч. Франтмен вядомага рок-гурта «Жадан і Собаки».

Аўтар раманаў «Депеш Мод», «Anarchy in the UKR», «Ворошиловград», «Інтернат», паэтычных зборнікаў «Цитатник», «Ефіопія», «Життя Марії», «Тамплієри», «Антена», «Список караблів», «Псалом авіації», «Скрипниківка» і інш.

Крытыкі называюць Сяргія Жадана адным з лепшых пісьменнікаў краін на постсавецкай прасторы, адзначаюць яго ўменне быць блізкім як для простага, так і для высокаінтэлектуальнага чытача.

Літаратурныя творы Сяргія Жадана адзначаны шматлікімі нацыянальнымі і міжнароднымі ўзнагародамі, перакладзены больш чым на дваццаць моў, што робіць аўтара адным з самых вядомых сучасных украінскіх пісьменнікаў у свеце.

За кнігу «Месапатамія» (2014) Сяргій Жадан атрымаў у 2015 годзе прэстыжныя літаратурныя прэміі «Ангелус» і «Украінская кніга года».

«Смерць Марата выявілася падобнай да яго жыцця — нелагічнай і поўнай таямніц. Была ноч з суботы на нядзелю. У царкву Марат не пайшоў, паколькі лічыў сябе мусульманінам, да таго ж няверуючым, затое сярод ночы выбраўся ў шапік па цыгарэты. У хатніх тэпцях і з купюрай, заціснутай у кулаку. Там яго і падстрэлілі. Ніхто нічога не бачыў, усе былі па цэрквах. Начная прадавачка з шапіка сказала, што нічога не чула, хоць ёй здалося, быццам хтосьці спяваў і чуўся рык матораў, аднак яна не ўпэўнена, але ў выпадку чаго магла б апазнаць галасы; зрэшты, немагчыма дакладна сказаць, ці былі яны мужчынскія або жаночыя, але яна ўсё ж паспела запісаць нумары на жыгулях, аднак выявілася, што жыгулі гэтыя стаяць на ўзбочыне пад студэнцкай паліклінікай ужо другі год і дворнікі складаюць у іх пустыя пляшкі ды знойдзены на сметніках кардон. Ну вось, казалі мы адзін аднаму, дзевяностыя вяртаюцца, хто наступны?»

(урывак з кнігі)

«Месапатамія» — кніга ўкраінскага літаратара Сяргія Жадана, складзеная з дзевяці празаічных і трыццаці паэтычных гісторый любові і смерці. Героямі гэтых гісторый сталі людзі розных лёсаў, біяграфій і характараў, але ўсе яны так ці інакш звязаныя паміж сабой. Разам з імі чытач апынецца ў горадзе міжрэчча, дзе яго чакаюць пакручастыя падарожжы ад аднаго берага да іншага — альбо ўглыб вады.

ISBN 978-83-969297-0-9

9 788396 929709

ЯНУШКЕВІЧ
выдавецтва

«Месапатамія» — кніга ўкраінскага літаратара Сяргія Жадана, складзеная з дзевяці празаічных і трыццаці паэтычных гісторый любові і смерці. Героямі гэтых гісторый сталі людзі розных лёсаў, біяграфій і характараў, але ўсе яны так ці інакш звязаныя паміж сабой. Разам з імі чытач апынецца ў горадзе міжрэчча, дзе яго чакаюць пакручастыя падарожжы ад аднаго берага да іншага — альбо ўглыб вады.

ISBN 978-83-969297-0-9



ЯНУШКЕВІЧ
выдавецтва

Сяргій Жадан

МЕСАПАТАМІЯ